**ПАЭЗІЯ**
Рычард Бялячыц
Уладзімір Васько
Паліна Дваранская
Мікола Кахановіч
Альжбета Кеда
Мечыслаў Курыловіч
Віктар Сазонаў
Янка Трацяк

**ПРОЗА**
Віктар Варанец
Уладзімір Васько
Міхась Зізюк
Віктар Сазонаў
Станіслаў Суднік
Янка Трацяк

**ЗАПІСЫ**
Рычард Бялячыц
Таццяна Валенцік
Валянцін Дубатоўка
Леанід Лаўрэш

**ДЭБЮТ**
Літаратурны клуб
"Катарсіс"

**НАШЫМ ЮБІЛЯРАМ**
**N MEMORIA**
**ДЗЕЦЯМ**
**САТЫРА І ГУМАР**
**СЯРОД КНІГ**



НОВЫ ЗАМАК

12

**ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ**

# НОВЫ ЗАМАК



**Выпуск 12**



**ГРОДНА 2023**

# НОВЫ ЗАМАК

ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ. ГРОДНА. MMXXIII
ЗАСНАВАНЫ Ў 2012 ГОДЗЕ
ВЫПУСК 12



УДК [821.161.3]-822

Г а л о ў н ы   р э д а к т а р :
Янка Трацяк

Р э д а к ц ы й н а я   р а д а:
Валянцін Дубатоўка
Ала Петрушкевіч
Сяргей Чыгрын

У к л а д а н н е:
Янка Трацяк

Мастацкае афармленне вокладкі
(выкарыстаны фотаздымак Сяргея Марозава)
Веры Нальшанскай

© Калектыў аўтараў, 2023
© Трацяк Я., укладанне, 2023

pawet.net

# Паэзія

## РЫЧАРД БЯЛЯЧЫЦ

### Больш няма

Зіма і лета.
Больш няма
Пары па краі іншай.
І спадзяемся мы дарма
На розум,
На зацішша.

Мароз і снег сярод вясны,
Па восені — спякота.
Стагоддзе тое ты прысніў,
Калі ты быў,
Быў хто ты.

Ні я вяшчун цяпер, ні вы
Прарочы, каб пачулі.
Быў ранак белы,
Бэз нібы
Ў нейлонавай кашулі.

Хоць ноч, хоць дзень — не разбярэш,
Хто першы, хто найлепшы.
Пачаў мой час
Далёкі верш.
І толькі ён завершыць.

Зіма цяпер, вясна альбо.
Ці іх няма ніколі.
Я памыляюся ўсё больш
І ты,
І наваколле.

## Прашу

Былі дзянькі мае іскрыстымі,
Сядалі чмель, зязюля, страказа.
А шлях да казачнае прыстані
Не зведаў сам,
Ніхто не прадказаў.
Няпраўда, што аднойчы родная
Для кожнага шчаслівага была
Свая Арына Радзівонаўна
Дзеля надзеі, ласкі і святла.
І прачынаўся, засынаў заўчасна я,
Дазволіць сонца яснае абы.
Палола маці дні свае калгасныя,
А бацька рэалістам вечным быў.
Нямала ўзносіў небу дзён і я,
То апускаў на дол, ажно на дно.
Таму, магчыма, ў дні свае будзённыя
Не склаў жа казкі добрай ні адной.
Таму прашу, калі мацней прытуляцца
Снягі да скроні сёння і дажджы,
Каб усміхнулася жыццё, —
На вуліцы
Мне казку намалюй
І раскажы.

## Песні

Свет нечаканасцяў поўны.
Сёння то добра, то горай.
Трэба, каб хтосьці нас помніў,
Нават далёкіх,
Як зоры.

Здасца дарога кароткай,
Дзень перастане быць веснім.
Твары, пагляды, паходка —
Прыпамінаем,
Як песні.

Свежыя, ясныя зранку,
Стройныя, нібы таполі.
Дзіўныя пад калыханку
І незабыўныя болей.

Зноў зарапад — мне на плечы
Праднавагодні раптоўны.
З місіяй тут чалавечнай
І застаюся ля Нёмна.

## Песня выраю

Кружаць над Шчучынам гусі,
Аж пацямнее ўваччу.
Кожны крычыць, што вярнуся,
Я анямела маўчу.
Светла на сэрцы і чыста
Часам усцешаных сноў.
Кружаць, нібы клянучыся,
Па-нада мною ізноў.
Сонца ў дарогу вам.
Ценем
Я пацярплю ля кастра.
Так пакідаюць, напэўна,
Людзі надоўга свой край.

## Святая праўда

Альбо людзям так лепш, альбо
Святая праўда на зыходзе.
Маны на свеце больш і больш
У дваццаць першае стагоддзе.

Было жальбы, пакутаў, бед.
Цяпер віноўнік хто, каторы.
Газеты, слаўны інтэрнэт
Усё памножаць і паскораць.

Мана падсцерагае нас,
Не абмінаюць крыўды, войны.
А сыдуць людзі,
Век і час,
Тады і знойдзецца віноўны.

## Успамін

Пад год падбіралася мне.
Яснелі віры, сенажаць.
І я памагаў, як умеў,
Капаць, весяліцца
І жаць.

Пад сонейкам па баразне
За мамай спяшаў след у след.
Пад год падбіралася мне
І вельмі хацелася ў свет.

Гнаў верасень з поля кароў.
Пастух мне быў родны і гуд,
Як выкрыкнуў ля Стаўбуроў,
Што я на зямлі,
Што я тут.

На крык той збіраліся скрозь
Суседзі, буслы,
Трын-трава.
Прыходзілі сонца,
Хрыстос.
Я мамаю ўсіх называў.

## Прызнанне

Сышла і саламонава пара,
Высокі храм пакінула святло.
У шкодлівага, сквапнага цара
Няўжо царыцы добрай не было?
Галінка да рукі, шчакі прымкне,
Слязою кропля ўпала на зямлю.
Зямля мая, ты церпіш і мяне
За тое толькі,
Што цябе люблю.
Прыйшоў сюды аднойчы незнарок,
Смяяўся, плакаў, радаваўся.
Што ж…
Пасею сціплы шчучынскі радок
На памяць добрую,
Пад дождж.

## Жаданне

Гракі чарнюткія, як вугаль,
Найперш, чым паляцець калі,
Зноў талакою, саматугам
Малююць пад сябе палі.

Зямля яшчэ адмаладзее,
Гады злічыўшы па вясне.
Ішла апошняя нядзеля
Для жніўня, неба,
Для мяне.

Тут грэшна плакаць ці смяяцца,
Таму трывожуся часцей:
У вокнах ціхага палаца
Ні князя болей,
Ні гасцей.

Сустрэць Агінскага хацеў бы,
Як колісь князь, як гоні спрэс.
Але гучыць з акон да неба
Яго шчымлівы паланэз.

Снягоў і радасці не стане,
Рукі Айчыны на плячы.
Вякамі цягнецца расстанне,
Імгненне музыка гучыць.

## Здымак

Зямля, паправіўшы хусцінку,
Замерла вуснамі і вокам.
Яна нібы на фотаздымку
Ці ў нашай памяці далёкай.

Што ўбачыць новы век захоча,
І ты пры ім,
І вы абое?
А я пазірую да ночы
Прад ім,
Сабою,
Прад табою.

Але фатограф-малайчына
Заўважыў вусцішнае нешта:
Варона ў кадры.
І Айчына
Расхвалявалася дарэшты.

## Варнянская вежа

Не пакідаючы зямлю,
Наіўны і далёкі,
Я плечы раніц затулю
Ў пуховыя аблокі.

Наскрозь Літву перасяку,
Каб родны край быў у бяспецы.
І за чыгункаю ўбаку
Варнянаў вежа застанецца.

Але вярнуся,
Час любы
Рукой махнуў бы трапяткою.
Нібы чаго недарабіў
Тут, на Віллі,
Дзеля спакою.

## Апроч цябе

Сяліўся ў кронах час птушыны,
На Нёмне чэрвень выткаў штось.
Цвіце па травах канюшына,
І маргарыткаў вочкі скрозь.

Варон заспоіць вецер лёгкі.
І ты ў ціхуткай старане
Прасуеш белыя аблокі,
Не заўважаючы мяне.

Калі наш дзень апусціць грэбень,
Не дакарай і не суроч.
Нікому верш мой не патрэбен,
Апроч цябе,
Цябе апроч.

Ты праз стагоддзе прачытаеш
Радкі эпосе дзіўнай той.
І будзе помніць веха тая
Душы настрой
І голас твой.

* * *

Як раніцай вырай пакажацца стуль,
Жаданы і велічны гэткі,
І як на зямлі маёй вырастуць
Без рук амузычаных кветкі,

Нясі хоць маленькае каліўца,
Спакою твайго не парушу,
Каб ведаць мне, як распускаецца
Бутон сімпатычнае ружы.

Дажджынкамі, свежымі росамі
Жыве і хвалюецца памяць.
А думкі твае шматгалосыя
Там, за балюстрадай,
Знікаюць.

## Запытанне

Быў разлад
Ці зімовы спакой
Па-над вечар
Ці прысветкам раннім.
Не прыпомню, з карціны якой
Ты сышла на мае скрыжаванні.

Паў на вусны абуджаны хмель,
Месяц сніў маладое аблічча.
На каленях стаяў Рафаэль,
Прад табою маліўся да Вінчы.

Я не маг, я ніхто,
Я — нідзе.
Ты ж пад пальмы
Між пеклам і раем
Ад машын, ад дажджоў, ад людзей
У стагоддзі свае забіраеш.

Моўчкі клічаш мяне за сабой
У лугі з залатой акварэлі.
Я ж даўно, нібы дымам сувой,
Беласнежным харэем хварэю.

## Запрашэнне

Не граф, не лорд, не прынц які.
За далікатнай працаю
Я вас чакаю, землякі,
У цішыні палацавай.

Пад зыкі вулічных сірэн,
Калі прастора думае,
Мы будзем слухаць мову сцен,
Калон маўчанне мудрае.

Францішак Друцкі з даўніны
Пачуе крокі вуліцы.
На памяць добрую, на сны
Нас беражэ, шкадуючы.

Сад княжы часам затравеў,
Ніводнай кронай не паклікае.
Заб’ецца памяці
Лявей
Малое княства
І Вялікае.

## Вераніка

Усё было. Прайшло. І знікла.
Сплыло ракою дагары.
І нават надпіс «Вераніка»
Пацерабілі тут бабры.
Ізноў пабачыў я на пляжы
Сляды застылыя са дна.
Як ні спрабуе —
Не прыляжа
На бераг хваля ні адна.
Ляцелі ў лета думкі звонка,
Цяпер — на лавачцы цішком.
І толькі памяць у пацёмках

Мяне чакае за мастком.
Спынюся побач.
Хай намоклі
Па непагодзе моцна мы.
А мы з табой — нібы дзве кроплі
Прад сонцам ясным
І людзьмі.
Тут успамін настолькі гулкі,
Што зноў не ведае мяжы.
Баброва княства ўздоўж рачулкі
Заштрыхаванае ляжыць.
Мой дзень, туманны і паніклы,
Расой трымаецца ў траве.
І толькі імя Вераніка
Далёкім рэхам тут жыве.



## Рычард Бялячыц

нарадзіўся 16 верасня 1953 года ў вёсцы Стаўбуры на Астравеччыне. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. Быў настаўнікам, дырэктарам школы, супрацоўнікам рэдакцыі. Аўтар дзясятка паэтычных зборнікаў, сярод якіх «Сакавіцкае крыло» (1988), «Міг выратавання» (2001), «Вочы малітвы» (2005), «Святлом і ценем» (2009), «На радзіме Котры» (2009), «Помню, што жыву» (2013), «Пах зоркі» (2019), «На вейках траў (2021), дзвюх кніг прозы: тапанімічнага аповеда «Котранскі нераст» (2013) і лірычных замалёвак «Са мной мой дзень» (2017). Жыве ў Шчучыне.

* * *

Мітусня… І нічога добрага…
Каламуць на змарнелай зямлі.
Пахавалі заўчасна Гогаля,
рана геніі адышлі.
Мішура… Дальнабойныя выстралы.
Зеўрыць роўнядзь крутым агнём.
Хто сказаў,
                    што ў войнах не выстаім?
Я кажу, што ўсе не памром.
Адзічэлі, як рысі драпежныя:
свой свайго калашмаціць з пляча.
Ад напружання глохнуць памежнікі.
Свет у вобліку палача.
Бог зямлю нам даў акуратную —
толькі б жыць, весяліцца, спяваць.
Ды размахваюць нелюдзі атамам.
Хто іх здолее зацугляць?

## Распяцце

Прысніў, што распялі
мяне на Зямлі
ад Балтыкі да Камчаткі.
А недзе плылі
і плылі караблі
і перавозілі тоны ўзрыўчаткі.
Калі ж вухналі
ўганялі ў ступні
молатам шматпудовым —
уздрыгвалі горы,
рэкі і пні,
танкі, гарматы, каровы.
Такую правіннасць
прышылі мне:
быццам я праўду
шукаў на свеце

і гойсаў па хмарах
у вузкім чаўне
і вогненны хвост
закручваў камеце.
А гэтага, праўду кажу,
не было.
Я абсалютна чысты, бязгрэшны.
Адно, што таптаў
пасівелы быльнёг
ды складваў лірычныя вершы.
І ўсё-ткі распялі
амаль ні за што.
А вось уваскрэсну
гадоў хоць праз сто.

## Паратунак

Абрыдла падлічваць капейкі,
штодня эканоміць на ўсім.
Паеду я заўтра ў Залейкі,
каб тут не збяднець назусім.
Грыбоў там хапае ўсялякіх,
і льецца ракой малако,
і ўмее падсмажваць прысмакі
паэтка Ірына Сліўко.
А дзядзька Максім Кукарэка
наловіць у Гаўі платвы —
і юшкі той пах, нібы рэха,
дакоціцца да Масквы.
Залейкі… Рыфмуецца «лейкі»,
хоць лейкаў у вёсцы няма,
бо дух самагонкі-зладзейкі
даўно прытуліла турма.
Цяпер у душы — адмыслова,
куды ні паглянь — любата.
І бліскае плоткаю слова,
і з Гаўяй сплывае нуда.

## Майскі павеў

Расспяваліся ў лесе дразды —
іх бясконца хацелася слухаць.
І прырода пайшла на ўздым —
белых кветак расла завіруха.
Майскі дзень нейкім ветраным быў.
Гай дарыў нам прыветлівы гоман.
Станавіўся мой дуб на дыбы:
пераскочыць хацеў цераз Нёман.
Знітаваныя гусі плылі,
раскалыхвалі неба арэлі.
Як блакітныя вочкі цвілі!
Як прывабныя вусны гарэлі!
Мы стаялі пад хвояй адны,
на пейзаж малады пазіралі.
Як свяціўся твой тварык тады!
Як анёлы яго цалавалі!

## Батрак

Апошні прастак
у палітыцы я.
Не ўмею раздзьмухваць
войнаў вуголле.
Адно, што люблю
па-над Нёмнам стаяць
і аглядаць, як бацян,
наваколле.
Найгорш, калі ўзрывы
снарадаў грымяць
і гінуць ад іх
і салдаты, і птушкі,
і смерць ашалелую
цяжка стрымаць,
і кроў праз бінты
цячэ на падушкі.
А людзям так хочацца
сеяць і жаць,
без страху, забойстваў,
пакуты.

Касіць уручную
 сваю сенажаць
і не ўдыхваць
 вецер атрутны.
Прыемна, калі
 над маёй галавой
і чыстае неба,
 і яркае сонца,
і дзеці наўкол
 шчабятлівай гурбой,
і шмат бездакорных
 даверлівых хлопцаў.
Дык што тут мусоліць
 паперу за так
без ганарару, без сну
 і без ежы:
батрак я ў палітыцы,
 круглы батрак,
і ад мяне аніўто
 не залежыць.

## Пад ліпаю

Стаіўшыся, зноў буду слухаць
залётнага ветру павеў —
і едкая, шэрая скруха
у сінюю даль адплыве.
Развеюцца ўмомант напасці
(хапае іх сёння ў жыцці).
Паклічу далёкае шчасце —
а раптам яно прыляціць?
Пад ліпаю цёпла, утульна.
Руплівыя пчолы ўгары.
І ўспомняцца дом мой, матуля
і голас яе ў двары.
Захочацца ціха паплакаць,
што ўсё адышло ў нябыт.
Адна толькі светлая памяць,
як сонца, кранула зеніт.

## Занядоліла

Занядоліла штосьці жыццё…
Вые вецер, як воўк,
апантана.
Аж лапаткі дрыжаць —
калаццё.
Пад рукамі ніякага плана.
Знішчаць хутка надзеі
датла.
Я забыўся, калі быў
вясёлым.
Да салдацкага
гоняць катла
чалавецтва, як статак
жывёлы.
Невядома куды
прывядзе
бездарожжа
упалага духу.
Мор накінецца
на людзей,
даканае іх
подлая скруха.
Выйсце можна знайсці,
ды ніхто
асабліва пра гэта
не дбае.
Больш разводзяць
сабак ды катоў,
люд няхай сабе вымірае.
У мастацтве — трывалы
застой.
Ні музыкаў,
ні здольных паэтаў.
І хмара тонаў
прыблізна пад сто
навісае над стомленым
светам.

## Бездухоўны кацёл

У транс упадаем?
Такое жыццё?
На ўсё не хапае
ні сіл, ні адвагі?
Мы трапілі ўжо
ў бездухоўны кацёл.
На нас нават Бог
не звяртае ўвагі.
Паэзія? Проза?
Ату іх, ату!
Вульгарныя фільмы
сталі ў модзе.
І душы музыкаў,
паэтаў катуй,
траві ўсё жывое
ў пракіслай прыродзе.
Наклюкаўся піва,
як жаба гразі,
бутэльку пад носам
разбі на асфальце.
Сумленне за гэта
сваё не грызі,
а зробяць заўвагу —
гаркні: «Адстаньце!»
Ці не герой ты
ўжо нашага дня?
Ніяк не магу я
ў табе разабрацца.
Ты не ад малпы пайшоў,
а ад пня:
не хочаш ні думаць,
ні ў кнігі ўзірацца.

## Душэўны прытулак

Ну дзе мне знайсці
свой душэўны прытулак?
У свеце так многа
ўсялякіх нягод.
Ніхто ніадкуль
не прышле паратунак,
а сэрца імкнецца
ў міжзорны палёт.
Дык што, так і буду
цялёпкацца тутака,
у краму хадзіць
і на лаўцы сядзець,
ці аглухаць
ад машыннага грукату,
ці спаць, як зімою
сібірскі мядзведзь?
Душа не пацерпіць
такой аднастайнасці,
не пpыме яе
паэтычная кроў.
Давай ім паболей
буслінае радасці,
гаючых гаёў
ды шумлівых бароў.

## Фантазія

Разбэсціў фантазію
вельмі і вельмі.
Не проста цяпер мне
яе ўтаймаваць.
Яна не ўспрымае
раскошную мэблю,
ёй хочацца ў небе
бязмерным гуляць.
Няхай сабе гойсае
ноччу бяссоннай,
як той адзічэлы
крылаты Пегас.
Не быць жа ёй кволай,
глухой, беспрытомнай

ці карасём
зашывацца ў гразь.
Нікому стрыножыць
яе не ўдасца,
на ланцугу
да кала прывязаць.
Умее яна, як жырафа,
брыкацца,
цераз высокія
горы скакаць.



УЛАДЗІМІР ВАСЬКО

нарадзіўся 2 студзеня 1937 года ў вёсцы Ліпічанка Шчучынскага раёна. Скончыў Гродзенскі педінстытут імя Янкі Купалы. Працаваў у рэдакцыях шчучынскай (1959–1960), дзятлаўскай (1967–1972) і лідскай (1972–2000) раённых газет. Друкуецца ў рэспубліканскім, абласным і раённым друку. Піша вершы і прозу. Выдаў кнігі «Прасветленасць» (1981), «На схілах берагоў» (1997), «Кругаварот жыцця» (2011), «Лясная рапсодыя» (2013), «Зігзагі лёсу» (2017), «Энергія душы» (2018), «На перавалах часу» (2021), «Неабдымнае» (2023). Жыве ў Лідзе.

## ПАЛІНА ДВАРАНСКАЯ

### Балада Алаізы Пашкевіч (Цёткі)

Прагне душа справядлівасці й ведаў,
як зялёны парастак — сонца.
Чалавеку свабода і вера патрэбны,
як у спёку — вады да донца.

Пад яе капялюшам светлыя думкі,
і гараць захапленнем вочы,
бо жадае сцерці няволю і смутак,
узлунаць над святочнай плошчай.

І каб скрыпка залівістая спявала
ў садзе руж, на ўзаранай зямлі,
не кранал і людзей каб жуда і навала
і хавалі спакой валуны.

Смела крочым, шукаем і маем веру,
нам анёлкі пяюць з нябёс.
Хай нас Божа адорыць шчодраю мерай, —
каб квітнеў васільковы лёс!

* * *

Я стаю пад дажджом
з табой.
Кроплі, такія цёплыя і прыемныя,
сцякаюць па шчацэ.
Якое ўсё-ткі шчасце —
вочы, мокрыя не ад слёз.

Я стаю пад дажджом:
дзве постаці
ідуць пад парасонам.
Яны шчаслівыя,
толькі каб не заўважылі мяне
ў апёках ад дажджу…

## Няхай квітнеюць сады… і ты

Я станцаваў бы з табою
апошні школьны вальс,
мы разам сустрэлі б світанак,
знішчылі б усе перашкоды
для шчасця…
Калі б не гарматы ў чатыры гадзіны.

Не плач,
мне лягчэй бачыць
кроў на сваіх руках,
чым хоць кроплю смутку
на тваім спагадлівым твары.

Бог пакарае тых,
хто перашкодзіў нашаму шчасцю
ў чатыры гадзіны…
Усё будзе добра,
толькі не сумуй,
мая касмічная дзяўчынка,
якая любіць звычайную вясну.

Я станцаваў бы з табою
апошні школьны вальс,
мы разам сустрэлі б світанак.
Я пабудаваў бы дом для нас,
пасадзіў бы ў садзе вішні.
Шмат чаго маглі зрабіць мы,
калі б не гарматы ў чатыры гадзіны…

## Несмяротная душа беларуса

Няхай усё згіне, дык душа ж не гліна?
*Ф. Багушэвіч*

Душа беларуса, ты саткана з дабрыні,
якую ніхто і ніколі не знішчыць!
Як кроплі зор, блішчаць твае агні
нават на схаваным папялішчы.

У душы нараджаюцца песні,
вершы — і плывуць па венах,
каб потым заспяваць іх напрадвесні
і пісаць… на чорных сценах.

Топчуць мову, паляць кнігі,
быццам стары непатрэбны кажух,
на нас, на тутэйшых, завуць ліха,
але —
ніколі не знішчыць душу

## Трыялет

Я пaглядзела ў мінулага люстэрка,
убачыла столькі прыемнага:
дзяцінства, лялькі, прыгоды, цукеркі…
Я пaглядзела ў мінулага люстэрка.
Такая драбяза — разбітая талерка,
а ў памяці так шмат адметнага.
Я пaглядзела ў мінулага люстэрка,
убачыла столькі прыемнага…

## Рандэль

Я п’ю мінулае, хоць і яно атрута,
няспешнымі, балючымі глыткамі,
бязмежна мару я пакінуць за плячамі
ўсе крыўды ў цвілі, слёзы і пакуты,

надзеі мёртвыя і словы непачутыя,
каханне, што ляціць вакол шматкамі…
Я п’ю мінулае, хоць і яно атрута,
няспешнымі, балючымі глыткамі.

Прасякнутая горка-церпкім смуткам,
хаджу бясконца па мінуламу кругамі.
Магчыма, знікне з неадступнымі гадамі
ў душы маёй неперaможны люты…

Я п’ю мінулае, хоць і яно атрута.

* * *

Я люблю іх —
свае найглыбейшыя раны.
Сапраўды, я вар’ят, і яшчэ закаханы,
але жыццё — мой неацэнны скарб,
колькі б ні было ў ім чорных адценняў і фарб…

Я люблю іх —
свае найвялікшыя раны,
хоць той, хто іх пакінуў, ужо не будзе пакараны,
але я магу зрабіць горыч салодкай ватай
і стужкі з драпін, якія былі даўжэй за экватар.

Я люблю іх —
свае загоеныя раны,
бо іх цяпер няма, а ёсць — каралы,
што ўпрыгожваюць душы бязмежны акіян —
і там няма глыбокіх і вялікіх ран.

Я люблю іх —
свае незагойныя раны!
Я ўдзячная ўсім, хто іх нанёс,
бо каб не вы — не мела б сёння я
такі шчаслівы лёс!



## ПАЛІНА ДВАРАНСКАЯ

нарадзілася 29 жніўня 2006 года ў вёсцы Ардашы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Пасля 9 гадоў навучання ў Крэўскай сярэдняй школе паступіла ў Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на філалагічны профіль, дзе вучыцца і цяпер. Друкавалася ў газетах «Светлы шлях», «Настаўніцкая газета», «Сельская газета», «Переходный возраст», часопісах «Маладосць» і «Бярозка». Пераможца міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет», міжнароднага моладзевага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берега дружбы», рэспубліканскага літаратурнага інтэрнэт-конкурсу «Здабыткі гісторыі: асобы і падзеі», рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «БрамаМар» (2022, 2023).

## МІКОЛА КАНАНОВІЧ

### Час летняга сонцастаяння

Час летняга сонцастаяння.
Чэрвень падоўжвае дні.
Шукаем мы выратавання
Ад нашай бязмежнай любві.

Шукаем дзе-кольвечы ценю,
Бо сонца галовы пячэ,
І целы нязносна пацеюць,
І пот наш па целах цячэ.

Яшчэ мы шукаем кахання,
Хто можа кахаць і хто не.
Шукаем мы выратавання
На нашай міжсобскай вайне.

Час летняга сонцастаяння —
І ныюць зубоў карані.
Ды зжытыя зубы дазвання
Не вырастуць зноўку ані.

Шукаем хто зубы, хто шчасце,
А часта — таго і таго,
А ў выніку пошукаў — наце:
Ні гэтага вам, ні таго.

Час летняга сонцастаяння —
Падоўжыўся дзень і замёр.
Кароткаю ноччу каханне
Струёй сваёй ловіць бабёр.

Ёсць у бабра свая хатка,
Бабрыха свая ў яго ёсць,
А па суседству — каханка,
Дзе часты бабёр вельмі госць.

Такое бабровае шчасце.
У нас жа й такога няма.
Нам ноччу кароткай паспаць бы,
А днём — працаваць задарма.

Час летняга сонцастаяння.
Чэрвень падоўжвае дні.
Не знойдзем выратавання
Ад нашай бязмежнай любві.

## Ода дажджу

Ода дажджу і ветру
Кладзецца ў скарбонку лету.
Суткі ўжо ідзе дождж,
І няхай яшчэ будзе больш
Ціхага, цёплага, грыбнога
Многа…
Тут смажыла месяцы з два,
Пагарэла была трава,
Асабліва на ўзгорках.
Хадзіць стала колка,
Глядзець было нудна —
Дзе жоўта, дзе руда.
Там цяпер зелянее брава
Згарэлай травы атава.
А ў лесе растуць грыбы
І дух стаіць баравы…
Ода дажджу і ветру
(Які гэты дождж дапетрыў)
Кладзецца ў скарбонку лету.
Хай суткі ідзе і больш
Наш жыццядайны дождж.

## Пляменніку Ціхану — віншаванне з атрыманнем дыплома ВНУ

У дваццаць шэсць ты атрымаў дыплом.
Я атрымаў такі у дваццаць сем.
Жыццё перавярнулася ўверх дном
За гэты час. І толькі ты ўзмужнеў.
Яшчэ паспела вырасці дачка.
Таксама ўжо працуе на дыплом.
Вас, маладых, жыццёвая рака
Яшчэ не пажагнала Перуном.
Наперадзе пашана, а мо й не,
Каму пяшчота, а каму раздрай.

Няхай жыццё ідзе не ў тумане,
А боль як схопіць, то каб не праз край.
Яшчэ хачу Радзімы пажадаць,
Каб мачыхай яна вам не была.
І ў дваццаць сем, і ў трыццаць, і ў сто пяць
Жадаю вам радзімага цяпла!

Разбуджаны ветрам і музыкай мухі,
Слухаю гукі —
Вецер на вуліцы, у хаце жужжанне.
Ранак. Світанне.

Лета разгар, ды яшчэ не палова,
Яшчэ целы сонца пагрэе па-новай,
І дождж, што на суткі быў зарадзіў,
Не раз яшчэ вернецца ўсім нам наўздзіў…

Чакаюць цяпло, лес, грыбы, ураджаі
Ўсіх, хто не згубіцца ў нашым раздраі
Ды выжыве ў родным да болю краю
Й каго не забралі.

Раніца ў палоне цішыні.
Так бывае хіба ў выхадны.
І вайскоўцы не крычаць «Ура!»,
Бо на палігоне ў іх «вайна».
Толькі птушка ўдод, а можа драч,
Горла не стамляецца ўсё драць
У бліжэйшым лесе на гары
З ранку і да позняе пары…
Горад ціхі. Людзі спяць яшчэ,
А ўжо сонца адбіваецца ў рацэ.

## Сястры Святлане

Маёй сястры сягоння — 55!
Мы з сёстрамі ўжо круглыя сіроты.
Няма бацькоў, каб нас павіншаваць
Ды пажадаць жыццёвае пякноты.

У Светы дзеці і унукі ёсць,
Яны яе, канечне, павіншуюць,
І пажадаюць радасцяў шматкроць,
І радасцю галоўнай самі будуць.

У межах часу, ў хуткаплыні дзён
Пра ўзрост нам юбілеі нагадаюць.
Ўжо бацькаў век сястрою перайдзён,
А маміны гады яшчэ чакаюць.

На скразняках цяпершага жыцця
Цяпло бацькоў у памяці нас грэе
І дадае трываласці быцця
Душы, якая ж, пэўна, не старэе.

Маёй сястры сягоння 55!
І я ёй доўгіх год жыцця жадаю,
Каб юбілеі слаўна святкаваць
І сустракацца нам у родным краі.

* * *

> По сваіх былых гаспадарах
> плачуць вішні белымі слязамі...
> *Рыгор Барадулін*

Цвітуць зноў вішні ў садзе маладым.
Пабелім дрэўцы, лепей будзе ім,
Жывуць, растуць хай новаю вясной
З усёй сваёю прагай маладой.
Аддзячаць летам вішні нас пладамі,
Іх будзе больш і больш расці з гадамі,
А час міне, паставяць крыж над намі —
Заплачуць вішні белымі слязамі.

* * *

А заўтра дождж і мокры снег
І да пяці цяпла.
Такі вось студзень, як на смех,
Такая ў нас зіма.

Даўно не радуе прагноз —
Забыцца на яго.
За шчокі каб узяў мароз
Знянацку — усяго!

Каб зноў павеяла зімой
І студзень астудзіў
Раскісласць гэткаю парой
Душы тваёй наўздзіў.

...Была калісь зіма зімой,
Між дрэў трашчаў мароз.
Была, была ж яна, пара,
Харошаю да слёз!

Змяніўся клімат і жыццё,
Як быццам край не той! —
Такое робіш адкрыццё
Вясноваю зімой.

* * *

Белыя лісты паперы
І дождж самотны за акном.
Тут сябар не адчыніць дзверы
І не разбудзіць дом званком.

Ў эпоху краху мадэрнізму
Пануе нейкі згубны -ізм,
І дождж па нас спраўляе трызну,
Па мёртвых і яшчэ жывых.

Тут хлопцу не сядзіцца ў хаце —
І цягне дзеўчыну на двор,
А мне папера, як закляцце,
Бялее праз жыцця раздор.

На ёй жывыя засталіся
Мазутчык, Тэкля і Лявон*,
Як каласы тыя у жыце,
Што склалі мастакоўскі плён.

Ў жыцці ж так стала адзінока,
Што й сябар чарку не налье,
І толькі памяць мружыць вока,
Папера кліча да сябе.

Вецер выстудзіў свет мой наскрозь.
Ў свеце снег, ў свеце дождж, ў свеце злосць.
Сакавік не дайшоў да вясны —
Сыпле снег мне халодны, пусты,
А шалёнага ветру набат
Б’е па сэрцы, пакуль неўпапад.
Апусцеў свет халодны і злы
На парозе чарговай вясны.
Хацеў выпіць з сабой дацямна,
Але грошай на гэта няма.
Дый на тое — таксама аблом.
Паздаваў нават металалом,
А за вершы не шлюць ганарар.
Цісне безграш душэўны абшар.
Вецер выстудзіў свет мой наскрозь.
Дзе жыла паэтычная млосць
І здаралася радасць жыцця —
Цяпер посная хіба куцця
Ды надзея на нешта яшчэ,
Што са мною апошняй памрэ.

* Мазутчык, Тэкля і Лявон — героі апавяданняў Міколы Канановіча, прататыпы якіх адзін за адным сышлі з жыцця...

* * *

Вясна свае пяшчоты раскрывае
Зыркім сонцам, цёплаю вадой.
Даўжэе дзень, трава расце густая,
І бэз успыхнуў пад тваім акном.
Ўсё гэта так, як летась, пазалетась,
Але бракуе на душы вясны,
А ў чалавечым свеце правіць ерась,
І гаманец, як правіла, пусты.

## Вясновае

Зялёным убраннем махае бяроза,
Быццам так кліча кагось да сябе.
Яшчэ красавік яе цісне марозам,
Ды сонца праменіць ва ўсю аб вясне.
Трава пад бярозай расце маладая —
Марозная шэрань ёй ні па чым,
Яна незаўважна пад сонцам знікае,
Расой растае, быццам ранішні дым,
Як маладосць, што прамінае,
Але ты ўсё бачыш сябе маладым.
Ды цалавацца пад гэтай бярозай
З любай дзяўчынай ужо не табе…
Шэрасць жыццёвая з мутнаю прозай
Замест кахання баліць галаве.
Але вясна і пачуцці ўзрушае,
Вецер юнацтва няўзнак апячэ, —
Хоць прамінула пара маладая,
Кроў яшчэ ў жылах жывая цячэ.

* * *

Не пераэжыць туманнасць Андрамеды,
Але туман чарговага дыктату
Не назаўжды схаваў нашы праспекты,
Дзе люд ізноў адстойваў сваю праўду.

Жыве заўжды надзея на вяртанне
Сюды свабоды, роўнасці, братэрства,
Калі прымус чарговы раз сканае
І запануе праўды міністэрства.

Гісторыя зямлі гэтай пакутнай
Пра́ва дала людзям народам звацца.
Цяпер у кругаверці яе згубнай
Патрэбна нам народам захавацца.

Не пераўжыць туманнасць Андрамеды,
Ды па́далі, як дрэвы, тыраніі.
І хто аднойчы смак свабоды зведаў,
Той не захоча іншае стыхіі.

## Паслясвяцце

Хату асвяціў святар.
Мінуліся святы Каляды.
Царкоўнай традыцыі ў дар
Пяцёркай аддзячыла хата.

Хутка Грамніцы. Ізноў
Грамнічную свечку запалім,
Пусцім у хату папоў,
Рублём за малітву аддзячым.

Так павялося здаўна —
Яны асвячаюць нам хаты,
Мацуюць ад згубы і тла,
Каб жылі, нам жадаюць, багата.

А ў вёсках ўсё менее хат,
Дзе жывуць і дзе ў госці чакаюць.
Не поп і не ксёндз неўпапад
З малітвай туды не трапляюць.

Бязлюддзе, закінутасць, змрок
Прыйшлі ў беларускую вёску,
Вяскоўцы ж — ў аграгарадок,
Як на вузкую поля палоску.

Туды цяпер едуць папы,
Ксяндзы па патрэбе спяшаюць,
А ў вёсках кладуцца платы
І хаты ў зямлю урастаюць.

Збыліся тых хат ўладары,
Пайшлі ў лепшы свет гаспадыні,
Іх дзеці ўцяклі ў гарады,
Пакінуўшы хаты пустымі.

Таму там бязлюддзе і змрок,
Таму туды поп не загляне,
Паедзе ў аграгарадок,
Жывы да жывых завітае.

## Паэт і вершы

Пішаш вершы — грэшны першы,
А не пішаш, то другі.
Хто святы, а хто тут грэшны? —
Прэ ўсіх нас праз берагі.
У паэта ўся планета
І галактыка ў руках,
Пакуль любіць хтось паэта,
Пакуль просіць: «Напішы
Пра мяне верш адмысловы,
Так, як любіш, напішы…»
І паэт старацца рады,
Не патрэбны тут загады.
Ён напіша ўсё як ёсць
Пра каханне, слёзы, млосць.
А ці грэшны, ці святы? —
Не пытайся лепей ты.

## Радуніца ў Востраве

Сонца абярнулася —
Радуніца зноў.
Могілкі прачнуліся
Памянуць дзядоў.

Урачыста, з кветкамі
Люд сюды ідзе,
Дарослыя з дзеткамі
Ў дружнай грамадзе.

У каго тут блізкія,
Родныя ляжаць —
Пакланіцца нізка ім,
Ўспомніць, памаўчаць…

Радуніца — радуйся,
Пакуль тут, жывы!
А дзяды спрыяюць нам
Хай ва ўсе гады.



## МІКОЛА КАНАНОВІЧ

нарадзіўся 13 сакавіка 1965 года ў вёсцы Вострава Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Востраўскую ВШ (1980) і Міжэвіцкую СШ (1982), Гродзенскае прафтэхвучылішча № 41 (1983). Працаваў кінамеханікам, служыў у войску. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта БДУ (1992) шэсць гадоў выкладаў беларускую мову і літаратуру ў СШ № 8 Слоніма. З 1998 па 2020 год працаваў у рэдакцыі «Газеты Слонімскай». Апошні год — на пасадзе галоўнага рэдактара. Друкаваўся ў літаратурных часопісах «Першацвет», «Маладосць», «Крыніца», «Роднае слова», «Правінцыя», «Дзеяслоў» і іншых перыядычных выданнях. Адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў паэзіі «Квадра» (1990), «Анталогія маладога верша» (2001), «Верш на свабоду» (2002), «Галасы» (2003, 2005) і ўсіх выпускаў літаратурнага альманаха «Новы замак». Укладальнік і рэдактар зборніка «Паэтычная Слонімшчына» (2000) і двух выпускаў літаратурнага альманаха «Ад А да Я» (2001, 2003) падлеткавага клуба «Святліца», што дзейнічаў у Слоніме пры грамадскім аб'яднанні «Воля да развіцця». Аўтар кніг паэзіі «І доўжыцца ноч…» (2003) і «Вяртанне восені. Сцятыя вобразы» (2020). Жыве ў вёсцы Пятралевічы на Слонімшчыне.

## АЛЬЖБЕТА КЕДА

### Лацінкаю піша тутэйшае поле…

*Пяціверша*

**1**

Лацінкаю піша тутэйшае поле.
Гатычныя знакі,
бы чорныя кроквы,
складаюць тутэйшую сагу.
Радочкі, калісьці праведзены роўна,
сягоння з прагалаў.
Бо тыя,
што знакамі сталі,
трываюць не ўсе,
не ўсе
ад марозу і сцюжаў
сябе захавалі.
Ды сыдзе
калісьці зіма.
І новы араты
насеннем адборным
засее
тутэйшае поле.

**2**

Чорныя буслы
ў Беларусі
такое ж выключэнне,
як мы, беларусы.
Чаму яны чорныя?
Ім, відаць, усё адно,
што нехта думае пра іх,
чамусьці не белых.
Чаму нам не ўсё адно,
што думаюць пра нас?
Яны мудрэйшыя,
бо яны
птахі нябесныя.
А мы ці даляцім калі
да нябёсаў?

Хоць і лячу ўсё жыццё
над Гародняй,
над Краем,
над светам…

**3**

На лініі адной, прамой —
царква, радзінны дом
і месца вечнага спачыну.
Высокі чын служэння слову
завершаны паэтам.
Завершана жыццё
між Горнам і Гародняй.
Няхай жыццё зямное прамінула,
але высокае лунанне слова не міне.
Праўдзівым голасам
у хоры вольным,
асвечанае талентам,
жыве.

**4**

Зіма трывогі нашай
на вуліцы каштанаў раскашуе.
Каштанаў вобмаль: спілавалі.
І бунтаў, як калісьці, не было.
Каштанавыя бунты —
вялікая раскоша для тых, хто выжывае.
Ды і зіма зімой ліпее тут ледзь-ледзь,
у гэтым горадзе, дзе з двух бакоў мяжа,
закрытая амаль наглуха.
І толькі нашыя трывогі
ўзрастаюць і квітнеюць
букетам роспачы, адчаю і тугі.
Зіма трывогі нашай
раскашуе
на вуліцы каштанаў
круглы год.

**5**

Зноў вясна.
Зноў квітнее душа.
І ні болю,
ні суму,

ні сну,
што сарваны між ночы трывогай.
Зноў нас клічуць дарогі, прасторы,
азёры і рэкі,
дарагія мясціны
нашай любай Айчыны.
Зноў вясна.
І так хочацца жыць!
Каб на поўныя грудзі ўдыхнуць
вецер вольнага краю.
Не мінуць
ні чаромхі-язміну-канвалій —
водар Боскай красы.
І за сонцам ісці,
і знайсці
ў супакоі пяшчоту
у вачох найраднейшых…
Пахаваем жа смутак.
Бо так хочацца жыць,
ды не так,
як бяжыць і віецца,
сціскаючы сэрца,
чорным га́дам туга…
О, як хочацца жыць!
Бо вясна…
Зноў вясна.



## Альжбета Акеда

нарадзілася 27 лютага 1960 года ў вёсцы Шчонава Карэліцкага раёна. Паэтка, празаік, літаратуразнаўца, кандыдат філалогіі. Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (1981), аспірантуру Інстытута літаратуры НАН (1992). Працавала на пасадзе дацэнта кафедры беларускай літаратуры ГрДУ імя Янкі Купалы (1992–2015). Аўтар каля 300 літаратуразнаўчых артыкулаў і 12 кніг, сярод якіх «Іду па слядах: літаратуразнаўчыя артыкулы, эсэ» (1997), паэтычнага зборніка «Пярсцёнак» (1997), «Літаратурная Гарадзеншчына ў постацях і лёсах» (2010), «Наталля Арсеннева: Шлях да Беларусі» (2013), «Пра тое, што люблю: кніга прозы» (2016), «Шчонаўскія абразкі: кніга прозы» (2017), «Белавежа: постаці, творы, героі» (2018), «Антанёва» (2020). Жыве ў Гродне.

## МЕЧЫСЛАЎ КУРЫЛОВІЧ

### Слухаю вочы
*Вершаваныя гумарэскі*

Вочы спакусы — бы ў казках Грымаў
эўрыкі выдах: «Неверагодна! —
як без сучасных сэкс-бомба-грымаў
дзеўкі палоняць рыцараў Гродна».

Вочы паэта — сверб прадчування
у «геніяльным» вершы да донца,
дзе варажбою бубніць пытанне:
«А ці заўважаць хоць плямай сонца?»

Вочы расстання — лісток апалы
восеньскай кветкі (зімы званочак)
ад урагану падчас аўралу.
Не разгадае і сон прарочы.

Вочы старэчай з ранку гаркоты —
ключ для красворда-рэбуса дня,
дзе ўсе праблемы рашае «Потым!» —
самая блізкая сэрцу радня.

Вочкамі дзеткі без кнігі знаюць:
Боскае слова народзіць зямля.
Нуль два адсоткаў, як прачытаюць, —
тым будуць жыць... Гэта — пасля.

А ў неспазналых салёнасць поту
водгук не знойдзе Боская тэма:
як на мурашку, наступяць ботам
і не заўважаць на вейках трэмар.

У алігархаў — плашч-невідзімка
з тайнай трайною супраць вачэй,
бо іх не бачна нават на здымках
самых прэстыжных Гродна людзей.

Вочы у следчых гараць, кусаюць
і дзеясловяць зрэдзьчас па-наску,
а мая хата, як мовяць, з краю
водкай палёнай прыедзе з Бранску

ды падміргне вам куслівым вокам
і манапольнай спіртное праўдзе,
каб на памінках хтось прагалёкаў
недзе за трэцяй: «Мо-ожна. Пастаўце!»

Вочы з ухмылкай падчас гавораць:
што Рубіконам стаць можа мяжа
і з навагодніх тэлепаўтораў
ад завірухі ці з капяжа,

там, дзе вядучы з тэлеэкрана
кажа пра тое, што хоча сам,
запар і татка амаль таксама:
«Я вас нікому тут не аддам!»

Толькі тым вочкам на́скае зоркі,
што паўтараюць у генах Бону,
ад Прынямоння скажу я: «Горка!» —
толькі тым вочкам... Болей нікому.

## Балада Нёмана

Не паіць з бацькоўскай
старажытнай жылы
табе долю пушчаў
і глухіх лясоў...
Хто ж цябе пазбавіў,
хто пазбавіў сілы,
хто замест вадзіцы
поіць морам слоў,

што ад смагі дыхаць
стала табе цяжка,
што ад смагі стыне,
стыне твая кроў,
што табе навырост
не насіць сярмяжку,
што табе навырост
не спазнаць любоў.

Хай табе пад коптур
з барышом не збочаць
Котра, Ласасянка,
Чорнай Ганчы дочкі,
дзе ятвяжскі бусел

цёплай, ціхай ноччу
адкрываў Купалле, —
быццам шлях у прочкі.

Хай твае унучкі
нанава ўваскрэснуць
з тарфяных балотаў
і жывых крыніц,
каб і ў час спякоты
сэрцу было цесна,
як у час цыклонаў
з процьмай навальніц.

Хай рунеюць поймы,
росныя атавы
вогнішчам рыбалкі
грэюць берагі…
Векавечны Кронан,
Кронан нашай славы,
за чые канаеш
цяжкія грахі?

## Балада ветру

На вэксаль даў спякоце ўздых,
усмешкай вочы поўнячы,
ды траскатнёй — сарокі слых —
ён сон збудзіў апоўначы.

І навіну прыпёр з калёс
пад коптур з кухні кошыкам,
для закаханых, бы з нябёс,
ад салавейкі пошчакам.

Партрэтам воўчым на скале
сваё імя засведчыў ён.
Ваўка забілі б мы, але
не раілі тут следчыя.

А вунь і дзюны ўскрай ляску
аздобіў пэндзаль хвалямі
і каланковым у стаўку —
дзявочымі каралямі.

З яго слядочкаў нат паэт
малюе вобраз мараю,
а ён, раз’юшаны як след, —
яшчэ і Боскай караю.

## Настальгія

Жыццёвы вобраз — водгук плыні,
а навуковы — скарбы дна!
І нас не выб’юць з каляіны
з цукеркай фэйкі і мана.

Бо акіян любові нашай
для Краю ведамы даўно,
і за яго піць не завяжам,
а гадам — кроплі не дамо.

Ды толькі сумна штось пад дахам,
душа пакутуе, гарыць…
Няўжо йрванула ўсё ж на Захад,
каб настальгію падлячыць?

## Дзень незалежнасці

Ніхто цябе не зробіць, браце,
гаспадаром сваёй зямлі:
ні трону царскаму пракляцце,
ні з юрам шляхты каралі,
ні праваслаўнай плыні дрэва,
калі Пярун прачнуўся русам,
ні каталіцкі раздрай Крэва,
ні уніяцтва пад прымусам;
ні кананічны апломб НАТА,
ні рамантычны Ватыкан…
Ніхто табе не зробіць свята,
калі яго не зробіш сам.

## Рэклама

Дае гарантыі на сон,
на збор грыбоў, паветра,
на маладосць да скону дзён,
на сэкс у стылі рэтра,

на вольнасць думкі і ваду,
каб піць з жывой крыніцы,
і на той свет, калі пайду.
Каб з Богам пахмяліцца.

* * *

На грані смерці і жыцця
і Бога брала за жывое,
бо на касцях стварыў працяг —
з рабра паненку для плэйбоя.

На грані смерці і жыцця
дасюль квітнее цудаў мроя,
дзе цуды толькі на касцях
здзяйсняе ў свеце параноя.

* * *

Свет з грахом назаўжды —
пад праменнем астральным.
Зямлю мыюць дажджы,
быццам глобус у пральні.

Ды не могуць дажджы
адмыць подласць ад страху,
калі хочацца жыць,
калі цягнуць на плаху.



МЕЧЫСЛАЎ КУРЫЛОВІЧ

нарадзіўся 17 лютага 1939 года ў Гродне. Скончыў Гродзенскі медыцынскі інстытут. Працаваў участковым лекарам у прынёманскіх вёсках, пасля анколагам і хірургам у Гродне, хірургам у рыбалавецкім флоце Мурманска. Аўтар кніг паэзіі «Тутэйшы» (2006), «Прыдарожная вярба» (2008), «Вчерашние святыни» (2008), прозы і лірыкі «Ліцвінка» (2015), кнігі роздумаў «Матыў прынёманскіх вятроў» (2016), зборніка «Споведзь эскулапа» (2018), «Пераклады» (2021). Жыве ў Гродне.

## ВІКТАР САЗОНАЎ

### Ты са мной

Сонца ласкава ўстае,
асвятляе дом,
ці то дожджык запяе
недзе за акном,
ці снег падае густы,
ці разліў вясной,
мне галоўнае, што ты,
як заўжды, са мной!
Ты са мной!

Многа мы з табой прайшлі
разам праз гады,
многа на шляху знайшлі
шчасця і бяды.
А нягоды, што ў журбе
выпалі на лёс,
без кахання, без цябе,
я — не перанёс.
Ты са мной!

Не дарэмна ўсё было,
калі кожны міг
і што ёсць, і што прайшло —
выйшла на дваіх.
Я наяве, як у сне,
з думкаю адной:
ўсё, што засталося мне,
падзяліць з табой.
Ты са мной!

### Позняя восень

Цёмнае неба і чорныя хмары,
вецер апошняе лісце зрывае,
зносіць у бездань нязбытныя мары,
роспач у лужы дажджамі збірае…

Сырасць халодная моўчкі змяніла
цуды суквеццяў, што фарбамі ззялі…
Лес засынае пад змрокам паныла,
зоркі апошнія з неба упалі…

У недасяжных хаваюцца далях
тыя падзеі, што ўжо адляцелі…
Злом і Дабром павісаюць на шалях
дні, што наіўным чаканнем сатлелі…

Як я люблю цябе, позняя восень!
Ты без падману! Ты праўда і веліч!
Сцяўшы тугою нябесную просінь,
сумных пачуццяў утульваеш безліч…

Позняя восень — найлепшая восень!
Роздум, сумневы, развагі пра долю…
Мы больш нічога нікога не просім,
слухаем сэрца, што рвецца на волю…

Тут неўзабаве зіма завітае,
веліч застыне, засне і малое…
Потым вясна ўсё абудзіць, адтае,
колам жыцця заквітнее былое…

Лета падорыць вяселле і спевы,
і завіруюць купальскія мары…
Ну, а пасля завіхураць сумневы,
неба ахутаюць чорныя хмары…

Позняя восень захоўвае мудрасць
і разуменне пра час і расплату,
каб зберагалі і Веру, і Мужнасць
годна сустрэць непазбежную дату…

І зразумеўшы Быцця сіратлівасць,
між чалавечых пачуццяў і зносін,
варта прыняць як вялікую міласць
тое, што дорыць нам позняя восень.

Хай летуценні дажджамі змывае,
ветрам здзімае нязбытныя мары,
лісцем былыя шляхі замятае
і адыходзіць у чорныя хмары…

## Камін у сэрцы

На зямлі бяры па мерцы,
На зямлі.
Запалі камін у сэрцы,
Запалі.

Пакахай, і тут без меры,
Пакахай.
Не шукай другія дзверы,
Не шукай.

Не гані, чаго не маеш,
Не гані.
У агні перачакаеш,
У агні.

Сцеражы, што атрымаеш,
Сцеражы.
Беражы, што пакахаеш,
Беражы.

Запалі камін у сэрцы,
Запалі.
На зямлі аддай па мерцы,
На зямлі.

## Белы Рысь

Адлятаюць і шпакі, і гусі,
пруцца людзі некуды ў журбе,
белы ж рысь заўсёды ў Беларусі,
і ў другой краіне не жыве.

Не жадае нікуды ён болей,
не шукае лепшае жыццё,
толькі тут сваю шануе волю,
за сваё змагаецца быццё.

Хай лісцём сцяжынкі замятае,
і трывожна ветрыць, і дажджыць,
нават бусел некуды злятае, —
белы рысь нікуды не бяжыць.

Ночкі тут зімовыя марозяць,
вые шэры воўк кудысь у высь,
нават зубра сілаю вывозяць,
ды заўжды на месцы белы рысь.

Ён нястомна ў радасці і ў скрусе
пільна паглядае ўдаль і ўвысь…
Белы рысь ёсць сімвал Беларусі,
Беларусь вартуе Белы Рысь.

## Лятаюць птушкі

На стомленай маёй радзіме,
дзе прытаіўся родны дом,
нібы з-пад неба пілігрымы,
лятаюць птушкі за акном.

Лятаюць птушкі ўзад і ўперад.
Чаму б тым птушкам не лятаць?
Ужо зусім згубілі меру,
балюча нават назіраць!

…І ўсё гляджу за далягляды
праз сіратлівае акно,
праз сэрца слухаю парады
і бачу кожны дзень адно:

над лесам, над ракой, над полем,
дзе горад, вёска, сенажаць,
лятаюць птушкі… Бо на волі!
Чаму б на волі не лятаць?!

## Фельетон

Ноч, за вокнамі віхура
Свішча, як каршун…
Я пад шэпт клавіятуры
фельетон пішу…

Думкай падзяліцца трэба
моцна, так, як жыць!
Больш чым выпіць, больш чым хлеба…
Бо душа баліць!

Не магу глядзець спакойна
больш на гэты свет,
хоць празаік я прыстойны,
ды — дурны паэт…

Жыць усім нам давялося
у няпросты век,
у якім жыццё звялося,
знік і чалавек!

Ён пакутуе, шукае,
гіне задарма,
а дзе сэнс знайсці — не знае!
Сэнсу тут няма!

Поўнач, вецер, як агрэсар,
за акном гучыць…
Як дазіметар, працэсар
ціхенька трашчыць…

Я не п’ю гарэлкі горкай,
сэксам не грашу,
а пад свіст віхуры звонкай
фельетон пішу…

## Восень. Жоўтыя лісточкі…

Восень. Жоўтыя лісточкі
вестачкі нясуць,
што душы маёй куточкі
ў лахманы дзяруць.

У нядобрых прадчуваннях
родная зямля,
ные стогнам у рыданнях
паша і ралля.

А навокал ўсё лятаюць
злыя крумкачы,
літасці зусім не маюць,
хоць ваўком крычы.

Толькі будзе так, як будзе,
пройдзе перакос,
і зямельцы роднай людзі
адбудуюць лёс.

## Кілішак са Старым Новым годам

У маўчанні і глухой самоце
гойдаем кілішкі да гары,
два старых у змрочнай адзіноце,
я — стары, і Новы год — Стары.

На зыходзе тых падзей бясслаўных,
калі свет ужо не чуе нас,
п’ем гарэлку, двое праваслаўных,
у такі не праваслаўны час.

І не знаем, што нам трэба болей:
выжыць або згінуць без пары,
вось і жлукцім доляй і нядоляй,
я — стары, і Новы год — Стары.



ВІКТАР САЗОНАЎ

нарадзіўся 18 кастрычніка 1963 года ў мястэчку Гальшаны Ашмянскага раёна. Скончыў гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (1990). Як журналіст і літаратар друкаваўся ў розных беларускіх і замежных выданнях («Літаратура і мастацтва», «Ніва», «Новы час / Літаратурная Беларусь», «Дзеяслоў», «Новы замак» і інш.). Аўтар кніг «Занатоўкі кантрабандыста» (2009), «Сандалі мітрапалітыка» (2012), «Паэзія прозы» (2013), «Суседскія былі» (2015), «Генетычны алфавіт» (2021). Жыве ў Гродне.

## ЯНКА ТРАЦЯК

*СМЕШНЫЯ ВЕРШЫ*

Ведай — такая праблема:
Словам адным не сагрэцца…

### Нешта пайшло не так…

Творца тварыў сусвет —
зорны архіпелаг.
Выбраў Зямлю з планет…
Нешта пайшло не так…

З гліны тварыў людзей, —
трэба ж было — пустак.
Райскі Адам вёў рэй…
Нешта пайшло не так.

Дрэвы Дабра і Зла, —
шмат было дрэў-прысмак.
Творца адно ўказаў…
Нешта было не так…

Творца, напэўна, й сам
райскі прадбачыў брак:
Ева тут…
Яблык…
Адам…
Нешта пайшло не так…

Хто гэты дзіўны Змій?..
Кім падасланы, як?..
Код замяніць Зямлі?..
Нешта было не так…

Дрэва Дабра і Зла
людзі пазналі смак.
Еву Адам пазнаў…
Нешта пайшло не так…

Так і распаўся рай —
Бог не сцярпеў, аднак…
Роспач, бяда, адчай…
Нешта было не так.

Збіўся Адам з дарог —
знік недзе Рай ніяк…
Ева тут…
Дзеці…
Бог…
Нешта пайшло не так.

Авель і Каін — зноў
выбар, ахвяры й знак…
Братазабойства…
Кроў…
Нешта пайшло не так…

Колькі блукаў Адам —
Рай аднаўляў, дзівак…
Нечага Бог не даў?..
Нешта было не так?..

* * *

Зямное і нябеснае, —
тут вельмі лёгка зблытацца:
калі ў пачуццях цесна нам, —
не надта верыш крытыцы
пра рацыю, эмоцыю
і творчую патэнцыю…

Што да мазгоў — тэндэнцыя,
ідэйная стагнацыя…
Якая экзістэнцыя,
такая і субстанцыя…

…Падлічана й дакладзена,
куды усё сцякаецца:
калі зашмат *тут* дадзена, —
*там* больш з таго спытаецца.

* * *

Дадзена нам у пачуццях,
дадзена словам,
у думках.
Славу няцяжка адчуць нам, —
слава кладзецца у сумку.

Хочацца нечага й нешта —
бралі б усё, каб давалі.
Толку: хто горшы, хто лепшы, —
колькі там гэтай маралі?!.

Ведай — такая праблема:
словам адным не саграэцца:
радасці хоць за калена, —
сверб у баку, а не ў сэрцы.

Сохнуць жывыя крыніцы,
творца чакае аддачы…
Хочацца чым пахваліцца,
толькі няма чым, няма чым.

Дадзена што? — парадыгма:
страўнік, пачуцці і думкі…
Сум у вачах эрудытаў…
Спісак паводле ўсіх пунктаў…
…Пункты спакуйце — у сумкі.

## Сам ведаеш…
*Споведзь іншапланетніка*

Цісне мароз ці маразм —
нешта усё накасяк…
Што калі робіцца ў нас,
робіцца — ведаеш як…

Промень ледзь бліснуў — пагас…
З Сонцам у нас нелады.
Так у прасторы, не ў час
цягнуцца нашы гады.

Тут кожны трэці — дзівак,
першы — апошні сюрпрыз…
І разабрацца — ніяк,
верх дзе,
сярэдзіна,
ніз…

Пасам уціснеш жывот,
глянеш, а хто там ідзе?..
Можа, ты бачыў народ?
Бачыў — сам ведаеш дзе…

Далей і болей — хоць плач:
Сонца сігналіць: «За што?..»
Шайбу загналі ці мяч
тыя — сам ведаеш хто...

Недзе ырнуў звездалёт,
нехта пайшоў не туды,
нехта ўзброіў паход,
ведаеш, пойдуць куды...

Іншы, хто можа, крадзе,
той загуляў у лато...
Колькі б хто дзе ні пацеў —
будзе сам ведаеш што...

## Дзень

Дзень пачынаецца з ранку:
сонейка,
хмаркі...
Указ...
Ветрык павее...
Аўсянка...
Долар падскочыць не ў час.

Дзень той прадоўжыцца з лайкаў,
з розных абраз у адказ...
З «хуткіх» машын, з катафалкаў,
гучных сірэнаў штораз.

Дзень той завершыцца ціскам...
Падаеш некуды ўніз...
Цэны... праверкі... зачысткі...
«Хуткая»... і набор клізм...

## Калі прачнешся...

Калі прачнешся — навокал цемра,
як пасля гвалту, як пасля дусту.
Было жыццё дзе — усё замерла,
і што ты ўбачыш? — навокал пуста...

Калі прачнешся — аглушыць рэха
магільнай цішы і супакою.

А што пачуеш — няма уцехі, —
якія гукі ад кучак гною…

Калі прачнешся, куды ты пойдзеш?..
Каго пазнаеш?..
І хто сустрэне?..
Што стала болем — даўно не ў модзе.
Няма знаёмых…
Людзей шмат меней…

Калі прачнешся — і што ты ўбачыш?..
Той сон жахлівы, дзе свеціць цемра…
…Ах, добрай ночы — і няйначай,
і не прачнуцца найлепш цяпер там.

Калі прачнешся — і што ты скажаш,
І хто пачуе — пустэча, быццам…
…І так заўсёды, як толькі ляжаш
З чужою жонкай…
Тады й не спіцца…

## Дзіўны знак

Ці сорам за людзей гнябе,
ці гэта нейкі дзіўны знак? —
жывуць сабакі для сябе,
а шмат людзей — дзеля сабак.

Ці Творца што не даглядзеў,
ці што з жыццём пайшло не так:
сабак ствараў ён для людзей?..
Ці мо людзей — для тых сабак?..

Ці што з людзьмі пайшло не так?..
І чым далей, дык пагатоў:
прыстасаваўся да сабак…
прыстасаваўся да катоў…

Якой нагодай вяжа ніць?
Ці нехта штосьці недабраў?..
Ці хто патрэбным хоча быць,
калі не людзям — дык звярам…

## Чорт

Галоўны Чорт у пекле цэлым
зло множыў злосна з крыкам, з лаем,
караў смалой, турмой, расстрэлам,
усіх палохаў страшным раем.

І так заўжды бывае ў часе,
калі прыходзіць скон на Чорта.
Яму галоўнае на разе —
каб слёзаў больш і больш каб мёртвых…

## Пра блуднага сабаку

…Праз выбухі, стрэлы, і дым
і вочы, налітыя злосцю…
Чаго ён прыходзіць сюды?..
Брахаць ён прыходзіць,
не ў госці…

А колькі такіх праз гады
ляжаць шчанюкоў у магілах…
Чаго ён прыходзіць сюды?
Хвастом тут махаць, як кадзілам?..

Не даў бы Бог іншай бяды, —
ён брэша на ўсіх дзікім матам…
Чаго ты прыходзіш сюды?
Ідзі лепш, сабака, дахаты!..

## Блытаніна

З маімі мінусамі, з плюсамі
мяне заўсёды з кімсьці блытаюць:
ці пуцявінамі распуснымі,
ці то з героямі,
з бандытамі…

Нядаўна зноў былі паблыталі
мяне з паэтамі,
з вучонымі…
Прыемна блытаюць з элітамі,
і — з лёсам нават нарачонымі.

З крутымі блытаюць і хватамі,
прамовы дзе гучаць застольныя…
З чынамі, нават — з дэпутатамі…
І менш за ўсё — з людзьмі прыстойнымі.

І так шторазбывае… Следам і
прыпішуць справу мне з гісторыяй…
Быў я у спісах з дармаедамі…
І на чужой быў тэрыторыі.

Шукаў у блытаным прычыны я,
з чужымі радасцямі,
з бедамі…
Калі дзе што… Але пры чым тут я? —
Не я…
Не быў…
Не піў…
Не ведаю…

* * *

Не люблю жанчын у джынсах,
у адзенні грубым, жорсткім,
дзе губляецца жаночасць
і пяшчота, й выкшталцонасць.

Не люблю такіх, дзе штучнасць
маскіруе натуральнасць,
пустату і бездухоўнасць,
не люблю лялькападобнасць.

Не люблю мужападобных —
канкурэнцыю мужчынам.
О жанчына, твая сіла
у той слабасці жаночай,

здольнай рушыць свет і горы,
здольнай кінуць непакорных
супермэнаў ганаровых
на каленях траціць розум…

## Позняе прызнанне

*Сяброўскі шарж на Сяргея Чыгрына*

Што прэмій няма, не далі медалёў —
як рэха нікчэмных надзеяў і траўм…
Чаго я хацеў — таго й не давалі,
як нешта давалі, дык сам жа не браў.

Забудзецца ўсё: і як каго звалі,
пустыя нагоды пачуццяў і драм.
Як вельмі хацеў — яны ж не давалі,
як лёгка давалі — чамусьці не браў.

Такая дылема, тыя ж скрыжалі —
накладка ніякіх ды важных спраў…
Кідаеш на шалі…
нормы, маралі…
Як лёгка давалі —
дурны, што не браў.

## Паэт і каханне

Там, дзе сустрэчы, там і развітанні,
і ран сардэчных непаўторны след, —
не можа быць шчаслівым у каханні
паэт, калі сапраўдны ён паэт.

Паэты ж пад анёльскія напевы
паэмы твораць, лірыку, санет…
Узлёт душы паэтаў — каралевы.
Без каралевы творца не паэт!

Паэтаў шмат, а каралеваў мала —
такі расклад паэту і імпэт:
шчаслівым стаў бы — толькі б пакахала…
Паэт шчаслівы — гэта ж не паэт!

Дзе той адказ на вечныя сумневы:
чаму такі несправядлівы свет?..
Паэт жыццё аддасць для каралевы,
а ёй кароль патрэбен, не паэт.

Марнее час паэтаў у прызнанні,
як нейкі фатум тут ці запавет:
не можа быць шчаслівым у каханні,
паэт шчаслівы — болей не паэт!

## Будзе яшчэ лепш…

Снегапад, мяцеліца,
б'е у вочы дождж…
Верыцца не верыцца —
будзе яшчэ горш.

Неба крые хмарамі,
цені наўздарож…
Будуць крокі марнымі —
будзе яшчэ горш.

Крыжыкамі, крэскамі
дзень пазначыш, што ж, —
там, дзе справы кепскія,
будзе яшчэ горш.

Хто сядзіць, хто сцелецца,
хто крычыць «Даёшь!» —
там, дзе людзі дзеляцца,
будзе яшчэ горш.

Не для тых авацыі —
розум не трывож…
А яшчэ — мутацыі, —
будзе яшчэ горш.

З торбамі, з хваробамі
так жывём, і ўсё ж…
Нехта скажа: «Добра нам…» —
будзе яшчэ горш.

Ды святлее раніца, —
верыцца найперш:
нешта, пэўна, здарыцца, —
можа, будзе лепш?..

нарадзіўся 17 сакавіка 1956 года ў вёсцы Труханава Смаргонскага раёна. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (1985) і аспірантуру (1997), кандыдат культуралогіі, дацэнт. Аўтар трох навучальных дапаможнікаў і дзвюх манаграфій пра беларускае каталіцкае духавенства (2013, 2019), кніг «Партрэты ў інтэр’еры Гародні: пародыі, эпіграмы» (2013), «Саветы», рамана-хронікі (2015). Жыве ў Гродне.



# ЯНКА ТРАЦЯК

# Проза

## Віктар Варанец

### Ад Fabergé

I

Ледзьве першыя промні сонца загулялі па дахах старажытнага Мінска, брыгада Валодзі Ташкевіча ўжо выгружалася з невялічкага «пазіка» на вуліцы Аранскай. Заказчык Іван Іванавіч, хударлявы, нешматслоўны мужчына ў добрым чорным паліто і капелюшы, загадаў быць на месцы а 5-й гадзіне раніцы. А неўзабаве падкаціў і сам на чорным БМВ. Коратка прывітаўшыся, Іван Іванавіч падвёў Ташкевіча да драўлянага двухпавярховага будынка.

— Вось гэты дом я днямі купіў, — сказаў заказчык. — І неўзабаве тут будзе… Зрэшты, якая табе розніца, што тут будзе. Твая задача, Валодзя, за сёння разабраць гэты дом да фундамента, смецце згрузіць і вывезці. Увечары я павінен убачыць роўную пляцоўку. Плачу́ двайны аклад, а табе, як брыгадзіру, прэміяльны бонус.

Мужчына выцягнуў з партманета пачак даляраў, адлічыў і працягнуў брыгадзіру. І папярэдзіў:

— Калі не паспееце, уся ваша праца будзе лічыцца дабрачынным суботнікам. Бонусы вернеш у трайным памеры. Усё зразумеў?

Той толькі пацiснуў плячыма. А што тут не зразумець? Адно слова, гаспадар жыцця… Толькі бандыты цяпер і жывуць добра. Яны ж і законы свае ўводзяць.

Іван Іванавіч моўчкі развярнуўся і праз хвіліну з'ехаў. Брыгада напружана пазірала на Уладзіміра.

— Ну што, хлопцы, трэба за сёння разабраць хату і вывезці смецце. Абяцалі па трыццаць даляраў кожнаму.

— Ого! — ажывіліся хлопцы.

— А калі не паспеем, дуліну з макам! — астудзіў іх брыгадзір.

— Дык чаго стаім, наперад! — зашумела брыгада. Усе разабралі інструмент, Ташкевіч вызначыў кожнаму месца працы, а сам, узяўшы ломік, пайшоў выдзіраць вокны (цесць прасіў знайсці якое шкло на лецішча). Валодзя акуратна даставаў шыбы, перакладаў іх паперай і выносіў пад яблыньку. Затым выцягваў падаконнікі, паколькі яны былі шырокія, трывалыя, маглі яшчэ дзе і спатрэбіцца. Раптам, здымаючы чарговы падаконнік, хлопец убачыў у выемцы дзве каробачкі і невялічкі скрутак. Пад крышкамі на аксамітных падушачках ляжалі залатыя завушніцы з каменьчыкамі і два пярсцёнкі з дыяментамі. На ўнутранай частцы пярсцёнкаў стаяў надпіс Fabergé.

У скрутку ляжаў пашпарт Расійскай імперыі на імя Вілі Генрыхавіча Штраўбаха і пасведчанне, датаванае 1916 годам, — што Вілі Генрыхавіч Штраўбах з’яўляецца галоўным бухгалтарам Мінскага аддзялення расійскай кампаніі «Фабержэ».

II

Студзень 1918 года замест традыцыйных святочных забаў прынёс у Петраград чырвоны тэрор, голад, разгул бандытызму. Карл Фабержэ добра разумеў, што хутка прыйдуць і па яго. Вядомы ювелір, гаспадар сеткі магазінаў, пастаўшчык упрыгожанняў для імператарскай сям’і, ён не мог не прыцягнуць увагі новай улады. Праўда, Карл мудра паступіў, аддаўшы гэты дом на Вялікай Марской вуліцы швейцарскай місіі і такім чынам атрымаўшы дыпламатычную недатыкальнасць. Але хіба гэта надоўга? І вось зараз ён сабраў у гасцінай ужо амаль не свайго дома найбольш давераных асоб: даўнішняга сябра па вучобе ў дрэздэнскім ліцэі пасла Швейцарыі Ад’е, галоўнага бухгалтара Мінскага аддзялення кампаніі «Фабержэ» Штраўбаха, прысяжнага павеstart паверанага Авяркіева, галоўнага бухгалтара кампаніі «Фабержэ» Баўэра.

— Панове, — пачаў размову Карл, склаўшы перад сабой далоні, — вы разумееце, што ў цяперашніх умовах наша фірма працаваць не можа. Мы вымушаны пакінуць краіну, каб адрадзіць нашу справу за межамі Расіі. Так, пан Вільгельм Ад’е высакародна прыкрывае нас пакуль дыпламатычным статусам. Але бальшавікі ўсё часцей плююць на ўсе міжнародныя нормы. І я ўпэўнены, што неўзабаве прыйдуць сюды з вобшукам. Як нам захаваць каштоўнасці нашы і нашых кліентаў?

— Магчыма, іх трэба перахаваць у розных месцах? — падаў голас Павел Міхайлавіч Авяркіеў.

— Іменна ў розных месцах! — падтрымаў паверанага Фабержэ. — І для гэтага мне спатрэбіцца, панове, ваша дапамога.

Ён падняўся з крэсла і падышоў да вялікага куфра, што стаяў каля сцяны. Падняў вечка і дастаў з куфра тры саквояжы і чорную скрыню з ручкай зверху.

— Тут знаходзяцца найдасканалейшыя ўзоры ювелірнай справы свету. Нават славутая Мацільда Кшэсіньская перадала нам на захаванне свае каштоўнасці. Усяго 562 прадметы. Іх пералік заняў у мяне 20 старонак тэксту. Вам, панове, я давяраю і абяцаю, што ваша самаахвярнасць будзе шчодра аплочана, калі мы сустрэнемся ў Германіі. На галоўным паштамце Вісбадэна для кожнага з вас будзе пакінута картка з маім адрасам. Вам дастаткова сказаць: «Мяне чакае паштоўка ад Карла». Шаноўны пан Ад’е бярэцца перавезці два саквояжы ў пасольства Нарвегіі на Мойку, 42. Адтуль дыпламатычнай поштай уласнаручна даставіць іх у Германію. Пан Баўэр з пакетам каштоўнасцяў едзе цягіком у Рыгу. Пан Штаўбах будзе дабірацца праз Польшчу, а пан Авяркіеў — праз Фінляндыю. Вось, панове, грошы на дарожныя расходы. Добра падумайце, дзе будзеце хаваць гэты груз.

— А як жа вы, паважаны Карл Густавіч? — запытаў Штраўбах.

— А я пад выглядам кур’ера народнага камісарыята па знешніх справах РСФСР заўтра ж адпраўляюся праз Рыгу ў Германію, ну і прыхаплю з сабой некаторыя каштоўныя рэчы. І няхай пра нас, панове, паклапоціцца Бог!

Невядома, які бог дапамог галоўнаму бухгалтару Мінскага аддзялення кампаніі «Фабержэ», але Вілі Генрыхавіч Штраўбах дабраўся да роднага Мінска даволі хутка

і без асаблівых праблем. За пару царскіх чырвонцаў праваднік пасяліў у купэ Вілі Генрыхавіча аднаго, дзверы зачыніў на ключ, а на ручцы павесіў шыльду «Не ўваходзіць! Дэзынфекцыя!» І ўвесь вагон бокам стаў абыходзіць пракажонае купэ. Дабраўшыся да свайго асабняка, Штраўбах, не распранаючыся, стомлена апусціўся ў крэсла. Сям'я даўно з'ехала ў Германію, прыслуга разбеглася, і таму дом непрыемна ціснуў цішынёй. Трэба было добра падумаць, што рабіць далей. Ехаць у Вісбадэн цяпер небяспечна: абабраць, а то і забіць маглі і бальшавікі, што кантралявалі горад, і бандыты, што спынялі цягнікі за горадам, і немцы на мяжы, паколькі вядома, што за законы на вайне. Лепш за ўсё, пэўна, перачакаць які час дома. Новая ўлада доўга не пратрымаецца, тыдзень-другі — і зоймуць Менск або немцы, або палякі, або які царскі генерал. Але парадак абавязкова вернецца. Вось тады ён і пусціць каштоўнасці Фабержэ ў справу. Гэта ж такія грошы! Праўда, і гаспадар можа вярнуцца па сваю маёмасць, але чаму не сказаць, што ўсё канфіскавалі тыя ж бальшавікі ці бандыты? Хай праверыць…

Для пачатку Штраўбах вырашыў прыхаваць каштоўнасці ў розных месцах на выпадак раптоўнага вобшуку. Штосьці размясціў у схованцы ў піўніцы, пару схронаў меў пад падаконнікамі і масніцамі. Схаваў у піўніцы і рэвальвер, добра змазаўшы яго алеем, бо калі зброю знойдуць бальшавікі, адразу ж расстраляюць. Задаволены зробленым, Вілі Генрыхавіч пайшоў спаць.

III

Зруйнаваўшы дом і атрымаўшы абяцаныя грошы, брыгада вырашыла адзначыць такую ўдалую падзею ў бліжэйшым бары. Валодзя Ташкевіч адмовіўся, спаслаўшыся на хваробу жонкі. Прычына была больш чым уважлівая, і брыгада хаця і са шкадаваннем, але адпусціла свайго начальніка.

На працягу ўсяго працоўнага дня Валодзя разважаў, што рабіць са знойдзеным багаццем. Зразумела, што нікому нічога ён не скажа. Завушніцы падорыць жонцы, каханай Маргарыце, бо і так даўно нічога ёй не купляў, — усё грошай не было. Адзін пярсцёнак схавае на чорны дзень, мала што… А вось другі занясе ў скупку і здасць. Але колькі прасіць за яго? А колькі ўвогуле каштуе залаты пярсцёнак з каменьчыкам? Хлопец вырашыў зазірнуць у ювелірны магазін, які сустрэўся па дарозе і, дзякуй богу, яшчэ працаваў. У вялікім светлым памяшканні, апроч прадаўцоў, нікога не было. Ды і тыя, агледзеўшы наведвальніка, тут жа адвярнуліся і працягнулі свае размовы. Валодзя падышоў да прылаўка, знайшоў латок з пярсцёнкамі і пацікавіўся коштам. Анічога сабе! Дзевяцьсот рублёў. Гэта амаль трыццаць даляраў па камерцыйным курсе (па афіцыйным ты ж нідзе не купіш!). Ташкевіч зайшоў у невялічкае і досыць цёмнае памяшканне са сціплай шыльдай «Скупка». За маленькім акенцам сядзеў сівы дзед з акулярам у воку і нешта разглядаў. Блямкнуў дзвярны званочак — стары падняў галаву, перасунуў акуляр на лоб і ветліва запытаўся:

— Добры дзень, малады чалавек! З чым завіталі да нас?

Валодзя адчуў нейкае хваляванне.

— Ды вось, прынёс сямейны пярсцёнак. Ад бабулі застаўся. Возьмеце?

— Канешне, вазьму, — тут жа пагадзіўся дзед. — Але спачатку хацелася б паглядзець на яго.

Ташкевіч раскрыў потную далонь і паклаў на прылавак пярсцёнак. Ювелір вярнуў акуляр на вока, доўга і ўважліва аглядаў тавар і нават чымсьці капнуў на каменьчык.

— Вы толькі не папсуйце, — занепакоіўся хлопец. — Гэта сапраўднае золата, і каменьчык не танны.

— Не хвалюйцеся, малады чалавек, — супакоіў яго стары. — Я не першы год у гэтай справе. І колькі вы б хацелі за свой тавар?

Уладзімір адчуў, як пот струменьчыкам пабег па спіне. Але сабраўся з духам і строга сказаў:

— Тысяча сто рублёў! Гэта ж антыкварыят!

Стары задуменна пакруціў пярсцёнак у пальцах і нарэшце прамовіў:

— Тысяча рублёў мая канчатковая цана. І толькі з павагі да вас, малады чалавек.

Ташкевіч адчуў, як крылы шчасця вырастаюць за плячыма.

— Добра, але грошы адразу!

— Канешне, — пагадзіўся ювелір, — зараз прынясу. А вы пакуль падрыхтуйце пашпарт. Трэба ж аформіць квітанцыю.

Ён вярнуўся хвіліны праз тры, несучы пачак купюр. Узяўшы пашпарт, перапісаў чамусьці і адрас прадаўца. «Пэўна, такі парадак», — падумалася хлопцу. А стары тым часам выклаў грошы перад Ташкевічам, вярнуў пашпарт і між іншым запытаўся:

— Можа, яшчэ што засталося ад бабулі?

— Можа, і засталося, — радасна адказаў Валодзя. — Пагляджу дома…

— Заўсёды буду рады вас бачыць, Уладзімір Іванавіч. І нават крыху падыму для вас цану як для сталага кліента.

Валодзя падзякаваў і, шчаслівы, паляцеў дахаты ўзрадаваць жонку неверагодным багаццем.

Ювелір яшчэ з хвіліну разглядаў пярсцёнак, затым, цяжка ўздыхнуўшы, паклаў яго на стол, падцягнуў да сябе тэлефон і пачаў накручваць дыск. Пасля некалькіх гудкоў у трубцы пачуўся незадаволены мужчынскі голас:

— Слухаю!

— Іван Іванавіч, гэта вас непакоіць Кац Саламон Майсеевіч. Вы прасілі паведаміць, калі будзе нешта цікавае. Маю неверагоднай прыгажосці пярсцёнак ад самога Фабержэ.

— Еду…

Кац акуратна паклаў трубку на апарат, падышоў да дзвярэй і павесіў шыльдачку «Зачынена». А сам сеў каля акна і прыплюшчыў вочы. Хвілін праз дваццаць да скупкі пад'ехаў чорны БМВ, з якога выйшаў мужчына ў доўгім чорным паліто. Кац расплюшчыў вочы, падняўся з крэсла і, па-старэчы шоргаючы нагамі, накіраваўся да дзвярэй сустрэць госця. Той увайшоў у памяшканне і гучна прывітаўся:

— Вечар добры, Саламон Майсеевіч! Толькі дзеля цябе кінуў усе справы і прыехаў. Ну, паказвай, што прыдбаў.

— Добры вечар, шаноўны Іван Іванавіч, — адказаў Кац і падвёў госця да стала, на якім ляжаў пярсцёнак. Іван Іванавіч уважліва разгледзеў каштоўнасць з усіх бакоў, прымерыў на палец і паклаў на месца.

— Што, на самай справе Фабержэ?

— Так, Іван Іванавіч, рэч зроблена на пачатку стагоддзя ювелірным домам Фабержэ. Паглядзіце, якая тонкая праца, а якой чыстай вады камень. Такога ўжо не робяць. Цаны яму няма.

Мужчына ўсміхнуўся.

— Цана, шаноўны Саламон Маісеевіч, ёсць усяму, нават нам з вамі. Колькі просіце?

— Толькі з павагі да вас, Іван Іванавіч, аддаю амаль без прыбытку. Дзесяць тысяч даляраў.

— Кац, не смяшы гусей! Магу даць пяць тысяч і тысячу за інфармацыю, адкуль гэты пярсцёнак.

— Іван Іванавіч, якія пяць тысяч? Гэта ж Фабержэ! — ледзь не плачучы запярэчыў стары.

— Ну і куды ты пойдзеш са сваім Фабержэ? На базар? Ці аб'яву дасі ў рэкламку? Або міліцыя адбярэ, або бандыты, яшчэ і парэжуць. А я табе добрыя грошы прапаную. Згода?

Кац у неверагоднай роспачы сеў у крэсла і сапраўды заплакаў:

— Першы раз у жыцці трымаў у руках сапраўднага Фабержэ і вымушаны аддаць за грашы… Што робіцца на свеце!

А госць тым часам адлічыў названую суму і паклаў перад Кацам.

— Гэта твая забяспечаная старасць. Радуйся, дурань. А цяпер скажы, адкуль цацка?

Гаспадар у адчаі махнуў рукой, згроб са стала грошы і працягнуў госцю копію квітанцыі. Іван Іванавіч уважліва прачытаў і ажно прысвіснуў ад здзіўлення.

— Саламон Майсеевіч, а гэты Ташкевіч — хлопец гадоў трыццаці, рыжы, рост прыкладна метр восемдзесят?

— Так, — механічна пацвердзіў Кац.

— Цікава жыццё разгортваецца, — задуменна прагаварыў мужчына. — Што ж, працягнем знаёмства…

IV

Вілі Генрыхавіч Штраўбах прачнуўся за імгненне да таго, як са звонам вылецела шыба з акна. І тут жа ў пакой адзін за адным улезлі дзве цёмныя постаці. Адна накіравала рэвальвер на гаспадара дома, а другая рушыла да ўвахода. Пачулася бразгаценне дзвярной клямкі, засаўкі, і неўзабаве ў спальню ўвайшлі яшчэ тры чалавекі. Адзін з іх меў досыць прыстойны выгляд: доўгае чорнае паліто з добрага сукна, капялюш з вялікімі палямі, лакавыя штыблеты. Астатнія класічна падыходзілі пад апісанне бандытаў: нейкія ватоўкі, брудныя боты, шапкі-вушанкі. Кожны трымаў у руцэ зброю. Чалавек у паліто прысеў у крэсла насупраць Штраўбаха, міла ўсміхнуўся і закурыў.

— Вы хто? — не вытрымаў гаспадар.

— Ах, Вілі Генрыхавіч, думаю, гэта рытарычнае пытанне. Вы ж і так здагадаліся, што да вас завіталі бандыты. Праўда, мы сябе называем вольнымі стралкамі.

— Робін Гуды? — чыста аўтаматычна перапытаў Штраўбах.

Субяседнік зноў міла ўсміхнуўся:

— Можаце і так нас называць. Дарэчы, асабіста мяне завуць Іван Іванавіч. Але, шаноўны Вілі Генрыхавіч, мы да вас па справе. Наш атрад збірае нарабаванае багацце ў былой буржуазіі, каб накіраваць яго на патрэбы былога прыніжанага класа. Вы доўга працавалі галоўным бухгалтарам Мінскага аддзялення «Фабержэ», думаю, тое-сёе прыхавалі на чорны дзень. Хачу паведаміць, што чорны дзень надышоў і вы можаце выгадна абмяняць каштоўнасці на не менш каштоўнае сваё жыццё. Як вам такая прапанова?

Штраўбах толькі пацісну плячыма:

— Вас увялі ў зман. Ну адкуль у мяне, звычайнага бухгалтара, каштоўнасці? Было пару бранзалетак, дык жонка забрала іх з сабой, калі ад’язджала за мяжу. Хіба што ў партманеце ляжаць некалькі царскіх чырвонцаў, то можаце забраць, панове.

— Дыялог не атрымаўся, — расчаравана працягнуў Іван Іванавіч. — Шкада!

І ён выразна паглядзеў на падзельнікаў. Тыя ўмомант адрэагавалі. Яны перавярнулі Штраўбаха на жывот і моцна скруцілі яму рукі і ногі дротам, канцы якога прыматалі да металічных спінак ложка. У рот уставілі кляп. Адзін з бандытаў выцягнуў з кішэні бутэльку з газай і пачаў паліваць голыя ступні ахвяры. Другі зняў з абразоў свечку і падышоў бліжэй. Іван Іванавіч нахіліўся над галавой палоннага:

— Зараз, дарагі Вілі Генрыхавіч, мы падпалім вам ступні. Газы ў нас дастаткова, і гарэць вы будзеце паволі: спачатку ногі, потым тулава, і, нарэшце, дабяромся да галавы, калі вы яшчэ будзеце здольны гэта адчуваць. Таму або вы скажаце, дзе каштоўнасці, або паступова падсмажыцеся, як калядны гусь. Будзеце гаварыць?

Штраўбах згодна заківаў галавой. Але як толькі выцягнулі кляп, палонны зароў на ўсю хату:

— Мярзотнікі! Ды як вы смееце! Вас усіх павесяць!

— Палі̂! — каратка загадаў Іван Іванавіч

Бандыт паднёс свечку да пятак гаспадара хаты — і яны ўмомант успыхнулі. Штраўбах задрыгаў нагамі, твар яго імгненна пасінеў, затым тулава неяк ненатуральна выгнулася і тут жа абмякла.

— Гасі! — зноў закамандаваў галоўны і выцягнуў кляп з рота ахвяры. Вілі Генрыхавіч не падаваў прыкмет жыцця. Іван Іванавіч узяў яго руку і праверыў пульс.

— Памёр, — канстатаваў праз хвіліну. — Відаць, сэрца не вытрымала. Што ж, давядзецца самім шукаць. А дом потым спаліць. Вы…

Гэта былі апошнія словы Івана Іванавіча, паколькі ў выбітым акне з’явіўся ствол вінтоўкі, раздаўся стрэл, і вядомы ў крымінальным свеце злодзей у законе Картуз, ён жа Іван Іванавіч, паваліўся на падлогу з дзіркай у лбе.

— Усім на падлогу! — прагучаў з вуліцы загад, і хату пачалі запаўняць міліцыянеры. Бандыты пакорліва палеглі на падлогу.

V

Валодзя Ташкевіч і яго жонка Маргарыта сядзелі перад тэлевізарам і вячэралі. На стале стаяла адкаркаваная бутэлька віна, на талерках ляжалі кавалкі смажанай курыцы, вараная бульба і тонка нарэзаны сервелат. Вушы Маргарыты ўпрыгожвалі новыя завушніцы.

— Які ж ты ў мяне малайчына! — ужо ў каторы раз нахвальвала яна мужа. — Такі цяжкі час, а ў нас стол ломіцца ад далікатэсаў. І ўсё дзякуючы табе, дарагі!

Яна гучна цмокнула Валодзю ў шчаку. Па кватэры прарэзліва прагучаў дзярны званок.

— Каго яшчэ чэрці прынеслі? — незадаволена прамармытаў Ташкевіч і пайшоў да дзвярэй. — Хто там?

— Суседзі знізу. Заліваеце.

Валодзя хуценька адчыніў дзверы.

— Дык мы і не ўключалі ваду…

Сказаў і аслупянеў. З парога яму ўсміхаўся Іван Іванавіч, ранішні працадаўца. За ім узвышаліся тры здаравенныя мардавароты.

— Вы ў нашым пад'ездзе жывяце? — разгублена запытаў Валодзя.

— Не, Вовік, не жыву… — жыццярадасна адказаў госць, — але ўсё яшчэ можа быць.

Ён адсунуў гаспадара ўбок і прайшоў у кватэру. Адзін з амбалаў падштурхнуў хлопца ў плечы, і той пакрочыў следам.

— Добры дзень, шаноўная гаспадыня! — прывітаўся Іван Іванавіч з Маргарытай, завітаўшы ў гасцiную. — Даруйце, што перапынілі святочную вячэру, але, спадзяюся, мы не надоўга. З вашага дазволу…

І ён сеў на канапу. Два мардавароты сталі па баках Валодзі, трэці — за спінай Маргарыты.

— Мяне, шаноўнае спадарства, цікавіць толькі адно пытанне: адкуль у вас з'явіўся гэты прадмет? — госць дастаў з кішэні пярсцёнак Фабержэ.

— Ад бабулі, — адказаў Ташкевіч.

— Ах, Вовік, Вовік, нядобра хлусіць гасцям, — Іван Іванавіч незадаволена паматаў галавой. — Твая бабка, як і яе бабка, усё жыццё працавала на зямлі, і максімум, што мела, гэта танны срэбраны пярсцёнак на ўласным вяселлі. А за такі пярсцёнак яна магла б купіць усю воласць. У вас, Вовік, была свая воласць?

— Не, не было, — сур'ёзна адказаў Валодзя, не заўважыўшы гумару госця.

— Ну вось, значыць, не ад бабулі. І нешта мне падказвае, што з'явіўся ён у цябе толькі сёння. Адсюль і такая раскоша на стале. Я не памыляюся, шаноўная Маргарыта?

— Ды як вы смееце! — раз'юшана закрычала жанчына. — Уварваліся ў чужую кватэру і яшчэ нахабнічаеце! Я міліцыю выклічу!

Бандыт, які стаяў за ёй, коратка рубануў далонню дзяўчыне па шыі, і яна ўраз абмякла ў крэсле, страціўшы прытомнасць.

— Што робіце, казлы?! — крыкнуў Уладзімір і атрымаў ад сваіх вартаўнікоў удары ў жывот і па нырках. Ён упаў на калені і скурчыўся ад болю.

— А так хацелася разысціся па-добраму, — з сумам заўважыў Іван Іванавіч. — Не атрымалася. І тым не менш, Вовік, паўтару сваё пытанне: адкуль у цябе пярсцёнак?

Ташкевіч з нянавісцю зірнуў на яго і ледзь чутна вымавіў:

— Знайшоў сёння ў доме, што разбіралі.

— Я так чамусьці і падумаў, — усміхнуўся бандыт. — Што яшчэ знайшоў?

Валодзя выцягнуў з кішэні другі пярсцёнак, затым падышоў да кніжнай паліцы і дастаў пашпарт Штраўбаха. Усё гэта паклаў на стол.

— Вось і малайчына! — пахваліў яго візіцёр. — Чаму б адразу не вярнуць гаспадару яго дабро? Што за людзі? Але, Вовік, ты забыўся пра грошы, што атрымаў за мой пярсцёнак ад Каца. Прынясі, калі ласка, а тады пагаворым вось пра гэтыя прыгожыя завушніцы, што так зіхацяць на твоёй жонцы.

Ташкевіч затраўлена паглядзеў на бандытаў, перавёў позірк на жонку і пакрочыў да курткі, што вісела ў прыхожай. Бандыты пацягнуліся за ім. Валодзя засунуў руку ў кішэнь і, выцягнуўшы адтуль газавы балончык, пырснуў у твар аднаму і другому. Тыя ажно ўзвылі ад болю. А хлопец тым часам кінуўся да дзвярэй, але трэці бандыт імгненна дастаў з-пад світара пісталет і стрэліў таму акурат у патыліцу. Ташкевіч упаў на падлогу. Іван Іванавіч зморшчыўся:

— Ну чаму ўвесь час нейкія выбрыкі здараюцца? Трэба было забіваць?

— Дык ён збег бы, — пачаў апраўдвацца бандыт.

— Ах, — махнуў рукою Іван Іванавіч, — пра што тут гаварыць… Ну дык разбярыся тады і з гэтай паненкай, не пакідаць жа сведку. Толькі здымі завушніцы.

Бандыт перадаў гаспадару ўпрыгожанні, а сам прыставіў да скроні Маргарыты пісталет і стрэліў.

Іван Іванавіч уважліва разгледзеў завушніцы, задаволена хмыкнуў і накіраваўся да выхаду. Бандыты пакрочылі следам. Яны селі ў машыну, і кіроўца запытальна паглядзеў на шэфа.

— На Аранскую! — загадаў той.

VI

Мікіта Апанасавіч Коўрах павольна цягнуўся па Аранскай вуліцы, шукаючы месца для начлегу. Кудлатыя валасы, дранае бруднае адзенне, а галоўнае, моцнае амбрэ ад даўно не мытага цела выразна сведчылі, што Мікіта Апанасавіч пражываў у статусе бамжа. Але такі стан рэчаў, тым не менш, яму падабаўся — вольны чалавек. А сённяшні дзень і ўвогуле выдаўся надзвычай добрым. Па-першае, раніцай нейкаму мужыку дапамог зацягнуць халадзільнік на пяты паверх, за што атрымаў рубель. Па-другое, выпадкова натыкнуўся на добра апранутага грамадзяніна на падпітку, які спаў на лаўцы ў парку. Коўрах крыху пасядзеў побач, а потым акуратна выцягнуў з кішэні таго кашалёк. Праўда, знайшоў там толькі тры рублі (астатняе, пэўна, прапіў, га́дзіна), але і гэта штось… Мікіта да вечара паблукаў па горадзе, але больш прыбытку не было. Тады зайшоў у магазін, купіў бутэльку віна, кальцо ліверкі, хлеба, а потым, крыху павагаўшыся (эх, гуляць дык гуляць), плаўлены сырок «Дружба». І вось засталося знайсці ціхае месца і зрабіць сабе свята жывата. Увагу Мікіты прыцягнула расчышчаная пляцоўка, на якой яшчэ ўчора стаяў дом. Цяпер жа дома не было, а тырчаў толькі фундамент.

«Разабралі, пэўна, — падумаў мужчына. — Але дом стары, думаю, і піўніца ў ім была. Трэба праверыць.»

Мікіта пахадзіў па пляцоўцы, там-сям адграбаючы рэшткі смецця і пяску, і заўважыў вялізнае кальца, прымацаванае да люка. Ён пацягнуў кальца на сябе, вечка

даволі лёгка паддалося, і перад вачыма Коўраха паўсталі мураваныя сходні кудысьці ўніз. Мікіта намацаў у кішэні запалкі і агарак свечкі, запаліў яе і стаў асцярожна спускацца. Піўніца была вялікая, абкладзеная цэглай. На падлозе валяліся некалькі пустых скрынь, у куце бачылася горба нейкіх ануч. Выдатнае месца для пікніка!

Мікіта ўмацаваў свечку на скрыні, а сам падняўся па сходах, зачыніў люк і вярнуўся назад. Хуценька накрыў стол, дастаў з кішэні складную шклянку (каштоўная рэч!), наліў да краёў і з задавальненнем усю выпіў. Прыемнае цяпло пабегла па целе. Мікіта няспешна прыкусіў і пайшоў да ануч. Старыя, брудныя, што яны тут рабілі — незразумела. Ён нагой пачаў раскідваць гэтую горбу, як раптам балюча стукнуўся аб нешта цвёрдае.

Бомж запусціў у горбу рукі і неўзабаве намацаў нейкі скрутак. Разгарнуў асцярожна і ажно ахнуў: перад ім ляжаў сапраўдны рэвальвер у густой змазцы. Мікіта ажно ўзмакрэў. Трэба было падмацавацца. Ён наліў яшчэ адну шклянку, выпіў і пачаў анучамі сціраць са зброі змазку. І вось на далоні ляжыць прыгожы, бліскучы, як у кіно, рэвальвер. Цікава, хто яго тут схаваў? А можа, ён сапсаваны ці патронаў няма? Віно ўжо крыху затуманіла розум, і Мікіта адважыўся на эксперымент. Ён узвёў курок, прыцэліўся ў адну са скрынь і націснуў на курок. Грымнуў стрэл, і ад скрыні адляцела трэска.

— Нічога сабе! — са здзіўленнем адзначыў Коўрах і наліў трэцюю шклянку. Выпіўшы, прываліўся спінай да сцяны і захроп. Прачнуўся Мікіта ад рэзкага ўпартага святла. Ён расплюшчыў вочы. Па твары бегаў прамень ад ліхтарыка.

— Шэф, тут толькі нейкі бомж спіць, — пачуў Мікіта голас.

— Дык выкінь яго адсюль, — загадаў нехта.

— Можа, прасцей застрэліць. Кранаць рукамі гэтую брыдоту не хочацца.

«Зараз мяне заб'юць», — пранеслася ў ачмурэлай галаве Мікіты. І тут жа накаціла неверагодная нянавісць да гэтых прышэльцаў за ўсё змарнаванае жыццё.

— А-а-а! — прарэзліва закрычаў Мікіта, выцягнуў з кішэні рэвальвер і пачаў страляць у дзвярны праём. Ліхтарык блямкнуў і пакаціўся па падлозе. Штосьці яшчэ бухнулася на зямлю, а па прыступках нехта пабег наверх.

Мікіта падняў ліхтарык і пасвяціў. На падлозе ляжалі два мужчыны: адзін хударлявы, у добрым чорным паліто, другі — здаравяк у кароткай скуранай куртцы. Абодва ўжо не дыхалі. Коўрах палез у іх кішэні. Здабыча была нядрэнная: дзвесце трыццаць рублёў, трыста долараў, а яшчэ два залатыя пярсцёнкі з каменьчыкамі і завушніцы.

— Заўтра аднясу Кацу. Ён купіць, — задаволена прамармытаў Мікіта Апанасавіч, нацягнуў на сябе паліто і капялюш забітага Івана Іванавіча, схаваў пад світарам рэвальвер і пачаў падымацца па сходнях на вуліцу.

## Падарожжа

Ну што, час ехаць. Міхась Уладзіміравіч Бырда павярнуў ключ запальвання — «фордзік» весела чмыхнуў і загудзеў ціхай, роўнай працай рухавіка, што так гаюча ўздзейнічае на сэрца любога аўтамабіліста. Якая ж прыемнасць — ехаць па начным Гродне! Пустыя вуліцы, цішыня, чыстае паветра, дзе-нідзе сустрэнецца запознены грамадзянін, засяроджана хістаючыся дахаты. Любата! А ўжо праз якія дзве гадзіны гэтыя ж вуліцы ўмомант запоўняць аўта- і пешапатокі — і бывай, рамантычная адзінота.

Калі Бырда пад’ехаў да будынка ўніверсітэта, дзяўчаты былі ў поўным зборы і пра нешта гучна гаманілі. «Хіба да дажджу», — адразу ж падумаў кіроўца. Праз адчыненыя дзверы ў салон буса струменьчыкам паліліся студэнткі. І зноў віскі, крыкі, рогат. Але паступова ўсе ўладкаваліся ў крэслах. Міхась стаў у праходзе.

— Усім добрай раніцы, прыгажуні!

— Вам добрай раніцы, Міхась Уладзіміравіч!

— Бачу, настрой вельмі добры. А зараз хвілінку ўвагі і сур’ёзнасці. Вось вашы пашпарты з візамі. Разбярыце, толькі не пераблытайце, дзе чый. І не дай божа яго згубіць! Таму схавайце.

— У трусы? — ляпнула адна ў прыцемку салона, і ўсе зноў зарагаталі.

— А хоць і ў трусы. Памежнікам дармовы стрыптыз не нашкодзіць, — адказаў разумніцы. — Далей, нагадваю, у каго гарэлка, цыгарэты — ёсць пяць хвілін, каб гэтую кантрабанду выліць і выкінуць, ну або выпіць і выкурыць.

— Не, мы столькі не адолеем, — зноў запішчалі ў салоне.

— Калі каго злапаюць на мяжы, чакаць і вяртацца не будзем. Самі вернецеся. Па дваццаць рублёў на праезд прынеслі?

— Так, прынеслі.

— Перадаць наперад. І глядзіце, не падманвайце старога куратара.

— Ну які вы стары? — суцяшальна вымавіла адна з дзяўчат.

— Ну які вы куратар? — дадала другая, і ўсе, вядома, зарагаталі.

Так, паездка абяцае быць не сумнай.

— Усё, дзверы зачыняюцца! Ад’язджаем!

— Ура! — закрычалі ў салоне, пачуўся хлапок шампанскага, прычым не адзін.

Ужо развідняла. Дзяўчаты ўвесь час варушыліся, пераходзілі адна да адной, мяняліся месцамі, а Міхась кіраваў да польскай мяжы. Дарога заняла хвілін пятнаццаць, як група пад’ехала да апошняй запраўкі на беларускай тэрыторыі. Кіроўца заглушыў рухавік.

— Грамадзянкі турысткі! Апошні сюсі-прыпынак да Польшчы. Раю ўсім наведаць гэты прытулак, бо можам мяжу і хутка праскочыць, а можам і завіснуць. Таму лепей сюсяйце тут.

Угаворваць дзяўчат не прыйшлося. Імгненна салон апусцеў. Міхась Уладзіміравіч за гэты час запраўіўся пад завязку дызпалівам, рэшту беларускіх грошай памяняў на еўра і нават паспеў выпіць кубачак кавы. І вось усе зноў у аўтобусе. У добры шлях!

Беларускую мытню і памежнікаў прайшлі вельмі хутка, на што, у прынцыпе, і разлічвалі. Цікава, як будзе з палякамі?

— Дзяўчаты, усе міла ўсміхаемся і памятаем, што мы едзем на студэнцкую канферэнцыю ў Кракаў.

— А мяне мама вучыла, што падманваць непрыгожа, — устрала Кардабнёва. — Мы ж ў Гданьск на мора адпачываць едзем, а не на нейкую каферэнцыю, Міхась Уладзіміравіч?

— А гэта, Святланка, святая няпраўда ў імя высокай мэты: не сядзець на мяжы гадзін так з пяць, а хуценька і цывілізавана апынуцца на тэрыторыі суседняй дзяржавы.

Бус заехаў на зялёны калідор. Аўтобусаў, дзякуй богу, наперадзе не было. Так, чатыры легкавікі. Стражнічка хуценька адзначыла пашпарты, а неўзабаве падышоў і польскі мытнік. Ён падняўся ў салон і здзіўлена пакруціў галавой.

— Дзень добры, паненкі. І куды гэтая квятарня едзе?

— Дзень добры, пан! А мы на канферэнцыю. Мы студэнткі. А паехалі з намі… — наперабой запішчалі паненкі.

— Так, а вудка, цыгарэты, наркотыкі? — працягваў традыцыйны апыт мытнік.

— Не, дзякуй, не трэба, у нас свае, — амаль хорам адказалі турысткі.

Мытнік аказаўся з гумарам. Ён весела зарагатаў, забраў пашпарты і пайшоў да сябе.

— Малайцы, дзеўкі, так трымаць, — пахваліў Міхась сваю «брыгаду».

— Міхась Уладзіміравіч, а чаму ні аднаго хлопца з намі не едзе? Мы ж не філфак які? — запытала Таня Маркіна.

— Разумееш, Таня, з намі збіраліся ехаць Сцяпанаў, Хоха і Кавальчук Міхал. Але Сцяпанаў напярэдадні здачы дакументаў згубіў пашпарт, Хоху на заўтра выклікалі ў ваенкамат, а Кавальчук з моцным атручваннем ляжыць у бальніцы. Так вось не пашанцавала нашым хлопчыкам.

Праз колькі хвілін ім прынеслі пашпарты. Можна ехаць.

— Ура, — закрычалі дзяўчаты, і экскурсія пачалася.

Машына весела бегла па вузкіх польскіх дарогах, турысткі з цікавасцю глядзелі на краявіды новай для іх краіны.

Да кіроўцы падышла староста групы Кацярына Ступка.

— Міхась Уладзіміравіч, а давайце заедзем куды-небудзь перакусіць, папоўніць запасы пітной вады і чыпсаў, ды і, як вы кажаце, пасюсяць большасць не супраць.

— Добра, — адказаў куратар, — хвілін праз дзесяць будзе Сакулка, там ёсць гіпермаркет, а ў ім — усё, што заказалі.

Неўзабаве даехалі да гіпермаркета. На пляцоўцы, на дзіва, не было ніводнага аўтобуса на беларускіх нумарах. «Цікава, і дзе яны ўсе?» Кіраўнік даў дзяўчатам 30 хвілін на рабаванне магазіна і вырашыў таксама крыху падмацавацца.

Уся група ўтульна ўладкавалася ў кафэ. Як нейкія блакаднікі, яны панабіралі гурбы хот-догаў, гамбургераў, чызбургераў і іншага фастфуду, і амаль кожная ўсё гэтае смакоцце запівала півам.

— Дзеўкі, вы што ж робіце? — ледзь не закрычаў ад злосці Міхась. — Вы ж абсікаецеся ў дарозе. Я спыняцца не буду, таму беражыце пустыя бутэлькі — вельмі спатрэбяцца…

— Ну не злуйцеся, Міхась Уладзіміравіч, ну як быць у Польшчы — і не пакаштаваць іхняга смачнага піва? Гэта як быць у Грэцыі і не купіць футра… — заенчылі півасёрбкі.

І зноў дарога. Кіроўца ўключыў нейкую камедыю на DVD, дзяўчаты, сытыя і задаволеныя, уладкаваліся ў крэслах і пачалі культурна адпачываць. Некаторыя пазасыналі. Ну і правільна, хутчэй пройдзе дарога.

Ужо пачало цямнець, калі яны пад’ехалі да Гданьска. Да канчатковага прыпынку заставалася кіламетраў 20. Кіроўца зарулій на невялікі кемпінг на ўзбочыне лесу і спыніўся.

— Дзяўчаты, усім выходзіць на вытворчае пасяджэнне, — абвясціў па салоне.

Пасажыркі не прымусілі сябе доўга ўгаворваць і адна за адной павыскоквалі з аўтобуса. Куратар дастаў з багажнічка раней падрыхтаваны пакет і далучыўся да іх. Яны зайшлі ва ўтульную альтанку з круглым сталом пасярэдзіне. Міхась выцягнуў з пакета тры бутэлькі шампанскага і вялікі стос пустых пластыковак.

— Ого, — радасна загулі студэнткі. — Дык мы гуляем…

— Так, — пацвердзіў Міхась, — куратар прастаўляецца. Прапаную ўзняць тост за паспяховае прыбыццё ў намечаны горад і прыемныя ўражанні ў ім.

Ён наліў кожнай шампанскага, крыху плюхнуў і сабе.

— Дык вам жа нельга, у вас руль, — перасцераглі дзяўчаты.

— А я толькі крышачку, — супакоіў іх. — За нас, адважных турыстаў.

Усе радасна загулі і кульнулі свае пластыкоўкі.

— А зараз усе ў аўтобус. Апошні рывок.

І бус зноў рушыў наперад. Хвілін праз пяць Міхась зірнуў у люстэрка салона. Усе спалі моцным сном. Дзякуючы навігатару Бырда хутка знайшоў патрэбную вуліцу і дом у Гданьску. Спыніўся каля высокіх жоўтага колеру варот, заглушыў рухавік. Затым з двума пакетамі прайшоўся па салоне, дастаючы з торбаў дзяўчат пашпарты, кашалькі, тэлефоны. Пасля пераклаў грошы ў сваю барсетку, адабраў штук шэсць каштоўных апаратаў, а пашпарты згрузіў у асобны пакет. Пасля чаго пагрукаў у дзверы. Праз пару хвілін яны адчыніліся, і ў праёме ўзнік высокі плячысты араб, які на ламанай польскай мове запытаў, што таму трэба.

— Мне патрэбны Лешак. Скажы, што Крафт прыехаў.

Дзверы зачыніліся. Чакаць давялося хвілін з пяць, не больш. Гэтым разам ужо адчыніліся вароты, і ўсё той жа араб паказаў рукой, каб заязджаў. Міхась вярнуўся ў бус. Дзяўчаты па-ранейшаму моцна спалі. Завёў машыну і ўехаў у двор. На ганак выйшаў гаспадар дома пан Лешак, невысокі лысы мужчына ўжо досыць сталага ўзросту. Міхась адчыніў дзверы і рухам рукі запрасіў яго ў салон. Лешак разам з арабам павольна падняліся па прыступках і рушылі паміж радоў, пільна ўглядаючыся ў твары дзяўчат. Каб было відней, кіроўца запаліў святло. Лешак дайшоў да канца салона, задаволена хмыкнуў і вярнуўся назад.

— Малайцом. Нядрэнны тавар прывёз. Дзе пашпарты?

— А дзе грошы? — запытаў Міхась.

— Будуць табе грошы. Ідзём у дом. Дарэчы, а калі яны прачнуцца?

— Гадзін праз пяць.

— Гэта добра. Якраз паспеем перацягаць іх у падвал і зрабіць ін'екцыю шчасця.

— І куды іх потым? — пацікавіўся куратар.

— Традыцыйна, лепшых у бардэлі Усходу, горшых тут уладкуем, — адказаў гаспадар і з'едліва запытаў: — А што, спадар выкладчык, шкада стала студэнтак?

— Канешне шкада. Але і сябе пашкадаваць трэба. Вось і давялося выбіраць, што найдаражэй. Так, ад лёсу не ўцячэш — маглі б стаць настаўніцамі, а стануць прастытуткамі. Вы толькі наркатой іх не вельмі ж накачвайце.

— А вось гэта, хлапец, — голас Лешака пасуравеў, — зусім не твая справа.

Яны зайшлі ў хату. Лешак дастаў скрутак даляраў.

— Як і дамаўляліся. Па дзве тысячы за кожнае цела і сем тысяч за твой бус. Пералічваць будзеш?

— Буду, — адказаў Міхась і хуценька перабраў стадаляравыя купюры. Усё сышлося. — Ну тады бывайце, шаноўнае спадарства.

Ён выйшаў на двор. На душы было паскудна. Але праз дзве гадзіны самалёт да Сіднэя. Там новае, вольнае жыццё. Можна будзе адкрыць на зробленыя грошы сваю справу, ажаніцца і пастарацца забыцца пра сваіх дзяўчат. Калі, канешне ж, атрымаецца забыць…

## «Уралачка»

### *Іранічны дэтэктыў*

Уначы Пятру Сямёнавічу Іванову сніліся грошы. Вялізныя рознакаляровыя паперкі павольна апускаліся на зямлю, нібы восеньскае лісце, складваючыся ў дзіўныя фігуры. Але як толькі хлопец працягнуў да іх рукі, гэтыя даляры, еўра, фунты жвавенька ўскочылі на крывенькія ножкі і са смехам разбегліся ў розныя бакі.

…Пятро расплюшчыў вочы і з хвіліну ашалела глядзеў у столь. Такіх сноў ён яшчэ не бачыў. І сто пудоў — тут нешта зашыфравана. Грошы — гэта добра, гэта да багацця. Але яны ж разбегліся па кутах. Дзеля чаго? Праўда, паразважаць не даў прарэзлівы звон будзільніка. Час ляцець на працу.

Брыгада будаўнікоў, у якой працаваў Пятро, была ўжо ў поўным зборы. Мужыкі ляніва перакідваліся словамі пра футбол і надвор'е, чакаючы брыгадзіра з новым заданнем. Неўзабаве з'явіўся і сам брыгадзір.

— Ну што, хлопцы, сёння ў нас гістарычная справа. Будзе што ўнукам расказаць.

— Будзем бурыць банк, тэлеграф і лазню? — пажартаваў нехта.

— Амаль што так, — пагадзіўся брыгадзір. — Толькі гэтым разам будзем бурыць апошнюю піўную на П'яным вугле.

Усе толькі ахнулі.

П'яны вугал ведаў у Гродне кожны жыхар сярэдняга і сталага ўзросту. Там, у Занёманскай частцы горада, на скрыжаванні дзвюх вуліц калісьці стаялі чатыры піўныя павільёны: «Вецярок», «Турыст», «Уралачка» і «Хваля». А над імі высіўся з дакор-

лівым выглядам Францішканскі касцёл. І кожнага дня рабочыя гарбарнага завода, хлебакамбіната і тытунёвай фабрыкі ішлі пасля змены да павільёнаў зняць працоўны стрэс, адвесці душу за куфлем піва з гарэлкавым дадаткам. Ды і гараджан іншых прафесій і поглядаў на жыццё хапала ў гэтых гасцінных піўнушках. Але час рабіў сваю справу: горад рос, вуліцы пашыраліся, і павільёны знікалі адзін за адным. Даўжэй за іншыя трымалася «Уралачка», але вось дайшла чарга і да яе.

— Ды ў каго рука падымецца на такое? — змрочна запытаў Сідараў, дужы чарнявы мужык з тварам выпівохі і задзіры.

— А там ужо пуста, — супакоіў брыгадзір. — Усё вывезлі, засталося разбіць толькі старыя сцены. Можа, якое кафэ паставяць.

— Ага, — дружна заківалі галовамі мужыкі, — і піва па цане каньяку…

— Не хочаш — не пі, — адказаў брыгадзір і гучна скамандаваў: — Хопіць трындзець! Усе ў машыну. Едзем!

Знішчэнне павільёна заняло ў хлопцаў не больш за дзве гадзіны. Горба дошак, цэглы і лістоў бляхі ўзвышалася на месцы славутай пабудовы. А паколькі да канца працоўнага дня заставалася яшчэ досыць часу, брыгадзір павёз будаўнікоў на іншы аб'ект, загадаўшы Пятру да канца дня адсарціраваць добрую цэглу ад бітай.

Крыху пасядзеўшы і пакурыўшы, хлопец узяўся за справу. Цэлую цэглу складаў роўнымі радочкамі, а бітую адкідаў убок. Хвілін праз дваццаць ён дабраўся да драўлянай падлогі. Адна з дошак была зламана, і пад ёй бачылася нешта металічнае. Пятро хуценька пааддзіраў яшчэ колькі масніц і ўбачыў нейкі люк з жалезным вечкам пасярэдзіне. Ад такой знаходкі хлопца ажно кінула ў пот. Трэба нешта тэрмінова рабіць. Можа, пазваць міліцыю ці пачакаць, пакуль вернецца брыгада? Ага, а калі там клад? Яго, Петрукоў, клад… Вось ён, сон у руку… Не, Пецька не дурань, спачатку сам усё агледзіць, а потым і вырашыць, што рабіць. Патрэбен толькі ліхтарык.

Закідаўшы ход смеццем, Іваноў хуценька злётаў да суседняга гандлёвага шапіка, набыў там танны кітайскі ліхтарык і, вярнуўшыся, рашуча пацягнуў за вечка. Люк з трэскам пачаў падымацца. Цвілая цагляная лесвіца вяла ў загадкавую цемру. Пятро цяжка ўздыхнуў і пакрочыў уніз…

Каля сямнаццаці гадзін да разбуранага павільёна пад'ехала машына з брыгадай будаўнікоў. Брыгадзір вылез з кабіны, скептычна агледзеў вынікі зробленай працы і зычна крыкнуў:

— Іваноў!

Не дачакаўшыся адказу, рушыў да развалін. За ім пацягнуліся астатнія. Убачыўшы адкрыты люк, брыгадзір пару разоў крыкнуў туды, але адказам была цішыня.

— Можа, палезем? — нерашуча прапанаваў нехта.

— Не, — адрэзаў брыгадзір, — трэба выклікаць міліцыю.

Праз якую гадзіну прыехала міліцэйская машына. Адтуль выйшлі два капітаны і сяржант з сабакам. Яны падышлі да люка, пасвяцілі ліхтарыкамі, і адзін з капітанаў павярнуўся да сяржанта:

— Ну, давай, Сцяпанаў, дзейнічай.

Сцяпанаў адчапіў павадок, злёгку хлопнуў сабаку па сцягне і скамандаваў:

— Рэкс, уперад!

Рэкс скочыў у цемру. І тут жа пачулася жаласнае скуголенне сабакі. Сяржант ужо быў кінуўся следам, але яго схапілі за руку:

— Чакай, Валера. Давай пакрысе…

Міліцыянеры зноў уключылі ліхтары і пачалі павольна спускацца па прыступках. Неўзабаве прамень высвеціў каменную падлогу, на якой ляжаў нейкі прадмет, падобны да бараны, з павернутымі даверху вострымі зубцамі. А на іх курчыўся ў лужыне крыві Рэкс. Далей былі бачны драўляныя, абабітыя металічнымі палосамі дзверы.

— Ну што, Барыс, трэба ісці далей? — вымавіў адзін з афіцэраў.

— Так, Саня, бо ёсць такая прафесія — ва ўсе дзіркі лазіць, — адказаў другі і павярнуўся да люка. — Сцяпанаў, вынось Рэкса і вязі ў ветлячэбніцу. Можа, што і зробяць. А мы далей.

Тоўстыя дзверы з агідным рыпеннем расчыніліся. За імі бачыўся невысокі, метры паўтара, умацаваны камянямі ход. Барыс зняў з планшэткі вузкі раменьчык, адзін канец яго ўзяў у левую руку, а другі даў напарніку.

— Гэта калі хто раптам праваліцца. Невядома, што яны тут яшчэ навыдумлялі, тампліеры няшчасныя… — патлумачыў Аляксандру і асцярожна рушыў па калідоры. З кожным крокам праход рабіўся ўсё больш нізкім. І вось ужо трэба было перасоўвацца літаральна на каленках. Але мужныя міліцыянты ўпарта цягнуліся наперад. Як раптам Аляксандра крыху хіснула ўбок, і ён абапёрся далоняй аб адну з цаглін на сцяне. І тут жа з жахам адчуў, што цэгла правалілася і рука натыкнулася на нейкі акруглы прадмет. Хутчэй інстынктыўна, чым свядома, ён адхапіў руку назад і ўбачыў, што трымае чалавечы чэрап.

— А-а-а! — міжволі зароў хлопец, выпусціўшы з рукі непрыемную знаходку.

— Ну і чаго verашчыш, як парсюк недарэзаны? — строга запытаў Барыс. — Што, чарапушак ніколі не бачыў?

— Ага, табе б такое… — пачаў апраўдвацца Аляксандр, стараючыся ўжо крочыць дакладна па слядах калегі. Нарэшце столь пачала падымацца ўгору, і ўжо крокаў праз дваццаць пінкертоны выбраліся ў вялікую мураваную залу, усю застаўленую вялізнымі, літраў на 500, драўлянымі бочкамі. Паміж бочак высіліся стэлажы, даверху застаўленыя цёмнымі бутэлькамі.

— Дык гэта ж кляштарная вінярня! — у захапленні прамармытаў Аляксандр.

— Ага, — пацвердзіў Барыс. — А вось і ахоўнікі ляжаць…

І ён кіўнуў на тры шкілеты, што акуратна ляжалі на пясчанай падлозе. І толькі чацвёрты быў у целе, у рабочай спяцоўцы — і нешта мармытаў сабе пад нос, радасна ўсміхаючыся.

— Здаецца, гэта і ёсць наша згуба, — прыгледзеўшыся, сказаў Аляксандр. — Але што здарылася з іншымі?

Барыс ужо корпаўся каля аднаго са шкілетаў. Ён асцярожна, узяўшы насоўкай, выцягнуў з-пад нагі (божухна, якая ж гэта нага?) нейкую тоўстую кнігу ў добра пацёртым скураным пераплёце. Гучна пачаў чытаць: «Аб уладзе і адзінстве царквы боскай. Пётра Скарга».

— Нішто сабе, — ён ажно прысвіснуў. — Сашка, ты разумееш, гэта ж канец шаснаццатага стагоддзя! Кніга славутага ўніята. Не дзіва, што гэты капуцын чытаў яе ў такіх скляпеннях, каб ніхто не пабачыў. Але, мусіць, перабраў з напоямі…

— А ты адкуль гэтага Скаргу ведаеш? Яго ў міліцэйскай школе не выкладаюць… Ці я нешта прапусціў?

— Не, — супакоіў Барыс сябра, — не прапусціў. Я ж да міліцыянства філфак скончыў. Ды я ж табе казаў калісьці. Памятаеш?

— Можа быць… — не зусім упэўнена адказаў Саня. — Ну а што з другім?

Барыс перайшоў да другога шкілета. Каля вялікагалёначнай косткі ляжала некалькі маленькіх манетак. Барыс падняў адну з іх і пачаў пільна разглядаць. Затым падняў галаву і голасам лектара ўрачыста абвясціў:

— Прыкладна сярэдзіна сямнаццатага стагоддзя! Вось адзін экю з выявай французскага караля Людовіка XIII. Менавіта такія манеты хадзілі ў той час у Еўропе.

— Гэта таксама цябе на філфаку навучылі? — ужо зусім збянтэжана запытаў напарнік.

— Не, — з усмешкай адказаў Барыс, — проста бацька быў нумізматам і шмат чаго мне расказваў пра старыя грошы.

— А як з трэцім у нас справы?

— Трэцяга ты і сам адолееш, дастаткова паглядзець на гэты экспанат, — і Барыс падняў з пяску пустую бутэльку, на якой выразна была выціснута лічба 1905.

Аляксандр стаяў у захапленні.

— Ну і як яны ўсе сюды з розных часоў трапілі?

— Я так мяркую, што гэтую вінярню францысканцы пабудавалі і напоўнілі, як толькі збудавалі свой касцёл. Зразумела, сюды і ход быў з касцёла. Ну, а як патрабаваў той час, былі зроблены і некалькі патаемных выхадаў з касцёла. Адзін з іх ішоў якраз праз вінярню. Капуцын, пэўна, адказваў за недатыкальнасць запасаў, куды, дарэчы, простым манахам уваход быў забаронены, дзе пад чарку і чытаў непатрэбныя кнігі. З нейкае прычыны ўваход з боку касцёла абваліўся. Бачыш тую гурбу камянёў? Пра другі ход ведаў, магчыма, мала хто. Ну вось той жа капуцын. Але здароўе аднойчы не вытрымала. А далей пайшло па ланцужку. Хтосьці знаходзіў выпадкова дарогу да гэтага багацця і заставаўся, ачмурэлы векавымі напоямі, тут назаўсёды. Ну а апошнім стаў наш сённяшні госць, які мірна сапе на пясочку.

— Крута, — працягнуў Саня. Потым на хвіліну задумаўся і нясмела прапанаваў: — Слухай, а давай пакаштуем гэтага віна. Што ж за смак у яго такі дзівосны, што людзі аддавалі жыццё?

— Ага, і прыйдуць па нас яшчэ праз пару вякоў. Не, Саня, давай лепш выбірацца адсюль, а віно… Ды халера яго бяры, гэтае віно… — з нейкай злосцю закончыў Барыс, ускінуў бязвольнае цела Пятра на плячо і рушыў да выхаду…

…Падзямелле было вырашана закансерваваць да лепшых часоў, калі з'явяцца грошы на яго даследаванне; уваход замуравалі, а зверху зрабілі асфальтавую дарожку, па якой і сёння гуляюць гарадзенцы.

## Выгадная прапанова

Калі гадзіннік на сцяне прабіў восем разоў, Ёсель Барухавіч Лапін з цяжкасцю падняўся з крэсла і рушыў да дзвярэй зачыняць сваю вінную лаўку. Але не паспеў ён дакрочыць і да сярэдзіны залы, як у памяшканне ўвайшоў элегантна апрануты барадаты мужчына гадоў трыццаці з медыцынскім саквояжам. Доўгія чорныя валасы з-пад капелюша даставалі яму ажно да плячэй.

— У нас ужо зачынена, — няветліва буркнуў Лапін.

Але такі тон зусім не збянтэжыў наведвальніка. Ён шырока ўсміхнуўся гаспадару, прыклаў руку да грудзей і нават крыху пакланіўся.

— Даруйце, шаноўны Ёсель Барухавіч, за мой позні візіт, але Бог сведка — я спяшаўся, як мог.

Такія паводзіны незнаёмца крыху змякчылі Лапіна, ён павярнуўся, зайшоў за прылавак і ўжо больш лагодна запытаў:

— Што будзеце купляць?

Але госць не спяшаў з адказам. Ён уважліва агледзеў лаўку, асартымент напояў, што стаялі на паліцах, потым падышоў да дзвярэй і зачыніў іх на засаўку.

— Што вы сабе дазваляеце? — абурана ўсклікнуў гаспадар лаўкі.

Незнаёмец тым часам вярнуўся да прылаўка, паставіў на яго саквояж, выцягнуў адтуль дзесяцірублёвую асігнацыю і паклаў перад Лапіным.

— Гэта, дарагі Ёсель Барухавіч, плата за дзесяць хвілін згубленага вамі часу. Можа, прысядзем?

Гаспадар недаверліва ўзяў грошы, агледзеў іх на святло. Чырвонец быў сапраўдны. Тады ён паказаў рукой на фіранку, што вісела на сцяне залы. За фіранкай быў невялічкі пакойчык з двума столікамі і чатырма крэсламі.

— Тут часам дэгустуюць пакупнікі мае напоі. Праходзьце, калі ласка.

Калі яны селі па розныя бакі стала, госць зноў прыязна ўсміхнуўся і пачаў гаворку.

— Мяне завуць Пятроў Пётр Пятровіч. Я ў пэўным сэнсе камерсант, і прыйсці да вас, Ёсель Барухавіч, парэкамендавалі мае знаёмыя, паколькі вядома, што вы чалавек сур'ёзны, разумны і досыць уплывовы ў Гародні.

Лапін моўчкі кіўнуў галавою.

— Дык вось, — працягваў Пятроў, — я хачу стаць вашым пастаўшчыком алкагольных напояў.

— Але ў мяне ёсць пастаўшчыкі, — запярэчыў гаспадар.

— Я ведаю, — пагадзіўся госць. — Але, Ёсель Барухавіч, вы ж умееце добра лічыць. Сабекошт вядра гарэлкі складае 45 капеек. Вам оптам прадаюць па чатыры рублі. Такім чынам цана павялічваецца амаль у дзесяць разоў. Вы ж у розніцу прадаяце па 12 рублёў. Але пасля аплаты акцызу ды іншых падаткаў у вас застаецца прыбытку два рублі з вядра. На бутэльках і таго менш. Па такой жа схеме працуюць і вашы канкурэнты. Я ўсё правільна адзначыў, шаноўны Ёсель Барухавіч?

— І што далей? — ужо больш зацікаўлена запытаў Лапін.

— А далей я прапаную купляць гарэлку ў вытворцаў па 50 капеек за вядро. І меці, такім чынам, з вядра 5 рублёў 50 капеек. Гэта дазволіць вам прадаваць гарэлку не

па 60 капеек за бутэльку, а па 40, а ў вашым тракціры на Саборнай браць за 100 грам не па 10 капеек, як вашыя калегі, а па 5 капеек. Праўда, ваш прыбытак зменшыцца з 5 рублёў 50 капеек да 4 рублёў, але за кошт уздыму попыту, бо браць гарэлку будуць выключна ў пана Лапіна, вы будзеце прадаваць за дзень не пяць вёдзер, а не менш за дзесяць. Уяўляеце, якія гэта грошы?

Лапін недаверліва ўсміхнуўся:

— Казка прыгожая, але які дурань будзе мне прадаваць гарэлку па 50 капеек?

— Я, — сціпла адказаў Пятроў.

— Вы? — здзіўлена перапытаў Лапін. — А ў вас што, ёсць свой бровар?

— А гэта ўжо выключна мой клопат, шаноўны Ёсель Барухавіч.

— Тады ў чым ваша выгода?

— З кожнага вядра вы, пан Лапін, будзеце мне аддаваць паўтара рублі. За арганізацыю справы.

— І што, мне застанецца толькі два пяцьдзясят? — ужо незадаволена канстатаваў гаспадар.

Пятроў толькі паківаў галавою:

— Яшчэ дваццаць хвілін назад вас задавальнялі і два рублі. А зараз два пяцьдзясят ужо мала… Але калі вы, дарагі мой чалавек, адкрыеце яшчэ пару кабакоў, дык зможаце рэалізоўваць і па трыццаць вёдзер на дзень. І колькі гэта будзе з абароту?

— А вы зможаце паставіць і трыццаць вёдзер на дзень?

— Так, — пацвердзіў Пётр Пятровіч, — змагу. Дарэчы, я чуў, што ў вас тут у будынку вялізныя скляпенні, якія цягнуцца ажно да брыгіцкага кляштара… Вось там і будзем складзіраваць гарэлку. А пастаўляць яе буду па начах, каб не хваляваць грамадскасць.

— Пятроў — гэта не сапраўднае вашае прозвішча? — нечакана пацікавіўся Лапін.

— Так, — пагадзіўся Пётр Пятровіч, — гэта творчы псеўданім.

— А з паліцыяй клопату не будзе?

— У паліцыі таксама ёсць нашы людзі. Але гэта, зноў жа, не ваш, Ёсель Барухавіч, клопат. За ўсё адказваю я.

— Тады па руках, — згадзіўся нарэшце Лапін.

— Цудоўна, — узрадаваўся Пятроў. — А цяпер раскажыце мне, калі ласка, пра асноўных вытворцаў алкаголю ў горадзе.

Самымі вядомымі вытворцамі алкагольнай прадукцыі ў Гародні былі тры жанчыны. Вінакурны завод Хаі-Леі Фішалеўны Яфэ знаходзіўся на Занёманскім Фарштаце, мясціўся ў драўляным аднапавярховым будынку і выпускаў хлебную гарэлку. У тым жа раёне працаваў піваварны завод № 69 Рахілі Лейбаўны Андрэс, на якім выраблялася вельмі папулярнае ў горадзе чорнае піва. Хана Сролеўна Круспадзіна валодала медаварным заводам, які спецыялізаваўся на алкагольных напоях з сырога мёду і патакі, паколькі на святы габрэям ужываць хлебную гарэлку было забаронена, а яны складалі палову насельніцтва горада.

І вось на кожнае з гэтых прадпрыемстваў у хуткім часе завіталі нейкія падазроныя людзі, якія захацелі купляць пэўную колькасць гатовай прадукцыі амаль па сабекошце. Жанчыны толькі пасмяяліся з гэтых нахабных прастакоў і з дапамогай работнікаў выкінулі іх на вуліцу. А ў ноч з пятніцы на суботу адначасова ў кожнай з

гаспадынь здарыўся пажар на прадпрыемстве. Дзякуй богу, гарэлі толькі гаспадарчыя пабудовы. Але ў панядзелак зноў з’явіліся гэтыя нахабныя людзі і папярэдзілі, што неўзабаве загарацца і самі заводы, а з блізкімі могуць адбыцца непрыемныя здарэнні. І барані божа звяртацца ў паліцыю, бо гэта будзе як падпісаць сабе смяротны прысуд.

Першай не вытрымала Хая-Лея Фішалеўна, якая паставіла свой подпіс пад дамовай аб штотыднёвым продажы трыццаці вёдзер хлебнай гарэлкі па 45 капеек пану Пятрову Пятру Пятровічу. А калі незнаёмыя аднаго вечара спынілі на вуліцы сына Ханы Сролеўны і зламалі яму руку, пайшлі на саступкі і астатнія прадпрымальніцы.

Як і было дамоўлена, у нядзелю ўвечары да будынка «баторыеўкі», дзе месціўся вінны магазін Лапіна, пад’ехалі чатыры крытыя вазы. Нейкія цёмныя постаці хуценька пачалі закатваць бочкі з алкаголем у выкладзеныя пальчаткай (старажытнай цэглай ручной работы) старадаўнія скляпенні. За іх працай уважліва назіралі Ёсель Барухавіч і Пётр Пятровіч. Калі бочкі занялі свае месца, рабочыя заклалі ўваход пальчаткай і пайшлі на выхад.

— Гэта наш запас, — патлумачыў Пятроў. — Перыядычна будзем яго папаўняць. А яшчэ два вазы зараз прывязуць тавар для магазіна і ў ваш тракцір на продаж. Справа, шаноўны Ёсель Барухавіч, пайшла.

І ён радасна рассмяяўся. Лапін толькі паціснуў плячыма:

— Як гэта вы робіце? Не разумею.

— А вам і не трэба, — весела адказаў Пятроў. — Ваша справа — гандаль. Ну і грошы мне перыядычна адлічваць.

Старшы следчы сыскнога аддзялення Аляксандр Паўлавіч Казырын любіў пасля працы завітаць на гадзінку ў тракцір Давіда Пельцара, які месціўся на Сабornай вуліцы, выпіць келіх «белагалоўкі», прыкусіць вэнджаным вугром, перакінуцца словам з гаваркім гаспадаром. Тракцір быў папулярным у гараджан, і ўсе столікі амаль заўсёды запаўняліся. Але гэтым разам больш за палову залы пуставала. Аляксандра Паўлавіча правялі да яго любімага століка ў дальнім куце пад пальмай, а праз хвіліну сам гаспадар прынёс традыцыйны заказ.

— А што гэта ў вас сёння пуста? — пацікавіўся следчы.

— Дык ужо каторы дзень пуста, — сумна ўздыхнуў Давід. — Нават сталыя кліенты перабеглі да Лапіна.

— І чым гэты Лапін іх прыцягнуў?

— Коштамі на алкаголь. У яго ўсё значна таннейшае за наша.

— Дык і вы б скінулі цану, — параіў Казырын.

— Калі скінуць да Лапінскай, дык я ўвогуле нічога не зараблю.

— А як тады выжывае Лапін?

— А вось гэтага ніхто не ведае. Але калі так пойдзе далей, дык ва ўсёй Гародні толькі Лапін і будзе гандляваць... — Пельцар у адчаі махнуў рукой і пайшоў за стойку.

У панядзелак на працоўным пасяджэнні Казырын расказаў калегам пра размову з Пельцарам. І ўсе ўспомнілі пра серыю пажараў на вінакурных заводах у горадзе. Начальнік аддзялення Іван Арыстархавіч Горын зацікавіўся такім супадзеннем і

накіраваў Казырына паразмаўляць з гаспадынямі заводаў на прадмет якіх-небудзь нечаканых канфліктаў, няпрошаных візіцёраў. Аляксандр Паўлавіч доўга прыкідваў, як лепей правесці гэтыя сустрэчы, і нарэшце запрасіў кабет у тракцір Пельцара ў сярэдзіне дня. Зараней папярэджаны Давід накрыў стол у асобнай зале, дзе неўзабаве і размясціліся Хая-Лея Фішалеўна Яфэ, Рахіль Лейбаўна Андрэс, Хана Сролеўна Крусподзіна, Аляксандр Паўлавіч Казырын і сам гаспадар Давід Майсеевіч Пельцар.

— Спадарыні, — пачаў размову следчы, — як вы думаеце: калі ўсе тракціры горада прадаюць гарэлку па 10 капеек, а нехта адзін па 5, то гэта сведчыць аб чым?

— Хутчэй за ўсё, што апошні або набыў яе танней у вытворцы, або поўны дурань, — тут жа адказала Рахіль.

— Адкінем версію пра дурня, — працягваў Казырын. — І тады ўзнікае новае пытанне: што гэта за такі вытворца, што прадае гарэлку па сабекошце?

У адказ было маўчанне.

— У якім выпадку чалавек можа аддаць сваю маёмасць задарма і пры гэтым нікому нічога не казаць? — зноў запытаў следчы.

— Я думаю, — уступіў у размову Пельцар, — калі моцна запалохалі і нешта пагражае жыццю.

— І з гэтым нельга не пагадзіцца, — кіўнуў галавой Аляксандр Паўлавіч. — Але калі ўвесь час маўчаць, нахабнікі будуць яшчэ больш сваволіць і нарэшце прыбяруць усю справу да сваіх рук. Гэта магчыма, спадарыні?

І тут не вытрымала Яфэ.

— Кабеты, — звярнулася яна да таварышак, — праўду кажа пан следчы: яны нас так проста не пакінуць, пакуль не пусцяць па свеце з торбай. Вы як сабе хочаце, а я маўчаць не буду…

Калі начальнік сыска прачытаў паказанні жанчын, адразу ж аддаў загад на вобыск магазіна Лапіна.

— І дабіцеся, Аляксандр Паўлавіч, прызнання, дзе хаваецца гэты Пятроў. Лапін — дробны выканаўца. А тут вялікая рыба ходзіць. Вось хто нам патрэбны.

Але Лапін нічога сказаць не змог, паколькі ляжаў з перарэзаным горлам за сваім прылаўкам. Ні жонка Сара Барысаўна, ні сын Мендал Ёселевіч нікога не бачылі, нічога не ведалі пра справы мужа і бацькі. Вобыск таксама нічога не даў. Так, у тракціры знайшлі бочку гарэлкі з кляймом дома Яфэ, але што з таго? Спускаліся ў піўніцу пад магазінам. Квадратнае памяшканне, абкладзенае цэглай, было амаль пустым: пару скрынь з гарэлкай і півам, нейкія старыя рэчы, газоўка — вось і ўсе знаходкі

— Хтосьці Пятрова папярэдзіў, — выказаў думку начальнік. — І мяркую, гэты хтосьці з нашых.

— Іван Арыстархавіч, я чуў, што пад магазінам Лапіна вялізныя падземныя хады, а мы ніводнага не знайшлі. Можа, ёсць сэнс пашукаць там схованку? — выказаў меркаванне Казырын.

— Праблема ў тым, паважаны Аляксандр Паўлавіч, што мы нават не ведаем, дзе шукаць. Ну не біць жа ўсе сцены. Даказаць віну Лапіна мы не можам, паколькі апроч здагадак нічога не маем. Дом пераходзіць ва ўладанне да сына Лапіна, і ён мае права падаць на нас у суд за знішчэнне маёмасці. Вось каб знайсці Пятрова… Хаця я

ўпэўнены, што ён хутка заявіць пра сябе. Але па-сапраўднаму мяне хвалюе «пацук» у нашых шэрагах, якім Пятроў, упэўнены, яшчэ скарыстаецца.

А тым часам сам Пятроў сядзеў у суседнім кабінеце з шыльдай на дзвярах «Следчы Гапонік Станіслаў Вітольдавіч», паставіўшы ногі на саквояж з парыком, барадой і вусамі, і вельмі ўважліва чытаў даведку Міністэрства фінансаў аб стане спраў на тытунёвай фабрыцы Лейбы Шарашэўскага ў Гродне…



## ВІКТАР ВАРАНЕЦ

нарадзіўся 18 красавіка 1962 года ў Гродне. Скончыў філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (1985). Працуе ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Аўтар 14 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, шэрагу артыкулаў па пытаннях беларускай медыцынскай тэрміналогіі. Выдаў «Русско-белорусский медицинский словарь» (2005), «Руска-беларускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў» (2012), «Дыялектны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў Беларусі», «Руска-беларускі слоўнік-даведнік лекавых раслін» (2018), «Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі» (2021, у суаўтарстве). Неаднаразова быў лаўрэатам літаратурных конкурсаў газеты «Звязда». Кіраўнік універсітэцкага літаб’яднання «Катарсіс», рэдактар чатырох літаратурных зборнікаў сяброў клуба. Аўтар зборніка паэзіі і прозы «Рамізнік». Жыве ў Гродне.

УЛАДЗІМІР ВАСЬКО

## Авечка

Гэта было ў Карэліі, даўно, задоўга да развалу Савецкага Саюза. Салдаты-навабранцы пастроіліся ў калідоры казармы на вячэрнюю паверку. Тут у асноўным былі беларусы, некалькі хлопцаў з Расіі, два з Украіны, тры з Грузіі, адзін з Эстоніі.

Сяржант, стараслужачы, Фёдараў па спіску выклікáў кожнага.

— Радавы Дурнеў.

— Я.

Па шарэнгах прайшоўся лёгкі смяшок.

— Смяяцца ў страі забаронена! — строга папярэдзіў сяржант і працягваў далей: — Радавы Шастак.

— Тут два Шастакі, — азваўся з шэрагаў салдат. — Які?

— Леанід.

— Я.

— Сяргей Шастак.

— Я.

— Радавы Авечка.

— Я.

— Дык Авечка не радавы, а радавая, — выкінуў рэпліку Дурнеў.

— Хто сказаў? Выйсці са строю!

Дурнеў выйшаў і стаў перад навабранцамі.

— Чатыры нарады без чаргі! — гучна абвясціў сяржант Фёдараў.

— Дык авечка жаночага роду, — апраўдваўся Дурнеў.

— Пяць нарадаў без чаргі. З заўтрашняга дня пойдзеш на кухню абіраць бульбу. Станавіся ў строй.

Фёдараў акінуў позіркам салдат, глянуў у спісак і працягваў:

— Радавы Бабёр.

— Не Бабёр, а Бобер, — паправіў навабранец сяржанта.

— Добра пастаўлю націск на «о». Радавы Казёл.

— Я.

— Радавы Рабакабыла.

— Я.

— Дык не радавы, а радавая, — зноў не ўтрымаўся Дурнеў. — Усё ж такі кабыла…

Фёдараў зноў выклікаў са строю Дурнева і сказаў:

— Адбудзеш нарады на кухні — і на тыдзень пойдзеш на гаўптвахту.

Дурнеў яшчэ не ведаў, што адбываць чатыры нарады на кухні — гэта пакута. Патрэбна было ноччу, у сырым, халодным памяшканні ўручную абіраць бульбу. Вочы зліпаюцца, хочацца спаць, а перад носам гара бульбы, і да пяці гадзін раніцы яе патрэбна ababраць. Вядома, тут бываюць і салдаты, што ў чарговым нарадзе, але яны суткі адбылі — і ў казарму, а ты застаешся на чатыры суткі. Цяжка. Вельмі цяжка. А гаўптвахта яшчэ больш горкая пілюля…

Радавы Багдзель замест «Я» выкрыкнуў «Прысутнічаю!», аднак сяржант Фёдараў не пакараў яго, а толькі папярэдзіў усіх:

— Адказваць не «ёсць», не «прысутнічаю», а «я». «Я» і толькі «я».

За месяц нас усё-ткі абламалі, навучылі, як трымаць язык за зубамі ў страі, не пярэчыць камандзірам і на ўсе загады толькі казаць: «Слухаюся!»

Авечка ж хутчэй за іншых засвоіў воінскую навуку, і неўзабаве яго здымак з’явіўся на Дошцы гонару ў ленінскім пакоі, крыху пазней яму прысвоілі званне яфрэйтара — і служба пайшла даволі гладка.

Адзін выпадак увогуле вывеў яго на шырокую дарогу славы. Ён нёс неяк караульную службу на аэрадроме. Праходжваўся з аўтаматам туды-сюды, акідваў пільным позіркам самалёты, прастору вакол іх, недалёкі лес, скалы. І раптам прыкмеціў, як нехта амаль непрыкметны з кустоў фатаграфуе аэрадром. Гэта выклікала падазрэнне. «Затрымаць», — мільганула думка ў свядомасці яфрэйтара. Авечка зрабіў выгляд, што нічога не бачыў, не пазіраў у той бок, а схаваўся за самалёты, прайшоўся далей, абмінуў вялізную скалу і праз кусты цішком, крадучыся, як ліса, прабіраўся да таго месца, дзе знаходзіўся фатограф. Заставалася некалькі метраў, як той азірнуўся і ўстрапянуўся.

— Стой! Страляць буду! — моцна выкрыкнуў Авечка, трымаючы напагатове аўтамат.

Для незнаёмца стала зразумелым, што ўцячы немагчыма: гэты малады яфрэйтар выпусціць па ім чаргу. Ступіўшы яшчэ з два крокі, Авечка загадаў:

— Ідзі прама на аэрадром. А я за табою. Найменшы рух управа ці ўлева — адразу секану з аўтамата.

Незнаёмец ужо, мабыць, не думаў, як уцячы, а планаваў, як апраўдацца, бо фатаграфаваць ваенныя аб’екты забаронена. Ён ішоў роўна… А на аэрадроме стаялі рэактыўныя самалёты першага пакалення — вось, напэўна, што яго цікавіла.

Раніца была хмурнаватай, палёты яшчэ не пачыналіся. «Ды і наогул ці будуць яны сёння», — прыкінуў Авечка.

Але ваеннаслужачыя ўжо мітусіліся. Яны, мабыць, не прыступілі яшчэ да выканання сваіх службовых абавязкаў, аднак былі на месцы.

«Куды яго весці? — азадачыў сам сябе яфрэйтар. — А, паганю прама ў штаб да камандзіра лётнага палка».

Некалькі дзяжурных афіцэраў дапамаглі Авечку ў яго намеры. І вось незнаёмы фатограф прадстаў перад палкоўнікам Нікіфаравым.

— У чым ён правінаваціўся? — спытаў палкоўнік Авечку.

— Фатаграфаваў нашы самалёты.

— Ах так!..

Нікіфараў выклікаў афіцэра з асабовага аддзела, начальніка штаба і яшчэ некалькі службовых асоб. Калі яны з’явіліся ў кабінеце, ён сказаў яфрэйтару Авечку:

— Працягвайце несці службу. А з дастаўленым фатографам мы разбяромся.

Фатографа арыштавалі, наладзілі допыт, праявілі плёнку — аказалася, што гэта быў сапраўдны амерыканскі шпіён.

Палкоўнік Нікіфараў прыкінуў: «Усё ж неяк патрэбна заахвоціць Авечку. І як гэты выпадак пакінуць без увагі?»

Праз паўмесяца ён выклікаў у свой кабінет камандзіра роты радыёрэлейных механікаў маёра Ломцева і яфрэйтара Авечку.

— Што вы можаце, маёр, сказаць пра свайго воіна? — звярнуўся камандзір палка да Ломцева.

— Толькі ўсё самае добрае. Ён выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі, смелы, дысцыплінаваны, вынослівы. Яго здымак змешчаны на Дошцы гонару.

— Мы прысвоім яму званне сяржанта і пашлём хадайніцтва ў Міністэрства абароны аб прысваенні яму звання Героя Савецкага Саюза. Як вы, маёр, гледзіце на гэта?

— Я толькі за, — адказаў Ломцеў.

— Але ёсць адна няўвязка, — працягваў Нікіфараў, — прозвішча… Ну як будзе гучаць «Герой Савецкага Саюза Авечка»?

— Можа, паставіць Баран? — ці то з гумарам, ці то сур’ёзна прапанаваў Авечка.

— Дык гэта ж амаль адно і тое ж — Баран ці Авечка, — павысіў голас камандзір палка. — Давай напішам Баранаў. Герой Савецкага Саюза сяржант Баранаў. Гучыць? Гучыць.

— Пішыце, — адказаў Авечка.

— Патрэбна змяніць прозвішча тады і ў ваенным білеце, — настойваў на сваім Нікіфараў.

— Мяняйце.

Так і зрабілі.

Званне Героя Савецкага Саюза сяржанту Баранаву было прысвоена. Яго назначылі камандзірам аддзялення. У палку толькі і гаварылі пра пільнасць і мужнасць гэтага няўрымслівага воіна, яго кемлівасць.

На вячэрняй паверцы, калі Фёдараў (які ўжо насіў пагоны старшыны) выклікаў па спіску «Герой Савецкага Саюза сяржант Баранаў», ніхто ўжо не хіхікаў. Усе з павагай і зайздрасцю пазіралі ў бок Баранава і маўчалі.

…А радавыя Дурнеў, Казёл і Рабакабыла сваіх прозвішчаў не мянялі…

## Дрэкс

Адкуль ён прыехаў у Астравец — толкам ніхто і не ведаў: адным ён казаў, што з Масквы, другім — што з Віцебска, трэцім — што з Вільнюса. Ад яго настырна праўды і не дамагаліся: можна і без яе спакойна пражыць на свеце. Галоўнае, што прыехаў, не абмінуў вядомы гарадскі пасёлак.

Уладкаваўся ж Альберт Васільевіч Цімафееў выкладчыкам нямецкай мовы ў сярэдняй школе з музычным ухілам. Ён хутка знайшоў агульную мову з настаўнікамі і вучнямі, не спрачаўся са школьным начальствам, умеў вытрушваць з разумовых кішэняў лёгкі, натуральны гумар, хораша смяяўся. У размове ўжываў і рускія, і беларускія, і польскія, і нямецкія, і літоўскія словы. Усё залежала ад таго, з кім уступаў у гутарку. Дрэнна, да прыкладу, вучань адказваў на ўроку — Альберт Васільевіч казаў:

— Дрэкс!

Старшакласнікі пачалі дамагацца, што абазначае гэтае слова. Ён патлумачыў: што па-беларуску «дрэнна», то па-літоўску «дрэкс». Цімафееў раскідваўся гэтым словам

не толькі ў абыходжанні з вучнямі і настаўнікамі, але і на вуліцы са знаёмымі, якіх хутка нажыў, і ў лазні, калі ў парылцы выпадала слабаватая пара.

Аднойчы дзесяцікласніца Таня Валодзька, прыйшоўшы са школы дахаты, пахвалілася бацьку:

— Мне сёння Дрэкс паставіў «пяцёрку» па нямецкай мове.

— Што за Дрэкс? — насцярожыўся бацька.

— Гэта наш новы настаўнік.

— Як яго зваць?

— Альберт Васільевіч.

— Так і казала б: Альберт Васільевіч, а то Дрэкс.

— А яго ўсе так называюць у школе.

— Усе няхай называюць, а ты кажы па-добраму. Бо даведаецца — зноў будзеш цягаць «двойкі» дадому. Як удалося зарабіць «пяцёрку»?

— Ну я сяк-так адказвала на ўроку, а як толькі Альберт Васільевіч нахіліўся над школьным журналам ставіць адзнаку, я пацалавала яго ў шчочку — і Альберт Васільевіч уляпіў мне «пяцёрку».

— Глядзі, дзеўка…

Услед за Таняю расшчодрыліся на буські і астатнія дзесяцікласніцы. Цімафееў толькі паспяваў падстаўляць шчочку. Ацэньваючы веды дзяўчат, ён ужо не вымаўляў слова «дрэкс», а моўчкі ставіў у журнал і дзённікі «пяцёркі».

Шумок пайшоў у асяроддзі юнакоў. А Юрка Зазноба, як найбольш смелы сярод іх, вазьмі і скажы:

— Альберт Васільевіч, чаму вы дзяўчатам ставіце толькі «пяцёркі», а нам «двойкі», «тройкі», «чацвёркі»?

— Бо яны лепей за вас адказваюць.

— Ведаем, як яны адказваюць…

Неаб’ектыўнасць у ацэньванні ведаў вучняў дайшла да дырэктара школы Захарчука. Той праглядзеў класны журнал і паклікаў у свой кабінет Цімафеева.

— Нешта дзяўчаты ў дзясятым класе займаюцца на «выдатна», а хлопцы горш.

— Вучаніцы, сапраўды, больш старанныя.

— Яны, мабыць, закахаліся ў вас і падцягнуліся ў вучобе…

— Гэтага я не ведаю.

— Пастарайцеся аб’ектыўна ацэньваць веды. Інакш мы можам прагрымець на ўвесь раён.

Натацыя дырэктара трошкі паўздзейнічала на Цімафеева — і ён паціхеньку пачаў заніжаць адзнакі дзесяцікласніцам. Аднак бывала і такое: Альберт Васільевіч наважыцца паставіць Таньцы Валодзька «тройку», але гляне на яе прыгожы тварык, лагодную ўсмешку — і рука міжвольна выводзіць «5».

Хадзіў Цімафееў неяк сцішана, бы кот, крадучыся да мышы. А кватараваў у адзінокай жанчыны Міхайлаўны, якая жыла ў драўляным доме па вуліцы Кастрычніцкай. Тут ён таксама праяўляў своеасаблівыя дзівацтвы. Бывала, правяраючы сшыткі ці пішучы планы работы на наступны дзень, засядзіцца да поўначы, пасля спахопіцца:

— Альберт Васільевіч, дрэкс працаваць па начах. Пара спаць.

Падыходзіць да ложка, становіцца па стойцы смірна і камандуе:

— Радавы Цімафееў, адбой!

Брык у ложак — драцяная сетка заскрыпіць, прагнецца разам з матрацам да самай падлогі, Дрэкс, паўседзячы, апусціць рукі па швах і прыкінецца, што спіць. Так праляжыць некалькі хвілін, пасля паварушыцца і сам сабе кажа:

— Радавы Цімафееў, ты забыўся раздзецца. Пад'ём!

Трымаючыся рукамі за раму, да якой прымацавана сетка, паднімецца, скіне пінжак, штаны, шкарпэткі, зноў стане па стойцы смірна і выкрыкне:

— Радавы Цімафееў, адбой!

Рэзка кінецца ў ложак. Як заўсёды, нудна заскрыпіць і прагнецца да самай падлогі сетка, Дрэкс нацягне на тулава коўдру і прымушае сябе спаць. Але ў пакой, у якім жыве Цімафееў, увойдзе гаспадыня дома Міхайлаўна і скажа:

— Альберт Васільевіч, ваш чай, мусіць, астыў. Давайце я пагрэю.

— Дрэкс піць гарачы чай. Я люблю халодны.

— То папіце перад сном хоць халоднага.

— Зараз…

Цімафееў варухнецца, але пры Міхайлаўне ўжо не падае сам сабе каманды «Пад'ём!», а ціхенька вылезе са свайго «карыта» і прысядзе за стол.

— Можа, пячэння даць?

— Абыдзецца і так…

Дрэкс пап'е халоднага чаю, вытра рукою вусны і сам сабе напомніць:

— Радавы Цімафееў, не забудзь на гэты раз выключыць святло.

— Не забуду.

Бывае, што перад самай апошняй камандай Альберт Васільевіч сам сябе павысіць у званні.

Стаіўшыся за сценкай, Міхайлаўна чуе:

— Сяржант Цімафееў, колькі разоў можна паўтараць. Адбой!

— Слухаюся.

І ў пакоі да самай раніцы ўсталёўваецца жаданая для гаспадыні цішыня.

За паўгода Дрэкс у Астраўцы стаў вядомай асобай. Яго прымала любая кампанія, бо сумна з ім не было ніколі. Парыльшчыкі ў мясцовай лазні пад час прысутнасці Альберта Васільевіча часта надрывалі пупкі ад смеху. Там Дрэкс галіўся: леваю рукою абмацваў поўсць на твары, а правай збрываў.

— Як гэта ты ўсляпую голішся? — пыталі мужчыны.

— А я заўсёды так. Люстэркам не карыстаюся і дома.

— І грудзі, і плечы, і рукі, і ногі ў цябе, як у малпы, зараслі поўсцю.

— Бо я пайшоў ад малпы. Яшчэ Дарвін пісаў, што малпа паступова ператварылася ў чалавека. Але для гэтага патрэбны быў працяглы перыяд, напружаная праца. Жыццё — адны пераўтварэнні.

— А чаму ў Гродзенскім заапарку малпа сядзіць у клетцы шмат гадоў, — акліткнуўся з верхняй паліцы Іван Дудук, — а ў чалавека не пераўтвараецца? Альбо я… працую ў хлебапякарні больш як трэць века, а малпаю не раблюся. Вучэнне Дарвіна — дрэкс. На практыцы яно не пацвярджаецца.

— Вы не разумееце, што такое эвалюцыя, — разышоўся Альберт Васільевіч, — яна цягнецца тысячагоддзямі.

— Я не сказаў бы, — не здаваўся ўсё той жа Дудук. — Вунь Ленін зрабіў эвалюцыю ў Піцеры за адзін дзень.

— То ж не эвалюцыя, а рэвалюцыя. Гэта дзве абсалютна розныя рэчы. Не блытайце боб з гарохам. Рэвалюцыя адбываецца гвалтоўным шляхам і параўнаўча хутка праходзіць, а эвалюцыя — мірным і, бывае, працягваецца, як я казаў, тысячы, а можа і мільёны гадоў.

— А што лепш? — не ўтрываў на ніжняй паліцы муляр з будаўнічага ўпраўлення Раман Бусел.

— І ў тым, і ў другім, — даводзіў да парыльшчыкаў Альберт Васільевіч, — ёсць свае плюсы і мінусы. Пры рэвалюцыі праліваецца шмат крыві, а эвалюцыя праходзіць бяскроўна, але марудна.

— А я лічу, — закругліў Бусел, — што і рэвалюцыя, і эвалюцыя — дрэкс. Найлепей, калі ўсё развіваецца само па сабе.

— От, — уклініў у размову слова шафёр з нарыхтоўчай канторы Сяргей Нічыпар, — улезлі ў нейкую філасофію. Трэба мяняць пласцінку. Альберт Васільевіч, што рабіць, каб быць здаровым?

— Я мяркую, што неабходна паводзіць сябе, як дзікун, а харчавацца не карэннямі, а сучаснай ядою. Я, калі жыў у Вільнюсе, прыкідваючыся дзікуном, аблазіў пешшу ўсю Літву, а харчаваўся варанай каўбасой, якой на той час там хапала ўдосталь. Адчуваў сябе выдатна.

— І колькі ж жонак вы пакінулі ў Літве? — зноў пераключыў размову на новую тэму Нічыпар.

— Ні адной. Я і цяпер халасцяк. Мне сорак два гады, а ніяк не магу натрапіць на сваю.

— Хлопцы, тэрмінова трэба жаніць Альберта Васільевіча.

— Няхай бярэ Паліну Міхасёву. Жыве яна па вуліцы Кастрычніцкай, у апошнім доме, пры лесе. Там для дзікуноў поўнае раздолле.

— Як яна выглядае? — пацікавіўся Цімафееў.

— Ну, ходзіць такая з распушчанымі па плячах валасамі. Зашыешся носам у густую прычоску — не захочацца па начах выкрыкваць «Радавы Цімафееў, адбой!».

Альберт Васільевіч насцярожыўся: «Адкуль яны ведаюць, што я агучваю такія словы? Ці не Міхайлаўна ім перадала? Але ліха з імі. А за Палінаю трэба пасачыць...»

Праз некалькі дзён Дрэкс сустрэў у пачатку вуліцы Кастрычніцкай дзяўчыну з распушчанымі валасамі па плячах і падумаў, што гэта Паліна, але набівацца ў знаёмства не палез: яна яму не вельмі спадабалася.

А ў жніўні Альберт Васільевіч зусім перастаў з'яўляцца ў лазні. Парыльшчыкі запанікавалі.

— А дзе ж Дрэкс? — стукнуўшы венікам па плячах, спытаў Іван Дудук.

— Я бачыў дырэктара школы, — адказаў Сяргей Нічыпар. — Сказаў, што Альберт Васільевіч паехаў на Чукотку. Там, маўляў, больш рамантыкі. Можна непадалёку ад берага ўбачыць кашалота, на льдзіне белага мядзведзя. У Астраўцы ж Цімафееву стала сумна...

— Шкада, — уздыхнулі мужчыны. — Такі быў арыгінальны, займальны чалавек. А можа, яшчэ вернецца?..

## Рабы

Да прадаўшчыцы сельмага ў вёсцы Гаманы Мівы заляцаліся адначасова трактарыст Лупік і вадзіцель грузавой аўтамашыны Рабы. Рабы і на самай справе быў трошкі рабаваты, ці, па-руску кажучы, канапаты. Лупік жа высокі (каля двух метраў), стройны. Праўда, на свой рост крыху вузкаваты ў плячах. Рабы ж даставаў яму галавою толькі да падпахі.

Яны амаль штодзень у вольную хвіліну забягалі ў сельмаг. Міва — ні даць ні ўзяць лялька Барбара, з блакітнымі вачыма і русявымі валасамі — аднолькава шчыра ўсміхалася ім і абаіх культурна абслугоўвала.

Лупік, калі яго не прыспешвала работа, узяўшы пакупку, іншы раз затрымліваўся і спрабаваў паразмаўляць з Міваю.

— Учора, — неяк казаў ён, — ідучы дахаты, трапіў пад дождж і намачыў шапку. Павесіў на плот сушыцца — дык вераб'і яе падзяўбалі…

— Спачуваю, — хіхікнула Міва.

— Як ты думаеш, ці пойдзе сёння дождж? — спытаў ён яшчэ.

— Не ведаю. Я ж не сіноптык.

— Хоць каб не было.

— Я таксама за сонечную пагоду.

І яшчэ ён сказаў:

— Раніцай праязджаў каля твайго магазіна і згубіў недзе гайку ад трактара. Ты не знаходзіла яе?

— Не, не бачыла…

— Шкада…

Рабы выступаў больш па-дзелавому:

— Не надакучыла табе яшчэ гандляваць у гэтым магазіне?

— А чаго? Мне тут добра.

— Можа, пераехала б у горад?

— А бацькі? На каго я іх пакіну?

— Яно то і ў вёсцы можна жыць. Вунь у Бердаўцы будуюць аграгарадок. Кажуць, маладажонам будуць выдзяляць кватэры.

Напачатку Міва нічога не падазравала, аднак з цягам часу прыкмеціла, што Лупік і Рабы клююць на яе, і стала больш уважліва прыглядацца да абаіх. Асаблівай ганьбы Лупіку яна не давала: рослы, не брыдкі на твар, спраўна водзіць трактар… Толькі вось гэтыя плоскія размовы пра вераб'ёў, гайкі, пагоду… «Ці вытрымаю я іх? — думала Міва. — Ну а Рабы? Гэты як гаворыць — здаецца, гладзіць па сэрцы».

У Гаманах моладзі станавілася ўсё менш, але клуба пакуль што не зачынялі на замок. Сюды прыходзілі хлопцы і дзяўчаты з суседніх вёсак, і чалавек дваццаць збіралася. Лупік, які найчасцей запрашаў патанцаваць Міву, канечне, вылучаўся сярод іншых. Аднойчы, нахіліўшыся, ён ціха шапнуў ёй на вушка:

— Міва, выходзь за мяне замуж.

— Ах, Божа! Не чакала я такой прапановы.

— Не пашкадуеш…

— Падумаю.

У той жа вечар Рабы, якому ўдалося толькі адзін раз запрасіць на танец Міву, ласкава паглядзеў ёй у вочы і шчыра прамовіў:

— Міва, як закончацца танцы, прыходзь пад тую тоўстую дзікую грушу, што расце за вёскай. Я там буду цябе чакаць.

— Пагляджу…

Лупік скоса зірнуў на Рабога і, мусіць, раўнуючы, выразам твару хацеў яму пагразіць, але дзяўчына, з якой ён танцаваў, загаманіла:

— Мабыць, хутка закончацца танцы. Бачыш, гарманіст стаміўся.

І Лупік перавёў позірк на гарманіста. Хутка той сапраўды скінуў рамяні з плячэй, зашпіліў мяхі на вузенькую дзяжку — і гэта азначала, што пара разыходзіцца.

Рабы першым выйшаў з клуба, за ім яшчэ некалькі чалавек і Міва. Міва азірнулася, убачыла, як перастаўляе на прыступках уніз свае «мыліцы» Лупік, і драпанула, баючыся, што ўвяжацца праводзіць яе дахаты.

А Рабы, прамінуўшы свой дом, пайшоў пад грушу. Ён там то таптаўся на месцы, то хадзіў вакол дрэва, пазіраючы ў бок вёскі, чакаючы, ці хутка пакажацца ў начным сутонні Міва. Паводле яго меркаванняў, яна трошкі марудзіла. І ён перажываў. Ды неўзабаве дзявочая постаць у белай сукенцы мільганула на выхадзе з вуліцы і пачала прыбліжацца.

— Зачакаўся? — спачувальна прамовіла Міва.

— Хваляваўся. Думаў, не прыйдзеш…

— Я не абяцала, але падумала: ходзіш там адзін… І рашыла сустрэцца.

Ён пяшчотна абняў яе за плечы і прытуліў да сябе. Нейкі час слухалі толькі біццё сваіх сэрцаў.

— Якая цішыня, які месяц, — расчуліўся Рабы. — Усе ўжо, напэўна, леглі спаць, і толькі мы тут…

Але ўдалечыні, па дарозе ў Белундзі, загучала песня:

Усе сяброўкі па парах  
У цішы разышліся,  
Толькі я ў гэты вечар  
Засталася адна…

— А ты не адна, — пахваліў Рабы Міву, — ты са мною. Як тут добра! Эх, каб такім было ўсё жыццё!

Міва разрахманілася, пахарашэла ў месячным ззянні. Яны між жыта прайшліся палявой дарогай. Роснае жыта спала. Не чуваць было ніводнага гуку. Зноў вярнуліся пад грушу.

— Міва, — загаварыў Рабы, — давай злучым свае лёсы.

— Пабачым…

— Ці ты закахалася ў Лупіка?

— Не-е…

А на ўсходзе ўжо абазначылася ранішняе майскае святло.

— Пара дадому, — занепакоілася Міва.

— Пайшлі.

Ён узяў яе за руку, правёў да веснічкаў, на развітанне прамовіў:

— Падумай над маёй прапановай.

— Пастараюся.

А па вёсцы тым часам папаўзлі чуткі, што да Мівы падбіваюць кліны два хлопцы — Рабы і Лупік — і яна не ведае, каму аддаць перавагу. Дайшлі тыя чуткі да бацькоў Мівы. Яны ўпотай абмеркавалі набеглую сітуацыю. Бацька рашуча стаяў на баку Лупіка, а маці знаходзілася ў разгубленасці.

Аднойчы, калі Міва, крыху стомленая і задуменная, вярнулася з работы, бацька спытаў:

— За каго ты збіраешся выходзіць замуж — за Лупіка ці за Рабога?

— За Рабога, — рашуча адрэзала Міва.

— Дык ён жа не дастане лямпачку ўкруціць у патрон пад столлю.

— Нічога, стане на табурэтку. А што мне з гэтай сталюгі, які толькі і гаворыць, што яго шапку падзяўбалі вераб'і…

— Дзе гэта было?

— У магазіне. Пры людзях.

— Запомні, дочка, — раззлаваўся бацька, — пойдзеш за Рабога — людзі будуць паказваць пальцам і казаць: «Вунь пайшла свіння рабая».

— А за Лупіка пайду — будуць казаць: «Вунь пайшла каза лупатая».

— Няхай выходзіць за каго хоча, — не змаўчала маці. — Канечне, лепш было б, каб выйшла замуж за інтэлігента. Але дзе ты яго ў глухой вёсцы возьмеш? А гэтыя абое замазаныя…

Неяк у нядзелю, пад абед, прыцёгся ў хату Мівы Лупік. (Міва была ў магазіне.) Бацька расшчодрыўся і паставіў на стол бутэльку першаку, а маці, каб не ўдарыць тварам у гразь, нарэзала і падала на сподачках скрыдлікі каўбасы і сала.

Размаўлялі на розныя тэмы: пра людзей, пра тэхніку, пра заробкі ў калгасе. У маці ад такіх размоў аж вушы вялі. Добра захмялеўшы, Лупік падступіўся да асабістага:

— У вас здатная дочка. От каб ажаніцца з ёй…

— А хто табе забараняе?! — ажывіўся бацька. — Хоць сёння бяры яе замуж.

Лупік узбадзёрыўся. Ён толькі гэтага і чакаў.

— За такім мужам, я думаю, што не прападзе, — яшчэ больш прыбавіў настрою госцю гаспадар хаты.

Калі ж скончылася застолле, бацька Мівы правёў Лупіка за вароты і моцна пацiснуў яму руку.

А ў наступную нядзелю набраўся смеласці пераступіць парог Мівінай хаты Рабы. (Мівы таксама не было дома.) Не паспеў Рабы на кухні раскрыць рот, як бацька ўхапіў яго за каршэнь і, як ката, выкінуў з хаты.

Млосна стала на душы ў Рабога. Ён будаваў такія раскошныя асабістыя планы — і на табе. І што цяпер казаць? І куды ісці? Ён пайшоў дадому і, каб адцягнуць увагу ад таго, што і як з ім толькі што ўчынілі, узяў вудачку і падаўся да Бердаўскага возера. Платва клявала, але ён яе адчапляў і кідаў назад у ваду: шкадаваў. «Не, — спахапіўся ў думках Рабы, — пайду да Мівы і пагутару з ёю. Што яна нарадзіць?»

Ён склаў вудачку і пашыбаваў у Гаманы. Абмінуў сваю хату і — у магазін. Міва была на месцы. Адзін толькі пакупнік, стары дзядзька, круціўся каля прылаўка. Але і ён хутка паклаў у цэлафанавы пакет буханку хлеба і выйшаў за парог.

— Міва, — расчаравана прамовіў Рабы, — мяне твой бацька толькі што выкінуў з хаты…

— Ах, божа! За што?

— Ну, мусіць, каб не рыпаўся жаніцца з табой. А Лупік хваліцца людзям, што яго прынялі гасцінна… Напаілі і накармілі.

— Што цяпер рабіць?

— Не ведаю. Прыйшоў да цябе параіцца.

— А давай куды-небудзь уцячом з гэтага цёмнага балота.

— Куды?

— Можа, у цябе ёсць які знаёмы? Звяжыся з ім, распытай пра ўсё: пра жыллё, пра работу — і махнём.

— У Магілёўскай вобласці, у вёсцы Сташына, жыве мой добры сябра Дзіма Пуйдак. Мы з ім разам служылі ў арміі. Ён там працуе аграномам.

— Ну вось і напішы яму ці патэлефануй. Пасля будзем рашаць.

Абрадаваны такой пазіцыяй Мівы, Рабы ў гэты ж дзень па мабільніку звязаўся з Дзімам.

— Прыязджайце, — сказаў той, — для вас будзе і работа, і кватэра. Я гэта ведаю дакладна.

Аднак яны не спяшаліся, спакойна ўзважылі ўсе плюсы і мінусы, падалі заявы на звальненне, атрымалі зарплату, разліковыя — і паехалі. Перад ад'ездам Міва сказала маці, куды едуць і дзеля чаго. Маці расчулілася:

— Можа, не едзь, дачанька. Пры сваіх людзях лепш, а там усе чужыя. Ці скажы хоць бацьку пра гэта.

— Ён не пусціць мяне. Мы едзем туды, каб пажаніцца. Доўга не будзем. Праз паўгода якога вернемся дадому. Не перажывай. А тату сама скажы, куды мы паехалі і чаго.

Рабы ж са сваімі бацькамі падзяліўся ўсімі сакрэтамі — і яны не пярэчылі рашучасці сына: Міва ім падабалася.

На новым месцы ў саўгасе «Сташынскі» абстаноўка маладой пары прыйшлася да душы. Рабы ўладкаваўся вадзіцелем самазвала, Міва пачала працаваць у бухгалтэрыі гаспадаркі. Яны там пажаніліся, ім выдзелілі кватэру ў двухпавярховым катэджы — і ўсё пайшло добра.

Бацька ж Мівы, калі дачуўся ад жонкі, што Рабы звёз іх дачку ў Магілёўскую вобласць, моцна раззлаваўся:

— Пайду да старога Рабога! Я яму павырываю сівыя вусы! Гэта ж трэба, каб нейкі недакурак украў маю дачку!..

— Не хадзі, — пачала ўпрошваць жонка. — Не блытай карты. Можа, у нашай Мівы лёс такі…

Вінцук стукнуў кулаком па стале, гаркнуў:

— Гэта ты ва ўсім вінаватая! Займаешся папусціцельствам!

Аднак да Рабых Вінцук не пайшоў і спакваля супакоіўся.

А ў Сташыне праз паўгода ў абед неяк парупілася Міва:

— Можа, паедзем дадому, Лёня? Хочацца ўсё-такі быць бліжэй да бацькоў. Перажываюць за нас…

— Няёмка перад Пуйдаком, — адказаў муж, — як-ніяк, ён для нас стварыў усе ўмовы, а мы дамо драла. Давай хоць пару месяцаў яшчэ пабудзем.

— Ну… пару можна, — пагадзілася Міва, — а больш не.

— Бацька твой зноў будзе наскокваць на мяне…

— Не будзе. Ён хутка загараецца і хутка астывае. А маме ты ўвогуле падабаешся. Так што не хвалюйся.

Праз восем месяцаў Рабы з Міваю пераехалі жыць на Лідчыну, у Бердаўку. Іх тут таксама забяспечылі жыллём і работай: яму, як і раней, даручылі вадзіць грузавік, а Міва ўладкавалася прадаўцом у сельскі магазін. Маладажоны былі задаволены жыццём.

…Ну а Лупік? Што Лупік? Лупік больш мокрай шапкі на плот не вывешвае…

## Злодзей

У нашым двары катоў трохі больш, чым сабак. І жывуць яны параўнаўча не горш, чым у гады перабудовы. Жанчыны ці дзяўчаты, праходзячы збоч іх, стараюцца адшчыкнуць ім ліварнай, крывяной альбо варанай каўбасы, некалькі дробных кавалачкаў іншай яды — і кінуць на траву ці пакласці на тратуар. Мужчыны ў гэтых адносінах больш скупыя: яны, акрамя недакурка, нічога лепшага прапанаваць катам не могуць.

Праўда, у двары ёсць нямала і штатных даглядальшчыц гэтых бяскрыўдных мяўкаючых жывёлін. Хоць бы ўзяць Валянціну Дарафееўну, пенсіянерку, у мінулым настаўніцу біялогіі. Жыве яна на чацвёртым паверсе, але яшчэ, як матылька, лётае ўгору-ўніз — і заўсёды прыносіць пачастунак катам. Тры разы на дзень корміць іх: ранкам, у абед і пад вечар. І корміць не абы-чым, а вяндлінай, балыком, паляндвіцай.

Грошай у Валянціны Дарафееўны хапае. Яна нікому фінансавай дапамогі не аказвае, бо адзіны сын, палкоўнік у адстаўцы, жыве ў Мінску, атрымлівае вялікую пенсію, сам не ведае, куды дзяваць грошы. Адзення ў былой настаўніцы таксама горы — яго хоць выкідай на вуліцу. Застаецца толькі купляць прадукты для сябе і для катоў.

Яна свае шчодрасці ні ад кога і не хавае. Калі адзін раз да кацінай сталовай падышоў нехта Багас, таксама пенсіянер, былы сантэхнік завода «Лідсельмаш», Валянціна Дарафееўна расказала і паказала яму, чым і як харчуюцца яе каты. Той акінуў позіркам сталовую і ўбачыў, што на цагляным выступе з падвала сапраўды стаяць тры талерачкі, запоўненыя мяснымі прадуктамі. Багас нават пазайздросціў катам з нагоды іх такога шыкоўнага харчавання.

— Ці даеш ты ім хоць вады? — спытаў ён.

— Дык вунь жа ўнізе стаіць слоічак з вадою. Паядуць, пап’юць — што яшчэ трэба?

— Няблага ўладкаваліся…

Сам Багас жыве ў суседнім пад’ездзе, на трэцім паверсе, і таксама ўтрымлівае кошку, але на двор яе не выпускае: баіцца, каб не навяла ў кватэру кацянят. Са свае слабенькай пенсіі ён, Багас, такую араву не пракорміць. А кот Валянціны Дарафееўны ходзіць у агульным статку і харчуецца з агульнай кухні, дадому прыходзіць толькі начаваць — і то не заўсёды.

Стоячы аднаго разу на балконе і назіраючы, як Валянціна Дарафееўна выкладвае катам на абед чарговыя порцыі пачастункаў, Багас падумаў: «А чым я горшы за катоў, што яны харчуюцца лепш, чым я?» І спантанна рашыў абкрадаць катоў.

А Валянціна Дарафееўна не заўсёды стаіць пры кармушцы. Яна іншы раз пакладзе правіянт — і адпраўляецца ў сваё жытло. І тут Багас спаўна выкарыстоўвае ўдалы момант: ён хапае цэлафанавы мяшок, збягае ўніз, засыпае прысмакі — і шусь у пад'езд. У кватэры дзеліцца прысмакамі з коткай — ёй менш, сабе больш. А дваровыя галодныя каты прыходзяць да кармушкі і голасна мяўкаюць: няма чаго есці. Тады Валянціна Дарафееўна высоўваецца на балкон, пазірае ўніз і думае: «Няўжо вам мала? Столькі ўсяго наклала — а вы яшчэ просіце». Яна зноў нарэзвае мясных прадуктаў і выносіць на двор.

Два разы запар абкрадваць катоў Багас не рашаецца: а раптам здагадаецца… Ён пачаў хітрыць: калі-нікалі не ўвесь забірае правіянт, а толькі частку — каты не так галосяць. Увогуле, усё ішло да пары-да часу даволі ўдала: мінуў месяц, а Валянціна Дарафееўна на злодзея знянацку ні разу не наляцела.

Але ж чалавеку заўсёды ўсяго мала — і Багас вырашыў пашырыць свой бізнес, даследаваў суседнія двары. Ды марна: там катам на зямлю выкідвалі ў асноўным крывянку, ліверку і курыныя косткі. Да таго ж нямала набягала і супернікаў — бадзячых сабак, якія апераджалі яго, — і Багас вярнуўся ў свае ўладанні.

Каб стварыць хоць які запас грошай, ён пачаў абкрадваць дваровых катоў на поўную моц: адбіраў у іх прадукты і раніцай, і ў абед, і вечарам. Мяўкалы пачалі худзець, папрашайнічаць — і ў Валянціны Дарафееўны запульсавала падазрэнне. Яна апытвала людзей са свайго дома: можа, хто бачыў зладзеяў, але на першым паверсе размешчаны магазіны, аптэка, і ніхто нічога не мог убачыць, на верхніх паверхах таксама не знайшлося дасведчаных. А вось вокны дома, што насупраць, акурат выходзяць на кацiную кармушку, і з іх усё добра відаць. І адна знаёмая Валянціны Дарафееўны сказала, што Багас часта круціцца каля кармушкі. «Але я думала, — удакладніла знаёмая, — што ён падкармлівае катоў, бо заўсёды стаіць спінаю да нас».

Валянціна Дарафееўна наладзіла сачэнне. На гэты раз яна паклала катам прадуктаў больш, чым у звычайны дзень, сама подбегам — на чацвёрты паверх і праз залу — шмыг на балкон. Стаілася і чакае. І вось рыпнулі дзверы ў суседнім пад'ездзе, на пляцоўцы паказаўся Багас. Ён хуценька спусціўся з прыступкаў уніз, дайшоў да кармушкі — і давай з талерчын высыпаць у цэлафанавы мяшэчак яе прадукты.

— Злодзей! — крыкнула Валянціна Дарафееўна.

Багас атарапеў. Ён не ведаў, ці высыпаць кавалачкі мяса назад у сподкі, ці ўцякаць з імі ў свой пад'езд. Рашыў высыпаць.

— І як табе не сорамна адбіраць у катоў яду?! Пажылы мужчына, а чым займаешся…

У адказ ён нічога не сказаў, а толькі скруціў дулю і рэзка пасануў яе ўгору, на балкон. Гэта дарэшты раззлавала Валянціну Дарафееўну. Яна вярнулася ў залу і, аналізуючы абстаноўку, дастала з шуфляды чысты ліст паперы, узяла аўтаручку і напісала заяву на імя старшага суддзі горада Піліпчыка. Унізе пазначыла нумар свайго дамашняга тэлефона.

Праз тыдзень Піліпчык пазваніў і запрасіў прыйсці ў яго кабінет — неадкладна. Валянціна Дарафееўна замітусілася, на хуткую руку адзела што з лепшага — і ў дарогу. Мінут праз пятнаццаць была ў кабінеце суддзі.

— Ну вось што, — сказаў Піліпчык, — я ўважліва прачытаў вашу заяву і не магу нічым абрадаваць. Разумееце, у Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь няма такога артыкула, які прадугледжваў бы пакаранне за абкраданне катоў. Калі б гэты самы Багас краў прадукты, скажам, у магазіне, на рынку ў людзей ці на мясакамбінаце альбо як-небудзь прабраўся б у вашу кватэру і апустошыў бы халадзільнік, то тут ад турмы яму не ўдалося б выкруціцца. А ў дадзеным выпадку…

— Але ж прадукты мае́, — запярэчыла Валянціна Дарафееўна.

— Пакуль былі ў вас, лічыліся вашымі. А як толькі вы іх аддалі катам, яны ўжо сталі кацінай уласнасцю. А артыкула аб крадзяжы прадуктаў у катоў у кодэксе няма. Суд нават не мае права аштрафаваць Багаса, бо гэта было б незаконным. Мы ж кіруемся толькі законам. Прабачце, іншага я нічога не магу прыдумаць.

— Як мне тады адпомсціць Багасу за крадзеж?

— Стварыце вакол яго ў двары абстаноўку нецярпімасці. Расказвайце людзям пра яго несумленныя ўчынкі, схільнасці да абкрадання катоў… Няхай жыльцы вашага і суседняга дамоў пасмяюцца з Багаса. Можа, гэта падзейнічае на яго?..

Валянціна Дарафееўна так і рабіла, аднак непакараны Багас нічога не ведаў пра яе захады і як абкрадаў катоў, так і абкрадвае, толькі ўжо больш асцярожнічае…

Некалькі разоў былая настаўніца запеленгавала былога сантэхніка ў час крадзяжу і патэлефанавала Піліпчыку, каб той зрабіў Багасу якое ўнушэнне, напалохаў бы турмой ці што… Праўда, Піліпчык выклікаў Багаса да сябе на гутарку і строга спытаў:

— Навошта ты крадзеш балык у дваровых катоў?

— Першы раз чую.

— Валянціна Дарафееўна казала.

— Гэтая Валянціна Дарафееўна — першая пляткарка ў нашым мікраараёне. Яна расказвае ўсім, што Зэлік Іваноў ходзіць да Мількі Панасовай у дом, што насупраць нашага, а Мілка, у сваю чаргу, ходзіць у наш дом да Шуркі Бузука. А гэта няпраўда.

— Што няпраўда?

— Ну што Зэлік ходзіць туды, а Мілка прыходзіць сюды.

— Чым яна яшчэ займаецца?

— Хто «яна»? Мілка?

— Ды не, Валянціна Дарафееўна.

— Бывае, калі-нікалі корміць катоў. Але дае ім толькі падгарэлыя на патэльні свіныя скуркі. Каб не прахожыя людзі, гэтыя каты даўно паздыхалі б…

— І ўсё?

— Не… Бывае яшчэ, па гадзіне чытае катам лекцыю, каб не сядалі на лаўкі, каб не лазілі на дрэвы, каб уцякалі ад сабак. Яна думае, што каты разумеюць яе. А яны проста стаяць, пазіраюць ёй у вочы і чакаюць, каб дала чаго-небудзь паесці. А яна іх словамі корміць…

— Чорт з вамі разбярэцца і з вашымі катамі. Вон адсюль!!!

МІХАСЬ ЗІЗЮК

## Скачок з парашутам

*Аповесць*

1

Паўсюль адчувалася дыханне вясны. Жаўтлява-белымі бруднымі плямамі яшчэ сям-там высвечваўся пад сонцам снег, з раніцы яшчэ хрупалі пад абцасамі коўзкія ледзяшы, яшчэ адыходзілі ад доўгай зімовай стыласці маўклівыя высозныя таполі ў парку, але звонкі веснавы покліч нельга было не заўважыць. На ўзбоччы жвавай куп-кай развалтузіліся вераб'і, усчаўшы гвалт-сварку з-за нейкай драбязы, крыху далей, за паркавай агароджай, рыхтык вартавыя, па мокрай траве важна пахаджвалі чорныя гракі; вось, весела шчабечучы, прайшлі з непакрытай галавой дзяўчынкі-падлеткі. І само паветра несла пахі цяпла, вільготнай свежасці — яго хацелася не проста ўдыхаць, а напоўніцу спатольваць гукамі і водарам вясны свае грудзі, чэрпаць з яго жыццёвую сілу ў чаканні абуджэння прыроды, прыходу нечага новага для сябе.

Аліна з задавальненнем лашчыла твар пад казытлівымі сонечнымі праменямі, загадкава мружылася, нібы гуллівая сакавіцкая котка, ніяк не выдаючы, што яна кудысьці збіраецца ехаць, кудысьці спяшаецца, хоць абставіны і прыспешвалі. Незразумелае прадчуванне нечага незвычайнага ўжо каторы дзень млява варушылася ў душы, хвалявала сэрца і думкі, прымушала з радасцю чакаць надыход кожнай новай раніцы.

Вясна, што й казаць. Вясна абуджае не толькі прыроду, але і чалавека, які з'яўляецца крэўнай часцінкай прыроды, часцінкай Бога.

Яна адпрасілася ў дырэктара школы на дзве гадзіны, паабяцаўшы не спазніцца. Заўтра дачцэ Карыне восем. Малая не можа дачакацца таго дня — яны з мужам паабяцалі купіць малой на дзень народзінаў недарагі смартфон. Раней выбрацца неяк не выпадала: то з грашыма нявыкрутка, то справы не адпускалі. І вось купіла, афарміла — гара з плеч. У райцэнтр даехала рэйсавым аўтобусам, а вось назад прыходзіцца на папутцы — болей аўтобусаў на сёння не было. Аграгарадок Зарэчнае знаходзіцца ў трынаццаці кіламетрах ад горада, дарога, што крывою стужкай ідзе праз вёску, злучае два суседнія райцэнтры, таму машын не бракуе. Каля звычайнай прадуктовай крамы на вуліцы Леніна, дзе стаяла Аліна, лавілі папутку ўсе, каму трэба было трапіць у Зарэчнае і дзве меншыя спадарожныя вёскі. Але сёння, як на тое, яна ніяк не магла ўзбіцца на машыну. Хто праязджаў, нават не павярнуўшы галаву, некаторыя збочвалі на суседнюю вуліцу, што ўпіралася ў будынак МНС. Аліна вя́ла ўзмахвала рукою — ёй пачало здавацца, што сёння яна не даедзе да вёскі, а за спазненне атрымае вымову ад Ганны Пятроўны. Нічога, перажыве, сёння чамусьці так не хочацца ў школу, дзе зноў адно і тое ж: планы, канспекты, вучні, графікі, сшыткі, праверкі. Дырэктар год як на пенсіі, але пакуль працуе. Увогуле, з ёю добра: спакойная, памяркоўная, асабліва не заядае. Як вопытны адміністратар, адно дзяўбе за паперы: каб ва ўсіх вучэбных і выхаваўчых планах, якіх развялі столькі, што

не пасляваеш пісаць, камар носу не падтачыў. Так і бягуць дні, тыдні, месяцы, ужо і гады ў бясконцых клопатах. Няўжо вось так, як у зачараваным коле, праляціць і ўсё жыццё? Як падумаеш, сківіцы зводзіць ад нуды. Але думкі няспынна беглі, ляцелі, закалыхвалі.

Таму, калі каля яе рэзка прытармазіў белы бус, Аліна нават здрыганулася ад нечаканасці. Прыадчынілася шкло, прыемны мужчынскі голас запрасіў:

— Сядайце, падкіну вас да школы.

— Адкуль вы ведаеце, дзе я працую? — здзівілася Аліна.

— Сядайце, сядайце, — усміхнуўся мужчына, — я ведаю.

Аліна села, выцягнула з сумачкі мабільны тэлефон. Заставалася сямнаццаць хвілін да пачатку ўрока. Павінна паспець, бо школа пры дарозе, на цэнтральнай вуліцы. З палёгкаю ўздыхнула, крадком глянула на кіроўцу. Здаецца, раней не бачыла яго. Тады адкуль ён ведае яе? Мабыць, недзе ў школе бачыў. Як бы звычайная знешнасць: шатэн, гадоў каля трыццаці, хударлявы, падцягнуты, правільныя рысы твару, нос крыху з гарбінкай, даволі прывабны. Як сказала б яе лепшая сяброўка, настаўніца англійскай Віка — красунчык. Адзначыла для сябе чамусьці, што жанаты — заручальны пярсцёнак выразна пабліскваў на безыменным пальцы. Яшчэ б, такі ды каб не жанаты. Выглядае, бы нечым усхваляваны — вунь, як вуснамі муляе, пальцамі нервова перабірае. Зрэшты, яе гэта не павінна цікавіць. Выпадковая сустрэча.

— Гадаеце, адкуль я вас ведаю? — кіроўца прыпыніў яе блытаныя думкі, што гурмою пранесліся ў галаве.

— Не зусім так, — шчыра прызналася яна, — але тое і сапраўды цікава.

— А вы не вельмі ўважлівы чалавек, — усміхнуўся мужчына. — Усё банальна проста. Я ж працаваў у вас дома год таму. Не, крыху болей. Зіма, а ў доме холадна. Памятаеце?

Памяць спрацавала і бліскавічна перанесла яе ў той час. Тады сапсаваўся газавы кацёл, Віктар псіхаваў, ніяк не мог знайсці майстра, які змог бы прыехаць і пагледзець. Па нейкай аб'яве адшукаў усё ж. Майстар сказаў, што адрамантаваць нельга, патрэбен новы кацёл. Чалавек тады сам стэлефанаваўся з Мінскам, дамовіўся пра дастаўку, прывёз, нешта там рэзаў, свідраваў, круціў, але назаўтра цяпло пайшло ў радыятары. Яна асабліва не лезла ў мужчынскія справы, не глядзела, хто там і што робіць, — сваіх клопатаў хапала. А ён не забыў.

— Так, цяпер так, — усміхнулася і Аліна. — Дарэчы, дзякуй, усё працуе файна.

— Калі ласка. А я вас добра памятаю.

Ён зірнуў Аліне ў вочы. Яна хацела спытаць, чаму ж ён яе запомніў, але ў тое ж імгненне знiякавела. Было штосьці такое ў яго вачах, у паглядзе, што прымусіла яе знямець. Усе словы выскачылі з галавы, а мову адняло — як бы хто ўвамкнуў выключальнік. Ці то сум, ці то туга, ці то радасць, ці то надзея, а мо і ўсё разам свяцілася ў ягоным позірку з такою неверагоднай шчырасцю, любоўю, што ў яе, здавалася, спынілася сэрца: тук, пасля доўгі перапынак, затым зноў тук-тук. Гэты позірк укрыў яе, як накрывае чалавека акіянская хваля — з галавою, калі дыханне перацінаецца і не хапае паветра. Гэта быў імгненны шок, як удар токам. Туман гэтак жа імгненна рассеяўся, замест яго пачало нараджацца штосьці новае. Новае пачуццё, якога яна ніколі раней яшчэ не зведвала, але яно было такое радаснае, такое салодкае, такое

ўсёабдымнае і хвалюючае, што яна разгубілася. І не магла ўцяміць, што з ёю адбываецца ў гэтыя хвіліны. Што за гіпноз такі?

— Вось мы і прыехалі. Школа, — з сумнай ноткай у голасе абвясціў мужчына. — А мы ж так і не пазнаёміліся. Мяне зваць Андрэем.

— Вельмі прыемна, — як не сваімі вуснамі адказала яна. — Аліна. Дзякуй, што падвезлі.

Яна схапіла сумачку, пакет са смартфонам і выслізнула з машыны. Бус паехаў. Яна яшчэ нейкі час стаяла, глядзела, аж пакуль аўтамабіль не схаваўся за пагоркам. Пасля схамянулася, войкнула і паспяшала ў школу.

2

Сёння ў яго быў выклік у суседні раён. Будзённая справа. Займаецца абслугоўваннем і рамонтам газавых катлоў ужо не першы год, хоць атрымаў некалі зусім іншую спецыяльнасць — адвучыўся ў Гародні на агранома. Паступіў, бо бацькі разлічвалі прабіць яму цёплую пасаду ў райвыканкаме, тата загадваў там аддзелам адукацыі. Так яно і склалася. Але да кабінетнай работы, тым больш да аграноміі, яго не цягнула. Пасля памёр ад інфаркту тата, ён адрабіў свой тэрмін ды кінуў нялюбы занятак. Яшчэ пакуль праціраў нагавіцы ў кабінеце, завочна скончыў інстытут па тэхнічнай спецыяльнасці, папрацаваў два гады ў прыватніка і адкрыў сваё прадпрымальніцтва.

Зыркае сакавіцкае сонца падбаўляла бадзёрасці, не хацелася думаць пра дрэннае. Сёння ў чарговы раз пасварыўся з жонкаю. Што далей рабіць? Не клеіцца ў іх апошнім часам, а па праўдзе, дык і даўнавата. Са Святланаю вучыліся ў адным класе, нічога такога, падобнага на каханне ці нават адносіны, паміж імі не было. Пасля школы яна падалася вучыцца на медсястру, ён на агранома. Вярнуўся ў родны горад, пайшоў праходзіць медыцынскі агляд, у паліклініцы шляхі аднакласнікаў збегліся. Неяк інакш зірнуў на яе, сталі сустракацца. Хутка Святлана зацяжарала. Ён не стаў адбрыквацца, падумаў — лёс: яна горнецца да яго, яму таксама падабаецца. А каханне? А што каханне — прыдумкі паэтаў, салодкія казачкі для падлеткаў.

Сыну хутка дзесяць, а сямейнае жыццё нагадвае нейкі дрэнны серыял: спрэчкі, прымірэнні, сваркі. Света пасля родаў набрала лішнія кілаграмы, пасля яшчэ больш паправілася. А яму гэта не падабалася. Далей — болей. У галаве адно грошы, новыя ўборы, строі — у шафах ужо месца вольнага бракуе. Лічыць сябе беззаганнай. Усё цяжэй ім знаходзіць агульную мову.

Каля крамы заўважыў стройную маладую жанчыну ў светла-рудым паліто — яна нейк нерашуча, як баязліва, уздымала руку. Чаму б і не падвезці? Як толькі спыніўся, зірнуў, адразу ж у пот кінула — яна. Памыліцца не можа. Колькі часу мінула, а яна стрэмкаю сядзіць у сэрцы.

— Сядайце.

Села, маўчыць, штосьці глянула ў тэлефоне. Мабыць, спяшаецца ў сваю школу. Яго не пазнала, вядома.

Ён жа добра памятае той дзень, калі ўпершыню ўбачыў яе. Новы кацёл ён прывёз у другой палове дня. Гаспадар быў на працы, дома засталіся жонка і дзеці — дзяўчынка гадоў сямі-васьмі і хлопчык гадоў чатырох-пяці. Гаспадыня зайшла, глянула на

яго, павіталася і села ў суседнім пакоі за нейкія сшыткі. Яго як варам абдало. Усяго адзін позірк, адно імгненне, а свет змяніўся непазнавальна. Ён не зразумеў нават, што гэта было.

Праца супакоіла, ён толькі спадцішка паглядваў на маладую жанчыну. Што ў ёй такога незвычайнага? Як бы нічога, адно вочы сінія, бяздонныя, гэта ў іх ён згінуў. Андрэй хадзіў па пакоях, нібыта глядзеў, як працуе ацяпленне, а насамрэч дзеля таго, каб зірнуць на яе. Усё ў ёй заварожвала: пастава, вочы, валасы, твар, нават рукі як вытанчаныя — само хараство, чароўная кветка ў зімовым садзе. Цікава, як яе зваць? Яму хацелася, каб Эсмеральдай, хоць тое, канешне, і нерэальна. А ёй пасавала б такое імя: казачна-чароўнае гучанне.

Ён скончыў позна, а дзявятай. Якраз вярнуўся гаспадар, усё праверыў, застаўся задаволены і разлічыўся. Андрэй употай зірнуў на гаспадыню. На душы ляжаў невымоўны цяжар, не было жадання вяртацца дахаты. У дарозе спыніўся на аўтобусным прыпынку, заглушыў рухавік, заплюшчыў вочы. Яна не знікае, ажывае ў памяці: вось схілілася над сшыткамі, вось наморшчыла лобік, вось яна ідзе на кухню, вось штосьці гаворыць дзецям. Паўсюль яна. Што з ім, чаму ён думае пра яе, чаму шчыміць у грудзях? Мабыць, прыйшло тое пачуццё, у якое ён не верыў, якога не ставала ім са Светаю. І што цяпер рабіць? Паехаць назад, пасунуць мужа і сказаць ёй: вы мне спадабаліся, давайце пазнаёмімся? Смешна самому. Не, ён дарослы мужчына, не варта напружвацца, міне час — пачуццё сплыве дымам, забудзецца.

З жонкаю ўсё было інакш. Яна спадабалася тады, у кабінеце: маладая, прыгожая, ласкавая. Сустрэліся, пасля першы інтым, абаім было добра. Здавалася, гэтага хопіць для сямейнага жыцця. Нават калі пачаліся сваркі, ён спісваў гэта на Светчын характар, на тое, што яна проста не разумее яго. Усе сварацца, усе мірацца. Таму мужчыны і каханак сабе заводзяць. Але ён не быў бабахотам і не шукаў прыгод на баку. Па-першае, ніхто з дзяўчат не вярэдзіў сэрца, не займаў думкі; па-другое, не было жадання пастаянна хлусіць, маніць, круціцца, што ўюн на патэльні. Тым больш што Света яму не здраджвала. Але апошнім часам усё часцей стаў задумвацца: ці не паспяшаўся тады, калі прапанаваў Свеце ажаніцца? Мо і ёсць сэнс у показцы: не памогуць і чары, калі хто не да пары.

Сённяшняя нечаканая сустрэча як гром на ясным небе. У люстэрка бачыў, што яна глядзела ўслед. Цікава, чаму? І чаму так хуценька выскачыла з буса, чаму так змянілася ў твары? Але ж і дурань ён, не спытаў нумар тэлефона. А што, калі невыпадкова сустрэліся яны? І вось, цяпер, калі яна сама села да яго, упусціў свой шанц. Калі і адшыла, то было б лягчэй: кахае мужа, усё, няма на што спадзявацца. Жыві з гэтым.

Праз нейкі час спыніўся каля добраўпарадкаванай сядзібы. Андрэй агледзеў кацёл, хутка высветліў няспраўнасць, заняўся рамонтам. Была якраз і патрэбная дэталь. На ўсё пайшло каля трох гадзін. Андрэй аформіў гарантыйны акт, пералічыў грошы, пажадаў гаспадару добрага дня, сабраў інструмент, сеў у машыну. На сёння больш выклікаў няма, можна ехаць дахаты. Але ўзгадаў ранішнюю сварку са Светаю, ехаць у сваю кватэру расхацелася. Хіба спачатку завітаць да мамы: перакýсіць, адпачне крыху, і яна будзе радая. У гэты момант зацілімкаў мабільны тэлефон. Ён адразу ж палез у кішэню, але праз імгненне спыніўся. На пасажырскім месцы засвяціўся экран чужога тэлефона, гукі ішлі адтуль.

3

Урок Аліна правяла як у тумане. Штосьці расказвала, апытвала дзяцей, тлумачыла матэрыял, але, як толькі ён скончыўся, не змагла ўзгадаць, пра што гаварыла і каго апытвала. Празвінеў званок, дзеці хуценька пакінулі клас. Яна села, паспрабавала ўзяць сябе ў рукі, асэнсаваць тое, што з ёю адбываецца. Якім такім дарам валодае гэты Андрэй, што парушыў спакойны і прадказальны лад жыцця, выбіў яе з раўнавагі за імгненне? Усяго толькі гадзіну назад яна нічога пра яго не ведала, нават і не думала, а цяпер ён, яго ўсмешка, вочы, вусны — усё гэта не пакідае яе. Ды не, глупства нейкае, проста выкінуць усё з галавы. Ёй хутка трыццаць, дома дзеці, розныя хатнія клопаты чакаюць, праца ў школе. Выветрыцца, забудзецца. З такімі намерамі яна рашуча паднялася, пайшла ў настаўніцкую. У яе невялікая фортка, можна за гэты час праверыць учарашні дыктант.

Яна паклала сшыткі на стол, але ўзгадала, што абяцала патэлефанаваць Віктару, калі набудзе падарунак дачцэ. Спяшалася на папутку, а потым забылася. Яна палезла ў сумачку і пахаладзела: свайго тэлефона няма. Вытрасла на стол змесціва сумкі: няма. Ад хвалявання аж рукі затрэсліся. Села, стала думаць, дзе і як магла згубіць, і ледзь не ўскрыкнула. Апошні раз тэлефон яна трымала ў бусе, потым паклала яго побач з сабою. Так, дакладна памятае. Трэба тэлефанаваць.

— Віка, дай тэлефон. Уяўляеш, якая я разява — забыла ў папутцы тэлефон, гэтак спяшалася.

— Калі ласка, — каляжанка працягнула свой смартфон. — Мабыць, невыпадкова. А хто ён? Красунчык, багаты, крутая машына. Так?

— Кінь ты вярзці глупства. Давай ужо…

Аліна набрала нумар. Гудкі ішлі, але ніхто не адказваў. Дзе ж ён, гэты Андрэй, чаму не падымае? Дзе цяпер яго шукаць?

Застаўшыся ў адзіноце ў настаўніцкай, Аліна крыху супакоілася. Села за сшыткі, але злавіла сябе на тым, што вочы адно слізгаюць па радках, не паглыбляючыся ў сэнс напісанага. Не, так дыктант не праверыш, трэба сабрацца. Але ў памяці ўсё роўна ажываў Андрэй. Вочы. Усмешка. Штосьці ўсё такое роднае, толькі даўно забытае.

Яна слаба памятае тату. Бацькі разышліся, калі ёй ішоў шосты годзік. Вось тата ўсміхаецца, цалуе яе, гладзіць, пасля закідвае сабе на плечы, іржэ, рыхтык конь, падскоквае і бегае з ёю па пакоі. Аліна аберуч абшчэплівае яго за лоб, заціскае пальчыкамі валасы і радасна смяецца. Хораша з татам. Яго вочы выпраменьваюць любоў. А потым нешта здарылася, тата з'ехаў, а ў хаце з'явіўся новы тата. Гэты тата не катаў яе на сабе і ніколі не цалаваў. Яна рана пасталела. Любімы татка пераехаў у другі горад, яе адведваў рэдка. Прыязджаў нейкі сумны, са сціплым падарункам, чакаў яе каля школы, цалаваў, як вінаваты, мала гаварыў і ад'язджаў хутка. Не было ўсмешак, радасці, вочы не свяціліся так, як раней, — любоў калі не пакінула іх, то стаілася недзе далёка. Пасля, напярэдадні выпускнога ў школе, прыйшла сумная навіна, што яго не стала.

Сілком прымусіла сябе паглыбіцца ў праверку сшыткаў. Зноў празвінеў званок, калідор запоўніўся шумам, дзіцячым крыкам, у настаўніцкую пацягнуліся каляжанкі. Аліна зноў папрасіла тэлефон у Вікі.

— Слухаю.

Яна пазнала голас Андрэя.

— Прабачце, гэта Аліна, вы мяне падвозілі сёння да Зарэчнага. Я пакінула тэлефон у вашай машыне.

— Ужо зразумеў. Я якраз вяртаюся назад, хвілін праз дваццаць буду праязджаць вёску. Вы ў школе будзеце?

— Так, буду вельмі ўдзячная вам, калі зможаце заехаць.

— Добра, дамовіліся.

Андрэй выехаў на галоўную дарогу, скіраваў у бок Зарэчнага. Дарога заспакойвала, дазваляла знітаваць думкі і выбраць адну, больш-менш вартасную. А што калі гэта і ёсць той самы лёс, цяпер не варта ўпускаць свой шанц? Вось проста ўзяць і сказаць ёй, што не можа забыць, што цэлы год трызніць ёю. А там — што ўжо будзе. Бо насіць далей усё гэта ў сабе не варта, дакладна звар'яцее.

Аліна стаяла крыху воддаль ад школы: не хацела, каб бачылі, перашэптваліся пасля, прыдумлялі ўсялякае. Што-што, а папляткарыць у іх любяць. З анічога зробяць такое, што дзіву даешся. Чым далей, тым болей нервовыя дрыжыкі ахаплівалі яе. І не холад жа, а трасецца ўся, як на марозе пякучым. Калі б хтосьці раніцай сказаў Аліне, што з ёю будзе рабіцца такое, яна адно пасмяялася б з гэтага чалавека. А яно вось як…

Калі яна наблізілася да буса, Андрэй прыадчыніў дзверы:

— Сядзьце, калі ласка. Я вас прашу.

Яна паслухмяна села.

— Ведаеце, — пачаў быў ён гаварыць, але яго ахапіла боязь, што ўсе словы будуць падавацца фальшывымі. Не, трэба адным разам, хутка. — Я не магу забыць вас з таго самага дня, калі ўпершыню ўбачыў. Праўда, я не маню. Раней я не верыў у каханне, а цяпер бачу, што памыляўся. Мне здаецца, што сённяшняя сустрэча невыпадковая. Я шмат не прашу — толькі адно спатканне. Не бойцеся, я не гвалтаўнік і не маньяк-забойца. Давайце ўбачымся з вамі, калі вы не супраць.

Ён выпаліў усё хвалюючыся, на адным дыханні, нібы закаханы падлетак, а не сталы мужчына. Сам унутрана сціснуўся ў чаканні. Яна нейкі час маўчала.

— Я не магу, — голас яе прыкметна дрыжаў, яна старалася не глядзець у яго бок. — У мяне муж, дзеці, праца. Разумееце? Дый навошта? Прабачце.

— Разумею, але ж толькі адно спатканне — проста пагаварыць з вамі, пабачыцца, а мне будзе лягчэй. Вельмі прашу вас.

Ён адкінуўся на спінку, выдыхнуў увесь страх, нервовасць, перажыванні — і адразу палягчэла. Вось, мабыць, і ўсё, мроі і надзеі адплываюць у невядомасць, у нябыт.

— Ну… хіба адзін раз… проста пагаворым.

Андрэй не паверыў сваім вушам. Ускінуўся:

— Калі?

— Не ведаю. Можа, паслязаўтра, у мяне будзе крыху часу.

— Дзякуй. Я абавязкова патэлефаную. Буду чакаць.

Аліна выскачыла з буса і шпарка пакрочыла па вуліцы.

4

Навошта яна дала згоду? Увогуле, якой халеры села да яго? Яна гнала ад сябе думку, хоць і сама ўжо зразумела, што прыйшло тое доўгачаканае пачуццё, пра якое яна марыла яшчэ падлеткам.

Хлопчыка і дзяўчынку, што нарадзіліся адно за адным, айчым любіў болей за Аліну. Гэта было заўважна па ўсім: і па падарунках, і па скупых ласках, і па пастаянных папроках у яе бок без дай прычыны. Яна была за няньку абаім, ёй жа трапляла за ўсе грахі брата і сястры. Маці больш маўчала, чым абараняла дачку. Таму Аліне хацелася як мага хутчэй вырвацца з дому, каб не вяртацца сюды болей ніколі. Пасля школы падала дакументы ва ўніверсітэт на настаўніцу пачатковых класаў — стаадсоткавае паступленне, жадаючых паступаць туды бракавала. Вучоба ў Гародні — як самыя шчаслівыя гады.

Сарамлівая, нясмелая, з комплексам Папялушкі, яна ніколі не імкнулася да знаёмстваў, крутых пагулянак, баляванняў са спіртным і хлопцаў на адну ноч. Універсітэцкія сяброўкі пакеплівалі з яе і называлі Алінай нецалаванай, нярэдка цягнулі ў начныя клубы, выхваляючыся кавалерамі і новымі строямі. Яна ж адчувала сябе няёмка, баялася выйсці ў свет. Хоць і не жыла ў нэнзе, але не адчувала і раскошы. Да Аліны не заляцаліся хлопцы, тым больш што на курсе іх не было.

Па размеркаванні трапіла ў Зарэчнае — не самы горшы варыянт, як яна лічыла. Дзяцей няшмат, спакойная праца, прыязнае стаўленне педкалектыву да маладой настаўніцы. Зняла пакой у адзінокай жанчыны — побач са школаю, зручна. Хадзіць не было куды, моладзі ў вёсцы не так і шмат, а ў мясцовым Доме культуры на суботнія дыскатэкі нешматлікія юнакі прыходзілі часцей пад градусам. Таму вечары праводзіла за сшыткамі і кнігамі з бібліятэкі. У снежні на двары сутыкнулася ўсутыч з маладзёнам у вайсковым. Ён спыніўся, праводзіў яе паглядам, штосьці выгукнуў услед. Чарговае хамло — падумала яна.

А назаўтра ён сустрэў яе каля веснікаў ужо ў цывільным. Высокі, шэравокі, далікатна напрасіўся праводзіць да школы. Віктар жыў па суседству, маці працавала даяркай у мясцовым калгасе пад гучнай назвай ААТ «Зарэчнае». Да службы адвучыўся ў тэхнікуме, цяпер жа дэмабілізаваўся і вырашыў папрацаваць трактарыстам. Маладзён крыху пажартаваў з ёю, яна нешта адказвала, потым разбегліся.

Навагодняе свята сустракалі ў Доме культуры. Віктар цалюткі вечар не адыходзіў ад яе. Пасля стаў заходзіць у госці, прыносіў падарункі. Аліне падабалася ўвага Віктара, бо раней да яе ніхто не заляцаўся, але сэрца дзяўчыны маўчала. Недзе пад весну Аліна моцна захварэла. Трэба было ехаць у паліклініку, неяк лячыцца, а яна не магла нават падняцца з ложка. Віктар заляцеў, як віхор, падхапіў на рукі, аднёс у машыну, адвёз у паліклініку. Як у тумане памятала: рукі, абдымкі, гарачыя вочы, прыемная млявасць. Віктар дамогся, каб яе паклалі ў лякарню, купляў лекі, прыязджаў ледзь не штодзень.

Ён адагрэў сэрца дзяўчыны, Аліна па-іншаму паглядзела на Віктара: клапатлівы, спакойны, вочы гавораць, што кахае, хоць уголас ён не казаў пра тое. Потым прапанаваў выйсці за яго, дзяўчына здалася. Віктар добры, гаспадарлівы, яе шануе і кахае. Чаго і каго ёй шукаць? Прынцы і пунсовыя ветразі пакуль сустракаліся толькі ў кнігах. Вырашыла, што каханне само прыйдзе, трэба пажыць разам.

У маі згулялі вяселле, яна пераехала да мужа, праз паўгода калгас-таварыства маладой сям'і выдзеліў сядзібу: як-ніяк, Віктар працаваў там. Усё ішло, як па схеме: вяселле, дэкрэт адзін, пасля другі. Сям'я папоўнілася дачкой-нянькай, а затым і сынам, патрыманую іншамарку прыдбалі. Яна жыла дзень за днём, ніколі не задумваючыся пра свае пачуцці. Пра гэта не было часу думаць: дом, муж, праца, хатняя гаспадарка, дзеці.

Замужжа дало ёй цвёрдую глебу пад нагамі, упэўненасць у заўтрашнім дні і, галоўнае, незалежнасць ад сям'і бацькоў — туды яна ехаць не хацела. Абыякавасць да айчыма і зводных брата з сястрою, крыўда на маці, нейкая дзіцячая зласлівасць — вось, глядзіце, я ўладкавалася не горш за вас — прыглушылі ў сэрцы сваяцкія пачуцці.

Сёння, як заўсёды, спяшалася хутчэй трапіць дамоў: вячэру трэба гатаваць, гара бялізны ляжыць, трусоў, якіх развёў Віктар, пакарміць, з Карынаю ўрокамі заняцца, прагледзець, нарэшце, тыя самыя сшыткі. Звычайныя клопаты. Даніла выскачыў да яе, як толькі парог пераступіла:

— Мама, мамачка! А Карына мяне дражніла, сказала, што я лапавухі.

— Яна гаворыць абы-што. Ты самы прыгожы хлопчык у свеце, — цмокнула сына ў лоб, прылашчыла за валасы. — А Карына, калі будзе так казаць, аніякіх падарункаў заўтра не атрымае. Ідзі пагуляй, мама вячэрай зоймецца.

Дзеці былі для яе ўсім. Яна любіла іх, як не любіла нікога. Усю сваю нерастрачаную любоў яна аддавала дзецям, і яны гарнуліся да яе. Віктар зрэдзь цікавіўся адзнакамі Карыны, марамі і гульнямі дзяцей, працаю жонкі. Ён лічыў, што муж павінен зарабляць грошы, глядзець гаспадарку, а хатнімі клопатамі, домам, выхаваннем дзяцей і іх вучобаю займаецца жонка. Аліна з разуменнем ставілася да таго: трактарыст, дацямна ў полі, праца нялёгкая. Такім чынам абавязкі размеркаваліся ў сям'і.

Віктар прыехаў а восьмай. Пераапрануўся, памыў рукі, сеў за стол.

— А дзе смартфон?

— Вось, паглядзі.

Віктар распакаваў пакупку, агледзеў і, нічога не сказаўшы, паклаў на месца. Пасля вячэры ён пайшоў да трусоў: трэба было падсадзіць самцоў да самак, праверыць самак, што павінны былі вось-вось даць прыплод, перагледзець клеткі. Яна паклала дзяцей спаць, занялася бялізнай.

Віктар лёг у ложак, гучна пазяхнуў, пасунуўся да Аліны. Усё адбылося, як звычайна — нядоўгія абдымкі і пацалункі, непасрэдна сама блізкасць, пасля чаго, атрымаўшы задавальненне, муж прыціснуў яе да сябе, пацалаваў і, крыху паляжаўшы побач, заснуў. Інтымнае жыццё Віктара і Аліны не вылучалася навізной, не выглядала чымсьці незвычайным. На пачатку сямейнага жыцця інтымная блізкасць бянтэжыла і нават крыху палохала Аліну: як-ніяк, Віктар яе першы мужчына. Але мінула колькі часу, яна прызвычаілася да гарачых абдоймаў, старалася падладзіцца да мужавых рухаў, дагадзіць яму. Яны рэдка размаўлялі ў ложку, а калі і размаўлялі, то пра побытавае ці сямейнае. Аліна нават праз столькі гадоў сумеснага жыцця чамусьці саромелася сваёй аголенасці, таму інтым праходзіў пры зацененых вокнах. Не сказаць, каб Аліне не падабаліся заняткі сэксам, але яна не адчувала таго, пра што расказвалі ўніверсітэцкія сяброўкі, каляжанка Віка. Аніякай феерыі, неверагодных эмоцый, ад-

чування, што ты ўзлятаеш у нябёсы, — такога не было. Пра сябе яна вырашыла, што, мабыць, не ўсім тое дадзена, у кожнай жанчыны свае фізіялагічныя асаблівасці, на тым і супакоілася. Галоўнае, што з мужам у іх добрыя адносіны, растуць здаровыя і цудоўныя дзеці, матэрыяльна больш-менш забяспечаныя. Чаго яшчэ хацець?

5

Яна не хацела сабе прызнавацца, але падсвядома разумела, што чакае тэлефоннага званка. Увесь наступны дзень Аліна хадзіла ўзрушаная, быццам думкамі жыла ў нейкім іншым свеце. Яна не ведала, як будзе сябе паводзіць, пра што будзе гаварыць з Андрэем і, галоўнае, як схаваць ад усіх свае пачуцці. Віка заўважыла, што яна сама не свая:

— Што з табою, сяброўчка? Ты не такая, як звычайна. Ці не захварэла?

— Так, так, — Аліна ўхапілася за своечасовую і зручную падказку. — Зуб разбалеўся, ды яшчэ як. Хачу заўтра паехаць да стаматолага. Ноч як-небудзь перачакаю, а зраніцы паеду.

— А чаму не сёння?

— Не выпадае, усё распісана на сёння, — зманіла яна.

Андрэй патэлефанаваў у другой палове дня. Дамовіліся, што сустрэнуцца заўтра на цэнтральнай гарадской плошчы. Ён хацеў прыехаць нават у Зарэчнае, каб забраць яе, але Аліна не пагадзілася — крый божа, згледзіць хто.

Ён купіў шыкоўны букет, цукеркі, фрукты, шакалад, шампанскае — джэнтльменскі набор. Вырашыў, што запросіць яе на бацькоўскае лецішча: усяго чатыры кіламетры адсюль. Горад невялікі, незаўважна наўрад ці дзе можна пасядзець, пагаманіць, а бавіць час у машыне, схаваўшыся і баючыся чужых вачэй, яшчэ горшы варыянт.

Апошнія хвіліны перад сустрэчай Аліну трэсла, як у ліхаманцы. Яна не адзін раз пашкадавала, што пагадзілася на сустрэчу, пасля некалькі разоў збіралася пайсці, не дачакаўшыся Андрэя. І ў апошняе імгненне прымушала сябе затрымацца, бо брыдка, сама дала згоду. Калі ж белы бус спыніўся каля яе, Аліна раптоўна супакоілася: прапалі нервовыя дрыжыкі, хваляванне, яна сабралася, упэўнена села ў аўтамабіль, як не было вар'яцкіх думак і перажыванняў.

— Прывітанне.

— Прывітанне. Яшчэ раз дзякуй, што не адмовіліся. Гэта вам.

Аліна разгубілася: такі прыгожы букет яна трымала ў руках упершыню. Якое ж хараство! Прытуліла кветкі да твару, з асалодаю ўдыхнула. Проста цуд. П'янкаваты гаркава-салодкі водар абудзіў напаўзабытыя вобразы і малюнкі, яна вярнулася на пятнаццаць гадоў назад. Штосьці падобнае адчувала тады, калі падлеткам пасвіла з бабуляю ў вёсцы каровы. Яна хадзіла па лузе за каровамі, ірвала безліч розных кветак, рабіла імправізаваны букет і, патанаючы ў марах, насалоджвалася водарам. Мары адносілі яе ў казачныя краіны, дзе ўсе шчаслівыя, а юнакі прыгожыя і закаханыя, дораць дзяўчатам кветкі і салодкія словы. Кветкі пахлі толькі гадзіну ці крыху болей, пасля яны страчвалі сваю прыцягальнасць, і Аліна са шкадаваннем аддавала свае мары і лугавую прыгажосць рачной плыні.

— Прабачце, — голас Андрэя вярнуў яе да рэчаіснасці, — Мы крыху ад'едземся — не стаяць жа на плошчы. Не супраць?

Не, яна, вядома, не супраць, хутчэй адсюль. Аліна зірнула на Андрэя. А ён наструнены не менш за яе: твар засяроджаны, не ўсміхнецца, рукі моцна трымаюць стырно. Нібыта перад ім не шырокая дарога, а вузкі горны серпанцін. Кветкі. Яна зноў схавала твар у кветкі. А калі ж Віктар ёй дарыў іх апошні раз? Калі не лічыць абавязковых сакавіцкіх туліпанаў (дый тое не штогод), то пасля вяселля толькі два разы — у раддоме. Неяк так.

Машына хутка выскачыла за горад, асфальт змяніўся грунтоўкай, прамільгнуў садсаннік, паказаліся раскіданыя паміж садовых дрэў хаты і домікі. Праз хвіліну машына звярнула ўлева, на вузкую вулачку.

— Калі ласка, — Андрэй адчыніў дзверы, працягнуў руку, — вось мы і прыехалі. Лецішча маіх бацькоў, але фактычна цяпер яно маё. Праходзьце.

Лецішча, якое нічым не адрозніваецца ад многіх іншых: невялікі, крыты шыферам, абшаляваны і пафарбаваны ў сіні колер дом, такая ж невялікая прыбудова, бочка для паліву, напаўразбураная цяпліца, кусты, некалькі яблынь, металічная сетка падзяляе межы. Але ж неяк вельмі ўтульна, хораша ад вясны, сонца, цішыні і новых адчуванняў. Аліна спынілася, прыслухалася. Недзе ў небе заліваецца жаўрук. У зацішку сонечна, цёпла. На грушы на ўсю моц цвыркаюць і шчыруюць шпакі, на суседнім лецішчы гарлаюць вароны, каля бочкі прабіваецца наверх зялёная трава. Жывое прагне цяпла, імкнецца да сонца.

Андрэй запрасіў у дом. Пакуль яна аглядалася, ён паспеў сціпла сервіраваць стол: парэзаў апельсіны, пачысціў мандарыны, клапатліва выклаў шакалад, цукеркі, вінаград, паставіў талеркі і келіхі для шампанскага. «Прадбачлівы», — усміхнулася пра сябе.

Ён дапамог распрануцца, павесіў паліто, адкаркаваў шампанскае.

— За што будзем піць? — Аліна ўзяла келіх.

Цікава, адкуль з’явілася незразумелая неўтаймаваная смеласць. Як жа хутка змяніўся настрой: з панічна-хваравітага на плошчы да разняволенага, і нават з доляй нейкай абыякавасці, тут, на лецішчы.

— Хацелася сказаць банальнае — за сустрэчу, але давайце спачатку за вас. Не супраць?

— А давайце.

Пасля першага ж выпітага келіха ў яе злёгку закружылася галава, з’явілася пачуццё лёгкасці, бесклапотнасці. Хораша, праўда. Даўно не адчувала сябе так хораша. Нікуды не хочацца спяшацца, штосьці рабіць, думаць пра будзённае і шэрае. Хочацца проста жыць і наталяць душу святлом, цяплом, каханнем.

6

Ён не ведаў, што будзе гаварыць Аліне: нічога не лезла ў галаву. Хай, вось вып’юць па кроплі, тады, магчыма, размова пойдзе сама сабой. Праўда, ён піць не збіраўся — так, для прыліку прыгубіць, бо ніколі не дазваляў сабе садзіцца за стырно нападпітку ці пасля ўчарашняга.

А яна яшчэ больш папрыгажэла пасля шампанскага: вочы засвяціліся, твар запунсавеў, расквеціўся нязмушанай радасцю. Андрэю нясцерпна захацелася прыціснуць

яе да сябе і цалаваць, цалаваць, укрыць усю яе пацалункамі. Адвёў позірк, каб стрымацца.

— Вы хацелі пагаварыць, а цяпер маўчыце. Пра што будзем гаварыць?

Андрэй злёгку напружыўся. Што ёй сказаць? Што кахае? Але, бадай што, ён выпаліў тое яшчэ тады, у вёсцы. Тады што?

— Аліна, я не паэт і не мастак, але скажу адно — вы незвычайная. Пачакайце, не пярэчце. Я ўжо казаў, што не магу забыць вас з таго самага дня, калі ўпершыню ўбачыў. Ні адна жанчына на свеце не можа параўнацца з вамі. Бо вы зрабілі са мною тое, чаго я ніколі не зведваў у жыцці, — я закахаўся. Закахаўся па-сапраўднаму, па-даросламу, закахаўся на ўсё жыццё. Спытаеце, навошта я ўсё гэта расказваю? Насамрэч, я не магу і не хачу болей насіць пачуцці ў сабе. Магчыма, калі б не наша апошняя сустрэча, я так і жыў бы марамі, не шукаў бы вас, але ж мы сустрэліся. Гэта знак, разумееце? Я веру ў гэта. А вы? Вы верыце ў лёс?

Аліна змянілася ў твары, пасур’ёзнела, лёгкай хмурынкай падценіліся вочы. Яна пакруціла перад сабою келіх, памаўчала.

— Ведаеце, мне ніколі і ніхто не гаварыў такіх прыгожых слоў. А давайце яшчэ вып’ем.

Андрэй напоўніў келіх. Яна залпам выпіла больш за палову, паставіла на стол.

— А тут утульна, па-дамашняму. Мне тут добра.

Яна з’ела дольку мандарына.

— Ці веру я ў лёс? Не ведаю, не ўпэўнена, але ці існуе ён, ніхто ж дакладна не ведае. Калі нават нашым дарогам наканавана перасячыся, тое не азначае, што яны зліюцца ў адну шырокую, што людзі пойдуць па жыцці разам. Ці не так?

— Так, але ж…

Андрэй хацеў пасунуць бліжэй да яе талерку з вінаградам і ненаўмысна зваліў бутэльку. Шампанскае палілося на стол. Андрэй падскочыў, каб падхапіць бутэльку, Аліна таксама прыўзнялася, баючыся, каб шампанскае не трапіла ёй на адзенне. Яны застылі — вочы ў вочы. Андрэй стаў на калені, узяў Аліну за рукі. Ад асцярожных пяшчотных пацалункаў яна затрымцела, рыхтык маладая танклявая бярозка.

— Што вы, не трэба, навошта вы…

Ён прыціснуў далоні да твару. Сэрца тахкала кавальскім молатам. Падхапіўся на ногі, абняў Аліну і пацалаваў. А яна ўжо і не спрабавала супраціўляцца, цалкам аддаўшыся жарсным пацалункам і ўсёабдымнаму пачуццю, якое паралізавала яе волю і розум. Аліна не памятала, як яны дабраліся да ложка, як распраналіся, колькі часу доўжыліся любошчы. З ёю адбылося тое, пра што расказвалі каляжанкі-аднакурсніцы і Віка. Аліна адчула, як увесь цяжар, які яна насіла ў сабе доўгія гады, раптоўна знік, сплыў, а цела зрабілася лёгкім, як бязважкім, прыемнае цяпло разлілося ад жывата да кончыкаў пальцаў ног, пасля папаўзло ўверх і паланіла яе ўсю. Яна насамрэч адчула сябе ў іншым свеце, нібыта ўзнялася ў неба, салодкі стогн вырваўся з яе вуснаў. Пасля ёй захацелася заплакаць ад шчасця, але апошнім куточкам свядомасці прымусіла сябе стрымацца і на нейкае імгненне правалілася ў знебыццё.

Калі Аліна расплюшчыла вочы, то ўбачыла, што ляжыць у Андрэевых абдымках. Ён пяшчотна кранаўся яе валасоў, ледзь-ледзь чутнымі дотыкамі цалаваў плечы. Божа, яна ў абдымках чужога мужчыны, аголеная! Ці магла яна такое сабе ўявіць

літаральна дзень таму? Яна, замужняя жанчына, маці дваіх дзяцей, але не адчувае згрызотаў сумлення, віны перад Віктарам і перад дзецьмі. Жах. Але ж вось цяпер, у гэты момант, яна адчувае сябе шчаслівай, а ўсё астатняе не мае аніякага значэння. Ці не ўпершыню ў жыцці яна адчула сябе не кім-небудзь, а шчаслівай, закаханай жанчынай.

— Дзякуй табе, — Андрэй пацалаваў яе ў куточак вуснаў, — я самы шчаслівы чалавек на зямлі. Я кахаю, ты побач. Ці можна жадаць большага шчасця?

Яна павярнулася да яго, уважліва паглядзела, нібыта бачыла ўпершыню, прыціснула яго руку да сваёй шчакі.

— Са мною такое ўпершыню. Я ніколі не думала, што здраджу мужу.

— Прабач, калі я зрабіў табе балюча.

— Не, не, што ты, не вінаваты. Наадварот, мне так хораша сёння — я адчула сябе шчаслівай жанчынай.

Яна прымоўкла на некалькі імгненняў.

— Ты гаварыў пра лёс. Ведаеш, я ў школьныя гады шмат чытала, любіла кнігі пра каханне, верыла ў вялікае і светлае пачуццё. Але жыццё так склалася, што яно не прыйшло да мяне тады, калі я пра яго марыла, у юнацтве. А мы сустрэліся толькі цяпер. Скажы: вось чаму лёс такі жорсткі?

— Я не хачу думаць пра гэта сёння. Мне так добра з табою — ты не ўяўляеш. Хай так і застаецца.

— Уяўляю. Бо я да апошняга не верыла, дакладней, прымушала сябе не верыць, што свет змяніўся. Я таксама закахалася.

— Аліна!

Андрэй закалыхваў яе сваімі пяшчотамі. Яна ніколі раней не думала, што інтымная блізкасць можа прыносіць такую радасць і лёгкасць, адчуванне палёту. І якой асалодай могуць быць пацалункі і пяшчоты таго, каго кахаеш. Ён жа проста купаўся ў сваім шчасці.

Паступова яны сцішыліся. Ляжалі, глядзелі адно аднаму ў вочы, гаварылі пра штосьці банальнае і бесклапотна смяяліся, елі фрукты, шакалад. Ідылію абарваў званок мабільнага тэлефона Аліны. Яна падхапілася:

— Колькі ўжо часу?

— Не ведаю, — разгублена адказаў Андрэй.

Аліна выскачыла з ложка, схапіла тэлефон. Як на тое, тэлефанаваў Віктар. Звычайна ён рэдка шукае яе днём, ведае, што на працы. Яна пахаладзела: няўжо штосьці западозрыў?

— Ты дзе?

— У горадзе яшчэ.

— Чаму так доўга? Здарылася што?

— Ды не, — яна старалася гаварыць як мага спакайней, — проста чарга была, пасля прыйшлося ісці па лекі. У мяне, як высветлілася, пэўныя праблемы з зубамі, яшчэ не раз прыйдзецца ехаць. Вось толькі выбралася на папутку. А ты чаму пытаешся?

— Карына мне тэлефанавала. Сказала, што цябе яшчэ дома няма, а ўжо другая палова дня.

— Чаму ж яна мне не патэлефанавала? Усё добра, я хутка буду.

Аліна села на край ложка. Шчасце скончылася, цябе чакае дом, муж, дзеці, праца. Як з гэтым жыць далей?

— Пра што думаеш? — Андрэй абняў яе за плечы.

— Ты сам усё чуў. Трэба збірацца.

Яна хутка апранулася, сабрала рэчы, падмалявала прыпухлыя вусны, паправіла фрызуру.

— Я цябе падвязу да Зарэчнага.

— Добра.

Аліна паспяшалася на выхад.

— А кветкі? — Андрэй працягнуў ёй букет.

Яна разгубілася. Але куды іх браць, як яна патлумачыць паходжанне шыкоўнага букета? Аліна ўзяла кветкі ў рукі, яшчэ раз удыхнула п’янкі водар.

— Шкада, але хай яны застаюцца тут — табе на ўспамін.

Яна загадала Андрэю спыніцца перад вёскаю. А ён не хацеў яе адпускаць, бясконца цалаваў, аж пакуль яна сама не вызвалілася з абдоймаў і не выслізнула з машыны з расцярушанымі пачуццямі.

7

Ён насамрэч нават у самых смелых марах не ўяўляў, што ўсё адбудзецца сёння, падчас першага ж спаткання. Душа спявала: Аліна яго кахае, Аліна яго кахае. Што далей? На гэтую хвіліну ён цьмяна ўяўляў, што рабіць далей, але пакуль ехаў дахаты, адно вырашыў дакладна: са Светаю развядзецца. Так жыць нельга. Як жа страшна ён памыляўся, калі лічыў, што разам можна жыць і без кахання. Пасля праскочыла думка: мо і Аліна развядзецца? Яна пераедзе ў горад, ён будзе працаваць, любіць і шанаваць яе дзяцей як сваіх. Разам збудуюць новую сям’ю, сваё шчасце. А першым часам пажыць могуць у маці — яна адна ў трохпакаёвай кватэры.

Мікіты дома не было, мабыць, пасля ўрокаў недзе гойсае з сябрамі. Яно і да лепшага: будзе магчымасць пагаварыць са Светкаю. Падумалася: хоць і позна, але папалуднаваць. Толькі есці не хацелася. Стомлена прысеў за стол, заплюшчыў вочы. Зноў паўстала Аліна, яе ўсмешка, вочы, аголенае цела. Няўжо гэта не сон?

Грукнулі ўваходныя дзверы. Жонка. Ён застаўся сядзець на месцы. Святлана доўга распраналася, штосьці звалілася на падлогу. Зразумеў, што жонка вярнулася з працы пад градусам. Падняўся, зазірнуў у вітальню. Так і ёсць: яна сядзела на скураным зэдліку: разбэрсаныя валасы, п’янаватая ўсмешка, павесіла абы-як паліто. Сёння гаварыць не мае сэнсу, можа адбыцца чарговы скандал.

— Ты дома? Штосьці ранавата?

— Няма працы, — адказаў.

Света паспрабавала падняцца, але пахіснулася, не ўтрымалася на нагах і зноў плюхнулася на зэдлік.

— А мы сёння крыху адзначылі, у Нэлі дзень народзінаў.

— Я бачу, — суха зазначыў Андрэй.

— Нічога ты не бачыш, — неяк спакойна, без злосці прамовіла Света, — жывеш сам па сабе, і ўсё. Хіба я не бачу, што я для цябе пустое месца.

— Як і я для цябе.

— Ды ідзі ты…

Андрэй вырашыў за лепшае не даводзіць да сваркі. Ён сеў на канапу, набраў нумар сына — трэба яго гнаць дахаты, хай урокамі займецца.

8

Аліна, задыханая, забегла ў вітальню. Казка скончылася, вазок зноў ператварыўся ў гарбуз. Добра хоць, што наказала Карыне, каб забрала Данілу з садзіка. Сама спазнілася б. Не паспела распрануцца, а малы ўжо тут:

— Мама, Карына не робіць урокі, а гуляе ў тэлефоне.

— А ты не ведаеш, што даносіць на іншых дрэнна? Табе не сорамна? — яна паўшчувала сына. — Ідзі памалюй, у цябе добра атрымліваецца.

— А што табе намаляваць?

— Што? — яна задумалася. — Намалюй сонейка, маму і добрага чараўніка.

— А добры чараўнік як выглядае?

— Як? — на некалькі імгненняў задумалася. — Мабыць, ён высокі, прыгожы, са шчыраю светлаю ўсмешкаю, вялікім сэрцам, і яшчэ ён — з кветкамі.

— Як тата?

— Як тата? Можа быць.

Яна зрабіла вымову Карыне, пасадзіла яе за ўрокі і занялася хатнімі справамі. Праз нейкі час сын прынёс ёй малюнак:

— Мама, глядзі, я намаляваў.

Яна ўсміхнулася. Мама ў Данілы атрымалася казуркай сярэдніх памераў, чараўнік жа выглядаў удвая вышэйшай казуркай, што амаль датыкалася галавой да сонца, з сэрцам на ўсю грудзіну. Затое над кветкамі сын пашчыраваў, размаляваў рознымі алоўкамі, яны ажывілі і напоўнілі святлом і радасцю дзіцячы малюнак.

— Дзякуй, сынок, вельмі добра.

Кветкі. Кветкі засталіся там. Перад вачыма прамільгнуў букет, сонца, лецішча, пакой, Андрэй. У грудзях штосьці сціснулася ад шкадобы да самой сябе.

Віктар вярнуўся позна — вядома, сяўба пачалася, рыхтуюць тэхніку. Яна паставіла на стол вячэру, прысела побач. Як жа яны будуць жыць далей? Няўжо мусіць хавацца, хлусіць мужу, выкручвацца, рабіць выгляд, што нічога не адбываецца? Віктар не заслугоўвае гэтага, ён не вінаваты ў тым, што яна не кахае яго. Як яна будзе разблытваць клубок цяжкіх і працілеглых пачуццяў? Цяпер гэта яе крыж. Пытанне толькі ў тым, як доўга яна зможа яго несці.

Пасля першай сустрэчы з Андрэем яна ўжо не адчувала сябе ранейшай Алінай — сціснутай, закамплексаванай, пакорлівай. Знікла нервовае напружанне, зваліўся нябачны шматгадовы цяжар, які не даваў ёй быць проста шчаслівай жанчынай. Ёй хацелася жыць па-сапраўднаму, радавацца жыццю, кожнаму дню, кожнаму імгненню, верыць, што наперадзе толькі лепшае. Расправіліся плечы, вочы загадкава пабліскваліі ўсміхаліся, пастава і хада прымушалі мужчын на вуліцы азірацца на яе. Праўда, іншым разам надыходзілі хвіліны, калі апаноўвалі згрызоты сумлення. Віця па-свойму кахае яе, а яна здраджвае. І тады нясцерпна хацелася камусьці паплакац-

ца, расказаць пра свае перажыванні, падзяліцца перажытым і параіцца. Але падступаў страх, што здрада раскрыецца. Што тады?

Ён не тэлефанаваў Аліне, абменьваліся толькі паведамленнямі. У яго пасля першай сустрэчы як выраслі крылы. На працы ўсё рабіў хутка, усе людзі здаваліся добрымі, ён усміхаўся ім, жартаваў, з'явіўся настрой на жыццё. Жыў чаканнем новай сустрэчы, слаў паведамленні, у кожным па дзясятку разоў пісаў, што кахае. Яна ж адказвала, што не можа вырвацца, баіцца, каб не западозрылі. Толькі і сама змагла вытрымаць адно тыдзень.

Як і тым разам, паехалі на лецішча. Андрэй спыніў машыну на ўзлеску. Вярнуўся назад з блакітна-светлымі пралескамі. На лецішчы паставілі кветкі ў слоік, ён паклаў на стол пакет з ежай і болей сябе не стрымліваў. Падхапіў Аліну на рукі, закружыў, шчаслівы. Рэчаіснасць для іх перастала існаваць, яны насалоджваліся адно адным, як маладыя падчас першай шлюбнай ночы.

Аліна прытулілася да Андрэя, слухаючы, як яго сэрца стукае ўсё павольней, набываючы звыклы рытм. Так і ў іх: міне гадзіна-другая, зноў усё пойдзе сваёй звычайнай хадой. А як жа не хочацца, як не хочацца!

— Ведаеш, у мяне ёсць адна мара, — сказаў Андрэй.

— І якая ж? — разняволеная Аліна ласкаваю коткаю абшчаперыла Андрэя за шыю. — Домік на беразе мора, дзе мы з табою ўдваіх?

— Пра такое я нават баюся марыць, але было б цудоўна. Гэтая ж мара юначая і крыху больш празаічная: я хачу скокнуць з парашутам. А калі яшчэ і ты далучышся, то будзе проста файна. Мне здаецца, што адчуць свабоду, пражыць імгненні палёту, калі вецер свішча ў вушах, калі ты вольны, сам-насам з небам, — гэта хвіліна шчасця. Такое ніколі не забудзеш. Усё думаю сабрацца, ды ніяк не збяруся. Пасля сустрэчы з табою яшчэ больш захацелася ажыццявіць сваю мару.

Аліна адкінулася на спіну:

— Не, я баюся, мне здаецца, я ніколі не змагла б скокнуць. А раптам парашут не раскрыецца?

— Ды не, там усё надзейна, баяцца няма чаго.

— Не, я не змагла б.

— А калі разам са мною?

— З табою? Не ведаю, праўда. З табою магчыма, але ўсё роўна боязна.

— А ты пра што марыш?

— Я? — Аліна задумалася. — Бадай што мая мара збылася — я сустрэла цябе. Здзіўляешся? Дарма. Проста я несучасная, бо любіла і люблю кнігі, шмат чытала замест таго, каб шлындацца ці хадзіць на танцулькі і гулі ў школе і ва ўніверсітэце. Дрэнна гэта ці не, але дзякуючы кнігам я верыла, што каханне існуе. Гэта цяпер разумею, што зрабіла памылку: зарана страціла веру ў сваю мару, перастала чакаць і выйшла замуж. А мара збылася цяпер — я сустрэла каханага. Вось што мне рабіць?

Андрэй прытуліў Аліну да сябе.

— Па-першае, ты не адна — я з табою і ніколі цябе не пакіну. Чуеш? Мы будзем разам. Будзе цяжка, так, але, калі захочам, мы зможам пераадолець цяжкасці. Па-другое, у бліжэйшы час я падам на развод — са Светаю мы чужыя людзі. Патрэбна вырашыць і табе. Пасля ты пераедзеш у горад. У маёй мамы трохпакаёвая кватэра,

месца хопіць. Знойдзем табе працу, дзеці пойдуць у школу. Усё будзе добра. А пасля і я ажыццяўлю сваю мару ды скокну з парашутам, разам з табою. Уяўляеш?

— Мне страшна, любы.

— Я буду з табою.

— Не, мне страшна, калі я думаю пра развод.

9

Андрэй падаў на развод, як і абяцаў. Святлана адрэагавала на такую навіну без біцця посуду, але паабяцала яму непрыемнасці і тое, што ён яшчэ пашкадуе.

На наступны дзень ён сабраў свае рэчы, перанёс у бус. Якраз выбраў зручны момант, калі Святлана на працы, не будзе нерваваць, гаварыць колкасці і жадаць яму тузін бедаў. Зайшоў у кватэру, прысеў. На душы як каты нагадзілі. Здавалася, усё даўно вырашана, абдумана, сумеснага жыцця няма, а ад гэтага разумення аніякай палёгкі, і самому пагана. Дурное жыццё ў людзей, суцэльныя мітрэнгі, зрэдзь толькі бывае, каб усё роўна ды гладка.

І яшчэ стрэмкаю ў сэрцы боль за сына. Выходзіць так, што без бацькі гадавацца будзе Мікіта. Сам сабе даводзіў, што гэта не так, што ледзь не штодзень будзе прыязджаць да сына, а Мікіта будзе наведвацца да яго, таму не мае сэнсу бедаваць. Але зноў прыходзіў да высновы, што парушыцца сувязь з сынам, усё-такі нябачная расколіна праляжа паміж імі, а Мікітава крыўда пераважыць бацькаву любоў. Бо ён пакінуў сям'ю, значыць, уся віна і адказнасць на ім.

Андрэй дачакаўся сына са школы. Той ужо ведаў, што тата не будзе жыць разам з ім і маці. Што яму сказаць, якія словы? Андрэй выйшаў у вітальню, як толькі ў дзвярах шчоўкнуў замок.

— Як справы ў школе?

— Нармальна.

— Што сёння атрымаў?

— Нічога, мяне не вызывалі.

— Ты, гэта… сынок, не крыўдуй на мяне. Падрасцеш — зразумееш. У дарослых свае праблемы і недарэчнасці, яны не заўсёды могуць іх вырашыць і жыць разам. Таму мы з мамаю разводзімся. Але я не кідаю цябе, заўсёды буду побач, ты можаш тэлефанаваць мне ў любы момант. Ведай, што я цябе люблю.

Сын крыху набычыўся, апусціў вочы долу, твар пачырванеў, але адказаў:

— Я не крыўдую.

— Праўда? Калі так, то добра. Я буду прыязджаць да цябе, абавязкова. А ты прыходзь да бабулі. Будзем бачыцца. Добра?

— Угу.

Андрэй абняў сына, ускудлачыў валасы. Які велькі ўжо — амаль да пляча дастае. А ён і не заўважаў, што сын вырас.

Седзячы ў бусе, зірнуў на трэці паверх. У акне сынава постаць. Назірае. Заўважыўшы, што Андрэй глядзіць на яго, Мікіта схаваўся. Мабыць, такі крыўдуе.

Аліна не магла сабе ўявіць — як, з чаго пачаць размову з Віктарам пра развод. І як выкрасліць гады сумеснага жыцця, як сказаць дзецям, што яны будуць жыць без свайго таты, а Андрэй іх новы тата. Гульні дарослых не для дзяцей. Для Карыны і Да-

нілы Віктар самы лепшы тата. А як адрэагуе Віктар? Высвятлення адносін са сваркамі і крыкам, напэўна, не будзе. Але і наўрад ці ён проста так возьме ды адпусціць яе на ўсе чатыры бакі. Чаго захоча ён? У якім свеце будзе адчуваць сябе яна?

Насамрэч, калі яна падасць на развод, яе ніхто не зразумее: дурніца, чаго ёй не хапае? Муж не п'яніца, працаголік, зарабляе па вясковых мерках нядрэнна, сям'ю глядзіць. І налева (у адрозненне ад яе) не ходзіць — прынамсі, яна пра такое не ведае. А каханне? Якое каханне — бабскія бзыкі, прыхамаць. Прыкладна так уяўляла яна сабе ўсё тое, што можа пачацца пры магчымым разводзе. Бо гэта ж вёска, тут усе навідавоку: няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны.

Гэтыя пытанні не давалі ёй спакою. Літаральна за некалькі дзён яна паблажэла з твару, дрэнна спала, у школе залішне нервавалася, з-за чаго стала піць заспакойваючае. Нядзіўна, што Віктар заўважыў гэтыя змены. Неяк раніцай, калі яна падавала снеданне на стол, сказаў:

— У цябе непрыемнасці ў школе?

— Ды не. Чаму ты так вырашыў? — здзівілася яна.

— Бо ты сама не свая — хіба ж я не бачу?

— Мне зноў зубы спакою не даюць, — схлусіла Аліна, — проста нікому нічога не кажу. Анальгетыкі дрэнна дапамагаюць, да зубнога ніяк не выберуся.

— Не варта адцягваць гэтую праблему. Калі не выпадае паехаць, то я магу адпрасіцца і адвезці цябе.

— Не, не трэба, я якраз збіралася сёння запісацца, — хуценька адмовілася ад дапамогі мужа Аліна.

Віктар паехаў. Аліна села і абшчаперыла галаву рукамі. Зноў хлусня, зноў падман. Што яна робіць? А ўчора прыйшло паведамленне ад Андрэя — чакае на спатканне, піша, што кахае, процьму смайлікаў даслаў. Паведаміў, што падаў на развод і пераехаў да маці.

На стале ляжаў малюнак сына — добры прыгожы чараўнік, яна, сонейка і кветкі. Дзе ён, той добры чараўнік, што вырашыў бы ўсе праблемы?

Майскі дзень радаваў сонцам, цеплынёй і зелянінай. Літаральна за некалькі дзён ажывілася і пайшла ў рост трава, успыхнулі маладой лістотай дрэвы і кусты, птушынае рознагалоссе напоўніла парк, самыя смелыя з моладзі апранулі цішоткі, маладыя мамы з дзіцячымі вазкамі няспешна сноўдаліся па вуліцы — усё жывое навокал радавалася цяплу і сонцу. І цяпер здавалася, што яны, цяпло і сонца, нікуды болей не знікнуць, што лета застанецца ці не назаўжды. Як жа інакш, калі ўсім так хораша.

Аліна ішла да паліклінікі — там яе павінен чакаць Андрэй. Яна сама так вырашыла: калі і ўбачыць хтосьці са знаёмых, то не трэба нічога выдумляць. Яшчэ здалёк убачыла знаёмы бус, паскорыла крок. Толькі села і яшчэ не паспела нават павітацца з Андрэем, як хтосьці з сілай расчыніў дзверы. Маладая паўнаватая пафарбаваная бландзінка ў медыцынскай вопратцы выглядала раззлаванай і ўзбуджанай. Яна нікому не дала вымавіць і слова, адразу ж зайшлася крыкам:

— Дык гэта з-за яе ты разводзішся, га? Я так і ведала. А ты, шлёндра, чаго бельмы вылупіла? Я цябе навучу, як чужых мужыкоў адбіваць, сучка.

Аліна сцялася. Усё адбылося так раптоўна, што яна не ведала, як сябе паводзіць і як абараніцца ад нападак. Андрэй выскачыў з машыны, падбег да раззлаванай медычкі, схапіў за плечы і трасянуў:

— Ты з глузду з'ехала? Ты што сабе дазваляеш? Гэта мой кліент, проста мы тут дамовіліся сустрэцца, і зараз я паеду выконваць сваю работу. Лепш ідзі, куды ішла.

— Так я табе і паверыла, але халера з табою, казліна, едзь куды хочаш. Я без цябе яшчэ лепш жыць буду.

Яна з сілаю таўханула дзверы і пайшла. Аліна не стрымалася: ніхто і ніколі яшчэ не размаўляў з ёю гэтак зняважліва. Няўжо яна заслугоўвае абразу? Слёзы міжволі пацяклі па шчаках.

— Любая, супакойся, не трэба, — Андрэй абняў яе, пацалаваў. — Не бяры да галавы, Светка — яна такая, палец у рот не кладзі. Гэта я вінаваты: не варта было сустракаць цябе каля паліклінікі. Дурань, зусім выскачыла з галавы, што яна можа ўбачыць нас. Супакойся, калі ласка.

А яна чамусьці не магла прымусіць сябе супакоіцца. З галавы не выходзілі зняважлівыя словы, было і сорамна, і брыдка, і балюча.

Амаль адразу ж за горадам ён звярнуў улева на лясную дарогу. Праз нейкі час машына спынілася. Андрэй падхапіў Аліну на рукі, укрыў пацалункамі:

— Усё будзе добра, праўда. Я цябе кахаю і ніколі не дам у крыўду. Ты самае цудоўнае і добрае, што ёсць у маім жыцці.

Аліна, закалыханая яго пяшчотамі і словамі, супакоілася. Ён разаслаў на траве квяцістую радзюжку, цёплы плед, пасадзіў Аліну і прысеў побач.

— Усё добра?

— Так. Прабач за маю слабасць.

— Што ты, не гавары глупства. Ведаеш, а я купіў нам марозіва, вельмі і вельмі смачнае. Паямо?

Марозіва насамрэч было смачнае. Лес, напоўнены водарам вясны, свежасці, шчэбетам, посвістам, ціўканнем і іншай птушынай радасцю, навейваў спагаду, спакваля нараджаў у душы разняволенасць і спакой. Каханы прытуліўся, сонечныя промні ласкава казычуць вочы. І зрабілася ўтульна, лёгка, як не было нядаўняй сцэны, і схаваліся ў закуток усе непрыемнасці.

— Ты не гаварыла з мужам? — зазірнуў ёй у вочы Андрэй.

— Не. Прабач, я не змагла. Здаецца, хачу яму ўсё сказаць, але як толькі падумаю пра Карыну, Данілу, пра ўсё тое, што будзе далей, — і мая рашучасць знікае. Мабыць, трэба пачакаць.

— Я буду чакаць столькі, колькі спатрэбіцца.

Жарсць авалодала імі. У каторы раз Аліна памірала і нараджалася зноў, узлятала ўвысь і бязважка апускалася на зямлю, замірала і абуджалася ад неверагодных пяшчотаў каханага чалавека. Свет станавіўся такім лагодным, захапляльным, што жыццё набывала новы сэнс, нягледзячы на ўсе яго дурасці і жахі. Міжволі хацелася падзяліцца хоць маленечкай жарынкай свайго шчасця з гэтым светам — настолькі яно перапаўняла Аліну ў гэтыя хвіліны.

— Ведаеш, а я заўсёды хацеў мець вялікую сям'ю, — Андрэй ляжаў на спіне і задумліва жаваў нейкую сцяблінку. — Я адзін быў у бацькоў, мне вельмі хацелася бра-

та ці сястру. Калі мы пажаніліся, Света сказала, што больш дзяцей не будзе, яна хоча пажыць для сябе. Нават тут у нас не было агульнай мовы. А ты хочаш яшчэ дзяцей?

Аліна павярнулася да яго, правяла рукой па шчацэ:

— У мяне былі толькі зводныя брат з сястрою, добрых адносін з імі не склалася, я нічога не магу сказаць пра тую сям'ю. Калі ў мяне нарадзілася дачка, Віця захацеў сына. У нас атрымалася, з'явіўся на свет Даніла. Але Віця пасля гэтага заявіў, што дваіх нам хопіць. А вось мне хочацца яшчэ адну дачку. Я нават імя прыдумала — Сафія. Праўда, прыгожае?

— Прыгожае. Гэта, дарэчы, і імя маёй мамы. А давай з табой народзім Сафійку?

— Летуценнік, — яна абняла Андрэя. — Ты забыў, дзе мы і хто мы.

— Нічога, я ж абяцаў пачакаць.

10

Мінуў месяц, другі, а ў адносінах Аліны з Андрэем нічога не змянілася. Андрэй жа прайшоў усе суды. Да пасяджэння Света запатрабавала ад яго пяць тысяч даляраў, аліменты пасля, само сабой, інакш развод не дасць. Спачатку Андрэй псіханул, адаслаў яе падалей, але, астыўшы, пагадзіўся сплаціць ёй грошы. З цяжкасцю наскроб патрэбную суму і атрымаў рашэнне аб разводзе.

Аліна так і не змагла перасіліць сябе, пагаварыць з мужам. Яна па-ранейшаму ўсімі праўдамі і няпраўдамі выбіралася на спатканні з Андрэем, ужо звыкла хаваючы ў сабе сорам за хлусню і нявернасць. Яе сэрца разрывалася ад супярэчных пачуццяў, думак пра сям'ю і Андрэя, перажыванняў за будучыню сваіх дзяцей. Страх апаноўваў яе, калі яна ўяўляла сабе, як пакуе рэчы, збірае дзяцей, сыходзіць у невядомасць, хай сабе і з каханым. Як толькі яна даходзіла да гэтага моманту ў сваіх думках, рукі апускаліся і яна вырашала адкласці размову на заўтра, паслязаўтра, на наступны тыдзень. А Андрэй, як і абяцаў, цярпліва чакаў, калі ў ёй саспее смеласць і рашучасць.

У той жнівеньскі дзень Аліна выбралася ў горад, каб пагледзець дзецям штосьці з вопраткі да школы. За лета і Карына, і Даніла прыкметна падцягнуліся, выраслі са сваіх рэчаў, паднавіць школьны гардэроб было проста неабходна. Памеры дзіцячыя яна ведала і дзяцей з сабою не брала — яны засталіся дома ўдваіх. Усё ж Карына не маленькая, дагледзіць Данілу. Да таго ж суседка, з якой добра сябруюць, у дэкрэце, заўсёды падстрахуе і прыгледзіць за малымі. Яшчэ не брала дзяцей і з той прычыны, што акрамя пакупак дамовілася ўбачыцца з Андрэем.

Ён сустрэў яе каля гарадскога базару, Аліна, тым часам, ужо паспела набыць амаль усё, што планавала. Андрэй выйшаў з машыны, закаханыя абняліся. Гэтым разам яны паехалі на лецішча — Андрэй ведаў, што сёння суседзяў не будзе і чужыя вочы не нашкодзяць ім.

Аліна выйшла з машыны. Надвор'е змянілася. Гарачыня, якая даймала раніцай, адступіла, нібыта вырашыла прыхавацца да лепшых часоў. Сонечнае святло паблякла, зацягнулася лёгкай смугою, па небе пацягнуліся чорныя хмары, вецер дробна затрымцеў лістотаю. На захадзе пагрымлівала, паблісквалі кароткія яркія сполахі, і, хутчэй за ўсё, дзень павінен быў скончыцца навальніцай. І яна падступала. Аліна любіла навальнічнае прадвесце. Хоць яно і нараджала пэўную трывогу, лёгкае ўзру-

шэнне, але яна атрымлівала таемнае задавальненне ад бурклівых ці раскацістых грымотаў, зыркіх, кароткіх агнявіц, першага нясмелага пошчаку дажджу, бурных парываў ветру. У жыцці яна пабойвалася перамен, а ў прыродзе іх чакала. І хай сабе будзе залева, хай.

— Пойдзем, дождж вось-вось пачнецца, — пацягнуў яе за руку Андрэй.

— Пачакай, я хачу пабыць на вуліцы. Тут хораша. Ты не згодзен?

— Ты пра навальніцу? У гэтым нешта ёсць, але можна змокнуць.

— А я хачу змокнуць, хачу адчуць на сабе пацалункі дажджу, хачу растварыцца ў ім, хачу, каб ён забраў з сабою ўсё дурное, непрыемнае. Дождж, хутчэй пачынайся! Я чакаю цябе!

Аліна ўзняла рукі, заплюшчыла вочы, закружылася.

— Божа, якая ж ты неверагодная! — прашаптаў Андрэй. — Ты сама як навальніца, як маланка, ты фея дажджу. Я кахаю цябе, кахаю…

Ніхто і нішто не перашкаджала ім, нават дождж. Па даху машыны блюмкнулі першыя буйныя кроплі, удалечыні паласнула маланка і гулка, працяжна і пагрозліва прагрымеў гром. Андрэй адчуваў, як жарсць зноў зацягвае яго ў сіло, як Аліна сцягвае з яго адзенне. І спыніцца яны не маглі. Гарачае дыханне апаліла іх, закаханыя зліліся ў адно цэлае. Дождж абмываў валасы, вусны, разгарачаныя целы, але не мог астудзіць тое, што адбывалася паміж імі.

Навальніца скончылася гэтак жа хутка, як і пачалася. Пакінуўшы пасля сябе невялікія калюжыны, мокрую траву і свежае паветра, яна пасунулася далей, на ўсход. Туды папаўзлі хмары, грымоты і палахлівыя маланкі. Сцішэлая прырода ачуньвала пасля кароткага нападу.

— Мы змоклі, — прашаптаў Андрэй.

— Так, але мне цёпла з табою, — шэптам адказала яна.

— Не, трэба ісці ў хату і апрануцца ў сухое — не хапала, каб ты яшчэ захварэла.

Ён падхапіў яе на рукі і панёс. Пасля пакапаўся ў шафе, знайшоў там стары цёплы халат, захутаў у яго Аліну, паставіў ваду для гарбаты і падрыхтаваў кубкі. З кладоўкі прынёс абагравальнік, развесіў адзенне для прасушкі. Аліна сядзела на ложку і замілавана любавалася тым, як Андрэй завіхаецца. У гэты момант яна востра, да болю ў сэрцы, зразумела: як жа цяжка жыць без кахання. Вось Андрэй робіць самыя простыя рэчы, а ёй гэта так прыемна, так салодка назіраць за яго рухамі, што не выказаць. З Віктарам яна і блізка таго не адчувае. Ёсць пачуццё ўдзячнасці як мужу і бацьку яе дзяцей, ёсць пачуццё абавязку, ёсць прывычка, ёсць цярпенне і яшчэ штосьці іншае, што цяжка перадаць словамі, няма толькі кахання.

Гарачая гарбата з цукеркамі і шакаладам прагнала смагу і пачуццё лёгкага голаду. Яны пра нешта гаманілі, цалаваліся, аж пакуль Аліна нечага не спахапілася:

— Колькі часу?

Андрэй зірнуў на гадзіннік:

— Без чвэрці шэсць.

— Вой, што я дома гаварыць буду? Трэба збірацца. Я ж думала, што буду каля трох, дома процьма работы, і дзеці чакаюць.

Ён адвёз Аліну ў Зарэчнае і паехаў, шчаслівы.

11

Аліна звярнула на сваю вуліцу і са здзіўленнем адзначыла, што Віктараў трактар стаіць каля хаты. Муж дома ў гэты час? Чаму? Падступіла трывога: дзеці. Што з імі? Паскорыла крок, усхваляваная, заляцела ў хату. Дзеці выбеглі насустрач:

— Мама, мамачка прыехала. Мама, а што ты купіла?

— Усё купіла, мае даражэнькія. У вас усё добра?

— Ага, мы гулялі, потым паабедалі і зноў гулялі. А Даніла кубак разбіў, а цябе тата чакае, — выпаліла адным сказам Карына.

— Тата? Мяне?

Яна зайшла ў пакой. Віктар сядзеў на канапе і нібыта глядзеў тэлевізар.

— Віця, штосьці здарылася? Ты дома ў такі ранні час.

— Затое цябе няма дома.

— Ты ж ведаеш, што я была ў горадзе, праўда, затрымалася крыху — дождж падвёў.

— Ведаю я гэты дождж. Дзеці, ідзіце пагуляйце, нам з мамай патрэбна пагаварыць.

Ён падняўся, шчыльна зачыніў дзверы. Стаіўшы дыханне, яна села.

— Ну, раскажы мне, з кім ты сёння абдымалася, з кім паехала і дзе была дагэтуль.

І раптам ёй палягчэла, як зваліўся цяжар: ведае. Усё, не трэба падманваць, выкручвацца, адводзіць вочы. Цяпер можна гаварыць адкрыта. Адно цікава: адкуль?

— Маўчыш? Не ведаеш, што схлусіць? Я табе скажу, калі мне маці патэлефанавала, не паверыў адразу. Мая Аліна не можа такога зрабіць. Вырашыў не шукаць цябе, пачакаць. І вось бачу, што можа. Не думаў я, калі цябе замуж пазваў, што ты такое выкінеш. І біць не хочацца — агідна.

Аліна ўзнялася, падышла да акна, ціха загаварыла.

— Віця, прабач мне, я вінаватая перад табою. Ты добры муж, гаспадарлівы, харошы. У нас цудоўныя дзеткі. Усё так, але так склалася, што я не кахаю цябе, разумееш? Так, я вінаватая, не ты, бо я зрабіла памылку, калі вырашыла пайсці замуж. Тады мне здавалася, што можна жыць без кахання, што гэта неістотна. На вялікі жаль, я жорстка памылялася і цяпер расплачваюся за сваю памылку.

— А я не расплачваюся? А мне не балюча?

— Прабач, я разумею, што…

— Ні халеры ты не разумееш. Ты мне ўсё жыццё зламала. Ведаеш, хто ты пасля гэтага? Змяя.

Грымнулі дзверы. Праз хвіліну на вуліцы завуркацеў рухавік, трактар з прабуксоўкай ірвануў з месца. Аліна зняможана апусцілася на падлогу. Балюча, чаму так балюча зрабілася на сэрцы? Быццам усё сказана, раскладзена па палічках, а як штосьці вельмі важнае згубілася. Хочацца яго знайсці, каб было, як раней, а ты разумееш, што так, як раней, ужо ніколі не будзе. Яна ціхенька заплакала.

— Мамачка, не плач. Я не хацеў разбіваць кубак, я выпадкова. Я болей не буду.

Даніла сеў побач, абняў, следам прыдыбала і Карына, таксама прытулілася.

— Любыя мае, харошыя… — яна абняла дзяцей. І боль стаў сціхаць, адыходзіць. Цяпер Віктар усё ведае, можна сказаць пра развод, вырашаць, як жыць далей. Ан-

дрэй сказаў, што можна пераехаць да яго. Якраз да новага навучальнага года дзецям школу знайсці, сабе працу. Неяк зрасцецца. Трэба падымацца, рабіць вячэру.

Віктар прыехаў дахаты ў прыцемках. Нічога не кажучы, памыўся, пераапрануўся і пайшоў у залу. Аліна пайшла за ім:

— Ідзі павячэрай.

— Дзякуй, накарміла ўжо.

Яна цяжка ўздыхнула.

— Віця, давай развядзёмся — ты ўсё ведаеш, так далей жыць нельга.

— Нельга кажаш? Развод? Добра, будзе табе развод, але дзяцей я табе не аддам.

— Як гэта? — яна пахаладзела.

— А вось так. У судзе скажу, што гэта ты здрадніца, гэта ты разбурыла сям'ю. Як пасля гэтага ты можаш выхоўваць дзяцей? Бо гэта так. Да таго ж хату атрымаў ад калгаса я, яна мая, нам ёсць дзе жыць, а ты ідзі на ўсе чатыры бакі. Мая маці дапаможа гадаваць дзяцей, не прападзём. А ты ідзі да свайго каханка, мілуйся з ім.

— Ты не зробіш гэтага.

— Яшчэ як зраблю! Самага лепшага адваката адшукаю, не пашкадую грошай, але дзеці застануцца са мною. Гэта я табе абяцаю.

Аліна выйшла з залы. Яе затрэсла, думкі заскакалі, як звар'яцелыя: дзеці, Андрэй, Віктар, хата. Выпіла заспакаяльнае, села. Было чуваць, як Віктар сцеле ў зале на ноч. Горка ўсміхнулася: упершыню за ўсё сумеснае жыццё яны будуць спаць паасобку. Што рабіць? А што, калі Віктар і сапраўды зможа адсудзіць дзяцей? Не, яна не дазволіць, не аддасць, яна не зможа без дзяцей — гэта ўсё, што ў яе ёсць. Трэба пагаварыць з Андрэем. Так, ён параіць, што рабіць.

Аліна ціхенька выслізнула з хаты, схавалася за гаражом. Андрэй адказаў амаль адразу ж.

— Слухаю, каханая.

— Андрэй, Віця ўсё ведае, і ён, — нечакана для сябе яна не стрымалася, расплакалася, — ён, ён…

— Ціха, любая, ціха, супакойся. Ён што — ударыў цябе?

— Не, не, — яна хлюпнула носам, — ён сказаў, што не аддасць мне дзяцей. Разумееш? Сказаў, што адсудзіць і ўсё. Што мне рабіць, Андрэйка?

— Па-першае, не панікуй. Ніхто ў цябе дзяцей пакуль не адбірае і, думаю, не адбярэ. Па-другое, супакойся, кладзіся спаць: пераначуеш — болей пачуеш. У мяне ёсць знаёмы юрыст, я пагавару з ім. Ты ж ведаеш, што я заўсёды з табою. Добра?

— Добра.

— Цалую цябе, каханая. Дабранач.

— Дабранач.

Крыху абнадзееная, яна пайшла дахаты. Прысела каля дзяцей, якія ціха саплі ў сне, замілавана ўзіралася ў любыя вочкі, носікі, тварыкі, гладзіла абаіх. Не, нікому сваіх дзяцей яна не аддасць, нікому, ужо лепш памерці.

12

Спала Аліна трывожна, неспакойна. Некалькі разоў за ноч падхоплівалася, бо скрозь сон здавалася ёй, што плачуць дзеці. Прыўзнімалася, услухоўвалася ў цемру, але падстаў для трывогі не знаходзіла. Тады, зняможана-заспакоеная, звальвалася на падушку. Гэткі палахлівы зайчыны сон падняў яе яшчэ а пятай. Занялася гатоўкай, але ўсё валілася з рук. Балела галава, і ўвогуле было пагана. Пераадольваючы слабасць і пануры настрой, пастаралася паглыбіцца ў дамашнія клопаты.

Віктар прыйшоў на кухню, зрабіў сабе гарбату, выцягнуў штосьці з лядоўні і хутка паснедаў. Рабіў выгляд, што не заўважае яе. Не прайшло і пяці хвілін пасля таго, як муж моўчкі падаўся на працу, бразнулі дзверы. Аліна азірнулася. Свякроў. Апранутая па-святочнаму: новы, светлы, у дробныя валошкі халат, убраныя валасы, у руках невялікі пакет. Увогуле адносіны ў Аліны са свякроўкай склаліся. Ніна Васільеўна адносілася да таго нешматлікага тыпу жанчын, якія не любяць пляткарыць, перамываць костачкі аднавяскоўцам і даваць парады на ўсе жыццёвыя сітуацыі. Мужа яна пахавала рана, сына гадавала адна і аддана любіла, а для Віктара з’яўлялася аўтарытэтам. Аліну свякроў прыняла добра, рэдка ўмешвалася ў жыццё маладой сям’і, цешылася ўнукамі і дапамагала тым, што мела з невялікай асабістай гаспадаркі.

— Ну, здароў, нявестачка. Я вось дзеткам гурочкаў свежых і яек прынесла.

— Добры дзень мама, дзякуй. Сядайце, калі ласка. Можа, вам гарбаты ці кавы зрабіць? — ціха адказала Аліна.

Ніна Васільеўна села.

— Не, дзякуй, я нядаўна паснедала. Ты от лепш скажы мне: чым жа гэта табе не дагадзіў мой Віця?

Аліна выцерла мокрыя рукі, прысланілася да лядоўні.

— Не ў гэтым справа, проста я не кахаю яго, разумееце?

— І даўно ты зразумела?

Аліна нічога не адказала. Свякроў памаўчала, загаварыла першай.

— От часы насталі, я табе скажу. А ўсё таму, што волі зашмат, што глядзяць розную непатрэбшчыну ў гэтых кампутарах, вучацца абы-чаму, голад не даймае. А што ты нажывеш з гэтай любові? Вось раней як жаніліся? Знаходзілі бацькі хлапцу дзяўчыну, сваталі, жанілі — і жылі тыя, дзяцей гадавалі. Каханне каханнем, а ў цябе сям’я, і робіш ад цямна да цямна. Клопат быў: накарміць, абуць-адзець дзетак, скаціну дагледзець, самім якую капейчыну адкласці. А цяпер падфарбуюцца, падкруцяцца, задзяруць галаў і нясуцца прыгод шукаць, а пра мужыка з дзецьмі і не думаюць…

Аліна маўчала, гледзячы ў падлогу. Свякроў на нейкі час прыпыніла свой маналог.

— Я ж на базар паехала атруты ад жукоў купіць, сабе сёе-тое паглядзець. Гляджу — а ты з нейкім ахламонам абдымаешся-мілуешся. Пасля селі і паехалі некуды. Мне й духі заняло, хай бы мае вочы таго не бачылі. Віцю патэлефанавала, думала, дадому не даеду. Што ж ты маўчыш? І не сорамна табе, га?

Аліна ўздыхнула.

— Я вінаватая перад Віктарам, што пайшла замуж без кахання, але лепш гэта зразумець позна, чым ніколі. Цяпер я пакахала харошага чалавека. І нам з Віктарам лепш развесціся.

— Вось як ты загаварыла! — Ніна Васільеўна падвысіла голас. — А дзяцей без кахання вы зрабілі? А амаль дзесяць гадоў без кахання пражылі? Ты пра сына з дачкою падумала? Як чужы чалавек стане ім бацькам пры жывым бацьку? Што ты на гэта адкажаш?

Аліна не ведала, што адказаць, а спрачацца са свекрывёю не было жадання. А тая раптам нахілілася да Аліны і горача зашаптала:

— Кінь ты дурное, адумайся, ты ж не такая шылахвостка, як некаторыя, я цябе добра ведаю. Усё ж тут дзеецца паміж намі. А Віця харошы, ён жа ў мяне не зласлівы, спагадлівы. Калі ты папросіш прабачэння і выкінеш з галавы дурное, я з ім пагавару, і, думаю, ён адыдзе, даруе табе. З кім не бывае — дзела маладое, усе мы грашылі ў маладосці. А вам жа дзетак трэба гадаваць, на ногі ставіць. Ці ж не так, нявестачка? Жыццё вялікае, нездарма кажуць: кінь за сабою, знойдзеш перад сабою. Ты пра гэта крэпка падумай.

Аліна не хацела плакаць, але даверлівы тон свекрыві як нешта прабудзіў у ёй: слёзы самі пацяклі па шчаках, вочы затуманіліся.

— Паплач, паплач, табе лягчэй стане. Нам, бабам, без слёз нельга, мы ўсё сваё гора выплачам і жывём далей. Праўда, ты падумай пра дзяцей, пра сябе, пра Віцю. Глядзіш, і надумаеш штосьці. А я пайду пакуль, работы ў мяне назбіралася.

Свякроў пайшла, а праз нейкі час Аліна сцішылася. І сапраўды, слёзы прынеслі палёгку, нават нейкую абыякавасць да ўсяго, што адбывалася з ёю апошнім часам. Яно адплыло, як адгарадзілася нябачнай сцяной, думкі пайшлі ў іншым кірунку — пра будзённыя клопаты. Але такое адчуванне трывала нядоўга. Патэлефанаваў Андрэй.

— Прывітанне, любая. Як ты?

— Прывітанне, нічога асаблівага.

— Слухай, я размаўляў са сваім знаёмым юрыстам. Ён сказаў, што наўрад ці дзяцей пакінуць з бацькам. Тэарэтычна такое, вядома, магчыма, але толькі тэарэтычна, разумееш? Ты ж нармальная маці, хто ж пойдзе на тое, каб дзяцей ад маці адарваць? Ты мяне слухаеш?

— Так. Давай пасля пагаворым, я пакуль не магу.

Ёй насамрэч зрабілася блага. Акрамя ўнутранай спустошанасці, адчувалася слабасць, млявасць, нават злёгку кружылася галава. Мабыць, усе хваляванні, перажыванні, цяжкая ноч пакінулі свой адбітак. Аліна вырашыла зрабіць сабе кавы, паснедаць, каб трохі падбадзёрыцца. Трэба па-хуткаму зрабіць сабе яешню. Разбіла яйка ў патэльню і раптам адчула, што яе пацягнула на ваніты. Толькі гэтага не хапала, зусім нервы ні да чорта. Дайшла ты, Аліна. Яна выпіла вады, аддыхалася. Гэтак яе цягнула на ваніты, калі была цяжарная Каралінай. І ў той жа момант яна знерухомела, маланкай бліснула згадка: у яе ж затрымка, ужо болей як два тыдні. Няўжо? Села, схапілася за галаву. Калі гэта так, то ад каго будзе дзіця, сумненняў няма: з мужам яны даўно засцерагаюцца ў ложку.

Яна ліхаманкава пабудзіла дзяцей, пакарміла, загадала сядзець дома, гуляць, а сама прыхапкам сабралася ў горад. Яшчэ забегала да суседкі, папярэдзіла і пайшла на дарогу. У горадзе купіла тэст і вярнулася дахаты. Ужо апоўдні ведала, што цяжарная.

Аліна легла на канапу, укрылася пледам: бралі халодныя дрыжыкі. Дзеці зноў нешта не падзялілі, сварацца, але ў яе не ставала ні жадання, ні сіл падняцца, каб паўшчуваць іх. Што цяпер рабіць? Пры разводзе дзяцей могуць пакінуць з Віктарам, хай сабе і тэарэтычна. Ён жа абяцаў знайсці самага лепшага адваката. І знойдзе — яна не сумнявалася. А дзеці? Як яны зрэагуюць на тое, калі яна скажа, што ў іх новы тата? Як яны прымуць Андрэя? Ім не растлумачыш дарослыя гульні. Яна ўявіла сабе, як вядзе іх ад Віктара, яны плачуць, цягнуць да яго рукі. Для Данілы добры чараўнік — гэта тата. Пасля ўзгадала сваё нешчаслівае дзяцінства з чужым татам, адчужанай маці, калі ёй так не хапала роднага чалавека, яго рук, яго слоў, яна так чакала, а ён не прыязджаў. Няўжо такім жа лёсам яна надзеліць Карыну і Данілу? Усё паўторыцца? Каб пасля яны ўспаміналі яе дрэнным словам? Не, такога лёсу яна ім дакладна не хоча.

Падумала пра Віктара. Не, Віця нядрэнны. Нават цяпер, калі ён даведаўся пра яе здраду, не крычаў, не пагражаў. Руліцца на працы дацямна, а ўсё дзеля сям'і, дзеля дзяцей. Ды ён жа ніколі слова дрэннага ў яе адрас не сказаў. А яна? Няўдзячная, эгаістычная, дбае толькі пра сябе. І штосьці добрае, нейкая цеплыня разлілася па сэрцы, калі падумала пра мужа. Мабыць, мае рацыю Ніна Васільеўна, не варта ёй выдурняцца, трэба выкінуць з галавы Андрэя.

Андрэй. А як жыць без яго, ведаючы, што ён ёсць на гэтай зямлі, дзе ўзяць тыя сілы, каб забыць каханне? З ім, пэўна, не будзе такога, каб з вачэй сышоў — і з памяці зваліўся. А што рабіць з дзіцем, з новым жыццём, якое яна ўжо носіць у сабе? Калі Віця даведаецца пра цяжарнасць, аніякага прымірэння дакладна не будзе — гэтага ён ёй не даруе. Што рабіць? Яна завывала параненай ваўчыцай, але ціха, у падушку, каб не спалохаць дзяцей. Цяпер толькі ёй разблытваць туга знітаваны клубок, ёй вырашаць і свой лёс, і лёс сям'і.

13

Дзень прайшоў у цяжкіх роздумах, але ўрэшце яна цвёрда вырашыла, што не мае ні маральнага, ні мацярынскага права пазбаўляць дзяцей шчаслівага дзяцінства, сямейнай цеплыні і любові. Канешне, яна спляжыць свае пачуцці, каханне, але на тое яна і маці, хай будзе дрэнна толькі ёй. Сапраўднай маці добра тады, калі добра яе дзецям. Развод дрэнна паўплывае на дзіцячую псіхіку, а наступствы могуць быць непрадказальнымі. Да таго ж яна падсвядома баялася яшчэ аднаго: а раптам у іх з Андрэем нічога не атрымаецца? Што тады? Ад адной такой думкі яе кідала ў холад.

Як сказаць пра тое Андрэю, як стрымаць свае пачуцці? Неяк усё ж сабралася, узяла ў рукі тэлефон.

— Андрэй, прабач. Я не магу.

— Што здарылася, любая?

— Мы не зможам быць разам…

— Як?! Чаму? — закрычаў Андрэй.

— Дзеці любяць Віктара. Яны яшчэ малыя, баюся, што развод надломіць іх. Не хачу, каб яны адчулі тое ж, што адчувала ў дзяцінстве я, хай хоць яны зведаюць бацькоўскую любоў і цеплыню. Спадзяюся, што ты мяне зразумееш і даруеш.

— Аліна, пачакай, пачакай! Ты не можаш так! — горача загаварыў Андрэй. — Ты зараз на эмоцыях і не ўсведамляеш, што робіш. Я ж сказаў, што не пакіну цябе, зраблю ўсё, каб табе і дзецям было добра, я дзень і ноч працаваць буду. Яны для мяне будуць як родныя. Ці ты мне не верыш?

— Веру, але гэта дзеці, мае дзеці, у іх склаўся свой свет, у якім ім утульна і добра, а я яго зруйную. І калі яны вырастуць, баюся, што яны могуць не дараваць мне гэтага. Зразумей, дзеці для мяне даражэйшыя за ўсё. А калі яшчэ Віктар адсудзіць іх, гэтага я дакладна не перажыву. Я слабая жанчына, і я баюся. Прабач.

— Аліна, Аліначка, пачакай, разам мы ўсё пераадолеем.

— Не, я цвёрда вырашыла, прабач. Не шукай мяне больш…

Яна адключыла тэлефон, хоць так хацелася закрычаць: «Лю́бы, прыязджай і забяры мяне, я не магу без цябе!»

Але яна змагла стрымацца, адно толькі дазволіла сабе выплакацца ў падушку. Праз нейкі час паднялася, спакойная і ўпэўненая, занялася хатнімі справамі, дзецьмі, а ўнутры ўтварылася пустэча, нібыта там усё заінела і здзірванела. Муж вярнуўся позна, калі дзеці ўжо спалі. Ён памыўся, пераапрануўся ў хатняе, зрабіў сабе гарбаты і ўзяў у рукі печыва. Яна села побач, ціха загаварыла:

— Віця, ведаеш, я доўга думала пра тое, што адбылося са мною… з намі, ўрэшце. Я зразумела, што не магу выкрасліць усё, што было і што яшчэ ёсць паміж намі. І яшчэ. Нашы дзеці… Яны любяць і цябе, і мяне, а мы любім іх. І мы не можам зрабіць штосьці дрэннае для іх. Я вінаватая перад табою, але я хачу, каб мы былі разам. Прабач, калі зможаш.

Віктар моўчкі сёрбаў гарбату. Дапіўшы, адсунуў кубак, з сілаю сціснуў абгортку ад печыва, шпурнуў камяк у сметніцу. Маўчанка працягвалася. Віктар пстрыкнуў выключальнікам і пайшоў спаць у залу. Аліна нейкі час сядзела ў цемры, думала. Душэўныя пакуты знясілілі яе, але спаць не хацелася. Некалі яна марыла пра свой дом, сям'ю, дзяцей, уяўляла, як яны ўсе гуляюць разам, трымаюцца за рукі, глядзяць адно аднаму ў вочы і шчасліва ўсміхаюцца. Цяпер яна мае амаль усё, пра што марыла. Не хапае дробязі: яны не глядзяць адно аднаму ў вочы. То што далей? Якімі вачыма яны будуць глядзець адзін на аднаго? Ці зможа яна забараніць сабе думаць пра Андрэя?

Дзеці яшчэ спалі. Аліна выцягнула прыхаваныя на чорны дзень сто даляраў, зайшла ў чарговы раз да суседкі і паехала ў горад. У кабінеце гінеколага яна дамовілася хутка, працэдура аборту прайшла паспяхова. З кабінета выйшла спустошанай і з пачуццём нянавісці да самой сябе. Жыццё губляла ранейшыя фарбы, той сэнс, дзеля якога хацелася б спяшацца, смяяцца, здзіўляцца. Засталася адно тонкая нітачка — дзеці. Цяпер яны яе жыццё.

Ідучы каля царквы, спынілася. Раптоўная пранізлівая думка жахнула яе, увагнала ў ступар: што ж яна нарабіла? Адштурхнула каханага, пасля аборт. Двайное забойства. Хацелася закрычаць, але сэрца скамянела, крык горкім камяком захрас унутры, не вырваўся на волю. Горкая ўсмешка: вось, Аліна, ты і атрымала падарунак ад жыцця. Дык ці патрэбна было табе вялікае каханне, ці патрэбна было кідацца ў вір, каб пасля не выплыць з яго, адно ўчарнець ад гора і злыбяды? Дзве дарогі так і не знітаваліся. Лёс?

Віктарава маўчанне доўжылася некалькі дзён. Ці вырашыў ён сам, ці маці змагла пераканаць яго, невядома, але ў суботу Віця прынёс бутэльку дарагога віна, паставіў на стол і сказаў:

— Зрабі нам павячэраць.

Яна паклала дзяцей спаць, паслала чысты настольнік, паставіла посуд. Муж наліў ёй і сабе па келіху, выпіў, яна прыгубіла. Віктар выпіў яшчэ раз і загаварыў:

— Мне цяжка было пераварыць усё, многае перадумаў. Хачу, каб ты ведала: другога разу не будзе, адразу ж за мэтлахі і выкіну на вуліцу. Я хачу нармальную сям'ю, дзе ёсць узаемаразуменне, давер і мір. Ты гатовая да гэтага?

— Так, — цвёрда адказала Аліна.

Віктар паабяцаў дараваць здраду, будзе надзяляць больш увагі і дзецям, і ёй як жанчыне. Спаць яны пайшлі разам.

14

Андрэй некалькі дзён не мог паверыць у тое, што страціў Аліну. Ён спрабаваў тэлефанаваць, але яна спачатку не адказвала на званкі і паведамленні, а пасля заблакавала яго нумар. Ён ледзь не звар'яцеў: шчасце было амаль што ў руках і раптам сплыло. Хацеў спачатку паехаць да яе, але тады прыходзіла цвярозае разуменне, што гэтым толькі створыць яшчэ большыя непрыемнасці каханай, зробіць балюча. Неяк уначы вырашыўся, прыехаў да сядзібы ў Зарэчным, доўга стаяў і глядзеў на цёмныя вокны, намагаючыся ўбачыць там яе, але вокны заставаліся абыякавымі. Дзе яна, што яна думае? Стукнуў кулаком у лабавое шкло, глуха прастагнаў і на шалёнай хуткасці паімчаўся ў горад. Раніцай заехаў у краму, купіў гарэлкі, з'ехаў на лецішча і на некалькі дзён запіў. Глядзеў на фотаздымкі з Алінаю ў тэлефоне, цалаваў іх і піў далей. Пасля спрачаўся з ёю, тлумачыў нешта і засынаў у абдымку з тэлефонам.

Маці прыехала раніцай, калі ён яшчэ спаў. Яна агледзела пакой, села побач, прыслухалася да цяжкага сынавага дыхання. Паднялася і ўзялася за працу: павыносіла пустыя бутэлькі, пазбірала аб'едкі і смецце, прыбрала ў пакоі, прыадчыніла акно. Андрэй прачнуўся а дзясятай, з цяжкасцю адарваў галаву ад падушкі, здзіўлена прамармытаў:

— Мама? Ты што тут робіш?

— Адзінага сыночка ратую. А вось што ты робіш? Ці ж так можна? Я сабе месца не знаходжу, а ён знік, на званкі не адказвае, кінуў сям'ю ды яшчэ співаецца. Што з табою, сынок?

— Ах, мама, не пытайся пакуль, — Андрэй аблізнуў засмяглыя вусны. — Мне проста баліць душа. Не хвалюйся, піць болей не буду, на гэтым усё. Зараз крыху адыду і паеду.

— Куды ты паедзеш, працверазей хаця. Я паесці прывезла, зрабіла каву. Памыйся ды сядай за стол. Гора ты маё…

Пасля навагодніх святаў Андрэй перабраўся ў Мінск: ён не змог жыць у родным горадзе, дзе ўсё нагадвала пра Аліну. Вырашыў, што на новым месцы будзе лягчэй, там хутчэй забудзецца былое.

**Эпілог**

У новым навучальным годзе ў школе многія заўважылі перамену ў Аліне Аляксандраўне: яна стала больш строгай і патрабавальнай да вучняў, менш усмешлівай і вясёлай у размовах з каляжанкамі, жорсткай, іншы раз нават цынічнай у спрэчках. Аднойчы здзівіла Віку тым, што папрасіла ў яе цыгарэту. І пасля нярэдка выходзіла разам з ёю пакурыць, хоць дома яна гэтага сабе ніколі не дазваляла і хавала дурную звычку ад мужа. На ўроках дзеці бачылі, як яна калі-нікалі штосьці глядзіць у тэлефоне, нечаму ўсміхаецца. Тады яе твар святлее, позірк робіцца задуменным, а сама яна як бы знікае на нейкі час у невядомасць.

Стаяў гарачы майскі дзень. Аліна расчыніла акно, каб разагнаць задуху ў класе; дзеці старанна схіліліся над сшыткамі, пісалі кантрольную. Яшчэ трохі — і празвініць апошні званок, завершыцца чарговы школьны год. Яна глядзела на вуліцу, кусты квітнеючага бэзу, рудога сабаку, які немаведама чаго швэндаўся па школьным двары, штосьці вынюхваючы. Краем вока заўважыла, як засвяціўся экран тэлефона. Зірнула і ўбачыла, што на вайбер прыйшло паведамленне з незнаёмага нумара. Яна адкрыла паведамленне. Некалькі фотаздымкаў, на якіх яна пазнала Андрэя. Вось ён стаіць на полі побач з самалётам. На другім ён з парашутам садзіцца ў самалёт. Трэці фотаздымак зроблены з самалёта, а на апошнім Андрэй стаіць каля самалёта побач з незнаёмцам. Знізу яна прачытала допіс:

«Шкада, каханая, што ты так і не змагла скокнуць з парашутам. Нават разам са мною. Але я буду чакаць цябе столькі, колькі спатрэбіцца. Памятай гэта. Твой Андрэй».

Аліна павялічыла здымак, нейкі час паўзіралася ў такі родны і блізкі твар, пасля пяшчотна пацалавала.

нарадзіўся 30 чэрвеня 1967 года ў вёсцы Лучыцы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь. Аўтар кніг прозы «Пропавшая судьба» (2007), «Храм его души» (2011), «Зелянее рунь» (2011), «Оракулы Междуречья» (2013), «Планктон» (2017), кніг для дзяцей «Янка, Шмурдзік, Бухматка ды іншыя», «Таямніца гары Міндоўга» (2019), «Чаму знікла сонейка» (2021). Жыве ў Наваградку.



ВІКТАР САЗОНАЎ

## Фрак

Сказаць, што Франак быў піжонам, будзе занадта перабольшана і вельмі нядобразычліва ў адрас гэтага сціплага, як ранішні матылёк, чалавека. Прычым — наўмысна перабольшана. Не верце аніводнаму слову таго, хто адважыцца вымавіць гэтую абсурдную лухту. Нагаворы тое ўсё, без падстаў і аргументаў.

А што пра яго хадзілі такія чуткі, дык гэта мясцовыя паскуднікі панавыдумлялі ўсялякага і ляпалі злымі языкамі, як бабы выбівачкамі для дываноў. Хіба што з зайздрасці ад заўсёды шляхетнага выгляду, акуратна адпрасаванай і густоўна падабранай вопраткі Франака. А можа, проста з паганай натуры шкодзілі таму чалавеку на пустым месцы і без дай прычыны. Хто іх разбярэ? Людзі ж розныя бываюць.

Ніякі Франак не піжон, я вам скажу. Далёка яму было нават да выпяндрожніка мясцовага разліву. Не дацягваў да такога высокага ды пачэснага ў асяродку гарадзенскіх выпівох звання. Ды і да сярэднестатыстычнага стылягі не быў падобны нават з агаворкамі. Ён проста па складу свайго характару не дазваляў сабе з’яўляцца на людзях у лахманах ды брудзе, вось і ўвесь выпяндрож, стыляжніцтва і піжонства разам узятыя. Сцвярджаў, што гэта з-за павагі да людзей трэба быць акуратным. Толькі і гэта не было праўдай.

Тут ужо ён ілгаў і іншым, і сам сабе, любімаму. Ці, калі сказаць больш дакладна, не да канца праўду гаварыў.

Сутнасць у тым, што не для ўсіх людзей прасаваў да вастрыні бандыцкай фінкі канцікі сваіх свежых, як зімовы ранак, штаноў Франак. А ўсяго толькі для паловы чалавецтва. Прычым для паловы жаночай.

Ну цягне здаровага мужчыну да жанчын! А да каго ж яго павінна цягнуць? Што тут такога?! А іншая палова людскога роду яго цікавіла выключна ў ролі дзелавых партнёраў, прыемных суразмоўцаў, аднадумцаў, сяброў і проста сабутэльнікаў. І для гэтых ён не тое што запанкі на кашулі не спяшаўся дэманстраваць, але не заўсёды і тую кашулю на пупе зашпільваў.

Мы на яго за гэту двудушнасць не крыўдзіліся ані кропелькі. Кожны мае права на свае слабасці. Вось перад жанчынамі Франак стараўся намалявацца прыгожа апранутым, гладка паголеным, гаварыў прыстойна, матам не лаяўся, не смаркаўся на зямлю, нават шнуркі на туфлях завязваў. А з намі выглядаў у меру паршыва, злёгку неахайна і практычна нічым ад іншых не адрозніваўся. Ну, можа, крыху толькі. І то па інерцыі.

Але цяпер не пра тое.

Багата гадоў сплыло з часоў нашага юнацтва, усе і не палічыш без калькулятара. Памянялася практычна ўсё, нават твары істотна здэфармаваліся ад жыцця і шкодных звычак. Якія былі раней, то не кожны камп’ютар з надзвычай разумнай праграмай распазнавання абліччаў зыдэнтыфікуе з сённяшнімі. А вось адна рэч засталася нязменнай. Як толькі Франак выйдзе ў людзі ў накрухмаленай кашулі, значыць, намыліўся на спатканне з эфектнай жанчынай. Тут ужо і ў ваду глядзець не трэба.

— Калі ты ўжо на нейкай адной спынішся? — пытаюся ў лоб, убачыўшы яго цёмным восеньскім вечарам у светлым гарнітуры з белай кашуляй і бліскучым гальштукам. — Табе яшчэ не абрыдла так часта апранацца прыстойна? Гэта ж непрыстойна! Асабліва калі ўлічваць той факт, што няма каму тую вопратку даглядаць, акрамя як самому. У цябе што, важнейшых спраў няма, як толькі з прасам у караблікі гуляць?..

— Абрыдла, — цяжка ўздыхае ён. — Ой як абрыдла. Часамі хочацца тую вопратку падзерці ў вераб'іны пух. Толькі аніяк раней не атрымлівалася знайсці тую адзіную, хто яе даглядаць будзе, ну і мяне заадно. А вось зараз закахаўся сур'ёзна і на ўсё жыццё. Засталося ж то няшмат таго жыцця. Таму перакананы, што не паспею разлюбіць. Часу не хопіць.

— Вось табе навіна! — не змог стрымацца я, ажно вароны з перапалоху пазляталі з дрэў парку Жылібера ад майго гучнага здзіўлення. Здаецца, у нас ніколі не было недахопу ў вольных жанчынах. І да прасавання мужчынскага адзення яны цікавасці не хавалі. Адзіная ўмова, што і адзенне, і яго гаспадар нейкім чынам мусяць патрапіць у іх асабістую ўласнасць. І ўсё. А ён толькі цяпер закахаўся, калі ўжо нармальныя людзі пачынаюць забывацца, што з жанчынамі рабіць трэба.

— Ды я і без цябе гэта ведаю, — адказвае сябра, яшчэ глыбей уздыхнуўшы. Глыбей, чым жарало патухлага вулкана. — Толькі не атрымлівалася ў мяне з імі раней. І намеры меў неаднойчы больш сур'ёзныя, чым сам, і жаданні мацнейшыя, чым ім здаецца, толькі ўжо на стадыі знаёмства праблемы здараліся.

— Якія?

— Ну, калі іх коратка ахарактарызаваць, то гучаць яны наступным чынам… Паміж жанчынай і гарэлкай я міжволі выбіраю апошнюю. Хоць і не хачу гэтага. Вось і зараз, баюся, што так будзе. Вельмі баюся, аж кроў стыне ў жылах. Бо я з той жанчынай сёння дамовіўся на першае рамантычнае спатканне ў рэстаране «Магнолія», збіраюся прапанаваць руку і сэрца…

От, было б што прапаноўваць! І рука, і сэрца ў Франака ўжо былі не першай свежасці і мелі кучу хранічных захворванняў, ад рэўматызму і болю суставаў да гіпертаніі і боляў пад левай лапаткай. Толькі гэта не галоўнае.

Я адразу ўцяміў, у чым справа з тым няўдалым выбарам паміж жанчынай і гарэлкай, пры наяўнасці абедзвюх у адным месцы і ў адзін і той час. Для майго, на той момант цвярозага, інтэлекту гэта было няцяжка, улічваючы шматгадовае сяброўства з цяперашнім суразмоўцам.

Франак не быў алкаголікам ніколі. І не толькі ў параўнанні са мной, але і з людзьмі, значна менш схільнымі да ўжывання горкай, чым я.

А ўся праблема выцякала з яго панічна-непрыстойнай сціпласці. Нясмелы ён быў з жанчынамі ад нараджэння. У радзільным доме ні з адной не пазнаёміўся. І ў школе пасля, і ва ўніверсітэце першым загаварыць не адважваўся, як быццам за гэта выкладчык двойку паставіць. Нават у грамадскім транспарце не знаёміўся. Незнаёмых дык ніколі па азадку не пляскаў. І знаёмых таксама. Нават у паўсілы не пляскаў.

Ну, бывае так. Нібыта і смелы чалавек сам па сабе, месцамі нават адважны. А з жанчынамі — як у чаканні страшнага суда. Жах такі, што мову адымае.

Вось і параіў яму калісьці нейкі ненармальны дурань кілішак-другі замахнуць за накрухмалены каўнер яго бездакорна адпрасаванай кашулі пад час сустрэч з прыгожым полам. Для смеласці.

Хутчэй за ўсё, гэта я яму параіў. Бо я ўсім гэта раіў.

А Франак аказаўся старанным вучнем і ўсё, як заўсёды, пачаў рабіць на выдатна. Вось і склалася патавая сітуацыя, якая, парушаючы ўсе шахматныя законы, нейкім чынам плаўна перайшла ў цугцванг. Пакуль не вып’е, загаварыць з дамай не можа. Сядзіць нерухома, як у порткі наклаўшы, паварушыцца баіцца. І маўчыць, нібы вады ў рот набраў. Ну, а як вып’е, то вып’е зноў і зноў. Ды, не змаўкаючы, вярзе такую лухту тады ды ахінею, што напачатку выглядае вялікім інтэлектуалам. Але як ужо рухне мордай у салату або ў чысценькім гарнітуры пад стол, то нават у самай бландзіністай бландзінкі ўзнікаюць лёгкія сумневы ў непаўторнай геніяльнасці яе кавалера.

Хоць калі шчыра, то дарэмна яны так, тыя бландзіністыя, брунецістыя і шэра-бура-малінавыя. Франак вельмі разумны хлопец. Але цяпер не пра гэта.

Ну дык вось. Надумаўся я яму і сёння даць добрую параду, не менш мудрую, чым першы раз.

— Ты вось што зрабі, — разумнічаю я, бо на цвярозую галаву стаў любіць павучаць іншых. Ну а што яшчэ рабіць на цвярозую? — Вазьмі ты перанясі месца сустрэчы бліжэй да свайго ложка. Рэстаран — гэта занадта далёка для дасягнення вялікіх мэтаў. Патрэбны карацейшы шлях.

— Як гэта? — пытаецца ён.

— Вельмі проста. Запрашаеш жанчыну да сябе дахаты. Прадстаўляешся лепшым кухарам на свеце, які не можа дазволіць сабе ў першую сустрэчу з дамай накарміць яе рэстаранным паскудствам, а таму прыгатуе яго сам.

— Дык а ў чым сутнасць.

— А ў тым, што ты маеш зайздросную звычку напівацца на першым жа спатканні ў свінячы піск, яшчэ да прапановы рукі і сэрца ці хаця б да інтымнай блізкасці. Дома наяўнасць ложка будзе цябе стымуляваць хутчэй патрапіць на яго разам з госцяй. А як дойдзе да ложка, то там пойдзе само па сабе. Паспееш да раніцы зрабіць хоць якую прапанову сваёй каханай. Гэта ж не рэстаран, які зачыняюць апоўначы, выкідваючы адтуль п’яныя целы пры дапамозе міліцыі.

— А ў гэтым нешта ёсць, — з захапленнем выдыхвае ён.

— Ну, натуральна, — замацоўваю я далей свой аратарскі поспех. — Гэта ж твой уласны ложак. Галоўная задача — патрапіць на яго. А пасля ложка хай каханая хоць кашулі твае крухмаліць, хоць порткі прасуе, хоць паліцы прыбівае да сцен, хоць балкон зашкліць. Дарэчы, даўно пара. Табе ўжо нічога гэтага рабіць не прыйдзецца аж да скону.

— Вось гэта крута, — ажно падскочыў ён ад райскіх перспектыў свайго дажывання на гэтай планеце. — Дзякуй, сябра, за параду.

І, дастаўшы мабільнік, стаў пераносіць сустрэчу з невялічкага акуратнага століка гарадзенскага рэстарана «Магнолія» бліжэй да свайго шырокага і не засланага ложка. А пасля дзякаваў нашаму знаёмаму афіцыянту, што пагадзіўся заказ адмяніць. Прычым так шчыра, што, здавалася, з удзячнасці і з ім ажаніцца можа.

На развітанне Франак задаў мне толькі адно пытанне:

— А што лепш апрануць?

— Вопратка ў такой сітуацыі не мае значэння, — кажу. — Хоць голым яе сустракай. Голым нават лепш. Менш пасля валтузні будзе.

І ён мне паверыў. Як роднаму бацьку паверыў, і нават больш. Ну, не зусім голым сустрэў госцю, але босым дык дакладна. На валасатых нагах былі толькі акуратна пастрыжаныя пазногці. А вось на плячах красаваўся свабодны баваўняны хатні халат з вышытымі на самым сэрцы ініцыяламі каханай. Да такой эфектнасці не дадумаўся нават аматар сустракаць жанчын у халаце Джэймс Бонд. Далёка яму да Франака. Ёсць куды расці ды імкнуцца ў новых серыях.

Ой, колькі пакутавалі майстры ў атэлье, вышываючы тыя ініцыялы залацістымі ніткамі! Некалькі разоў перараблялі. Цяжка было дагадзіць заказчыку. І тое яму не так, і гэта не гэтак. Бо вельмі хацеў, каб тыя дарагія яго знерваванай душы літары былі бачныя пад кожным вуглом зроку і ззялі на яго сэрцы незалежна ад таго, сядзіць ён, стаіць ці валяецца. Нешта ў падсвядомасці хіба падказвала, што і апошні варыянт магчымы.

Вось такі эфектны і нечаканы ад заўсёды празмерна апранутага кавалера выгляд усё гаварыў сам за сябе і недвухсэнсоўна намякаў пра намеры яго стваральніка. Кожная жанчына высока ацэніць фантазію такога мужчыны. Заставалася толькі адна загадка: ці ёсць хоць што з адзення пад халатам. І разгадаць яе жанчыне не падавалася ўжо цяжкім. Вось-вось — і разгадка раскрыецца…

Назаўтра я вырашыў першым павіншаваць маладажонаў з такім важным крокам у іх ужо не маладым жыцці, а заадно і з першай шлюбнай ноччу. Ну, ці хаця б з першай шлюбнай ноччу, калі яшчэ да абмеркавання важнага кроку не дайшло. Бо людзі не заўсёды жэняцца пасля шлюбнай ночы. Сур'ёзныя намеры вечарам і рашэнні раніцай — гэта не адно і тое ж. Таму лепш не спяшацца з двайнымі віншаваннямі, а то падарунак можа прапасці дарма.

І добра, што я яго не набыў, той падарунак. Бо з першага погляду стала відавочна, што віншаваць не было з чым.

Дзверы ў кватэру былі адчыненыя насцеж. Ложак хоць і быў не засланы, але з першага погляду здаўся мне сумным. Бо гаспадар спаў пад сталом у навюткім расшпіленым халаце, пад якім сінелі старыя сямейныя трусы памерам па калені.

Разгадка аказалася хіба што не такой рамантычнай, як абяцала інтрыга. Ды яшчэ па ўсім было бачна, што зняць гэта ўсё з сябе Франак і не спрабаваў.

— Што здарылася? — буджу яго я. — У вас хоць дайшло да ложка? — пытаюся. — Ну хоць у апранутым выглядзе?

— У нас не, — расчаравана адказвае Франак. — А вось у яе так. Ажно тры разы.

— Як гэта, — не магу ўцяміць я.

— А проста, — адказвае ён. — Яна ажно тры разы даходзіла да ложка. І назад па мяне вярталася. Але не здужала дацягнуць туды маё цела ані разу. Зацяжкае аказалася для яе тонкіх ручак. Напэўна, я зашмат кілаграм у сябе ўліў і стаў непад'ёмны…

А ўжо бліжэй да абеду Франак пачаў стагнаць.

— Пайшоў ты полем са сваімі парадамі! — так ён аддзячыў за маю дабрыню і клопаты. — Цяпер я канчаткова страціў яе! Толькі пакахаў — і адразу згубіў! Мне ад

тваёй дапамогі толькі горш стала, — ці то крычаў, ці то хрыпеў Франак, я да канца не разабраўся.

— А я тут пры чым, што ты сапсаваў стаадсоткавы варыянт? — прыйшлося адпарыраваць мне. — Можа, я табе ў гарляк той віскар сілай заліваў?! Мяне тут увогуле не было. Каб быў, то я сам яго выпіў бы. Ды і з жанчынай сам разабраўся б. Ты ж спаў. А на бязлюддзі і я чалавек.

— Апошні раз я табе паверыў, — не змаўкаў прыяцель. — Апошні раз…

— Ды мае парады нармальныя! Гэта ты…

— Усё!!! — барабаніць Франак сабе ў грудзі кулакамі. — Нікога больш слухаць не стану. Пайду сваім старым шляхам. Прабачуся і зноў запрашу яе ў рэстаран. І апрануся так хораша, што яна па вопратцы адразу зразумее ўсю сур’ёзнасць маіх намераў.

— І што ты яшчэ можаш прыдумаць у апрананні? — паціскаю я плячыма. — І так ходзіш па горадзе як расфуфыраны манекен, які ўцёк з вясельнага салона. Маленькія дзеці як убачаць цябе, дык пытаюцца ў бацькоў, чаму гэтаму дзядзьку так весела, калі іншыя маюць да сённяшняга жыцця вялікія прэтэнзіі.

— А я цяпер буду сам сабой, — адрэзаў ён. — Апрану фрак!!!

Пасля гэтых слоў я пляснуўся на азадак, хоць з ранку не выпіў ані кроплі. У галаве пранесліся думкі, што мушу ратаваць сябра. Бо гэта Гародня пачатку дваццаць першага стагоддзя, а не канцэртная зала «Ла Скала» канца дваццатага. Тут за такі выгляд і ў псіхушку патрапіць можна.

Ну і праўда. Яму ж не варон палохаць на полі, дзе на пудзіле такі прыкід глядзеўся б вельмі дарэчы. Вароны падурнелі б ад убачанага і больш не прыляталі б, і іх дзеці абміналі б гэтае поле бокам, і дзеці дзяцей таксама.

А яму жанчыне трэба спадабацца. Нашай. Звычайнай. У якой на шыі не вісіць калье за трыццаць тысяч даляраў, а на вушах не боўтаюцца завушніцы з брыльянтамі велічынёй са спелую сліву. А ён што апрануць надумаў?!! Яна ж не з тых ангельскіх арыстакратак дзевятнаццатага стагоддзя, якім, каб дапоўніць вобраз лэдзі, толькі мужыка ў фраку не хапае.

Не! Яна самая звычайная гарадзенка, якой трэба ад мужчыны толькі прапанова выйсці за яго замуж. Можна нават без прызнання ў каханні.

А гэты прыйдзе ў фраку! Са сваёй славянскай мордай! На ім той фрак будзе глядзецца, як на карове конскае сядло. А на карове, як вядома, хораша глядзіцца толькі бык. Можа, і конь глядзеўся б някепска, але дакладна не конскае сядло.

Ну хоць стой, хоць падай! Ды і не ў гэтым справа. Само такое з’яўленне ў грамадскім месцы парушае агульнапрынятую мараль мясцовых дам і джэнтльменаў. Жанчына дакладна падумае, што кавалер вырашыў гэтым разам паздзекавацца з яе яшчэ з большым цынізмам, чым папярэдні раз.

Ды і ўсе гэтак падумаюць. Нават наш знаёмы афіцыянт.

— Толькі не гэта, — прашу я сябра. — Лепш у трусах ідзі. Вось у гэтых, сініх, сямейных, што па калена. Што заўгодна, толькі не фрак. Хочаш, я замест цябе пайду?!

— Па адзенні сустракаюць!.. — крычыць ён.

— А па розуму праводзяць, — парырую я. — А розуму-то няма! Ды і адзежа выклікае вялікі сумнеў, мякка кажучы.

Але дзе там! Франак ужо навастрыў свае туфлі ў кірунку пракату фракаў. Шукаў самы танны з прыстойных і самы прыстойны з танных. Толькі аніводзін яму не спадабаўся. І тады ён заказаў гэтую экзотыку ў старога добрага майстра Іосіфа Ісакавіча Рубіновіча, які не выехаў у Ізраіль хіба толькі таму, што ад заказаў адбою не было. Такі быў майстар спраўны.

І чалавек чулы. Выслухаўшы аповед пра няшчаснае каханне, пашыў Франаку фрак без чаргі і нават з грашовай скідкай, чаго да гэтага моманту не дазваляў сабе зрабіць ані разу за ўвесь свой працоўны стаж. А ён у яго быў вялікі.

А я нават глядзець на тую ганьбу не пайшоў. Не стаў рызыкаваць, бо здароўе ўжо не тое. Гады, як кажуць, бяруць сваё, а людзі чужое.

Ну, мяркуйце самі. Франак у фраку! Не Людвіг ван Бетховен, не Альфрэд Нобель, не Ёган Себасцьян Бах і нават не народны артыст Беларусі Міхаіл Якаўлевіч Фінберг. А проста Франак з Гародні. І арыстакратычны лоск на мужыцкім азадку. Відовішча не самае эстэтычнае.

Хоць бы дырыжорскую палачку ўзяў для понту. А ён цэлы венік кветак валачэ. Ну, не дурны?! Людзі ў фраках кветкі нікому не дораць. Гэта ім нясуць букеты. Але скуль гэта ведаць Франаку?

Мне ўсё наш знаёмы афіцыянт расказаў. Ён сам, як убачыў Франака ў фраку, увесь разнос з гарачым супам вывернуў на кліента. А кліент гэтага нават не заўважыў. Таксама не мог адарваць вачэй ад пудзіла ў экзатычнай вопратцы.

Хачу вам сказаць, што рэстаран «Магнолія» такога яшчэ не бачыў. Наведвальнікі падумалі, што выпадкова патрапілі ў тэатр, і сталі пакрысе сыходзіць, не расплаціўшыся. А вось дама, насуперак усім прагнозам, ацаніла выгляд кавалера стрыманай усмешкай. Гэта дадае ёй павагі. Што рабілася ў душы жанчыны, цяжка сказаць. Але для яе гонару трэба заўважыць, што знаку не падала.

А Франак хацеў пачаць рамантычны вечар з вершаў, ды, як заўсёды, язык ад страху прыліп да зубоў. Прыйшлося для смеласці выпіць. Ну, а там панеслася пракладзенай дарогай. Пасля ўжо былі і вершы, і песні, і пахабныя анекдоты, і пабіты посуд, і перакуленыя талеркі ды разлітае на фрак віно. І не толькі на фрак, але і на значна больш сціплую сукенку дамы.

Выглядала на тое, што ўсё лагічна ішло да прызнання ў каханні і прапановы рукі ды сэрца. І сапраўды ішло. Гэта ж было задумана адпачатку. Але не дайшло. Бо галоўны акцёр той драмы ў самую адказную хвіліну рухнуў пад стол і салодка заснуў.

Жанчына нейкі час сядзела разгубленай. А пасля звярнулася да афіцыянта, бо ўжо ўцяміла, што ён добры знаёмы яе эфектнага кавалера.

— Спадзяюся, як ён прачнецца, то здолее расплаціцца, — прашаптала яна. — Мяркуючы па вопратцы, грошы за расхераčаны столік у яго павінны быць.

І сарамліва пасунулася да выхаду.

Афіцыянт, які быў у курсе справы, пастараўся зградзіць сітуацыю і пакінуць свайму эфектна апранутаму сябру хоць нейкі шанц на будучыню.

— Вы на Франака не злуйцеся, — вымавіў ён. — А лепш дачакайцеся, як прачнецца. Ён жа харошы. Фрак для вас пашыў. Вершы чытаў.

— Лепш вы перадайце яму ад мяне пасланне, — адказала жанчына абнадзеенаму афіцыянту. — І таксама вершаванае. Хай у гэтым фраку ідзе сабе ў с*аку.

А сказаная ёй фраза з тае пары стала крылатай у народзе.

Ну а цяпер хіба яшчэ больш пашырыцца.

## Залатая прыбіральня

Золата! Ай, гэтае золата! Што праз яго толькі не нарабілася на свеце…

Людзі шукалі золата ва ўсе часы з імпэтам заядлага грыбніка. Многія шукаюць скарбы і цяпер паўсюдна і ў розны спосаб. І толькі дурань можа смяяцца з той бліскуча-жоўтай з чырвоным адценнем мары пра багатую рэчаіснасць, аздобленую самымі дарагімі аўтамабілямі, уласным домам памерам з Вавілонскую вежу і станам непаўторнай асалоды ад бязмернай зайздрасці цяперашніх суседзяў і былых аднакурснікаў.

Толькі недасведчаныя людзі тую мару называюць безнадзейнай тратай часу. Пры больш дэталёвым аналізе прыходзіш да нечаканай высновы, што золаташукальнікі, напэўна, маюць рацыю. Нават у латарэі ўкладваюцца апошнімі сродкамі мільярды людзей. Хоць усе ведаюць, што шанц выйграць вялікую суму ў латарэю у разы меншы, чым знайсці кучу золата, капнуўшы адзін толькі раз рыдлёўкай у чыстым полі, ужо засаджаным бульбай. Ну то чаму б не паспрабаваць пашукаць шчасця праз пошук скарбу?!

Вось і шукаюць людцы манеты вакол старадаўніх замкаў і нават у чыстым полі ды спакою не ведаюць. Вось і лазяць яны з рыдлёўкамі вакол старадаўніх фальваркаў і даўно разбураных хатаў былых мясцовых рабінаў, наіўна мяркуючы, што золата само прыліпала да прадстаўнікоў гэнай рэлігіі і культуры. А можа, і не наіўна. Хто яго ведае.

Шукаюць неўтаймаваныя аматары імгненнага абагачэння не толькі схаваныя ў зямлі дробныя манеты, але і цэлыя караблі на дне сусветнага акіяну, і бязмежныя скарбы індзейцаў майя або інкаў у непраходных джунглях Лацінскай Амерыкі, і вялізны Бурштынавы пакой царыцы Кацярыны, і напічканую крадзеным золатам карэту імператара Напалеона, схаваную недзе на беларускай зямлі…

Дык вось, пра беларускую зямлю. На ёй шукаюць такія ж скарбы, як і ва ўсім свеце. І карэты, і пакоі… Ад самых дробных залатых завушніц, прададзеных прама з вушэй прыгажуні, каб купіць хлеба для галоднай сям'і, да неверагодна вялікіх скульптур дванаццаці залатых апосталаў Радзівілаў з таямнічых скарбніц Нясвіжскага замка. Але нідзе на свеце золаташукальнікі не спрабавалі знайсці залатую прыбіральню. А вось тут шукаюць. І самае галоўнае, што яна насамрэч існуе. На захадзе Беларусі. На зямлі, якую з даўніх часоў называюць Віленскім краем.

Нават прыбіральня тут ёсць залатая! Вось дзе зямля дык зямля! Не дзіва, што за яе ва ўсе часы змагаліся захопнікі, ды і цяпер пакою не даюць. Трасцу ім у бок. Каб іх той зямлёй і завярнула.

Больш дакладных каардынатаў месцазнаходжання залатой прыбіральні я не агучу нават за грошы, каб шукальнікі імгненнага абагачэння не пераварнулі рыдлёўкамі, як дзікі лычамі, тую зямельку цалкам. І так яна напакутавалася ўжо. А вось

гісторыю ўзнікнення той залатой пабудовы для спраўлення натуральных і зусім не залатых патрэбаў раскажу як ёсць.

Было гэта напрыканцы шасцідзясятых гадоў дваццатага стагоддзя. Звалілася тая падзея на бедную галаву Пятра Яхімовіча проста з ніадкуль, адным самым звычайным днём, калі ласкавае летняе сонейка аблашчыла ранішнім святлом невялічкую заходнебеларускую вёску, у якой жыццё спакойна ішло сабе адпаведна з гістарычным часам і геаграфічнымі каардынатамі і не азіралася асабліва па баках.

— Ідзі ўжо новы туалет зрабі, — настойліва і жорстка папрасіла Наталля Яхімовічыха мужа. — Тры дні як стары разбурыў. Мне што, у поле ляцець ці ў сабе яшчэ тыдзень нечыстоты насіць?!

Наталля была мясцовая настаўніца пачатковых класаў. Старалася і выглядаць прыстойна сярод мясцовага калгаснага люду, і гаварыць настолькі культурнай мовай, наколькі тое дазваляла яе савецкая прафесійна-тэхнічная адукацыя. І, на думку той адукацыі, слова «туалет» гучала больш культурна, чым слова «прыбіральня».

— Зраблю, зраблю, — адарваўся ад кляпання касы яе муж Пятро і пасунуўся ў паветку па рыдлёўку.

Прыбіральня ўжо была гатовая і ўтульна размяшчалася ў траве за хлявом у ляжачым стане. І, каб яна ператварылася ў сапраўдны ды дзейсны туалет, заставалася надаць ёй вертыкальнае становішча. Толькі напачатку трэба было выкапаць яму, над якой і будзе ганарова ўзвышацца гэтае архітэктурнае збудаванне.

Пятро капаў няспешна, бо і сам ужо тры дні як не наведваў прыбіральню па прычыне яе адсутнасці. Але пакрысе справа рухалася. Мужчына ўсё больш паглыбляўся ў зямлю, рыдлёўка мякка і рытмічна ўваходзіла ў грунт, як раптам непрыемна скрыпнула, нібыта жалезам па шкле.

«Зноў камяніска, — заляцела ў спацелую галаву працаўніка думка. — Камяністая ў нас зямля. Камень на камені. Хоць бы не вялікі, а то замучаюся даставаць. Ужо даволі глыбока зарыўся».

Пятро яшчэ раз дзеўбануў рыдлёўкай у цвёрдае месца і па гуку адчуў нядобрае.

— Э, не, — прабубніў ён сабе пад нос. — Гэта не камень. Дошка. Больш на труну падобна. Гэтага мне толькі не хапала!

Пятро няспешна вылез з ямы, прысеў на кучу пяску і зацягнуўся цыгаркай з мясцовага самасаду. Абдумаў усе варыянты. А раптам сапраўды труна?! Ну то тады не кінеш нябожчыка без пашаны. Чалавек жа ўсё ж такі, не сабака! Прыйдзецца магілу насыпаць, крыж паставіць. І гэта акурат ля хаты, пры хляве. Таксама неяк не па-людску. А каб яго трасца ўзяла! Патрэбны яму гэты клопат, як возу пятае кола! Як кабыле другі хвост! Як карове трэці рог!

— Не, — зноў загаварыў ён сам з сабой, — засыплю я́му, пакуль не высветліў, што там, і выкапаю другую ў іншым месцы. А то як даведаюся, што там, будзе позна. Сумленне не дазволіць засыпаць.

Але рукі не слухаліся. Як здзервянелі. Аказаліся напрамую прывязанымі да сумлення. Раней Пятро і не падазраваў пра такое.

— А каб яно ўсё ляснулася! — выгукнуў ён у роспачы, што першае на язык лягло, і скочыў назад у яму.

Толькі ногі расставіў шырока, каб не бруднымі ботамі на нявызначаны прадмет.

— А можа, гэта ніякая не труна, — прамовіў з надзеяй. — З чаго гэта я такое ў галаву ўзяў? Мала якія дошкі тут хто закапаў. Можа, які склеп даўнейшы?

Радасць, якая засвяцілася на яго твары, магла па бляску спаборнічаць з ранішнім сонейкам, бо пры больш дэталёвым даследаванні Пятро высветліў, што невядомы прадмет па памерах мог быць усяго толькі невялічкай драўлянай скрынкай і нічым іншым. Далейшыя раскопкі пацвердзілі гэтую версію. З адным толькі ўдакладненнем. Скрынка была абабітая жалезнымі палосамі ў выглядзе кратаў. На іх і прыйшоўся першы ўдар рыдлёўкі.

Чарговы ўдар Пятро нанёс па драўлянай частцы, і яна трэснула. І адтуль, як крупы з падзёртага папяровага пачка, пасыпаліся залатыя манеты. І заблішчалі ў праменях усё таго ж ранішняга сонейка, якое сваім цяплом ужо аблашчыла ўсю вёску і ўсіх яе жыхароў без аніякага золата і без аніякай іншай аплаты.

— Мікалаеўскія чырвонцы, — зрабіў выснову Яхімовіч.

Яго аблічча набыло надзвычай заклапочаны выгляд, нібыта ён дакапаўся да самога пекла.

— Гэтага мне толькі не хапала! — выгукнуў ён у роспачы. — Яшчэ горш, чым было! І што мне зараз рабіць з усім гэтым?!

Пятро зноў вылез з ямы і сеў на кучы пяску. Задуменна зацягнуўся самасадам, выпусціў воблачка дыму з вуснаў, але не з галавы. Там было задымлена гусцей. Думкі, нібы дзікія міфічныя пчолы, раіліся чорнымі хмарамі і прасвету не пакідалі.

— І што мне рабіць з тым праклятым золатам? — прастагнаў Пятро. — Не мела баба клопату, купіла парасё. А я і не купляў нічога. Толькі туалет хацеў паставіць, каб жонка хутчэй аблягчылася. І на табе! Вось жа як не пашанцуе, дык не пашанцуе! І за што мне ўсё гэта?!

Яхімовіч прыпомніў, як у суседняй вёсцы стары Флёра Спірыда знайшоў неяк адзін залатнік, калі разбіраў згарэлую вайной хату свайго бацькі-нябожчыка. У раённым цэнтры яму сказалі тады, што як здасі знаходку дзяржаве, то дваццаць пяць адсоткаў ад яе вартасці дзяржава заплаціць. Паверыў тады Флёра дзяржаве, хоць добра ведаў, што гэтага нельга рабіць ніколі і ні пры якіх умовах. Здаў залатнік з чыстым сумленнем, як бычка на бойню. А назаўтра дзяржава сама прыехала да яго дахаты ў выглядзе кампетэнтных органаў і забрала таго з сабой, нават мокрыя порткі пераапрануць не дазволіла. А пасля так дала ў косці, што не толькі адмовіўся ад узнагароды за знойдзены залатнік, але і свае, прыхаваныя, што ад бабулі дасталіся любімаму ўнуку ў спадчыну, усё аддаў хутка і добраахвотна. І быў рады яшчэ, што не пасадзілі.

— Не, пра знаходку нікому прызнавацца нельга, — зрабіў выснову Пятро. — Трэба прадаць яе цішком зубным лекарам. Кажуць, яны патаемна скупляюць золата на каронкі.

Ён зажмурыў вочы і ўявіў, што стаў жыць багацей. Матацыкл з люлькай купіць. Фарбу набудзе, хату асвяжыць, і плот, і нават новую прыбіральню пафарбуе. Людзі пачнуць пытацца, скуль грошы ўзяў. Усялякія версіі напрыдумваюць, і ўсе нядобрыя. Найлепшая з іх будзе такая, што грошы ўкраў.

«Зайздросціць пачнуць. Вітацца перастануць з тае прычыны, — падумаў Яхімовіч. — Не, прадаваць золата нельга. А што з ім тады рабіць? Вось жа на бяду напароўся! А дзень гэтак хораша пачынаўся. І хто б мог падумаць, што такое няшчасце за хлявом чакае!»

Пятро зразумеў, што сілы аднаго самасаду для далейшага абдумвання настолькі крытычнай і безвыходнай сітуацыі ўжо замала. Ён падняўся і заклапочана пакрочыў у родненькую хату, якую сам і збудаваў цяжкой працай. Ужо за сталом успамінаў, як адзін канец цяжкага бервяна на свае плечы ўзвальваў, а пад другі сальную скуру падкладваў, каб слізчэй цягнулася. І ўсё астатняе ўласнымі рукамі рабіў. На правай руцэ па сённяшні дзень палец не разгінаецца, бо ад сякеры, што з рук не выпускаў, нейкая там жыла сцягнулася. А каб што купіць ці наняць каго, то грошай было кот наплакаў. Вось бы тады тое золата знайсці…

У здзіўленай жонкі ажно яе культурную мову адняло, як убачыла, што муж з самай раніцы наліў сабе двухсотграмовую шклянку гарэлкі ўласнай вытворчасці і бутэльку прымаць са стала не збіраецца. Такога не назіралася за ім ніколі. Яе Пятро не цураўся шклянкі на святы ці як госці якія. Нават любіў. Павесялее тады, пагамоніць. Але каб вось так, зранку ды без дай прычыны — то ніколі не было таго.

І некультурную мову ў яе таксама адняло ад такога ранішняга нацюрморта на стале. Аж дух заняло. Але каб і не заняло, то нападаць з прэтэнзіямі не адважылася б. Такое было ў мужа засяроджанае і заклапочанае аблічча, што і пра невыносную ўжо патрэбу карыстання новым туалетам нагадваць не стала. Тры дні цярпела, то і яшчэ пацерпіць.

— А можа, яго лепш перахаваць куды да лепшых часоў, тое золата? — агучыў муж услых нечаканую думку.

Ён глынуў нагбом другую шклянку і задумаўся.

«А можа, гэтае золата належала людзям, з якімі бяда сталася? Можа, іх вайной пабілі? Праклянуць яны за тое золата з таго свету, няшчасці пойдуць, хваробы, не дай бог, — папаўзлі па душы сумневы. — Яны зарабілі на тое золата, а карыстацца незаконна ім буду я. А калі і не карыстацца, дык уладарыць. Несправядліва гэта неяк. Ды і адкуль я ўзяў, што лепшыя часы хоць калі прыйдуць сюды? Ніколі іх тут не было, лепшых часоў! Дык адкуль яны возьмуцца?!»

Трэцяя няпоўная шклянка, у якую звалілася апошняя кропля з перакуленай бутэлькі, таксама хутка паказала сваё пустое дно, як і тая бутэлька. А праз хвілінку Пятро ўжо ўпэўнена крочыў да выкапанай ямы. Ён рашуча параўняў зямлю па краях, утрамбаваў і спрытна паставіў на яе прыбіральню. Акурат так, як і хацеў. Прыбіральня стала роўненька, як ангельскі газон, які для такой роўнасці трыста гадоў стрыгуць. А тут з першага разу так хораша стала, нават папраўляць не прыйшлося. Як спрадвеку тут стаяла.

— Ну што ж, — задуменна выдыхнуў майстар, задаволены вынікам сваёй працы. — Так яно і павінна быць, — падвёў рысу пад развагамі.

А ў наступны ўжо момант пераключыў свае думкі на іншае. І як вынік гэтага абдумвання стала старадаўняя фраза, агучаная гэтым разам ім жа самім:

— Не жылі багата, то няма чаго і пачынаць!

Пасля Пятро Яхімовіч зайшоў у толькі што ўзведзеную пабудову, зняў порткі, прысеў і вызваліў ад нечыстотаў свой страўнік прама на тое золата. Праверыў, ці правільна патрапіў, ці перастала яно ўжо блішчаць і да граху штурхаць. Пераканаўшыся, што снайперскія здольнасці яго не падвялі, Пятро ласкава саступіў сваё месца жонцы.

— Ну што, палягчэла? — спытала тая, як муж выйшаў з туалета.

— Палягчэла, — адказаў муж. — Ты нават не ўяўляеш, як мне палягчэла!

Пятро з жонкай пражылі доўгае жыццё. Дзяцей на ногі паставілі. Тыя ў розныя гарады параз’язджаліся, як і іншыя дзеці іх суседзяў. Дажыліся і да таго часу, калі ў вёсцы адны старыя бабулі ды дзядулі засталіся. І самі сталі старымі бабуляй ды дзядулем.

Хату Яхімовіч за гэты час разбудаваў і пашырыў, што хоць ты новых дзяцей заводзь. Ды дзе там ужо. Не тыя гады. Ну а прыбіральню за гэты час таксама не адну зладзіў. Любіў, каб у туалеце было чыста, як культурная жонка таго патрабавала. Год-другі стаяў стары туалет — і ўсё. Падавай ёй новы, чысты, больш сучасны.

Старыя прыбіральні бурыў, ямы з нечыстотамі засыпаў, і яны зарасталі травой.

Пра знаходку маўчаў амаль да скону. І толькі як паміраў, распавёў пра тое золата...

І хіба што дарма так зрабіў.

Ён-то адправіўся на той свет спакойна. Чыстая і не сквапная душа белым галубком адляцела. А вось у некаторых іншых яго аповед спакой забраў раз і назаўсёды. Многія пачулі пра тую гісторыю, і з суседніх вёсак, і да гарадоў яна дайшла, і нават да сталіцы, горада-героя Мінска. І пацягнуліся аматары імгненнага абагачэння з усіх куточкаў шукаць залатую прыбіральню, як мухі на гной.

І з-за мяжы прыязджаць пачалі. Тых яшчэ больш, чым сваіх. Ну, гэта як заўсёды. Пацягнуліся шэрагамі і калонамі шукаць залатую прыбіральню. Знайсці-то яе не знайшлі яшчэ, але найбольшых поспехаў у працэсе дасягалі тыя, у каго нюх лепшы.

Ужо і ў якой вёсцы тое было, не ведаюць, ды і вёскі той ужо няма. Але як знойдуць якую старую вясковую яму з нечыстотамі, то рыюць далей з ашалелым вар’яцтвам.

Так, глядзіш, і карэту з накрадзеным Напалеонам золатам выпадкова знойдуць.

## СТАНІСЛАЎ СУДНІК

# Мама, дай!

Яны ішлі ўсё далей, і іх станавілася ўсё меней. Яны не ведалі, хто яны, бо не мелі назвы. Яны наогул не ўмелі гаварыць. Яны не ведалі, колькі іх, бо не ўмелі лічыць. Яны не ведалі, адкуль яны ідуць і куды, бо не маглі хоць неяк акрэсліць мясціны, па якіх рухаліся. Яны ведалі толькі, чаго яны ідуць. Яны ішлі, як і доўга перад тым, у пошуках ежы і каб схавацца ад небяспекі. Яны не разумелі, што ёсць дзень і ноч, але разумелі, што бывае то светла, то цёмна. Яны нічога не ведалі пра вясну і лета, пра восень і зіму, яны разумелі толькі, што бывае цёпла і бывае холадна. Яны не ведалі, якія расліны можна есці і якія есці нельга, яны знаходзілі салодкія расліны, ягады, плады і елі іх, яны знаходзілі горкія і кіслыя плады і іх не елі. Калі ж раптам салодкая ягада аказвалася атрутнай, то той, хто з'ядаў яе, або паміраў, або хварэў, але выжываў. Калі паміраў, то на тым усё і заканчвалася. Не пашанцавала. Калі выжываў, то прыблізна ведаў, якая расліна яму пашкодзіла, і стараўся больш яе не чапаць. Калі атрутную расліну распазнавала маці, то яна імкнулася не даць яе дзецям, забараняла, узнікаў досвед.

Яны елі кожную жывёліну, якую маглі злавіць, і ўцякалі ад кожнай, якая магла з'есці іх. Досвед многіх паляванняў гаварыў ім, на каго варта паляваць, а на каго — без сэнсу, бо выніку не будзе.

Сёння іх стала яшчэ менш. Сёння загінуў А-а. А-а быў найдужэйшы з іх. Яго ўсе баяліся і ўсе слухаліся. А-а быў адзіны, хто меў імя. Імя сваё ён атрымаў праз тое, што вельмі часта і з розных нагодаў крычаў: «А-а». Ці то гэта быў клік перамогі, ці папярэджанне пра небяспеку, ці што іншае. Калі чулася: «А-а», — усе ці азіраліся на правадыра, ці кідаліся да яго, ці, папярэджаныя пра небяспеку, уцякалі.

Неўзабаве, каб перадаць нейкі знак, які ішоў ад правадыра, то той, то сёй таксама прамаўляў: «А-а». Наогул-то яны чулі гукі, адрознівалі гукі і нават маглі самі гукі падаваць. Яны лямантавалі ад болю, яны пераймалі гукі, што падаваліся звярамі ці птушкамі: маглі паказаць рык тыгра, выццё ваўка, посвіст птушак. У перадачы гэтых гукаў быў сэнс. Але кожны раз свой. Рык тыгра не заўсёды абазначаў небяспеку, а свіст птушкі не абазначаў амаль нічога.

Сёння ўсё было як звычайна. Яны начавалі ў лесастэпе, дзе былі вялізныя дрэвы і шырокія пашы. Лесастэп быў найбольш прыдатным для жыцця.

Выйсці ў адкрыты стэп для іх было вельмі небяспечна. Яны не маглі бегаць вельмі хутка, яны не мелі моцных зубоў і кіпцюроў, не маглі ўзляцець у неба, як птушкі, ці закапацца ў норы, як дробныя звяры.

Забрацца глыбока ў глухі лес таксама не выпадала, там вельмі цяжка было знайсці ежу. А тут, на мяжы лесу і стэпу, ім, хто ўмеў лазіць па дрэвах і ўмеў бегаць па зямлі, было ямчэй. Па сваіх магчымасцях кожны з іх прайграваў навакольным жывым істотам. Ніхто з іх не мог дагнаць аленя ці антылопу. Ніхто не мог падужаць тыгра ці мядзведзя. І яны не змаглі б жыць у гэтым свеце, каб не мелі адной важнай перавагі: яны трымаліся разам вялікай групай, яны ўмелі ўзгоднена нападаць і абараняцца. У іх былі інстынкт еднасці і інстынкт адказнасці за супляменнікаў.

Ноч была халаднаватая. З першымі промнямі сонца яны пачалі вылазіць з нораў, з дуплаў, проста з разлежыстых кустоў. Ім было холадна, і ўсе хацелі есці. У іх не было поўсці, як у звяроў, ці пер'я, як у птушак. І ім было холадна. Сагрэць іх магло толькі сонца і ўласныя рухі. Рух мог іх і накарміць. На ўскрайку лесу было шмат ягадных кустоў, але ягады былі яшчэ горкія. Знайсці нешта салодкае было няпроста. А побач з імі жыло шмат жывёл. Адны з іх елі траву. Другія елі першых. Тыя другія былі страшныя і для іх, але калі ўдавалася злавіць і забіць траваедную жывёліну, то можна было паесці мяса і папіць крыві. Злавіць якую-небудзь вялікую жывёліну надзеі было мала, не хапала ні спрыту, ні хуткасці, ні сілы. Але што-небудзь меншае можна было спрабаваць. Некалькі з іх хаваліся ў засаду за кустамі. А астатнія набліжаліся да статку антылоп, аддзялялі некалькі і пачыналі гнаць на засаду. Калі ўсё ішло ўдала і засаднікам удавалася схапіць адну антылопу і скруціць ёй шыю, то яе тут жа пачыналі рваць на часткі і есці. У іх не было нічога, акрамя зубоў і кіпцяў, але рукі ўжо ўмелі хапаць, браць, трымаць. Рукі ўмелі трымаць палку, камень, рог, костку, але ніхто іх з сабою не насіў: трэба — бралі, не трэба — выкідвалі. Адны з іх, адарваўшы кавалак мяса, піхалі сабе ў рот, іншыя імкнуліся даць перш дзецям. Пары рэдка трымаліся разам, сям'і як такой не было, пары ўзнікалі і распадаліся, хаця мелі месца і даўжэйшыя па часе сімпатыі і прывязанасці. Клопат пра дзяцей цалкам клаўся на маці, але калектыўны клопат пра малых існаваў. Іх заўсёды імкнуліся абараніць, схаваць, пакарміць.

Сёння ўсё было як звычайна. Яны заўважылі статак антылоп, што мірна пасвіліся недалёка ад зарасцяў кустоў. А-а і некалькі мацнейшых пахаваліся ў кустах абапал вузкага праходу, астатнія адышлі далёка ў поле, каб акружыць антылоп і пагнаць іх у бок кустоў. Зразумела, што антылопы да кустоў ісці не хацелі, іх трэба было моцна напалохаць і адрэзаць усе іншыя кірункі ўцёкаў. Загоншчыкі, хаваючыся ў траве, ачапілі статак і, падняўшыся ва ўвесь рост, з крыкамі пабеглі на антылопаў. Тыя, пачуўшы гвалт, кінуліся ў бок супрацьлеглы і пабеглі-такі да кустоў. Засаднікі са сваіх схованак кідаліся на жывёлін. Але схапіць і ўтрымаць адну асобіну ўдалося толькі А-а. Ён спачатку змог паваліць антылопу на зямлю, а пасля рэзкім рыўком скруціў ёй шыю.

— А-а! — пачулася вакол. На гэты раз танальнасць покліччу была ўрачыстая і пераможная адначасова.

Але не паспелі яшчэ ўсе сысціся да А-а, як збоку пачуўся грозны рык і паказаўся вялікі малады леў. Леў нахабна рухаўся да забітай антылопы. Усе сыпнулі ў бакі, але А-а застаўся на месцы. Ён загыркаў падобна, як і леў, і даў зразумець, што не аддасць здабычу. Ён стаяў высокі, моцны, але з пустымі рукамі. Не раз здаралася, што драпежнік у такія моманты адступаў, але сёння леў скочыў. А-а ўхіліўся, і леў амаль праляцеў міма, аднак задняй лапай усё-ткі зачапіў А-а, і той не ўстаяў, паляцеў на зямлю. І леў паспеў першым сабрацца для наступнага скачка. А-а толькі падымаўся, як на яго вухнула ўся маса драпежніка. На завяршэнне драмы глядзець не было каму, усе разбегліся...

Яны даўно ішлі разам: Ён і Яна. Яны сябравалі з маленства. Ён не пакінуў Яе. Калі Яна зацяжарала, Ён падтрымліваў Яе. Калі Яна нарадзіла маленькае стварэнне, Ён

адрозніваў гэтае стварэнне ад усіх іншых, такіх жа, разумеючы, што гэта яго дзіця. Ён стараўся падкарміць малое. Спачатку адно, а потым і другое. Такая доўгая ўзаемная прывязанасць не была характэрная, выклікала непаразуменне, асабліва з боку Таго са злымі вачыма, які імкнуўся пабыць з Ёю і ад якога ім абаім часта даводзілася адбівацца. І, як ні дзіўна, ім гэта ўдавалася, бо іх падтрымліваў А-а. Грозным поглядам ці рыкам ён адганяў Таго ад пары, і на нейкі час усё супакойвалася.

Але сёння А-а не стала. Усё племя сабралася на невялікім узгорку. Усе выдатна ведалі, што, каб выжыць, яны мусяць трымацца разам. Каб трымацца разам, патрэбна, каб было за каго трымацца, патрэбны новы А-а. Пры тым усе разам яны нічога не вырашалі, вырашаў нехта адзін. Сёння гэтым адным быў Той са злымі вачыма. Той выйшаў наперад, выцяў сябе кулаком у грудзі і пракрычаў: «А-а!» Гэта мусіла абазначаць, што ён цяпер галоўны, яго павінны слухацца, ён будзе караць непаслухмяных, ён будзе весці ўсіх, куды захоча.

Для Яго і Яе гэта была рэальная небяспека. Заступіцца больш не было каму, а ў выпадку бойкі супляменнікі проста маглі дапамагчы новаму А-а і разарваць на часткі — і іх, і дзяцей.

Яна паглядзела на Яго. Ён кіўнуў галавой і пайшоў наперад. Ён выйшаў на другі край узгорка. Таксама выцяў сябе кулаком у грудзі і таксама пракрычаў: «А-а!»

Двух А-а быць не магло. Значыць, павінен быў застацца адзін. Яны пайшлі насустрач адзін аднаму. Той выглядаў вышэйшым і мацнейшым. Ішоў, расставіўшы рукі, каб ямчэй схапіць супраціўніка.

Ён ішоў роўна, але ў нейкі момант нахіліўся і ўзяў у руку ладны камень.

Ён не парушыў ніякіх правілаў, бо ніякіх правілаў не існавала. Не парушыў ніякіх законаў, бо ніякіх законаў не было. Не парушыў ніякіх нормаў маралі ці этыкі, бо не было ні нормаў, ні маралі, ні этыкі.

Былі толькі інстынкт самавыжывання, былі сіла, хуткасць, спрыт і хітрасць. Але ў дадзеным выпадку інстынкт самавыжывання ў Яго змяніўся страхам за Яе і дзяцей, таму пры Ім з усёй зброі засталіся толькі сіла, якая была яўна меншая, чым у Таго, засталіся хуткасць, спрыт і хітрасць, якая раптам на імгненне прабліснула розумам і падказала Яму ўзяць камень. Трэба было паспець выцяць першым. Той не разумеў небяспекі ад паднятай рукі з каменем. І калі Ён кінуўся проста ў расстаўленыя рукі, радасна рвануўся сашчапіць іх, але ў тым прамежку цяжкі камень апусціўся на галаву Таго. Ён уклаў у той удар усю сілу. Увесь страх за Яе. І Той упаў, так і не сашчапіўшы рук. Яшчэ адзін удар каменем давяршыў справу. Той не дыхаў. Ён пераможна паглядзеў на ворага, выйшаў на вяршыню пагорка і голасна крыкнуў:

— А-а!

І ўсе зразумелі, што Ён — больш не Ён, Ён цяпер — А-а. Гэта і яго імя, і яго пасада. Гэта і права, і абавязак.

Але на тым усё не скончылася. А-а махнуў Ёй, і Яна падышла да яго.

— Ма, — сказаў А-а, паказваючы на яе.

Што гэта мусіла значыць? Мая, яе так завуць, ці яшчэ што. Аднак усе зразумелі, што ў іх цяпер ёсць не толькі А-а, але і Ма.

Гэта трэба было запомніць, да гэтага трэба было прывыкнуць, гэта трэба было навучыцца вымаўляць; з апошнім было лягчэй, пераймаць гукі яны ўмелі. Запомніць

такое доўгае і першае ў іх жыцці слова «Ма» было цяжэй. Чаму першае, бо «А-а» — гэта фактычна яшчэ працяжны гук, а «Ма» — два гукі, «Ма» — слова.

— Ма, — яшчэ раз крыкнуў А-а.

— Ма, — паўтарыла Яна.

На гэтым першы ўрок мовы закончыўся. Сонца хілілася да зямлі, а яшчэ трэба было пахаваць Таго. Яны даўно не елі сваіх супляменнікаў, але і не кідалі іх там, дзе застане смерць. Гэта таксама быў інстынкт — не прывучаць драпежнікаў да смаку свайго мяса, каб не будзіць у тых жадання паляваць на іх. Таму яны паклалі Таго ў невялікую ямку і закідалі большымі і меншымі камянямі. Магчыма, хто-небудзь і разверне тыя камяні, магчыма, які-небудзь ліс і падкапаецца пад каменне. Але большага зрабіць для нябожчыка яны не маглі і не ўмелі.

Надыходзіла халодная і галодная ноч, бо за дзень мала што ўдалося знайсці для ежы. Ім яшчэ не было вядома, дзе той дзень і тая ноч, яны разумелі толькі святло і цяпло або цемру і холад. Але сёння ноччу засынала не бездапаможнае племя двухногіх, голых, галодных істотаў. Сёння сярод іх засыналі дзве зусім іншыя істоты, так падобныя і так адрозныя ад іх. Гэтай ноччу сярод іх засыналі два чалавекі: А-а і Ма. Чалавекі, бо мелі імёны, і калі А-а было яшчэ паўімем-паўпоклічам, то Ма было імя ў чыстым выглядзе.

Назаўтра ўсе маглі гэта забыць, але А-а, прачнуўшыся з першымі промнямі сонца, выйшаў на пагорак і замест звыклага «А-а» ціха прамовіў:

— Ма, — і абняў яе.

— Ма! — пачулася збоку, да іх падыходзілі іхнія дзеці

— Ма!

Яна абняла дзетак, стараючыся сагрэць іх сваім целам. Грэць больш не было чым. Племя не ўмела яшчэ здзіраць скуры з жывёл, ды і жывёл тых упаляваць удавалася не так шмат. Гэтаму яны навучацца пасля. А пакуль што яны толькі станавіліся людзьмі, бо ведалі ўжо два словы.

Яны сабраліся і пайшлі далей, шукаючы то вады, то яды.

А-а і Ма паспяхова вялі племя. А-а паказаў усім, што, ідучы на паляванне, трэба браць у рукі па добрым камені, і тады іхнія сілы значна павялічваюцца. Паляванні сталі больш удалыя, але асноўнай здабычай былі птушыныя яйкі, салодкія карэньчыкі, ягады, плады.

Аднойчы Ма падышла да дрэва з пладамі, якія мелі вялікую костачку ўнутры. Дрэва не мела ніякай назвы, не мелі назвы і плады. Усё, што цікавіла Ма, — ці можна ўжо плады есці, бо калі можна, то зверху з’ядаецца мякаць, а з костачкі можна дастаць зярнятка, раскусіць ці разбіць каменем і таксама можна есці. Ма сарвала плод, паспытала, мякаць была салодкая. Яна не ведала, плод спелы ці зялёны. Ён быў салодкі. Прырода сама паклапацілася, каб спелыя плады былі салодкімі, а няспелыя — кіслымі або горкімі.

Убачыўшы, што Ма есць плод, да яе падбегла дзіця, выцягнула руку:

— Ма! Ма!

Ма не звяртала на яго ўвагі.

— Ма, Ма! Мама, дай!

Просьбы малога не надта кранalі Ма, але яна пачула і зразумела, што дзіця просіць плод і што гэтым словам можна прасіць.

Ма крыкнула:

— А-а!

А-а пачуў і зразумеў, што Ма кліча яго, падышоў. Ма паказала яму на плод, які вісеў высока для яе. А-а падскочыў і сарваў плод. Ма выцягнула руку і сказала:

— Дай!

І А-а зразумеў, што яна просіць плод, што так можна прасіць. А знізу зноў зарумзала малое:

— Мама, дай!

Гэта быў першы асэнсаваны сказ з двух слоў, але што гэта быў за сказ! Яны трое — А-а, Ма і дзіцяня — гэтым сказам пачалі гаварыць.

Неўзабаве слова «дай» будзе ведаць усё племя. Потым з'явяцца словы «сюды», «туды», «ідзі». З'явяцца назвы жывёл. Яны будуць вельмі кароткія, з аднаго склада: «бык», «леў», «тыгр», «слон», «конь», «ліс», «воўк», «бэр». З'явяцца назвы дрэў, таксама кароткія: «дуб», «бук», «кедр», «вяз», «клён, «граб».

Племя А-а і Ма загаворыць, пройдзе пэўны час, пакуль дойдзе да сапраўднай мовы. Слоў будзе мала, звязкі іх будуць не заўсёды лагічныя, але калі іхняе племя сустрэнецца з чужым, нямым племем, то ў іх будзе відавочная перавага.

Што сталася з нямым племем, невядома, а гаваркое племя жыло, множылася, падзялілася на два, потым на чатыры. Часткі пайшлі ў розныя бакі.

Яны даведаліся, што такое дзень, што такое год. Прайшлі тых гадоў многія тысячы, а першыя словы «Мама, дай!» гучаць па ўсёй планеце дагэтуль. Гучаць ужо непадобна, малазразумела, але захоўваюць свой спрадвечны сэнс:

— Мама, дай!

Магчыма, гучыць гэта без налёту высокай духоўнасці, магчыма, па-спажывецку, але так пачыналася чалавецтва:

— Мама, дай!

## Не дай божа дажыць...

На межах Імперыі было неспакойна. З паўднёвага ўсходу раптам пачаліся набегі воінаў невядомага раней Каралеўства, пра якое яшчэ нядаўна ніхто не чуў. Узятыя ў палон воіны Каралеўства хоць не маглі нічога расказаць, але былі той жа расы, што і жыхары Імперыі, таму іх без праблем адпраўлялі працаваць на падземныя фабрыкі, адкуль немагчыма было ўцячы, а неўзабаве палонныя станавіліся амаль сваімі, і ўцякаць ужо не мела сэнсу.

Імператрыца здагадвалася, адкуль узялося новае Каралеўства. Некалькі пакаленняў таму назад вялікі аддзел воінаў Імперыі пайшоў у далёкую выведку якраз на паўднёвы ўсход і знік. Знік па зразумелых і вядомых прычынах. Праз нейкі час пасля выхаду аддзела лінуў страшны лівень, размыў не толькі дарогі і сцежкі, а затапіў усе нізіны, размякчыў і знёс многія пагоркі. Сталіца Імперыі была пабудавана разумна і амаль не пацярпела. Большасць фермаў была затоплена, але пасля сыходу вады яны даволі лёгка былі адноўлены.

Аддзел не вярнуўся, і ўсе палічылі, што ён загінуў. Па ўсім відаць, не загінуў, а знайшоў вольную і багатую тэрыторыю ды заснаваў сваё Каралеўства. Але адкуль у іх Каралева? І чаму менавіта цяпер воіны гэтага Каралеўства з'явіліся на межах Імперыі? І тут Імператрыца ведала больш за іншых. Яна ведала, хоць і не казала падданым, што Імперыя значна аслабла пасля леташняй вайны, заставы на межах сталі не такімі шматлікімі і моцнымі, і суседзі гэта заўважылі.

Леташняя вайна была страшная. На Імперыю абрынулася нашэсце народа чужой расы. Воіны гэтай расы былі чорныя, іх было многа, але былі яны значна меншыя за воінаў Імперыі. Просты імперскі воін мог справіцца з двума-трыма чужакамі, ды ўсё ж іх было вельмі многа. З паўднёвых застаў паляцелі эстафеты пра нашэсце, не пра набег, а менавіта пра нашэсце велізарнымі сіламі. Войска Імперыі было паднята па трывозе і батальён за батальёнам рушыла на ўзмацненне памежных застаў. Вялікі гетман генерал Мур сфармаваў тры калоны, нацэліў іх на тры кірункі, і маршавыя батальёны адзін за адным рушылі па сваіх франтальных дарогах, каб праз нейкі час змясціцца па ракадах і ўтварыць агульны фронт. Воіны Імперыі мелі перавагу перад прыхаднямі, бо ведалі ўсе гэтыя дарогі, у той час як батальёны чужынцаў рухаліся наўгад.

Імперцы прынялі першы бой, калі амаль разгарнулі фронт. Бой быў жорсткі. Батальёны прыхадняў гінулі адзін за адным, але іх было многа, і неўзабаве правы фланг Імперыі пачаў адступаць. Адступаць-то ніхто не адступаў, але маршавыя батальёны не паспявалі заняць месца выбітых і прымалі бой проста там, дзе сустракалі ворага. Лінія фронту паволі загіналася. Цэнтру таксама было цяжка, але сюды маршыравалі самыя баявыя, гвардзейскія батальёны, і неўзабаве яны ўтварылі з целаў ворагаў цэлы вал, збіўшы тым самым у іх ахвоту лезці напралом.

Левы фланг Імперыі разгарнуўся да сутыкнення з ворагам, прыняў першы ўдар у поўнай баявой гатоўнасці і не адступіў ні на крок.

Са сталіцы ішлі і ішлі падмацаванні. Лагічна было думаць, што падмацаванні будуць накіраваны на правы фланг, але генерал Мур кінуў іх на левы. У сталіцу паляцелі эстафеты, у якіх генерала абвінавачвалі то ў здрадзе, то ў вар'яцтве. Імператрыца ў здраду не верыла. Вайна ішла з народам іншай расы, прыхадням не патрэбны былі ні здраднікі, ні рабы, ні палонныя — толькі тэрыторыя. Вар'яцтва? Але ж войска не ўцякала, войска білася. Няхай пава'яцеюць хоць усе афіцэры і генералы, абы біліся.

Правы фланг працягваў адступаць, цэнтр стаяў, але ўзмоцнены левы фланг пайшоў наперад. Фронт пачаў паварочвацца і з усходне-заходняга стаў амаль што паўднёва-паўночным. Амаль, бо генерал Мур спыніў наступленне левага фланга. Склалася сітуацыя, пры якой шлях маршавых батальёнаў чорных, якія ішлі з поўдня, пралягаў уздоўж фронту імперцаў, і тыя білі іх у слаба прыкрытыя флангі. Тым не менш пагроза на правым флангу ўсё яшчэ не спадала, і генерал Мур паслаў у сталіцу эстафету з просьбай падняць з падземных фабрык рабочых, сфармаваць батальёны апалчэння і высунуць іх на захад ад сталіцы. З рабочых воіны былі слабаватыя, але кожны мог справіцца з адным чорным, і батальёны апалчэння пачалі займаць пазіцыі на захад і паўднёвы захад ад сталіцы, каб сустрэць ворагаў.

І вось генералу паведамілі, што на левым флангу паказаліся абозы чорных, гэта азначала, што ўсе шыхтовыя аддзелы ворага ўжо ў баі. І генерал кінуў наперад гвар-

дыю цэнтра, разразаючы фронт чорных. Дабівалі іх па частках. Гэта быў народ іншай расы, таму ніводнага палоннага не ўзялі. Выбілі ўсіх.

Аднак і Імперыя панесла цяжкія страты. І цяпер гэтыя страты адчуваліся па ўсёй мяжы.

Каралева і Каралеўства былі маладыя — і таму амбітныя. Каралеўства плаўна пашырала свае межы і непазбежна павінна было з некім сутыкнуцца. На ўсходзе была непраходная і бязмежная пустэльня. На поўдні — горны ланцуг. Ланцуг быў, магчыма, не надта шырокі, але да гэтага часу заставаўся недаследаваным. На захадзе і поўначы разлягаліся выдатныя землі, але гэта былі ўжо землі Імперыі. Воіны Каралеўства выйшлі на межы, абазначаныя заставамі Імперыі, але пераходзіць іх асцерагаліся, бо гэта заўсёды дрэнна заканчвалася. Падчас леташняй вайны Каралеўства засталося ўбаку. На яго тэрыторыю таксама ўварваўся выведвальны аддзел чорных, але маладыя воіны Каралеўства атачылі аддзел прыхадняў і выбілі ўсіх, так што і распавесці пра іхні лёс не было каму. Каралеўства магло прыйсці на дапамогу Імперыі, але Каралева вырашыла гэтага не рабіць. Аслабленне Імперыі ў выніку гэтай вайны цалкам адпавядала інтарэсам Каралеўства, і цяпер яго воіны значна смялей рушылі на тэрыторыю Імперыі. Пачаліся частыя памежныя канфлікты…

Імператрыцу гэта хвалявала не вельмі моцна. Яна ведала: пройдзе перыяд узаемных набегаў, нешта Імперыя страціць, нешта набудзе. Нарэшце ўстановіцца або моцная мяжа, або шырокая нейтральная паласа. Яе хвалявала іншае — стаяла нябывалая сухмень. Фабрыкі працавалі, але на фермах было цяжка. А найбольш хвалявала небяспека пажару.

І ён здарыўся. Запалала ўсё наўкол. Тыя, хто быў у сталіцы, кінуліся ў падзямеллі, хаця гарантый бяспекі не было і там. Для воінаў на межах, працоўных на фермах і транспарту на дарогах ратунку не было. Згарэла ўсё і ўсе… І ў Імперыі, і ў Каралеўстве…

* * *

Два пажарнікі стаялі на выгаралым участку лесу велічынёй у пару гектараў. На краях участкаў былі відны папялішчы на месцы двух мурашнікаў — былых сталіц Імперыі і Каралеўства.

— А тут жа былі цэлыя цывілізацыі, — прамовіў адзін.

— Так. І вось што я табе скажу з гэтай нагоды: не дай нам бог дажыць да той пары, калі адзін касмічны пажарнік, прыляцеўшы з іншага Сусвету, скажа другому касмічнаму пажарніку, гледзячы на ўсезямное папялішча: «А тут жа былі цэлыя цывілізацыі…»

## Сасна крычала…

Сасна крычала, крычала ўсім целам і ўсімі фібрамі яе сасновае душы. Ёй трэба было дакрычацца да людзей, але ж людзі яе не чулі і не разумелі. А дакрычацца трэба было абавязкова. Са сваёй трыццаціметровай вышыні яна бачыла тое, чаго не было відно знізу: яна бачыла дым. За свае сто з лішнім гадоў яна бачыла розныя дымы і адрознівала дым кастра, дым з коміна леснічоўкі, хаця калі гэта было? Гэта

быў дым пажару, пад дымам было вялікае полымя. Вецер гнаў і дым, і полымя ў яе бок, і сасна крычала. Яна магла б перадаць свой крык цераз іншыя дрэвы, калі б яны былі бліжэй і датыкаліся сваімі галінамі да яе ствала, а яшчэ лепш да кроны, але яна была адна на паляне. Некалькігадовы падлесак — не ў лік. Бяздумныя, а хутчэй хітрыя і хцівыя людзі выпласталі цэлы абшар сасняку пад выглядам барацьбы з караедам, хаця яшчэ сто гадоў таму назад навучыліся таго караеда паспяхова труціць, труцілі нават з самалётаў. Але тут некаму прыглянуўся сасновы бор побач з дарогай, знайшлі, можа, адно дрэва з тым караедам, і ўвесь бор пайшоў на добры будаўнічы матэрыял па недарагой цане, а як жа: драўніна ж пашкоджана караедам. Яе ж адну чамусьці пакінулі пасярод паляны. Каб гэта было некалі, то падумалася б, што пакінулі дзеля таго, каб яна засеяла паляну і падняўся новы лес. А цяпер ніхто гэтага не чакае, паляну перааралі і пасадзілі саджанцы, а ёй даводзіцца стаяць тут без вялікай справы і чакаць буры, але пакуль бура, набліжаўся пажар.

Сасна магла перадаць інфармацыю цераз птушак, але на яе вышыню і птушкі заляталі вельмі рэдка. Гнёздаў не вілі, ветрана і холадна, а так чаго на такую вышыню ляцець? І ўсё ж сасне пашанцавала, на яе галіну сеў ястраб, ці то каб адпачыць, ці то каб пацікаваць зверху якую здабычу. Ястраб сеў на галіну, і сасна змагла расказаць яму пра бяду, якая набліжалася да іх. Сасна прасіла ястраба перадаць інфармацыю людзям. Ястраб і сам ужо бачыў дым, але яго той дым хваляваў не моцна. Ну, пажар, можна адляцець убок, і клопату мала. Але сасна адляцець не магла, у яе быў клопат, і яна прасіла ястраба перадаць пра пажар людзям.

Ястрабу ляцець да людзей было ніяк не з рукі, дакладней, не з крыла. Ад тых людзей нічога, акрамя порцыі шроту, яму чакаць не выпадала, ды і як бы ён тым людзям што сказаў? Сказаў бы, што ён ніякай шкоды людзям не рабіў, што гэта не ён, а каршун пабраў на мінулым тыдні куранят у тутэйшых разявак-гаспадынь, якія выпусцілі тых куранят з-пад сетак на вольны шпацыр. Людзі не адрознівалі ястраба ад каршуна, людзі не разумелі мовы сасны, людзі не разумелі і мовы ястраба. Але сасна прасіла, і ястраб паляцеў.

Ён ляцеў у бок горада і ўжо ведаў, што ён зробіць. У горадзе была вежа, пад вежай той былі людзі, у людзей былі чырвоныя машыны, якімі, ён бачыў, яны ўжо неяк тушылі агонь у лесе. Ястраб ляцеў туды. Недалёка ад вежы раслі высокія таполі. На тых таполях жылі чароды гарадскіх варон, якіх тут асабліва ніхто не чапаў. Ястраб падляцеў да таполяў і нягучна, але выразна клекатнуў. Вароны былі хоць і гарадскія, але інстынктаў яшчэ не пагубілі. Ад клёкату ястраба чароды іх узвіліся з таполяў і паднялі неймаверны гвалт. Ястраб у гэтым гармідары мог і прыхапіць якую гапу, але не стаў гэтага рабіць. Ён адлятаў, а калі вароны пачыналі супакойвацца, падлятаў зноў, практычна не даючы ім сесці.

Людзі ўнізе варон заўважылі.

— Чаго гэта яны ўзбударажыліся?

— Мо які кот залез на таполю.

— Што той кот, дурны туды лезці? Задзяўбуць.

— Тады чаго?

— А злазь ты на вежу ды глянь, мо дзе што гарыць.

— Каб гарэла, то ўжо нехта патэлефанаваў бы.

— Нехта... а калі няма каму?

Чалавек такі палез на вежу і ўбачыў дым. Далёка ў лясным масіве сапраўды нешта гарэла. Не дым, а так, дымок. Мо якое галлё хто паліць? Але досвед гаварыў пра іншае.

— Падымай верталёт і гатоўнасць нумар раз.

Ястраб бачыў, як лёгенькі верталёцік застракатаў у бок пажару. Сам ён туды ляцець не збіраўся, хіба што злятаць сказаць сасне, што з даручэннем справіўся.

Задзілінькалі тэлефоны, памчаліся на пажар чырвоныя машыны, завурчалі цяжкія лясныя трактары і папаўзлі напярэймы агню.

Пажар ішоў і верхам, і нізам.

Нізавы пажар людзі перахапілі на лясной дарозе, але верхавы шугануў над імі, і трэба было адступаць.

Прыляцеў цяжкі верталёт і лінуў вялікую порцыю вады. Удала. Верхавы пажар аціх, людзі пачалі тушыць невялікія агмені ўнізе, але раптам шуганула зноў, зноў з'явіўся верталёт, потым зноў. Спынілі пажар якраз на краі паляны недалёка ад сасны. Залілі верхавы, а ўнізе трактар з велізарным плугам адараў глыбокую баразну, каб агонь не мог прабрацца пад імхом па сухой лясной падсцілцы.

Франтальны рух пажару быў спынены. Людзі занялі пазіцыі справа і злева, не даючы агню абысці паляну. А ён спрабаваў, ішоў як бы пад зямлёю. Ціха-ціха, і раптам за спінаю ў пажарнікаў успыхвала сухая сасёнка. А то і не ўспыхвала, як бы стаяла спакойна, а стукнеш абухом па ствале, а з-пад кары іскры. Але і людзей большала, прыбывала падмога. Агонь з квартала не выпусцілі.

Сасна замоўкла, яна хацела падзякаваць ястрабу, але той адляцеў падалей і ад агню, і ад людзей. Магчыма, прыляціць калі-небудзь, і сасна падзякуе яму, а пакуль што моўчкі дзякавала людзям. Людзі — яны розныя. Адны лес рэжуць, другія садзяць, трэція ратуюць. І неяк паміж сабой ужываюцца. Ужываюцца, бо трэба жыць. Трэба жыць і сасне, і ястрабу, і воранам, і людзям. І гэтае «трэба» мае такую сілу, што і дрэва крычаць змагло прымусіць…






нарадзіўся 24 верасня 1954 года ў вёсцы Сейлавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча (1977), Цвярскую ваенна-камандную акадэмію імя Жукава (завочна). Як прафесійны ваенны служыў у Савецкай арміі, пасля ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі» і ордэнам «За службу Радзіме». У 1992 годзе выдаў першы зборнік вершаў. Друкаваўся ў часопісах «Полымя» і «Маладосць». Аўтар кніг «Кароткі расійска-беларускі вайсковы слоўнік» (1993); «Расійска-беларускі вайсковы слоўнік» (1997) на 8000 слоў (сумесна з С. Чыславым); «Шыхтавы статут Беларускага войска», навуковага дапаможніка «Стэнаграфія» (2009)», зборнікаў вершаў «Пагоня за мову», «Наш Грунвальд» (1999), «Лідскія скрыжалі» (2008), «Літва» (2011), «Пілігрымка да дому» (2018). З'яўляецца рэдактарам газеты «Наша слова», часопісаў «Лідскі летапісец» і «Ад лідскіх муроў».

ЯНКА ТРАЦЯК

## Ляжалі разам...

1

На мітынг, прысвечаны чырвонаму дню календара — з нагоды ўгодкаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, таварыш Порахаў прыйшоў стомлены, незадаволены і нервовы.

Перш-наперш нервы пачаліся яшчэ за колькі дзён да свята, і віной таму быў іх былы лідар партыі і вечны арганізатар партыйных дэманстрацый і мітынгаў таварыш Аляксандр Мікалаевіч Пушкароў, які забыўся пра свята і ўспомніў толькі тады, калі ён, Порахаў, яму нагадаў па тэлефоне. Порахаў хацеў удакладніць, як будзем адзначаць свята ў гэтым годзе, а Пушкароў (як усё роўна здзекаваўся) спытаўся: «Якое свята?..» А да свята заставалася ўсяго чатыры дні... Праўда, усё абышлося. І дазвол атрымалі (задняй датай), і падтрымка была ў атрыбутах і транспарантах ад гарвыканкама, але гэта толькі дзякуючы ініцыятывам яго — Порахава — і мясцовых уладаў, якія таксама, на ўсякі выпадак, рыхтаваліся да такога дня.

Абураным застаўся таварыш Порахаў і ад учарашняга вечара, які ён правёў на тэлефоне, заклікаючы сваіх былых таварышаў, калегаў і прыхільнікаў узяць актыўны ўдзел у святкаванні, а літаральна: «Выйсці грамадой на плошчу Леніна і паказаць, што вялікія ідэі Вялікага Кастрычніка з вялікай літары жывуць і перамагаюць...»

Але многія былыя партыйныя аднадумцы і паплечнікі не праяўлялі значнага энтузіязму і жадання выходзіць на плошчу і нешта паказваць, спасылаліся не толькі на кепскае самаадчуванне, але і на «не тыя гады», і на тое, што «не вернеш таго, што раней было», і на тое, што «няма больш чаго паказваць», і нават некаторыя нахабна заяўлялі: «А што мне за гэта будзе?» І з такімі (да чаго дайшлі некаторыя) яму нават даводзілася сварыцца.

А пасля ўжо незадавальненне выклікала не толькі арганізацыя працэсу святкавання, але і сам працэс, асабліва колькасць дэманстрантаў. Каля помніка правадыру пралетарыяту сабралася ўсяго каля двух дзясяткаў састарэлых пенсіянераў, прыкладна столькі ж чыноўнікаў і пераапранутых міліцэйскіх і дванаццаць студэнтаў-камсамольцаў (таварыш Порахаў усіх палічыў). Студэнты падышлі быццам бы падтрымаць ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі, але Порахаў ведаў, што прыйшлі яны дзякуючы таварышу Рыгаровічу, які працаваў ва ўніверсітэце і абяцаў «падагнаць» цэлы паток (сто дваццаць студэнтаў) на пераздачу іспытаў па курсе «Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны і выключнай ролі ў перамозе камуністычнай партыі» (менавіта так ён называў свой курс). Але чамусьці прыйшло ў дзесяць разоў менш. Відаць, нешта не склалася. Дарэчы, і сам абяцаў прыйсці, але не прыйшоў, пэўна, захварэў Рыгаровіч альбо запіў, што з ім здараецца вельмі часта.

А яшчэ больш Порахаву сапсаваў настрой непасрэдна на мітынгу ўсё той жа таварыш Пушкароў Аляксандр Мікалаевіч: ён прыйшоў на мітынг без партрэта Сталіна.

Маўляў, забыўся. Пяцьдзясят гадоў хадзіў і не забываўся, а тут забыўся. Болей за тое, ён падыходзіў да кожнага прысутнага і з нейкім цьмяным бляскам у вачах пытаўся: «Хто ты такі?.. А ці ведаеш, хто я?..» Падыходзіў ён і да Порахава, і нейк шчымліва было глядзець на чалавека, які каля трыццаці гадоў быў тут галоўным рулявым, быў князем, каралём і богам, з якім амаль паўстагоддзя Порахаў правёў побач: і як правая рука, і як надзейны сябра, і як лепшы арганізатар розных пазакабінетных імпрэзаў… Нездарма іх называлі калегі жартам Два-пэ-квадрат: адзін — Пушкароў, другі — Порахаў.

Да ўсяго да гэтага — стаяла мокрае і смаркатае надвор’е. Пырскаў без ніякага толку які ўжо дзень запар дробны дождж, як у песні ўсё роўна, — ад панядзелка да панядзелка, — пырскаў з дамешкамі мокрага снегу. Дзьмуў халодны праніклівы вецер, які стараўся паказытаць гланды, залезці пад вопратку, дастаць прастáту… Паскудны быў вецер.

А яшчэ таварыш Порахаў адчуваў сябе няважна. З усяго было відаць, што і ціск быў павышаны, і халестэрын вышэй нормы, і цукар зашкальваў; кружылася галава, і нейкая слабасць разлівалася ва ўсім целе. На гэты конт таварыш Порахаў падумаў, што «ці не варта было б прачысціць сасуды…».

…Зразумела, што дэманстрацыі як такой і не было. Гэта не тое, што раней… Быў звычайны мітынг, на якім малады сакратар (якога ніхто нідзе не чуў і не ведаў) адноўленай партыйнай арганізацыі агучыў нагоду, дзеля якой сабраліся, сказаў пра тое, што гэта — вечнасць і стаў даваць слова паводле папяровага спісу.

Раней спіс гэты зацвярджалі на партыйным сходзе, пасля некалькі разоў яго складалі Пушкароў і Порахаў і самі зацвярджалі, а апошнія гады ўдакладнялі выступоўцаў па тэлефоне. І тыя, каму вядоўца-сакратар даваў слова, выходзілі на трыбуну, якая стаяла акурат пад помнікам правадыру, і выступалі… Гаварылі амаль што адно і тое самае, толькі мянялі словы, сказы, акцэнты: вялікі Ленін, сацыялістычная рэвалюцыя, атачэнне ворагаў-імперыялістаў, перамогі на ўсіх франтах пад мудрым кіраўніцтвам камуністычнай партыі і будаўніцтва развітага сацыялізму…

Тут і сапраўды — нешта новае за столькі гадоў цяжка было прыдумаць.

Палез на трыбуну і Пушкароў, хаця, здаецца, яго не было ў спісе выступоўцаў. Палез, відаць, праз шматгадовую звычку. Адчувалася, што ён хацеў сказаць нешта істотнае і важнае, што ўразіла б і заваражыла, і таму гаварыў нешта доўгае, блытанае і малазразумелае. І, вядома, калі чалавек гаворыць шмат і не з паперкі, і тым больш з няўстойлівай псіхікай, дык ён абавязкова скажа нешта такое, што можа нават рассмяшыць астатніх. Пушкароў дагаварыўся да таго, што абвясціў сябе знаёмым Надзеі Канстанцінаўны і пачаў даводзіць, што асабіста ведаў яе мужа — Уладзіміра Ільіча Крупскага… І яшчэ нешта хацеў сказаць таварыш Пушкароў нядобрае пра таварыша Сталіна (таварыш Порахаў адчуў гэта нутром), і яго давялося далікатна сцягнуць з трыбуны…

І заўсёды на такіх імпрэзах выступаў таварыш Порахаў. Гаварыў ён адно і тое, што гаворыць заўсёды з году ў год на кожным мітынгу ці на сустрэчах са школьнікамі: пра крамлёўскую зорку, якая загарэлася вельмі шмат гадоў таму і сёння загараецца ў іншых гарадах і добра гарыць ды асвятляе дарогу ўсім у светлую будучыню…

Нейкі прайдоха каля пляца стараўся перашкодзіць, смяяўся і крычаў, што зорка даўно патухла, а будучыня пацямнела… Праўда, нейкія правільныя людзі ў цывільным вельмі хутка яму заткнулі рот і адвялі ў месца трохі больш аддаленае.

«Хай там сабе пакрычыць, — радаваўся і супакойваў сам сябе таварыш Порахаў. Пасля гэтага ён з яшчэ большай перакананасцю даводзіў пра арыентацыю на такія зоркі:

— Толькі адтуль і толькі дзякуючы гэтаму вялікаму агню, які распыляецца паступова на ўсёй планеце, і яму — вялікаму генію…

Тут ён быццам ажыў на трыбуне, быццам узнёсся над ёй… Рэзка павярнуўся да помніка Леніну і выкінуў руку ў яго бок, каб лішні раз указаць на веліч генія…

І тут выразна ўбачыў, як на твары вялікага бронзавага помніка адклаўся ледзь прыкметны цень, а правае вока расплюшчылася трохі болей і весела яму падміргнула…

Пасля хвіліннай знiякавеласці таварыш Порахаў павярнуўся да мітынгоўцаў і стаў крычаць: «Няхай жыве справа вялікага Леніна!», «Няхай жыве Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя!..»

Пасля слабога і старэчага няшматгалосага «Ура-а-а!» ён зноў крадком азірнуўся на помнік…

І Ленін, такі малады, падміргнуў яму і на гэты раз…

Таварыш Порахаў не ведаў, што рабіць у дадзены момант, — ён стаяў на трыбуне і маўчаў, а нешта там, у грудзях, глыбока пад лыжачкай, засмактала. «Можа, здалося?» — падумаў ён, але тут накаціла нейкая хваля радасці і бадзёрасці, і ён ні з таго ні з гэтага зноў раптоўна стаў гучна крычаць:

— Ленін жыў! Ён — жыве! І Ленін будзе жыць! Ура!..

На гэты раз падхопленае «Ура!» было яшчэ слабейшым, чым першы раз. Выдыхаліся людзі. Раней маглі паўдня хадзіць і крычаць лозунгі пра нейкага «Славу…»: слава партыі, слава Леніну (…Сталіну, рэвалюцыі, радзіме, працы, хлебу, рукам і работнікам кожнай галіны народнай гаспадаркі…).

Чарговага прамоўцу Порахаў не чуў — думаў аб сваім: аб падміргванні і нейкай сваёй асаблівай ролі ў гэтым…

Пасля клалі кветкі да помніка. Пасля яшчэ пастаялі колькі хвілін, як на памінках, і пачалі памалу разыходзіцца. І ўжо на развітанне таварыш Порахаў яшчэ раз глянуў на помнік і яскрава ўбачыў, як вялікі правадыр ледзь прыкметна кіўнуў яму галавой.

«Відаць, адобрыў», — падумалася таварышу Порахаву, і пасля гэтага трохі палягчэла.

2

…Раней, пасля такіх святочных дэманстрацый, яны збіраліся ў рэстаране ці ў абкамаўскай сталоўцы (зразумела, што за кошт партыі) і працягвалі свята да самай раніцы. Пасля, як партыі не стала, збіралі карпаратывы ў кабінетах, бо амаль што ўся партыйная наменклатура, пасля нязначнай ратацыі кадраў, засталася ў сваіх перайменаваных кабінетах, пасля ладзілі выхады з шашлыкамі на прыроду і на свае сядзібы за горадам (калі яшчэ было з кім сабрацца), а апошнія гады святкавалі ў

каго-небудзь на кватэры невялікай кампаніяй: нехта памёр, нехта здрадзіў вялікім ідэям, нехта хварэў, а некага і жонкі не пускалі…

А святкаваць сваім калектывам варта было б: і каб традыцыю не парушаць, і каб абмеркаваць падзеі, абазначыць мэты і акрэсліць новыя планы мінімум і максімум на будучыню.

У мінулым годзе сядзелі ў яго, таварыша Порахава, на хаце. Сядзелі ўчатырох: Пушкароў, Васіль Іваныч Нечапай, Пецька Ландэр і ён, Порахаў.

І ў гэтым годзе варта было б дзе сабрацца, бо ёсць пра што пагаварыць, а яму, Порахаву, тым больш, — адно толькі падміргаванне таварыша Леніна на плошчы чаго вартае… І тут адным розумам сваім не ўсё скумекаеш, што да чаго… А калі раптам у гэтым які-небудзь шматабяцальны прарочы знак?..

Толькі ў гэтым годзе і пасядзець няма з кім: Ландэр памёр, Пушкароў, з усяго было відаць, прыдурнеў трохі, і сядзець з ім было небяспечна, застаўся толькі адзін хворы Васіль Іваныч Нечапай, які спаслаўся на недамаганне і «адпрасіўся» ад удзелу ў мітынгу…

Порахаў патэлефанаваў. Трубку падняла жонка Васіля Іваныча і эмацыйна загаласіла пра тое, каб ён не чапаў яе мужа. Яна так і пракрычала:

— Порахаў, колькі разоў я табе гаварыла, каб Васіля Іваныча Нечапая ты больш не чапаў!.. Ніколі каб не чапаў!..

І так яна заўсёды гаварыла. І ён, Порахаў, заўсёды яго чапаў.

Нечапай жыў у самым цэнтры горада. Дарэчы, усе яны, былыя функцыянеры (не любіў Порахаў такога словазвароту — былыя функцыянеры), мелі свае кватэры ў прэстыжных дамах у цэнтры — таму што заслужылі.

Да дома Нечапая ад плошчы трэба было прайсці якіх-небудзь трыста-чатырыста метраў, не болей.

Апошні раз ён быў у Нечапая каля трох месяцаў таму. Тады таксама была важная нагода, каб абгаварыць адну сур'ёзную сітуацыю. А справа была ў тым, што калі ён, Порахаў, праходзіў неяк каля царквы, адзін бомж-жабрак з-пад царкоўнай агародкі кінуўся да яго насустрач як да добра знаёмага. «Здароў, Санёк!.. Ты што, не пазнаў? — дзівіўся бомж. — Ляжалі разам!..» Гэтае «ляжалі разам» тады разанула па свядомасці Порахава так, што ён нават разгубіўся і не ведаў, як адказаць жабраку. І толькі моўчкі рэзка развярнуўся і хутка пайшоў прэч. Не хапала тут яшчэ, каб гэты вулічны бамжара каля царквы стаў нагадваць, дзе яны ляжалі разам…

Вось гэтую загадку ён тады і надумаў абмазгаваць з Нечапаем — не чужы ж чалавек і быў някепска асвядомленым у тым, дзе ляжаў Порахаў… Тады Порахаў узяў з сабой пляшку каньяку таннага разліва да кавы, каб мозг добра мог працаваць над такім правакацыйным пытаннем…

3

Часам лёс так звязвае людзей між сабою, што калі б і хацеў хто адвязацца — не адвяжашся. Нешта падобнае атрымалася ў Порахава з Нечапаем. Вось калі і ляжаў ён дзе-небудзь з кім, дык хіба што з Нечапаем: яшчэ школьнікамі ляжалі ў бальніцы ў адной палаце, пасля жылі ў адным пакоі ў піянерскім лагеры і сем гадоў сядзелі разам за адной партай. Пасля, калі ў іх стаў праразацца мужчынскі басок, ім абодвум

кінулася ў вочы Наталі — сяброўка дзяцінства, аднакласніца і надзейны школьны таварыш-піянер... Кінулася не як школьны таварыш, а зусім з іншага боку... Пасля гэтага захаваць сяброўскія адносіны было вельмі складана абодвум. Ды яны і не вельмі імкнуліся да таго — у галаве былі зусім іншыя задумы, планы, у якіх яны не бачылі адзін аднаго каля Наталі, а кожны бачыў толькі сябе... І нехта павінен быў саступіць, але ніхто саступаць не хацеў, а Наталі ніяк не магла разабрацца, што да чаго і каго абраць...

У Нечапая тады ў хаце нікога не было, апрача гаспадара. Жонка з унукамі засталіся на лецішчы, і гэта было добра. Нечапай доўга смяяўся над пытаннем пра ляжанку разам. Нават здзекаваўся: маўляў, вы, магчыма, пасля нейкага партыйнага сходу агульную ляжанку ўстроілі... А магчыма, ты з ім у адной трыперцы ляжаў... А ці не на якім-небудзь нудысцкім пляжы валяўся?.. А можа, у санаторыі?..

Порахаў нават пакрыўдзіўся на такія пляскатыя жарты. І толькі пасля таго, як Нечапай задаволіўся сваім сцёбам, яны пачалі перабіраць сотні варыянтаў, дзе можна было б паляжаць разам, і ні на адным так і не спыніліся, бо не мог недзе ляжаць ён, таварыш Порахаў, разам з нейкім бамжом... У акопах маглі б ляжаць некалі, але яму, хоць ён і Порахаў, порах нюхаць не даводзілася ў акопах...

Нават пасля стымуляцыі мазгавой актыўнасці напоямі з асабістага нечапаеўскага бару, бо каньяк вельмі хутка выветрыўся, нічога не ўспомнілася канкрэтна пра ляжанку разам з асобамі падазронай знешнасці...

Скончылі яны тады абмазгаванне тэмы тым, што злеглі разам на кухні: адзін за сталом, другі на кушэтцы...

4

І на гэты раз па дарозе да Нечапая Порахаў, як і каля трох месяцаў таму, зайшоў у краму.

Яго раздражнялі сучасныя крамы. Раней, бывала, зойдзеш: адзін гатунак хлеба, адзін гатунак піва, адзін гатунак гарэлкі, каўбасы зусім няма — трэба даставаць... А цяпер — вочы разлятаюцца, і ад разгубленасці не ведаеш, што браць. Ды, праўда, не хадзіў ён раней у крамы — усё прывозілі паводле спецзамовы. І цяпер можна было б замовіць, але ж гэта зусім не тая замова, ды і ці хопіць у яго пенсіі на такія абслугі.

У краме Порахаў, як і ў той раз, узяў палку недарагой каўбасы і пляшку каньяку таннага разліву і праз нейкіх пяць хвілін ужо ціснуў кнопкі дамафона нечапаеўскай кватэры.

Дзверы адчыніла Наталі — жонка Нечапая.

Ах, Наталі, ах, Наталі...

5

На гістарычны факультэт інстытута яны з Нечапаем паступілі абодва толькі таму, што туды паступіла Наталі. І амаль што пяць гадоў вучобы былі яны не проста супернікамі, а лютымі ворагамі. І што толькі ні рабіла Наталі, каб прымірыць былых неразлучных сяброў — нічога не атрымлівалася. На чацвёртым курсе шалі саперніц-

тва пераважылі ў яго карысць, і яны з Наталі сталі рыхтавацца да вяселля… Здаецца, было каханне. Ён тады нават вершы пачаў пісаць, і адзін, філасофскі, прысвяціў сваёй Наталі:

Нішто не вечна на зямлі,
І тут няма чаму дзівіцца…
Ах, Наталі, ах, Наталі,
Мне век табой не наталіцца!..

Але век яго наталення быў нядоўгім. Усё было добра, і нават людзей ужо запрашалі на вяселле, але трэба ж было тады Наталі сказаць: «І да гэтага часу не ведаю, што рабіць: ці мне сесці на парахавую бочку, ці стаць нечапайкай…»

Ёй трэба было сказаць, а яму трэба ж было пачуць…

Так, яго, Порахава, называлі Парахавой Бочкай: і таму, што прозвішча было такое, і таму, што быў трохі таўставатым, і таму, што меў выбухны характар.

І тады ён выбухнуў… «Ты з кім мяне праўноўваеш?!. Дзе я — сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта, і дзе ён — нават не ў бюро камсамола групы… Хто я — бацька і маці на высокіх пасадах у гаркаме партыі, дзядзька — у аблвыканкаме, цётка — у міністэрстве, і хто ён, смаркач: бацька — электрык, а маці — настаўніца…»

Выбухнуў ён тады і перакрэсліў сам сабе лёс… Гэтых жанчынаў цяжка іншы раз зразумець — ён жа хацеў ёй дапамагчы з выбарам… А яна што выбрала?..

І пасля гэтага на пятым курсе Наталі стала Нечапайкай. І Вася Нечапай ганарыўся перад аднакурснікамі (і перад ім таксама), што ў яго жонка — Нечапайка.

Праўда, толькі адзін Порахаў ведаў, што ў яе быў нашмат лепшы выбар і якая яна была «нечапайка»…

6

— Праходзь, — адказала Наталі на яго прывітанне. — Не стой у парозе…

Цяпер ад той Нечапайкі нічога не засталося з таго, што некалі так хвалявала Порахава, і ад таго, што можна было чапаць. Хіба што голас не змяніўся і нешта нязменнае і няўлоўнае, як і тады, засталося ў яе блакітных вачах.

— Не варта вам ужо хадзіць па плошчы і крычаць каля помніка — не тыя гады, — гаварыла Нечапайка, калі Порахаў у прыхожай памалу распранаўся і разуваўся. — І не чуе вас Ільіч, як ніхто не чуе, і нікому гэта ўжо не трэба…

— Пакуль помнік стаіць, значыцца, гэта некаму трэба, — пераканаўча запярэчыў Порахаў.

— Помнік, можа, і стаіць… — даводзіла сваё Нечапайка. — Толькі цяпер іншы час, іншыя людзі, іншыя лозунгі. Вы, як маладыя козлікі, падскокваеце, а толку з вас — ужо ніякага…

— Наталія, ты, як заўсёды, памыляешся. — адказаў ёй Порахаў, бо згубіў усякі сэнс у дыскусіі.

Ён акуратна паставіў свае чаравікі і зазірнуў у залу.

— А дзе ж сам Нечапай?

— Тут я! — адгукнуўся Нечапай, выходзячы з уборнай пад шум бягучай вады ва ўнітазе. — Прыхварэў трохі… Кашаль нейкі…

7

З Нечапаем яны так і не сталі сябрамі нават і тады, калі ён, Порахаў, займаў высокія партыйныя пасады, а Нечапай заўсёды быў у яго ў падпарадкаванні. Ведаў Порахаў, што Нечапай раўнаваў жонку і ненавідзеў яго, але і ў Порахава да Нечапая былі не лепшыя пачуцці. Відаць, здагадваўся Нечапай пра тое, чаму ў яго нічога не атрымлівалася з кар’ерным ростам, але нічога зрабіць не мог… А сыходзіцца сталі яны толькі ў апошнія дзве пяцігодкі. І зблізілі іх (парадокс!) дзеці: ажаніўся сын Порахава з дачкой Нечапайкі, і яны сталі сватамі. Порахаў быў катэгарычна супраць такога шлюбу — не быў ён упэўнены на сто адсоткаў, што дачка не ад яго ў Нечапаяў, — але хто сёння слухае бацькоў?.. А тут якраз і партыі не стала… Порахаў пасля некалькіх вымушаных застольных «пасядзелак разам са сватамі» стаў пераконвацца ў тым, што Нечапай быў сапраўдным камуністам… А гэта для яго было больш важным, чым нейкае сватаўство…

8

— Кашаль, кажаш… Трэба лячыцца! Трэба сасуды чысціць рэгулярна! — і Порахаў урачыста, як дарагімі падарункамі, абдарыў Нечапая пляшкай каньяку, а Нечапайку — палкай каўбасы.

І тут Нечапайка стала актыўна даводзіць:

— Алкаголь — гэта вялікае зло!.. А Васю — Васілю Іванавічу — дактары катэгарычна забаранілі, нават віно…

Але хто калі слухае такую агітацыю?

— Кінь што на стол лепш, — прапанаваў ёй спакойна Вася. — Не адной жа каўбасой нам давіцца…

Пасля ўжо давіліся не толькі каўбасой, але і катлетамі, і салатамі нейкімі, і бульбай-скрабанкай.

Васіль Іванавіч, якому дактары забаранілі піць нават віно, піў з Порахавым роўнымі кілішкамі. І пілі не толькі каньяк таннага разліву да апошняй кроплі, але і нейкі самаробны каньяк, які Нечапай быццам бы зрабіў спецыяльна для гэтага дня і выпадку.

Гаварылі пра ўсё, але гутарка ўсякі раз вярталася да таго, хто сёння быў на пляцы, што гаварыў, і каго сёння не было, і з якой нагоды не было. Згадалі і памянулі хвілінай маўчання тых, хто памёр, і выпілі за здароўе тых, хто яшчэ жыве і змагаецца за вялікія ідэалы. І неяк, выбраўшы момант, Порахаў заікнуўся пра Леніна, які яму тры разы падміргнуў і адзін раз кіўнуў галавой у час мітынгу.

— А не зашмат — тры разы падміргнуў? — засумняваўся чамусьці Васіль Іваныч.

— Я думаю — нармальна, — адказаў Порахаў і задумаўся.

На самай справе Ільіч падміргнуў яму два разы, але ж як тут не сказаць тры, калі Бог любіць тройцу.

— А хто яшчэ мог такое бачыць? — зноў спытаў Нечапай.

— Не ведаю, — адказаў Порахаў. — Можа, ніхто… Не кожнаму ж сустрэчнаму будзе падміргваць такі геній…

Нечапай моўчкі наліў чаркі. Выпілі. Закусілі і далей сядзелі моўчкі. Кожны думаў пра нешта сваё…

— Не веру! — закрычаў раптам Нечапай. — Ты брэшаш, сабака, як брахаў усё жыццё!..

— Не верыш? Ты мне не верыш!! Пайшлі, сам убачыш! — ускочыў абураны Порахаў.

— Пайшлі!..

На іх крык прыбегла Нечапайка, спрабавала затрымаць, пакуль яны збіраліся ў дарогу і апраналіся, але хто на яе звяртаў увагу?..

Ужо на вуліцы Нечапай раптам спытаў:

— А можа, табе здалося?..

— Можа, і здалося, — Порахаў не стаў спрачацца.

— А калі здалося, дык трэба было перахрысціцца…

— Толку…

— Будзе толк! — упэўнена, як бацюшка, заявіў Нечапай і нечакана прапанаваў: — Перш у царкву зойдзем…

— Яшчэ чаго!.. — абурыўся Порахаў.

— Ніхто там цябе з крыжам да сценкі ставіць не будзе… А зайсці варта…

Нечапай не стаў тлумачыць, чаму зайсці ў царкву было варта, толькі моўчкі павярнуўся і пайшоў да сабора. Паплёўся за ім гэтак жа моўчкі і Порахаў, балазе сабор быў побач.

Збольшага Порахаў у дадзены момант не быў супраць царквы. Гэта каб яму раней хто такое прапанаваў, дык быў бы сапраўдны скандал. А цяпер у царкве больш бывае былых партыйцаў і яго аднадумцаў, чым іх бывае на камуністычным мітынгу. Праўда, у яго, Порахава, ёсць вельмі моцныя сумневы ў іх рэлігійнасці, і ён ніяк не можа зразумець аднаго: як так можна — усё жыццё некаторыя яго партай-геносэ ганялі ксяндзоў з папамі і вернікаў выганялі з працы, а тут раптам сталі такімі набожнымі, што хоць блажэннымі іх абвяшчай… Праўда, царква сёння прываблівае Порахава тым, што толькі тут ён можа адчуваць нейкі моцны праўладна-імперскі дух, які чымсьці нагадваў яму дух Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі і той культуры…

У царкве якраз ішоў малебен. Людзей было прыкладна столькі ж, колькі і на мітынгу.

Порахаў з Нечапаем ціхенька прайшлі да вялікай іконы Трыумфатара-Усядзержца і сталі пра сябе маліцца, як умелі. Пры тым Порахаў раз-пораз кідаў недаверлівыя позіркі на велічную выяву Трыумфатара і лавіў сябе на вельмі сумнеўнай думцы аб тым, што выява гэтая наўрад ці нейкім чынам здольная яму дапамагчы… І калі ён чарговы раз зірнуў на ікону, дык раптам выразна ўбачыў, як Сын Божы сурова нахмурыў бровы, гледзячы на яго. Порахаў хацеў быў перахрысціцца, але рука бездапаможна павісла ў паветры…

— Я пайду, — прашаптаў ён Нечапаю і асцярожна, без аглядкі, накіраваўся да выхаду. І толькі каля самых царкоўных дзвярэй ён наважыўся нясмела азірнуцца… і тут выразна ўбачыў, як правая рука Трыумфатара замест благаслаўлення трасе яму ўслед указальным пальцам: «Глядзі мне!..»

Порахаў слаба помніў, як ён вылецеў з царквы: ці галавою ў дзверы, ці нагамі ўперад. Хмель калі і быў які, дык згарэў, як салярка ў трактары «Беларус». Ён не заўважыў нават, як зляцеў з царкоўных сходаў, як апынуўся каля царкоўнай агарод-

кі і як выскачыў на тратуар… І толькі там рэзкі скрыгат гамульцоў і крык «Ты, што, ашалеў?!!» пачаў вяртаць яго да свядомасці. Аказалася, што ён ледзь не трапіў пад машыну… І аварыі было б не мінаваць, калі б нехта ў час не затрымаў яго за крысо курткі.

— Ты што, Санёк! Жыць надаела?..

Ён стаў і азірнуўся — той самы бомж-жабрак мёртвым хватам учапіўся за яго куртку.

— І хто ж цябе так мог там напалохаць?.. Цікава…

Ні тлумачыць яму нешта, ні дзякаваць Порахаў не збіраўся.

Тым часам жабрак няспешна вяртаўся на сваё месца — драўляную паламаную скрыню каля царкоўнай агароджы. Усеўшыся, ён вясёлымі вачыма стаў паглядаць на Порахава.

— Ну што, успомніў, дзе ляжалі разам?..

Голас у жабрака быў такім жа агідным, як і ён сам.

«Каб ты здох…» — падумаў Порахаў.

Было гэта не лепшае зычэнне бліжняму пасля выхаду з царквы і ўратавання ад магчымага калецтва ці нават смерці, але іншыя словы ў яго галаву не прыходзілі.

«Што за дзень такі?.. Што, яны — Ленін, Трыумфатар, жабрак гэты — дамовіліся сёння дастаць яго, давесці да ручкі, да шаленства, да гарачкі, да…»

— Хто ты такі? — засіпеў Порахаў. — А ці ведаеш, хто я?..

— Маці мая заўсёды цябе ставіла ў прыклад, — агідным голасам працягваў жабрак. — Казала: ты глядзі, вось Саня — вялікі начальнік, а ты — боўдзіла… Усё па турмах і турмах… А ляжалі ж разам…

— Пры чым тут твая маці? — абурыўся не на жарты Порахаў.

— Маці казала, што ў цябе быў нумар 244, а ў мяне, як у той песні: «Мой нумар 245»…

— Пры чым тут нумар, бамжара?! — Порахаў перайшоў на крык.

— Пры тым, што ляжалі разам…

— Дзе ляжалі?

— У радзільным аддзяленні…

За спінай нехта выбухнуў дзікім рогатам. Порахаў азірнуўся — Нечапай. Як і калі ён падышоў, Порахаў не заўважыў.

Крыва і неяк нацягнута ўсміхнуўся і Порахаў.

— Хоць і збрахаў ты пра нумаркі ці рамсы паблытаў, але на табе, чалавеча, чырвонец, — добры Нечапай кінуў у папяровую скрыначку перад жабраком жменю каляровых папераў — аналаг дзесяці рублям. — Сёння свята, ідзі і выпі за нашае здароўе, і асабліва за таго, з кім ляжаў разам…

Тут нешта найшло і на Порахава, і ён палез у свае кішэні, каб падкінуць трохі фінансаў суседу, з якім быццам бы некалі ляжаў разам, але Нечапай шапнуў на вуха, маўляў, ці варта, каб не зашмат было на адзін раз — сап’ецца. І Порахаў пагадзіўся.

Пасля таго, як сітуацыя так нечаканна растарнавалася, яны з чыстым сумленнем пайшлі на плошчу глядзець на правадырскае падміргванне.

9

На плошчы Леніна людзей было няшмат. Дакладней, былі толькі тыя, хто праходзіў побач. І мала хто звяртаў увагу на дзве дзіўныя постаці, якія непарушна стаялі перад вялікім помнікам, быццам самі помнікі, і хвілін дзесяць пільна і нерухома ўглядаліся ў непарушны і каменны лік правадыра. Але правадыр маўчаў і ніякіх патаемных знакаў не падаваў.

— Відаць, мы не ў той час прыйшлі, — выказаў здагадку Порахаў. — Рана яшчэ падаваць нейкія знакі…

— Так, так! — пагадзіўся Нечапай. — Мы ж не ведаем нават, ці пройдзе нашай рэчкай крэйсер Аўрора…

— Не смешна, — адрэагаваў на выхадку з крэйсерам Порахаў. — І нешта зімнавата…

— Можна пагрэцца, — тут таварыш Нечапай смела дастаў з-за пазухі пляшку свайго самаробнага каньяку. — Спецыяльна для такога моманту рабіў…

— А не павяжа тут нас наша народная міліцыя? — засумняваўся таварыш Порахаў, пазіраючы ў бакі.

— Давай бліжэй да помніка: і ветру менш, і не так будзем кідацца ў зайздросныя вочы, — прапанаваў Нечапай, і яны трохі схаваліся ад ветру.

Нечапай захапіў з сабой і зборныя кілішкі, і нават бутэрброды з каўбасой. За ветрам (за помнікам) яны кульнулі па кілішку, пасля па другім, і Нечапай стаў разважаць:

— З якой такой натуры таварыш Ленін будзе табе падміргваць?.. Хто ты такі?..

— А ты хто такі? — абурыўся Порахаў.

— Я не пра гэта… Я пра тое, што мы стаім і маўчым. Тут трэба нешта гаварыць, можа, лозунгі якія, заклікі, вітанні, можа, як літанні ў касцёле… ці псалмы якія…

— Ну ты і загнуў — псалмы… Давай яшчэ бацюшку клікнем… Кадзілам памахаем…

— Давай лепш яшчэ па кілішку…

— Давай…

— Я табе болей скажу… — Порахаў дажаваў бутэрброт. — Ты можаш мне не верыць… Але і ў царкве Ісус паглядзеў на мяне сурова і пальцам так: «Я цябе, гад, дастану…» Прыйшлося ўцякаць…

— Што ты кажаш? — не на жарты здзівіўся Нечапай і задумаўся.

— Тое і кажу…

Яны дапілі самаробны каньяк, які Нечапай спецыяльна рабіў для гэтага дня, паглядзелі яшчэ хвілін пяць-дзесяць на помнік, які ніякіх прыкмет жыцця і тым больш знакаў не паказваў, — і тут, вядома, са спасылкай на старасць і на магчымае абвастрэнне адэномы праста́ты, як кажуць у народзе, рэзка прыпёрла… Што аднаму, што другому… І, галоўнае, абодва добра разумелі, што да кватэраў сваіх з усімі выгодамі яны проста не дацягнуць. Але ж і не на плошчы…

Быў жа праект пабудовы каля плошчы грамадскай прыбіральні, і абгрунтаванне было салідным — тут столькі бывае народу і піва ў святочныя і выходныя дні, але той праект «зарэзаў» не хто іншы, як ён, таварыш Порахаў. Маўляў, ніякага піва і можна

пацярпець, а калі што — збегаць на чыгуначны вакзал, балазе недалёка — усяго каля кіламетра.

Тут да кватэраў трыста-чатырыста метраў, і то — праблема… А там — каля кіламетра…

Нечапай прапанаваў зайсці ў тыл помніка і там прыстасавацца: спераду будзе прыкрываць Ільіч (і сам бачыць не будзе), а ззаду яны будуць прыкрываць адзін аднаго. Іншага выхаду не было. Так і зрабілі. І калі таварыш Порахаў стаў адчуваць значнае аблягчэнне, побач з ім, як мухаморы ў лесе, выраслі дзве міліцэйскія постаці ў фуражках.

— Ай-я-я-яй!.. Старыя людзі, камуністы, відаць. І ў такім грамадскім месцы… Дзе толькі ваша рэвалюцыйнае сумленне?..

— Лопнула, — спакойна адрэагаваў Нечапай. — І гэта нашмат лепш, чым бы лопнуў мачавы пухір…

— Пройдзем, таварышы, да машыны. Разбяромся дзе што лопнула…

— Пачакайце трохі, пухір у працэсе, — папрасіўся Нечапай.

— Што-о? — зароў адзін міліцыянт і замахнуўся сваёй гумовай палкай, каб паскорыць працэс, але другі, больш талковы, спыніў яго палкасць, маўляў, не тут.

Порахаў пачаў даводзіць ахоўнікам парадку пра свае заслугі, пра свята і прастáту, але ў адказ гучала толькі адно слова: «Разбяромся…» Тут Нечапай нечаканна кінуўся быў убок, а Порахаў, доўга не думаючы, штырхануў міліцыянта і таксама зрабіў спробу ўцёкаў, але абодва паспелі зрабіць усяго некалькі крокаў, як тут жа былі схоплены ўчэпістымі і дужымі рукамі ахоўнікаў парадку. На рукі ім накінулі кайданкі і павялі ў канец плошчы.

Ідучы поруч з міліцыянтам, трэба ж было Порахаву азірнуцца на помнік: на гэты раз вялікі правадыр расчараванаківаў галавой убакі, маўляў, «ай-я-яй… што ж вы нарабілі…».

— Во, глядзі, Васіль, глядзі! — закрычаў Порахаў, паказваючы вачыма на помнік. — Галавой ківае…

Бачыў што Васіль ці не — засталося невядомым, бо ў гэты момант пад'ехаў міліцэйскі ўазік, і іх хуценька загрузілі ў салон.

Толькі на другі дзень удалося агульнымі намаганнямі знаёмых, сяброў і былых партыйцаў выцягнуць таварыша Порахава і таварыша Нечапая з учэпістых лапаў народнай міліцыі. Выйшлі яны нейкія пакамечаныя і хваравітыя.

Порахаў чамусьці гаварыў толькі адно: «Зараз не толькі не тыя песні, але і не тая міліцыя…», а Нечапай яго папраўляў: «Міліцыя — лепшая…»

Пасля гэтага яны праходзілі доўгі курс рэабілітацыі ў бальніцы, пасля яшчэ доўга адлежваліся ў сваіх кватэрах, калі-нікалі тэлефануючы адзін аднаму…

Не змаглі яны правесці ў апошні шлях свайго былога аднапартыйца Аляксандра Міхайлавіча Пушкарова… І толькі доўгімі зімнімі вечарамі жылі надзеяй дацягнуць да 1 Мая, а там, глядзіш, і 9 Мая… А там і 7 лістапада… І заўсёды ў тэлефонных размовах абяцалі ачуняць да чарговага чырвонага дня кастрычніка, каб зноў быць разам на плошчы Леніна…

10

Сумная вестка прыйшла за тры дні да 7 лістапада. Нават мясцовае тэлебачанне перадало, што «перастала біцца сэрца аднаго з вядомых дзеячаў камуністычнай партыі…». І партрэт паказалі таварыша Порахава ў чорнай рамцы.

У царкву, на адпяванне, Нечапая прывёз яго зяць (сын Порахава). Пасярэдзіне царквы стаялі дзве труны: у адной ляжаў Порахаў — яго лепшы сябар дзяцінства, лепшы вораг у студэнцтве і ў сталым жыцці, пасля ўжо яго сват і яго прыхільнік-аднадумец і, урэшце, зноў лепшы сябар і самы блізкі чалавек у пажылым і пенсійным узросце…

У другой труне — тут Нечапай прыгледзеўся больш пільна — нешта знаёмае… Ці не той бомж-жабрак, які неяк яго насмяшыў… Паголены, памыты, прыадзеты… Як ён сюды трапіў — іншая справа… Але так і ёсць — ён! Той вясёлы жабрак-боўдзіла, які казаў, што «ляжалі разам…».

— Яны і ў трупярні ляжалі разам, — нечаканна ціха паведаміў зяць (сын Порахава).

Можа, і меў той жабрак рацыю?..

# Запісы

## Рычард Бялячыц

### У святле палаца

**Каб ведаць Беларусь**

На днях я спахапіўся: колькі ж цікавых сустрэч, працуючы на ўваходзе ў Палац творчасці, прапусціў, не занатаваў на паперы і забыў. А яны ж усе павучальныя, карысныя, непаўторныя, бо выпадковых, абыякавых людзей, што едуць у Шчучын, каб пабачыць палац князёў Друцкіх-Любецкіх, не сустракаецца. Так, «Малы Версаль» служыць цяпер дзецям, моладзі дзеля развіцця іх эстэтычных здольнасцяў і ўменняў. Уражвае само збудаванне, гісторыя яго з'яўлення тут, на нашай зямлі, жыццё ў гады апошняй вайны, у пасляваенны перыяд, захапляюць дасягненні гуртакоўцаў у вакальнай і харэаграфічнай творчасці, у модным шыцці, маляванні, іншых творчых кірунках. І людзі едуць, каб пабачыць, падзівіцца, каб сказаць «дзякуй» шчучынцам. На развітанне заўсёды пытаюся пра экскурсію. «Не чакалі, не думалі, што ёсць такі цуд у гэтым невялічкім гарадку», — у адзін голас кажуць людзі. І застаецца толькі пашкадаваць, што так позна пачаў аб гэтым пісаць.

**Мая Радзіма**

Гэты надпіс прачытаў на майцы ў адной з маладых наведвальніц палаца, і адразу ж захацелася чым больш паказаць наш помнік архітэктуры і распавесці пра яго. А гэтыя маладыя дзве пары ўжо пабылі амаль ва ўсіх райцэнтрах краіны, не кажучы пра Нясвіж, Мір і Ліду. Яны вольна разважаюць пра Астравец і Косава, ведаюць гісторыю Айчыны ад часу княстваў, пачынаючы з Полацкага. Гэта і ёсць сучасныя мінчукі, патрыёты сваёй Бацькаўшчыны, бо нельга быць патрыётам, не ведаючы сваёй гісторыі. Уразіла родная мова маладых людзей, сінтаксічна багатая і стылёва разнастайная.

**Спазнаць і расказаць**

Напачатку было здзіўленне, бо ў нашым гарадку сустрэць цемнаскурага чалавека — рэдкасць. Але ў палац ён уваходзіць, сярэдняга росту, адзеты троху адрозна ад нашага беларуса. Аказваецца, родам з Лондана, цяпер жыве і працуе ў Мінску, у прыватнай школе (прызнацца, я пра такое і не здагадваўся).

— Як апынуліся ў Шчучыне?

— Вывучаю Беларусь, каб потым на англійскай мове расказваць маленькім мінчанам пра іх Радзіму.

Мяне адначасова ахапіў і жах, і гонар. За маю кароценькую службу тут з мясцовых жыхароў прыйшлі, каб пабачыць, пачуць, чым жыве палац, лічаныя людзі, калі не браць канцэрты дзяцей, якія займаюцца ў гуртках. Але ж гэта зусім іншае. Чым цікавіўся мой далёкі госць: ён жадаў ведаць нашу гісторыю, каб нам жа і расказваць, толькі на іншай мове.

**Паэтычным радком**

— Лукомльская ДРЭС, — з падкрэсленай годнасцю на маё традыцыйнае запытанне пра месца жыхарства адказаў чалавек. Па ўсім было відаць, што гэта малады дзед, бо прывёз ён дачку і, напэўна, унучку. Але найбольшае здзіўленне найшло, калі «малады дзед» амаль ускрыкнуў, што яго дачка піша вершы на беларускай мове. Хоць прыязджалі ў палац і прафесар БДУ, і журналісты, і нават унук Максіма Танка, а чамусьці вершы на роднай мове зацікавілі найбольш. «Ды на роднай мове ў мяне толькі з дзясятак вершаў, астатнія на суседскай», — разгубілася жанчына. І пачала чытаць па памяці. Залішне доўгія страфы, знаёмыя метафары выдавалі пачаткоўца ў вершаскладанні, але яе імпэт, інтанацыя казалі пра жаданне пісаць, выказвацца. Не сумняваюся, што напіша яна і пра наш горад, бо засталася ў захапленні ад яго.

**З Вежы**

У адну з субот завітаў у палац мастак. Што ён з творчай кагорты, бачылася па джынсавай апратцы, прычосцы і па беларускамоўнай гаворцы. То і я пачаў з таго, што горад над Нёманам дарагі мне і блізкі, бо там жыў і працаваў шмат часу паэт Юрка Голуб, адзін з лепшых сяброў. Не раз і не два вадзіў ён мяне на «Вежу», дзе працуюць і ладзяць выставы сучасныя мастакі.

Тым часам прыйшла ў палац жонка мастака, і той нас пазнаёміў. Быць сябрам Голуба было ганарова перад жанчынай, бо яна добра ведала паэта. Вельмі шкада, што не ўсміхаўся побач паэт так, як ён рабіў гэта заўсёды — адкрыта і шчыра.

А Вежа чакала мастака. Спадзяюся, што і — мяне.

**Сум**

Жывуць за акном лістоўніцы. Летам яны зелянеюць, растуць да неба. А мне ніякавата, калі на іх ні гляну. Тады здаецца, што яны сумуюць па сваёй далёкай радзіме. Падумаўшы пра Юрку Голуба, засумаваў. Нібыта гэта я прывёз тыя дрэвы сілком сюды з Сібіры і прымусіў жыць. Стройныя, высокія, яны пад ветрам хістаюцца, нібы думаюць разам са мной. І сумуюць, сумуюць сярод шыракалістых дубоў і клёнаў. Лістоўніцы…

**Раскажу…**

Сустрэў яе ля палаца. Хацелася спытаць: куды так рана? І спытаў.

А сам штораз у гутарцы з экскурсантамі ўспамінаю, што непадалёку жыве падпалкоўнік, які лятаў на самалёце, што стаіць на пастаменце пры пад’ездзе да Шчу-

чына. Але Кашавіцкага ўжо тры гады як няма тут, на зямлі: ён у палёце да зор, сваім звыклым, незабыўным. Жонка ж несла яму кветкі той нядзеляй.

Было: пісаў пра лётчыка, дзе ён на фотаздымку, укленчыўшы, цалуе шасі свайго самалёта. Але… развал вялікай дзяржавы, адлёт са Шчучына «МІГаў» і людзей. Даруйце, Людміла Андрэеўна, за недарэчнае пытанне ў тую раніцу, але я буду расказваць людзям, хто лятаў на самалёце, які стаіць і сёння на ўездзе ў Шчучын.

**Вось табе і Шчучын**

Падыходзілі да палаца, бачылася на маніторы ад відэакамеры, трое, але мужчына вярнуўся ў машыну. Маўляў, чаго я не бачыў тут, у нейкім Шчучыне. А колькі жонка і дачка ні хадзілі, ні слухалі, усё паўтаралі: «Вось табе і на. А наш бацька, былы вайсковец, шмат страціў». Потым ён усё ж прыйшоў і быў здзіўлены мінулым горада. А без ведання сваёй гісторыі грамадзяніна-сучасніка не бывае. З разуменнем адзін аднаго мы расставаліся. Палац захаваўся, адноўлены, прыносіць вядомасць нашаму краю, нават Айчыне. Бо кожны куток, кожны факт не маўчыць, расказвае, трэба толькі пачуць, пабачыць, зразумець.

**Дзень паломніцтва**

Сёння дзень паломніцтва беларусаў перад святам Незалежнасці. Едуць са сталіцы, з Гродна, з Гомеля. Усім на былой Заходняй Беларусі ці Паўночна-Заходнім краі асабліва імпануюць касцельныя храмы, збудаваныя ў розныя вякі. Гараць вочы, калі людзі глядзяць на карту Шчучыншчыны. І пытанні, пытанні… Кажу пра старажытнае Ішчална і касцёл Найсвяцейшай Тройцы, пра Жалудок і палац Святаполк-Чацвярцінскіх, пра Мураванку і царкву-крэпасць, Васілішкі… Яшчэ ж ёсць Гервяты на Астравеччыне. А людзі там ужо пабывалі.

Найважней, што краязнаўцы — пераважна зусім маладыя, захопленыя, апантаныя людзі. І абавязкова ўсе з дзецьмі. Адзін з юных, адыходзячы, папрасіў у мяне кніжку вершаў, сказаўшы: «Пах зоркі» я ўжо чытаў, сябра даваў. Хачу яшчэ што ваша». Я з задавальненнем падпісаў на памяць адну з апошніх кніжак. Для аўтара ў тым была найвялікшая ацэнка.

**I Дзень беларускага пісьменства**

Як ні кажы, а кожны раз звяртаюся да 2015 года, калі ў Шчучыне адбыўся Дзень беларускага пісьменства. І на памяць прыходзіць праўда, што ў нас, даведаўшыся, дзе пройдуць «Дажынкі», любы горад адбудуюць за два тыдні. Так літаральна за паўгода наш горад стаў непазнавальным — вуліцы, школы, Дом культуры. А пасля з’явіўся ў былым княжым палацы нават музей Шчучыншчыны. Цяпер ён асноўны, на што арыентуюцца падарожнікі і, увайшоўшы, пытаюцца: «У музей можна?».

Уваходзім. Справа — піяніна, злева — партрэты князёў. Але ж я — пра нямецкі стагадовы інструмент. І адна прафесіянальная піяністка з Масквы так шыкоўна сядае перад старадаўняй рэліквіяй, ускідвае рукі і…

— Зоя — вядомая піяністка, — калі гукі ціхнуць, тлумачыць муж. А піяністка ціхім правільным голасам як бы крыху наракае на адзін клавіш, што «правальваецца». Але ж інструменту сто гадоў!

Гэта адзін творчы варыянт наведвання палаца-музея. Яшчэ тут існуе фальклорна-этнаграфічная тэатральная студыя «Эцюд», і пры неабходнасці вучні прадстаўляюць аднаактовую лірычную п’есу пад назвай «Не ў кожнага жонка Марыя — каму Бог дасць», напісаную кіраўніком калектыву. Дарэчы, не лішнім будзе сказаць, што амаль усе вядомыя нам князі палаца мелі за жонку абавязкова Марыю.

**Белая зайздрасць**

Ад зайздрасці можна зайсціся. Гэтыя сталічныя госці за два дні пабылі ў Залессі Міхала Агінскага, пабачылі адзін з лепшых па архітэктуры касцёлаў Еўропы ў Гервятах, мудра памаўчалі ў Лідскім замку, даведаліся, чаму Гродна называюць горадам-музеем. Самі ж маладыя-маладыя. Патрыёты. На такіх трымаецца мая краіна, бо яны ведаюць, дзеля чаго жыць, за што змагацца.

**Скрыжалі**

Як ні жыві, колькі ні жыві, а скрыжалі не даюць спакою, не даюць памерці, бо яны вечна жывыя і вядуць, вядуць за сабою. Перачытваю лірычную кніжку выбранага Валянціны Коўтун «Свяча любові». Праўда, я і цяпер не магу расчытаць, што аўтарка напісала мне, даючы аўтограф. Думаецца, што напісала пра добрае, якой была сама. Яна вучыла мяне роднай мове і жыццю ў старэйшых класах Варнянскай школы. І я не змог не пісаць вершы. А адна з экскурсантак нядаўна запытала, а навошта я пішу? Не чытала ніводнага радка, а запытала для чагосьці. Можа, і мела рацыю. Я прамаўчаў, потым доўга думаў. Зноў вярнуўся да выбранага маёй настаўніцы. І ўсё ж пішу, бо напісанае застанецца. Бо не магла Цётка (Алаіза Пашкевіч) не хадзіць тут, ля шчучынскага палаца, не глядзець на яго перад ад’ездам у свой Стары Двор. Не магла тут не быць і Валянціна Коўтун, збіраючы матэрыял для дылогіі «Крыж міласэрнасці» пра нашу Цётку. Цяпер тут я. І таму пішу.

**«Да пабачэння»**

Прыязджаюць людзі, з якімі і знаёміцца проста, і гутарыць прыемна, і расставацца не хочацца. Так здарылася ў мінулую суботу, калі ў палац увайшлі дарослыя мінчане з групкай сваіх дзяцей. Вельмі важна браць у падарожжа юных радзімічаў, бо ў дзяцінстве ўсё запамінаецца надоўга. Спачатку гаварылі дарослыя пра князёў, іх эпоху, пра даўні Шчучын. Адчувалася, што мы на адной хвалі. Я размаўляў па-беларуску, госці ж — хто як мог.

Але прыйшоў час расстання, і мы затрымаліся ў дзвярах, бо падобныя сустрэчы з прычыны гістарычнай памяці асабліва яднаюць людзей. А мной раней не заўважаны ці не пяцікласнік запыніўся яшчэ на хвілінку і прамовіў мне: «Да пабачэння. Мне было вельмі прыемна пабыць у Шчучыне і даведацца пра князёў Друцкіх-Любецкіх».

Гэтыя колькі слоў на роднай мове ад юнага мінчука здзівілі і ўразілі. Я веру, што мы яшчэ сустрэнемся.

Да пабачання.

ТАЦЯНА ВАЛЕНЦІК

## Пад покрывам Маці Божай

*Непрыдуманая гісторыя*

— Ну скажыце, калі ласка, ці можа быць месца дзе прыгажэйшае, чым тое, дзе я жыву? — пытаецца айцец Аляксей, звяртаючыся да прыхаджан і прыязджан, што наведваюць храм, не патрабуючы на сваё пытанне адказу. — Раніцою выйду на ганачак хаты — у паветры водар кветак, птушкі на розныя галасы заліваюцца, а перад вачыма — вежы велічнай царквы Святой Вялікапакутніцы Варвары. «Маці Божая Райчанская! Вітаю Цябе, Каралева Неба і Зямлі! Жадаю Тваёй апекі на дзень сённяшні», — прамаўляю да сваёй нябеснай апякункі. І так кожны божы дзянёк, раніцою і ўвечары. Дзякую Богу, што менавіта сюды накіравалі мяне на служэнне! Як аказалася, менавіта адсюль ідуць і мае карані па матчынай лініі. А ўсё магло б быць зусім па-іншаму…

### Лініі лёсу

Замуж Валя выйшла рана, толькі 18 стукнула. Ды й не дзіва: муж прыгожы, чарнявы хлопец з кучаравым чубам. Пазнаёміліся на танцах у Валеўцы. Ён — сталы хлопец, паспеў адслужыць тэрміновую вайсковую службу, вельмі любіў жартаваць. Прыглянулася яму спрытная весялуха Валька, нічога, што мала яшчэ гадкоў. Падрасце. Запрасіў на адзін з танцаў, затым правёў дадому, так і страчаліся амаль год. Прыкіпела сэрца да дзяўчыны, ды і яна, відаць, не супраць, каб быць разам, але як адважыцца зрабіць прызнанне, хлопец не ведаў. Неяк выпіў для смеласці крыху і кажа: «Ведаеш, Валя, я цябе кахаю, выходзь за мяне замуж». І ўзрадавалася, і разгубілася дзяўчына, а што адказаць, толкам і не ведае. Па-свойму ўспрыняў гэтую паўзу хлопец і кажа: «Ты не слухай, што я тут табе ба́ю, я ж п’яны, магу многа нагаварыць…».

Праз пару дзён гаворка аднавілася на цвярозую галаву, так, як і патрэбна на самай справе. Валя, канешне ж, дала згоду. Перад самым вяселлем сніцца Валі сон, што сустрэла яна сваю нябожчыцу бабулю Стэпку. Вельмі любіла дзяўчына яе пры жыцці, таму хацела падбегчы і падзяліцца з ёю сваёй дзявочай радасцю, але пачула: «Не падыходзь да мяне, бо ты мяне пакрыўдзіла…» Прачнулася Валя і давай думаць, чым яна магла пакрыўдзіць любімую бабулю. Узгадала, што тая была вельмі набожная, малітоўная і перад смерцю наказала ўнучцы, каб тая абавязкова павянчалася з будучым мужам. Аб сваім рашэнні вянчацца сказала жаніху і бацькам. Радыя былі ўсе за маладых, але тое вянчанне надоўга запомнілася ў наваколлі, бо былі яны камсамольцамі і «не прыстала ім верыць у нейкага Бога». Дзеля перасцярогі іх шлюб не запісвалі ў царкоўную кнігу, але такія навіны разыходзяцца хутка. Валя ўжо была цяжарная, калі прыехалі з абласнога радыё браць інтэрв’ю і сарамаціць за такую правіну. Калі ж прыйшлі да маладога мужа, то той змог аджартавацца, сказаўшы, што павянчаўся, бо цешча абяцала купіць «Жыгулі». «А купіла?» — пытаюць. «А дзе яна дзенецца, абяцала ж…»

Скончылася «вялікая трагедыя» тым, што маладажонаў выключылі з камсамола… Але жыццё на гэтым не спынілася.

Не паспелі як след пажыць для сябе (так сёння прынята гаварыць), як нарадзілася дачушка, а ў хуткім часе і сынок з'явіўся, Алёшка. Тут і радасць, і бязмерная трывога, бо нарадзіўся раней часу: медыкі сказалі, што не праслухоўваецца сэрца, таму на сёмым месяцы выклікалі роды. Хлопчык быў вельмі ж кволенькі і маленькі, пазногці яшчэ не сфармаваліся, адно лёгкае было не раскрыта зусім: надзеі на выжыванне амаль не было. Глядзела Валя на сына скрозь слёзы і не ведала, як нават узяць яго на рукі, бо памяшчалася немаўлятка ў яе худзенькую далонь. Штодзённыя кропельніцы ў маленькую галоўку, спыненне сэрца, двухбаковае запаленне лёгкіх у двухтыднёвым узросце… Чаго было чакаць маладой маці, на што спадзявацца? Усякія думкі хадзілі ў галаве жанчыны, а яна толькі ціхенька плакала, гледзячы на спакутаванае цельца.

У такім бязважкім стане яе аднойчы заўважыў загадчык дзіцячага аддзялення Наваградскай бальніцы Георгій Пятровіч Конюх, мужчына сталага веку. Падышоў, пакруціў галавою і сказаў: «Не хвалюйся, маці, і не плач: выкарабкаецца твой сынок, ты яшчэ будзеш ім ганарыцца!»

З недаверам усміхнулася жанчына: ад лёсу свайго нікуды не дзенешся. (Забягаючы наперад, скажу, што хлопчык выжыў, адужаў свае хваробы. Пасля айцец Лазар, старац Лаўрышаўскага манастыра, скажа, што выжыў таму, што бацькі былі павенчаныя.) Калі сыну споўнілася два месяцы і з'явілася хоць якая надзея, раптам памірае яе маці — падтрымка яе і апора. І такі сум агарнуў жанчыну, але не кідалася ў роспач, бо характарам была ўпёртая, працавітая. На руках засталіся не толькі свае дзеці, але і малодшыя браты, якіх вымушана была забраць да сябе (жылі маладыя асобна ад бацькоў і пачалі будавацца). Адзін з братоў заканчваў школу, а другі хадзіў у 5-ы клас. Бацька ў хуткім часе прывёў мачыху, таму ўсе клопаты ў выхаванні братоў Валя з мужам узяла на сябе. Жылі бедна, ды і адкуль багаццю ўзяцца: столькі едакоў за сталом. Але між сабою жылі зладжана, у згодзе і любові ды ў цяжкай працы.

**Да каго прыгарнуцца, з кім падзяліцца журбою, страхам сваім чалавечым?**

Лёшка выжыў, адужэў. Але, як і ўсе дзеці, быў няўрымслівым, цікаўным, а часамі і шкодным. Калі падрос, стаў задаваць філасофскія пытанні, а ў хуткім часе пачаў наведваць нядзельную школу пры праваслаўным сястрынстве. Крыху пазней ужо стаў прыслужваць, дапамагаць у храме Кірыла і Мяфодзія ў Навагрудку. Паступова хлопчык знаёміўся з асновамі праваслаўнай веры. Уражанні з дзяцінства, якія з цягам часу ўзмацняліся разуменнем, што Бог — гэта дабрыня і любоў, пакінулі свой след. Вернікі расказвалі пра ласкі і даброты, якія яны атрымліваюць дзякуючы шчырым малітвам да Маці Божай, і таму пераадольваюць жыццёвыя выпрабаванні з лёгкасцю. Трапяткое пачуццё даверу да Багародзіцы і Яе Сына, Ісуса Хрыста, з гадамі даспявала і ў сэрцы юнага Аляксея.

Калі хлопчыку было 12 гадоў, а маці не было яшчэ і 32, жанчына занядужала. Выклікалі хуткую, завезлі ў бальніцу. Пасля невялікага абследавання вырашылі, што патрэбна кансультацыя больш спецыялізаваных медыкаў. Праз знаёмых дамовіліся на медагляд у Бараўлянах. Паехала туды і прабыла роўна тыдзень у анкалагіч-

ным цэнтры. Убачыла людзей, якія трапляюць у цэнтр, і ўсё зразумела… Адчуўшы невылечную хваробу, яна заплакала, але не ад таго, што захварэла сама. Сэрцам яна адчула, што прападуць дзеці. Яна ў гарачцы клікала дапамогу не да сябе — да дзяцей.

На выхадныя Валя прыехала дадому, каб папярэдзіць родных і сабрацца на больш працяглы час лячэння. Доўга думала, як сказаць мужу. Пра дзяцей і гаворкі не было: не павінны яны ведаць пра яе бяду.

Познім вечарам Лёша выйшаў на надворак і маўкліва глядзеў у бязмежнае зорнае неба... Малы-дарослы чалавек пільна ўглядаўся ў прасторнае неба, углядаўся да тае пары, пакуль не пачуў голас сваёй маці, якая гутарыла з бацькам: «Юра, у мяне — РАК!»…

Ценькая аблачынка разгубленасці накрыла хлопчыка ў адно імгненне. Ён ужо разумеў, што рак — дыягназ, які мог абазначаць адно: канец жыццю маці. Нібы гром з яснага неба: мамы ў мяне больш не будзе, мамы, якая «вачыма, святымі ад слёз, у Бога выпрасіла мой лёс»… Ад такой думкі хлопчык, здавалася, праваліўся ў студню адчаю. І ў той студні не было дна. Прыйшоўшы ў свой пакой, хлопчык доўга думаў. Проста да болю ў сэрцы яму хацелася выгаварыцца каму-небудзь блізкаму, надзейнаму, выплюхнуць усё, што займала галаву, ачысціць душу; было страшна — нават дзядзькам ці сястры баяўся распавесці тайну падслуханай гаворкі. Перамагла думка, што тайна не яго, а бацькоў і ён проста не мае на яе права. Тым больш што ніхто не ведае, што ён выпадкова падслухаў пра страшную навіну. Хай бацькі думаюць, што ён гэтага не чуў. Некалькі гадзін пакутлівых роздумаў ні да чаго не прывялі — толькі выпілі рэшту сілаў, і хлопчык у чарговы раз заснуў.

Ноччу яму снілася тое падзенне: у сне ён адчайна хапляўся за сценкі студні, здзіраючы да крыві пальцы, ломячы пазногці, спрабаваў замарудзіць падзенне — і прачынаўся ад болю і бездапаможнасці. Уткнуўшыся ў мокрую ад слёз падушку,ператасоўваў свае думкі-развагі. Нават у асуджанага на смерць чалавека, якога вядуць на расстрэл, ёсць выбар. Выбар — з якім настроем туды ісці. Са злосцю і крыўдай, з даразаннем ці з надзеяй. Ужо засынаючы, Лёша страпянуўся. І раптам думка: а як жа Маці Божая змагла моўчкі перанесці ў сваім сэрцы боль, стоячы пад крыжам, на якім распіналі Яе Сына? Здалося, што Багародзіца хоча падтрымаць, позірк Яе вачэй не халодны, прысутны. Хлопчык пачынае разумець, што пакутаваць трэба не ляментуючы… Правальваючыся ў трывожны сон, Лёша зразумеў, што ў яго выбары — яго выратаванне і маміна. Зразумеў, што нарэшце зрабіў свой свядомы выбар. І перастаў падаць у студню. Прыпыніўся. Падняў галаву і ўбачыў неба. І прамяні сонца, якія дацягнуліся да яго ў студні.

**Пачуй нас, Божа, бо словамі ціхай малітвы грукаемся ў неба**

Нядзеля наступнага дня, здавалася, была падобнай на папярэднія. Лёша з цяжкасцю расплюшчыў вочы, калі маці асцярожна паклікала на сняданак. Валя выцягнула з печы талерку аладачак у смятане, беленькіх і пульхных, і паставіла на стол. Яшчэ раз гукнула дзяцей да стала. Ёй хацелася абняць Ленку, Лёшку, абняць усіх, але яна, стрымліваючы сябе, усё завіхалася, каб не выдаць родным свой неспакой. Лёшку, на

дзіва, прасіць доўга не трэба было. Прыцмокваючы і аблізваючыся, ён умінаў аладачкі адну за адной. Набіўшы поўны рот, хлопчык усё нешта расказваў, шамкаючы ротам, быццам баяўся спазніцца.

Ён еў і гаварыў, а Валя сядзела на лаве і, схіліўшы набок галаву, хісталася паціху. Яна глядзела на сына, дачку, але думкі яе былі вельмі далёка.

Лёшка пакінуў есці толькі тады, калі на яго глянула дно талеркі.

— Я пабягу, — сказаў ён. — Сёння ж нядзельная школа.

Валя правяла яго да дзвярэй, затым вярнулася ў хату і села на лаву. Яна засталася сам-насам са сваімі думкамі. Яна глядзела ў акно, а з гародчыка ў хату пазірала на Валю чырвоная рабіна. Рабіна хіліла да долу свае абцяжараныя пладамі галіны. Клён паступова губляў жоўтыя лісты. У небе свяціла сонца і плыло срабрыстае павуцінне. У сініх бяскрайніх прасторах цягнуліся качкі, ляцелі гусі. Непрыкметна бег час. Падумалася: а куды ляцяць гусі? А якімі шляхамі ўецца чалавечы лёс?.. Разгубленасць на твары… Дзе знайсці выйсце? І раптам нібы схамянулася ад трывожнай думкі, бо сына доўга не было з заняткаў. Ніколі не было такога спазнення. Жанчына выйшла на вуліцу, паглядзела ўдалячынь — пуста. Як заўсёды, нейкае дурноцце лезла ў галаву, але яна адганяла ад сябе пустое. Сын з’явіўся нечакана, нібы з-пад зямлі вырас.

— Сыночак!.. — сама не свая ад радасці паўтарала Валя. — Хадзі ж хутчэй у хату, хадзі, мілы мой...

Яна схапіла Лёшку за руку і амаль уподбежкі пацягнула яго ў хату. Нярвова пасадзіла хлопчыка на лаву. Яна стала перад ім, усёй сваёй постаццю выяўляючы нецярплівасць і хваляванне. На твары ў яе з’яўляліся то радасць, то непакой, то трывога. Яна адчувала, што здарылася нешта неардынарнае, бо сын неяк па-даросламу пазіраў на маці.

— Кажы хутчэй, Лёшка! Што здарылася?

Лёшка, адчуваючы ўсю важнасць моманту, не марудзіў, хуценька нырнуў у сваю сумку і дастаў адтуль лёгенькі блакітны лісток, вырваны, відаць, з вучнёўскага сшытка ў клетачку.

— Во, — падаў ён лісток і ўмольна зірнуў на маці. Тая міжвольна выхапіла ліст з Лёшкавых рук, разгарнула. Углядаючыся ў тое, што было на паперы, яна на хвіліну змоўкла і, хапаючы на поўныя грудзі паветра, павярнулася тварам да сына. З хвіліну яны стаялі так, без аніводнага гуку, нікому не хацелася парушаць цішыню. Маці глядзела на сына з удзячнай пяшчотай, а ён — з надзеяй і ўпэўненасцю, што надыдзе не адна ноч, а ён доўга яшчэ будзе слухаць яе дыханне — найлепшую сімфонію любові. Хлопец праглынуў ком у горле і адкрыў сасмяглыя вусны: «Вяртайся хутчэй, мама! Маліся Яму! Ты ж ведаеш малітву “Ойча наш”… яна дапаможа, выведзе і выратуе!»

На блакітным лісточку няўмелай дрыготкай рукой алоўкам была напісана ікона Ісуса Хрыста.

Мама паклала сыну на галаву сваю далонь. Дзіўна, але гэты дотык супакоіў хлопчыка, нібы матуліна рука піла боль з галавы, піла і выпівала да кроплі. Яна гладзіла валасы і штосьці шаптала. Лёшка пачуў толькі канцоўку: «Дзякуй, Госпадзі, за яшчэ адзін пражыты дзень. Заўтра нас чакае новы».

**Прыхілі, Госпадзе, вуха Сваё і пачуй мяне...**

Чалавек здольны мірыцца з тым, чаго нельга вярнуць. Цяпер яна радавалася ўжо толькі таму, што кожны дзень мела магчымасць бачыць сонца і людзей, што адчувала боль і магла з удзячнасцю сказаць: «Дзякую, Усявышні, Табе за кожную хвілю, за кожную зморшчыну на лбе, за сілу й за бяссілле». Яна зразумела, што Бог даў ёй шанц знайсці сябе і сваё жыццё ў большым — Божым — свеце.

Мала-памалу вастрыня ўсяго перажытага згладжвалася напластаваннямі новых падзей. Знаходзячыся ў анкалагічным цэнтры, Валя пачала пастаянна наведваць мясцовы храм. У палаце малілася штодня, гледзячы на іконку, напісаную з любоўю яе сынам. Пераасэнсавала-перагледзела ўсё сваё жыццё: пагадзілася, што і напорысты характар свой трэба стрымаць, узгадала, што ёй вечна не стае часу, каб да нядзелькі памыць бялізну ці прыбраць у хаце, а самой пайсці ды памаліцца… Дала зарок перад Богам, што абавязкова змяніцца, будзе хадзіць у храм і дякаваць Усявышняму, толькі б вярнуць здароўе…

Прапанавалі ў якасці эксперыменту ўколы хіміятэрапіі — пагадзілася. Выконвала ўсе медыцынскія прадпісанні. Назіралася ў анкалагічным цэнтры амаль пяць гадоў. Як вынік — пухліна перастала расці, застыла на месцы. Праглядваючы чарговыя здымкі, доктар здзіўлена ўзняў бровы, пасля ўсміхнуўся і сказаў: «Відаць, вы паспелі зрабіць штосьці вельмі добрае, што Бог не дапусціў вас так дачасна пакінуць гэты свет».

Цёпла ўсміхнуўшыся, Валя адказала не адразу: «Дзякуй Богу за ўсё! Дзівосныя справы Твае, Госпадзі!»

Ужо едучы дадому, міжволі ўзгадвала, як пасля невялікага паляпшэння аднойчы прыехала дамоў, а там — гара бялізны дзіцячай, дарослай. Што рабіць — трэба мыць. Нагрэла вады, пазбірала ўсё, але раптам стала так млосна, што пацямнела ўваччу. У думках мільганула: «Сёння ж нядзеля… Я ж абяцала…» Адклала ўсе хатнія турботы на будзённы дзень. Але прайшло колькі часу, і ў адзін з асенніх дзён, калі толькі пачалася копка бульбы (якраз было нейкае свята царкоўнае), сабралася дапамагчы суседцы. На вялікі ўздзіў — у яе аднялася рука. «Вось табе навука, Валя, — падумала жанчына. — Абяцала Богу — трэба трымацца слова свайго. Бо Бог літасцівы, але да пары…»

**Прызнанне**

З той пары сплыло многа вады. Увесь гэты час дома штодня маліўся за яе здароўе сынок Алёшка, кожны тыдзень наведваў набажэнствы і падаваў запіскі. Святар дазваляў яму нават грошай не плаціць. Верыў хлопчык у сілу малітвы і спадзяваўся на маміна выздараўленне. Недзе на адрэзку матулінай хваробы пайшоў з жыцця бацька. Згарэў ад анкалогіі за адзін год. Было яму толькі 47 гадоў. К таму часу і Лёша вырас, вывучыўся на святара, сабраўся жаніцца. Прадбачыў бацька скоры свой сыход, але перад смерцю даў дамашнім наказ-бласлаўленне: вяселле мусіць быць. І як ні мянялі даты, як ні круцілі, яно адбылося менавіта тады, на калі і было задумана першапачаткова. Ужо будучы дарослым, прызнаўся сын матулі, што даўно ведаў пра яе хваробу, ведаў, маліўся і верыў. Светлымі дажджынкамі пацяклі па яе шчоках слёзы, калі пачула ад сына:

Бога і Маму ў душы нашу,
Ступаю па грэшнай зямлі асцярожна,
Каб толькі не здрыгануць душу,
Звышняга й Маму не патрывожыць.

Валя працягнула да сына рукі, скупа ўсміхнулася. З яе грудзей вырвалася кароткае: «Ах, сынок!»

Нібы да яе завітаў усемагутны лекар, волат-заступнік. Яна не адпускала сына ад сябе, пакуль усё-ўсё не распытала. Ёй цікава было ведаць любую драбязу з яго жыцця. Адчувалася, што маці вельмі ганарыцца сваім малодшанькім, але выгляду не падае. А сынок усё гаварыў, гаварыў:

— Я за ўсё ўдзячны табе, мама. Ты — жывая вада для мяне, мора духоўнага багацця. Ты мацуеш мяне ў веры, надзеі і любові. Будзь і надалей мудрай дарадцай на жыццёвым шляху. Ты — як знак маёй бяспекі. Ведаеш, мама, ёсць у Грэцыі святая гара Афон, дзе вельмі многа манастыроў. У адным з іх знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай «Усецарыца». Гэтая ікона аказвае асаблівы ўплыў на людзей з анкалагічнымі захворваннямі. Па шчырых малітвах вернікаў вылечваюцца самыя цяжкія хваробы. Ікона ацаляе нават тых, у каго, здавалася б, ужо не засталося ніякага шанцу выжыць. Я так мару, каб набыць спіс з гэтай іконы для свайго прыхода, бо свет увесь такі хворы…

**Мара і ява**

Настаяцель храма Святой Варвары з Райца іерэй Аляксей па літасці Божай атрымаў неверагоднай сілы Благадаць і здзейсніў паломніцкую паездку на Афон. Сваімі ўражаннямі ад паездкі бацюшка падзяліўся з намі.

На грэчаскім паўвостраве, дзе размешчана гара, знаходзіцца больш за дваццаць манастыроў. Самы старажытны быў пабудаваны ў 963 годзе, а самы позні — у 1542 годзе. Асобам жаночага полу ўваход на гару забаронены, паколькі ўвайсці сюды можа толькі Багародзіца. А мужчыны мусяць атрымаць спецыяльны дазвол. І яны абавязкова павінны быць хрысціянамі.

Перш за ўсё Афон — не гара, на якой жывуць святыя, святой з’яўляецца сама гэтая гара. Усіх, хто прыязджае сюды, уражвае яе дзівосная прыгажосць: скалістыя схілы на марскім узбярэжжы, яе кветкі і дрэвы, разнастайная фаўна і, вядома, велізарная трыкутная вяршыня, якая ўзвышаецца над паўднёвым ускрайкам Афонскага паўвострава. Чалавеку, які верыць у Бога, такая прыгажосць — сведчанне Божай прысутнасці. Святая гара нібы памежная тэрыторыя паміж небам і зямлёй. Жывы голас на гары Афон чуецца рэдка; паўсюль ціха і маўкліва.

Афон з’яўляецца на самай справе ўсеправаслаўным, месцам не толькі для грэкаў, але і для рускіх, грузін, сербаў, балгар, беларусаў, румын... У кожным манастыры знаходзяцца вядомыя свету цудатворныя іконы, мошчы святых, найвялікшыя рэлiквіі. Адметнай асаблівасцю манаскага служэння тут з’яўляецца ветлівасць. Расхінаючы дзверы сваіх манастыроў перад паломнікамі і іншымі наведвальнікамі, манахі спрабуюць дастукацца да тых, хто далёкі ад Царквы, пазбаўлены зносін з ёй. Нават калі на Афон прыязджаюць людзі, зусім далёкія ад веры, дзеля цікаўнасці, кожнага госця трэба «прымаць як самога Хрыста». І традыцыі святой гары пацвярджаюць

гэта. Таму мы і не былі здзіўлены, што айцу Аляксею ўдалося трапіць з рускага манастыра на супрацьлеглы бераг паўвострава, туды, дзе знаходзілася «Усецарыца».

Прыхіліўшы калені і малітоўна ўзняўшы рукі, бацюшка славіў Госпада за тое, што Ён даў такую магчымасць — быць на святой гары, што яго асабісты лёс склаўся дзякуючы Яе заступніцтву перад Усявышнім. Калі ж ікону ўсклалі з малітвай над яго галавой, неймавернае адчуванне прысутнасці самой Багародзіцы адчувалася ў душы святара.

Пазней айцец Аляксей прызна́ецца, што калі сам дакранаешся да бяды, то разумееш, як цяжка іншым. А дапамагчы ты не можаш нічым, толькі малітваю.

Спіс іконы «Усецарыца» — дакладны і ў выглядзе, і ў памеры як і той, што на Афоне, і мае такую ж сілу, як і арыгінал. Абраз быў пранесены па ўсіх 20 манастырах святой гары, прыкладзены да святыняў, у тым ліку да Пояса Прасвятой Багародзіцы.

У Райцы сустракалі дарагую сэрцу святыню з душэўнай радасцю і хваляваннем ля Праабражэнскага храма. Суправаджаў цудатворную ікону (з благаславення ўладыкі Гурыя) айцец Арыстарх, ігумен Лаўрышаўскага манастыра. Хросным ходам з песняспевамі суправадзілі «Усецарыцу» да месца яе пастаяннага пражывання: у храм Святой Варвары. Там адбылася спачатку літургія, а затым адслужыўся малебен. Кожны з прысутных меў магчымасць прыкласціся да святыні і памаліцца аб тым, што турбуе сэрца і душу.

Узіраюся ў абраз і бачу выяву Божай Маці на Прастоле ў акружэнні двух архангелаў. На каленях Яна трымае Дзіця, паказваючы на Яго правай рукой і як бы гаворачы людзям: «Вось Той, Хто дасць вам палёгку на цяжкім шляху зямнога жыцця».

Са слязьмі на вачах слухалі людзі малітву «Усецарыцы», у якой ёсць вельмі важныя словы пра значэнне нябеснай дапамогі для лекараў і для хворых: «Исцели болящия люди Твоя, о Всемилостивая Царице! Ум и руки врачующих нас благослови, да послужат орудием Всемощного Врача Христа Спаса нашего».

Сярод натоўпу прысутных стаяла і Валя, якая з удзячнасцю глядзела на сына, пераводзіла позірк на цудатворны абраз і шчыраю малітваю дзякавала за ацаленне:

Колькі дзён Ты мне ні дасі —
Буду ўдзячна і заўтра й сёння,
На зямлі й на небясі
Шчыра ўкленчу святой іконе.



нарадзілася 5 студзеня 1958 года ў вёсцы Райца Карэліцкага раёнана. Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (1996). Педагог, краязнаўца, празаік, аўтар шэрагу артыкулаў пра родную зямлю і яе людзей.

## Тацяна Валенцік

## ВАЛЯНЦІН ДУБАТОЎКА

# Між кувалдай і кавадлам

### Лёс чалавека

У аснову аповеду Міхаіла Шолахава «Лёс чалавека» пакладзена гісторыя шараговага жаўнера Чырвонай арміі, якому давялося перажыць усе жахі мінулай вайны: гібель пабрацімаў, раненне, жудасны палон, нечалавечыя пакуты, страту родных. І, як фінал, напрыканцы вайны ён нарэшце застаецца абсалютна адзін на белым свеце. І толькі беспрытульны хлапчук, якога ўсынаўляе мужчына, дорыць галоўнаму герою жаданне жыць далей. Як на маю думку, скразная ідэя аповесці — гэта тое, як жаўнер, прайшоўшы ўсе кругі пекла, застаецца чалавекам. На першы погляд — простая гісторыя, да глыбіні душы кранае выпадковага чытача. Але наўрад ці нават самы таленавіты аўтар у стане перадаць усю трагічнасць чалавечага лёсу, бо няма больш здольнага аўтара, чым само жыццё.

### Гутарка з жыхаром г. Дзятлава Анатолем Іванавічам Альшэўскім*

***Аўтар.*** Паважаны Анатоль Іванавіч, я ведаю, што вы родам з вёскі Скіборавічы, што каля м. Казлоўшчына. А там падчас вайны хтосьці забіў дзве сям'і. Ці можаце пра тое страшнае здарэнне што-небудзь расказаць?

***Альшэўскі А. І.*** О-о, гэта будзе працяглы аповед!

***Аўтар.*** Трагічныя гісторыі не бываюць простымі, тым больш калі размова ідзе пра блізкіх людзей.

***Альшэўскі А. І.*** [*Уздыхае*] Тады на Скібораўскіх хутарах партызаны пастралялі дзве сям'і. У людзей, што жылі бліжэй да лесу, было прозвішча Ліцьвіны. У іх хаце партызаны забілі чатырох чалавек. Гаспадароў — мужчыну было 50 гадоў і жанчыне 45 — і дваіх іхніх дзяцей. На тамтэйшых могілках ёсць два помнікі, пад якімі знайшла вечны супакой сям'я Ліцьвіноў. Дарэчы, на адным з помнікаў маецца надпіс, што іх забілі партызаны. На жаль, я пра іх мала што ведаю. А вось тыя, што жылі на ўскрайку вёскі, мелі прозвішча Альшэўскія. Гэта мае родныя.

***Аўтар.*** Прабачце, калі ласка, Анатоль Іванавіч, але каго тады забілі з вашых?

***Альшэўскі А. І.*** Тады загінула ўся сям'я майго бацькі: мой дзед Антон Іванавіч, мая бабка, мая цётка Марыя сямнаццаці гадоў і мой дзядзька Васіль, дзевятнаццаць яму было тады.

***Аўтар.*** А як гэта адбылося?

***Альшэўскі А. І.*** У сорак другім годзе нямецкія ўлады пачалі збіраць хлопцаў і дзяўчат дзеля адпраўкі ў Нямеччыну на працу. Мясцоваму солтысу далі заданне сабраць умоўную колькасць маладзёнаў. Той, не марудзячы, стаў выконваць спушчаную яму зверху разнарадку. Ужо праз пару дзён ён рушыў па дварах, ну і, зразумела,

* Запісана 16 траўня 2023 г.

да нашых зайшоў. Як распавядаў бацька, мой дзед доўга ўгаворваў чыноўніка, каб нікога з сям'і не забіралі. Але нічога з гэтых перамоў не атрымалася, і мой бацька Іван Антонавіч Альшэўскі як старэйшы з братоў мусіў адправіцца ў Германію. Праз некалькі дзён развіталіся, і бацька крануўся ў дарогу. І ніхто з сям'і тады не ведаў, што тое развітанне будзе апошнім.

Два доўгія гады бацька пакутаваў у Германіі. Невыносная прымусовая праца па дванаццаць гадзін, голад, лагеры… І вось яго, як і многіх іншых, у 1944 годзе вызваляюць амерыканцы. Перад адпраўкай у савецкую зону акупацыі да яго падышоў амерыканскі афіцэр з прапановаю не ехаць у СССР. Працяглай размовы не атрымалася, бацька вырашыў вяртацца дамоў, хоць амерыканец уцямна даводзіў беларускаму маладзёну, што яго чакае ў савецкай Расіі. Але ён вельмі хацеў трапіць да сваіх. Ды ўсё пайшло так, як і прагназаваў амерыканскі афіцэр. Дарога да Радзімы расцягнулася яшчэ на доўгія чатыры гады. За гэты час бацька паспеў павābваць, атрымаў цяжкае раненне, затым было працяглае лекаванне ў шпіталі. І толькі ў 1947 годзе ён, шчаслівы, выправіўся дадому, дзе, як думаў, яго чакаюць ягоныя родныя: шчаслівая маці, чуллівы, але скупы на эмоцыі бацька, ласкавая сястрычка.

І вось ён прыязджае ў Скіборавічы… А там пустая хата, выбітыя вокны, бадыль вышэй даху. І ён даведваецца ўсю праўду, што здарылася той халоднай восеньскай ноччу 1943 года. Уяўляеце? Чалавек шэсць гадоў пакутаваў, цярпеў, з усяе сілы спрабаваў выжыць, у яго была мара вярнуцца да сваёй сям'і. І вось нарэшце ён дабіраецца дадому, а тут… Скрозь — разбурэнні, запусценне і трупы, трупы, трупы. Непадалёк ад хаты яго бацькоў жыла жанчына, вось яна першай усё яму і расказала, як партызаны забілі яго бацькоў, як рабавалі маёмасць.

***Аўтар.*** За што забілі? Можа, дзед ці ваш дзядзька служылі ў паліцыі ці ў самаахове?

***Альшэўскі А. І.*** Каб дзед служыў немцам, то бацьку не адправілі б у Германію. Папросту дзедаў фальварак быў збудаваны блізка каля лесу, таму яго было вельмі зручна рабаваць. Дык вось пра што даведаўся бацька, калі вярнуўся дадому. Улетку партызаны прыйшлі да дзеда і забралі карову. Як дзед ні прасіў — нічога не атрымалася. Але на гэтым гісторыя не скончылася — восенню, калі толькі ў вокны паставілі дубэльты, прыйшлі зноў людзі з лесу…

***Аўтар.*** Прабачце, Анатоль Іванавіч, а што такое дубэльты?

***Альшэўскі А. І.*** Дубэльтамі ў нас называюць падвойныя вокны. Дык вось, калі прыйшлі партызаны, дзед ужо быў да гэтага візіту падрыхтаваны. Як толькі партызаны рушылі ў хлеў, дзед пераняў іх, узброіўшыся сякераю. Ён стаў перад рабаўнікамі і кажа: «У мяне двое дзяцей, ім што есці? Не аддам карову — вы ж ужо адну забралі». Тыя пастаялі каля фальварка і з пустымі рукамі вярнуліся ў пушчу.

І вось аднаго дня тая ж самая суседка не заўважыла зранку дыму з коміна ў дзедавай хаце. Тут ведаеце як: калі ў раніцу гаспадары не паляць печ, значыць, у хаце нешта не тое. Суседка хуценька туды. Адчыніла дзверы, а там у сенях ляжыць дзед, увесь у крыві. У пакоі, трымаючы ў руках шкло ад лямпы і запалкі, ляжыць мёртвая бабуля. На ложку забітая дзяўчынка. А пераваліўшыся праз акно, практычна вісеў Васіль. Дубэльта валялася побач. Я мяркую, было так… Бандыты пастукаліся, дзед адчыніў дзверы — і адразу там жа быў забіты, баба хацела запаліць лямпу —

яе застрэлілі пры гэтай справе, маю́ цётку застрэлілі ў ложку. А дзядзька выцягнуў дубэльт, але ўцячы ўсё ж не паспеў. Карацей, разлічыліся за тое, што дзед не аддаў карову. На раніцу прыйшла адзіная сваячка, якая жыла непадалёк, больш сваякоў у дзеда ў вёсцы не было. Па-хуткаму ўсіх забітых прыкапалі — і на гэтым усё. Вайна.

***Аўтар.*** Скажыце, Анатоль Іванавіч, а бацька пасля таго, як вярнуўся ў Скіборавічы, не спрабаваў даведацца, хто забіў бацькоў?

***Альшэўскі А. І.*** А як жа! Стаў хадзіць па людзях, дапытвацца. Звяртаўся да мясцовых улад, але яго хуценька прывялі да прытомнасці: маўляў, ты, свалата, працаваў на немцаў, а мы тут змагаліся, кроў сваю пралівалі. Тут жа пасля вайны ўсім кіравалі былыя партызаны. Бацька мне казаў: «Пры гэтай уладзе, Анатоль, мы праўды не знойдзем». Вось і ўсё.

**Польскія партызаны: Армія Краёва (белапалякі)**

Напружанне паміж польскім насельніцтвам Панямоння і савецкімі партызанамі пачалося са з’яўлення апошніх на згаданых тэрыторыях. І для гэтага склалася процьма прычын. Тут і гвалт над багатымі землеўладальнікамі і каталіцкімі святарамі, рабаванне вяскоўцаў-каталікоў і мясцовых касцёлаў, і атаясамліванне савецкіх партызан з даваеннымі Саветамі, якія ўчынялі масавыя рэпрэсіі. Рэакцыя мясцовых каталікоў была адпаведнай.

У 1941–44 гадах палякі складалі 15–20 % ад усіх паліцэйскіх на Заходняй Беларусі. Пры тым, што многія служачыя нямецкіх устаноў польскай нацыянальнасці дапамаглі разам з тым і польскаму падполлю, якое падпарадкоўвалася кіраўніцтву ў Лондане. Пры гэтым палякі неахвотна далучаліся да савецкіх партызан. У кастрычніку 1943 года ў 48 партызанскіх атрадах Баранавіцкага злучэння былі праведзены даследаванні на прадмет нацыянальнага складу. Дык вось, з 8795 партызанаў толькі 34 былі палякамі, 386 украінцамі і 713 габрэямі. У большасці выпадкаў польскае насельніцтва адносілася да савецкіх партызан не інакш як да бандытаў. Але ўсё ж да часу партызаны АК і савецкая партызанка неяк знаходзілі паразуменне.

Сапраўднае абвастрэнне адносін пачалося пасля таго, як немцы аб’явілі пра злачынствы Саветаў у Катыні. Лонданскае кіраўніцтва патрабавала праз Чырвоны Крыж правесці неафіцыйнае расследаванне забойства сваіх афіцэраў. Крэмль тут жа адрэагаваў. Наркам замежных спраў Молатаў 25 красавіка 1943 года абвінаваціў Лонданскі польскі ўрад у дамоўленасці з немцамі з мэтай дамагчыся ад СССР тэрытарыяльных саступак. Але ж у першай палове вайны савецкія партызаны і жаўнеры АК яшчэ ў прамое супрацьстаянне не ўступалі. Нават здараліся выпадкі, калі процілеглыя бакі праводзілі агульныя ваенныя аперацыі супраць немцаў. Трэба зазначыць, што ў сярэдзіне 1943 года на тэрыторыі Панямоння ўжо дзейнічала 8 тысяч узброеных жаўнераў АК. Калі ўлічыць, што ў паўночным Панямонні быў значны адсотак польскага насельніцтва, атрымлівалася, што мабілізацыйны рэсурс АК у гэтых раёнах быў даволі важкі.

Калі пасля Сталінградскай бітвы стала зразумела, што немцы прайграюць вайну, гэтымі абставінамі пастаралася скарыстацца польскае кіраўніцтва ў Лондане, і ўжо ў красавіку 1943 года падполлю на Панямонні было загадана пасля адыходу немцаў

да прыходу Саветаў узяць пад кантроль асноўныя цэнтры, якія эміграцыйнае кіраўніцтва лічыла часткай будучай Польскай дзяржавы (пасля адыходу немцаў летам 1944 года Ліду занялі жаўнеры АК). Гэтая палітыка эмігранцкага кіраўніцтва атрымала назву аперацыя «Бура» (Burza). Але пасля бітвы на Волзе Сталіна ўжо не цікавіў саюз з польскім «буржуазным» урадам у эміграцыі. У яго ўжо былі свае планы на паваенную польскую дзяржаву, і АК у гэтых планах месца не было. Першыя значныя сутычкі паміж варожымі бакамі пачаліся пасля таго, як жаўнеры АК у пачатку лета 1943 года забілі дваццаць савецкіх партызан, якіх ідэнтыфікавалі як рабаўнікоў. Справа была ў тым, што кожны з апанентаў абараняў «сваіх». У рэальнасці гэта азначала, што акаўцы рабавалі праваслаўных сялян, а савецкія партызаны — каталікоў.

У траўні 1943 года была здзейснена ці не апошняя спроба дамовіцца. Прадстаўнікі камандуючага АК генерала Камароўскага і пасланцы камандуючага Баранавіцкім партызанскім злучэннем В. Я. Чарнышова (Платона) рабілі спробу дамовіцца паміж сабой, але беспаспяхова. І адносіны паміж бакамі ўсё больш пагаршаліся. Ужо 22 чэрвеня П. Панамарэнка загадаў абласным камітэтам КП(б)Б і БШПР весці больш актыўную барацьбу з польскімі «нацыяналістычнымі» групамі, па магчымасці ствараць партызанскія атрады і на тэрыторыях, якія АК лічылі сваімі, бо гэта, маўляў, тэрыторыя БССР. Польскіх агентаў у сваіх шэрагах загадвалася знішчаць. Узброеныя атрады АК мусілі быць раззброены альбо далучаны да савецкіх атрадаў. У жніўні 1943-га пачаліся актыўныя баявыя дзеянні. Савецкія партызаны раззброілі польскі атрад «Кміцец». Напрыканцы года налібоцкія партызаны разбілі стаўбцоўскі польскі батальён. А ацалелыя жаўнеры пад кіраўніцтвам капітана Адольфа Пільха (Стаўбцоўскі абвод АК Навагрудскай акругі) тут жа заключылі з немцамі часовае замірэнне.

Яшчэ адзін цікавы факт супрацоўніцтва кіраўніцтва АК з нямецкімі акупантамі. У лютым – сакавіку 1944 года кіраўнік Лідскага абвода АК паручнік Юзаф Свідо атрымаў ад немцаў пяць абозаў зброі. З цягам часу ў гэтым баявым трыкутніку з'явіўся яшчэ і чацвёрты ўдзельнік, і гэта быў самы ўразлівы з бакоў — беларускі нацыянальны рух і безабаронныя мірныя жыхары Панямоння. Што датычна савецкіх партызан — тут усё было зразумела яшчэ з 1939 года. Для Цэнтральнага штаба партызанскага руху ў Маскве ўсе беларускія актывісты адназначна лічыліся прыслужнікамі ворага. Але і кіраўніцтва АК таксама лічыла беларускі незалежніцкі актыў ворагам Польскай дзяржавы, а шараговых беларусаў — ворагамі польскага народа ўвогуле.

Пратакол № 5 ад 3 траўня 1943 года з нарады польскай арганізацыі, якая шыфравалася пад назвай «Партыя грэнадзёраў», гаворыць наступнае: усе нямецкія арганізацыі ў адпаведных раёнах павінны запаўняцца толькі нашымі людзьмі, каб уся практычная ўлада была ў нашых руках. Такім чынам, усе паліцыянты і каманданты змогуць зрабіць дапамогу зброяй і амуніцыяй легіянерам, праводзіць разведку і рабіць адпаведны ўплыў на немцаў і на ўсё акружэнне; кожны паляк павінен памятаць, што ніколі і ні за што беларус не захоча даць нам дапамогі, таму мы павінны імкнуцца выжыць беларусаў з усіх устаноў, імкнуцца вышукваць усякія матэрыялы, што абвінавацяць беларусаў у сувязі з партызанамі, перадаваць іх немцам, каб іх расстрэльвалі. Такім чынам мы зможам не толькі выціснуць беларусаў, але і супрацьпаставіць немцам беларускае насельніцтва; пры дапамозе ўмелай прапаганды мы

перацягнем беларусаў на свой бок і дасягнем як мінімум іх нейтральнасці. Праз сваіх людзей прасіць паліцыю і немцаў паліць беларускія вёскі нібыта з прычыны, што яны дапамагаюць партызанам.

У пратаколе № 7 ад 12 траўня 1943 года ўдзельнікам польскага падполля ў Беларусі ставілася ў абавязак прымяняць тэрор супраць беларускіх дзеячаў.

У дырэктыве ад 14 траўня 1943 года, перахопленай савецкімі партызанамі на Берасцейшчыне, кіраўнічы цэнтр «Грэнадзёраў» пастанаўляў, што мэта польскіх легіёнаў — вызваленне Заходняй Беларусі ад бальшавікоў, і кожны паляк павінен памятаць, што беларусы — гэта ворагі польскаму народу, палякі павінны любым спосабам кампраметаваць беларусаў перад немцамі, дамагаючыся арышту беларусаў, каб страты ў іх былі як мага большымі. Ну а далей ужо пайшло і паехала… А парадаксальнасць гэтай гісторыі была ў тым, што «крайнімі» ў дадзеных абставінах аказаліся менавіта мірныя каталіцкія і праваслаўныя жыхары Заходняй Беларусі.

* * *

Вёскі Панямоння здаўна былі заселены як праваслаўным, так і каталіцкім насельніцтвам. Многія сем'і мелі змешаныя шлюбы. Пад адным дахам мірна ўжываліся праваслаўныя і каталікі. І ўсё было адносна спакойна да той пары, пакуль не пачаўся захоп Заходняй Беларусі спачатку Саветамі, а затым немцамі. Асабліва моцныя рэпрэсіі пачаліся пасля таго, як на Панямонні з'явіліся савецкія партызаны, а затым і польскія жаўнеры АК. Да пачатку 1943 года на згаданай тэрыторыі склаліся два цэнтры ўзброенага змагання з нямецкімі акупантамі. Савецкая партызанка ў асноўным фармавалася з акружэнцаў, габрэяў і мясцовых сялян-беларусаў. Другі лагер складалі вяскоўцы і гараджане каталіцкага веравызнання, якія атаясамлівалі сябе з палякамі і Арміяй Краёвай. Мушу сказаць, што апошнія не толькі ваявалі з нямецкімі жаўнерамі і савецкімі партызанамі за адраджэнне Польскай дзяржавы ў яе даваенных межах, але, як і іх праціўнікі, няспраўакавана палілі і забівалі простых, абсалютна ні ў чым не вінаватых праваслаўных беларусаў. Яскравы прыклад падобнага злачынства — знішчэнне людзей у вёсках Ваўчкі і Орля, што на Шчучыншчыне. У пэўным сэнсе гэту трагедыю можна назваць абсалютна беларускай: савецкія партызаны (так званыя чырвоныя) забіваюць мірных вяскоўцаў-каталікоў проста ў час сну, а праваслаўных сялян расстрэльваюць ужо жаўнеры Арміі Краёвай, якіх на Панямонні называлі белымі партызанамі альбо белапалякамі. Бясспрэчны факт: і тыя, і другія партызаны несумленна падстаўлялі ні ў чым не вінаватых беларускіх мінакоў, чым праваквалі апанентаў на варожыя дзеянні.

**Гутарка з жыхаром вёскі Ваўчкі Шчучынскага раёна Антонам Антонавічам Юрэвічам***

***Аўтар.*** Антон Антонавіч, людзі ў Орлі расказваюць, што тут, у Ваўчках, падчас вайны хтосьці забіў вяскоўцаў. Хто ўчыніў гэтае злачынства?

***Юрэвіч А. А.*** У Ваўчках забівалі людзей і белыя партызаны, і красныя, а вось немцы ў нас з'яўляліся рэдка і людзей амаль не білі.

* Запісана 27 ліпеня 2022 г.

***Аўтар.*** Антон Антонавіч, а з-за чаго тыя і другія расстрэльвалі людзей?

***Юрэвіч А. А.*** Тут ведаеце як было… Недалёка адсюль у Ліпічанскай пушчы стаялі партызаны. Імі камандаваў нібыта сакратар Шчучынскага райкама Шупеня. Дык вось, аднаго разу партызаны сабраліся напасці на Жалудоцкі гарнізон, а брод быў тут, паміж Орляю і Ваўчкамі. І вось калі пачалася пераправа праз Нёман з гэтага боку, па красных пачалі страляць белыя партызаны. Але пасля невялікай перастрэлкі палякі, пабачыўшы, колькі перапраўляецца савецкіх, папросту паўцякалі, але пабеглі не ў лес, а ў бок Ваўчкоў. І толькі ў вёсцы звярнулі ў лес. А вось ліпічанцы падумалі, што гэта зрабілі нашыя мужыкі. І як толькі ўсе партызаны пераправіліся на гэты бок, доўга не думаючы, напалі на Ваўчкі. Білі абсалютна нявінных людзей. Многіх забілі ў ложках. Але забівалі толькі каталікоў.

***Аўтар.*** Так-так, я пра напад ліпічанскіх партызан на Жалудок чытаў у Шупеневай «Гнеўнай Шчары». Дый і Б. А. Булат узгадвае пра напад партызан Ленінскай брыгады на Жалудок у кнізе «В принеманских лесах». А скажыце, калі ласка, каго тады забілі савецкія партызаны ў Ваўчках?

***Юрэвіч А. А.*** Той ноччу яны забілі двух Сямашкаў: Іосіфа, бацьку, і сына Івана, ранілі яшчэ аднаго сына, але той, будучы параненым, уцёк у лес. Тады ж забілі двух Кордаў: бацьку і сына. І Пясецкіх бацьку і сына. Хацелі забіць яшчэ нейкага мужчыну, але хтосьці з іхніх камандзіраў нарабіў крыку, што тыя марудзяць ды губляюць час. То партызаны прыпыніліся толькі вось на тых і рушылі на Жалудок. Уяўляеце, пазабівалі дарослых, здаровых мужчын. А хто на зямлі будзе працаваць, а сем'і хто мусіў карміць? А ў кожнай хаце дзяцей пяць-шэсць у рад! Во бяда!..

***Аўтар.*** А забітыя былі ні ў чым не вінаватыя?

***Юрэвіч А. А.*** Абсалютна! Я ж кажу — людзі спалі! Партызаны выломлівалі дзверы, вокны і так вось, спячых, і забівалі. Тыя нават уцячы не мелі шанцаў.

***Аўтар.*** А хто забіў праваслаўных у вашай вёсцы?

***Юрэвіч А. А.*** А вось калі партызаны вярнуліся ў пушчу пасля сваёй баявой аперацыі, сюды прыехалі белапалякі і адразу пачалі шукаць тых, хто дапамагаў партызанам. Вось менавіта тады забілі сям'ю Крупіцаў. Бо нібыта іхняя Юля была звязана з партызанамі. Але знішчылі ўсю сям'ю.

***Аўтар.*** А Дзяхцэвічаў хто забіў?

***Юрэвіч А. А.*** А Дзяхцэвічаў, маці і дачку, белапалякі забілі прама на полі, калі тыя працавалі там. Так што вось так... Маглі забіць і тыя, і другія.

***Аўтар.*** Антон Антонавіч, а як цяпер жыве ваша вёска?

***Юрэвіч А. А.*** Няма больш Ваўчкоў. Так, яшчэ пару чалавек засталося, і ўсё.

***Аўтар.*** Скажыце, Антон Антонавіч, а дзе стаялі акаўцы?

***Юрэвіч А. А.*** Яны стаялі недзе каля Беліцы. А вось тут яны прыпыняліся — паблізу Ракавіч, на нейкім хутары…

**Гутарка з жыхаром вёскі Орля Шчучынскага раёна Мікалаем Андрэевічам Ненартовічам (93 гады)***

***Аўтар.*** Раскажыце, паважаны Мікалай Андрэевіч, як загінуў ваш родны брат Кірыл?

***Ненартовіч М. А.*** Што тут рабілася падчас вайны — страх! Днём — адныя, вечарам — другія, ноччу — трэція. І кожнаму трэба нешта даць! А дасі — заб'юць тыя, што прыйдуць за першымі, а не дасі — то і да вечара не дажывеш. Брат мой Кірыл разам з яшчэ чатырма маладымі орлянцамі пайшлі ў Жалудок вырабляць пашпарты. І калі вярталіся назад, на дарозе іх затрымалі ўзброеныя людзі, доўга трымалі ў палоне, а пазней усё ж усіх чатырох і пастралялі. Тады забілі Жамойду, Лапуця, Шындзюка і нашага Кірыла, а вось Якімчык Макей быў паранены ў нагу, але здолеў уцячы і выжыў. Кірыл таксама ўцякаў, але быў спачатку паранены, бо на кажушку былі дзіркі на плячах. Але, відаць, потым яго дагналі і дабілі. Казалі, што яго дагналі конна. І калі дагналі, то прыстрэлілі. Потым сястра мая ездзіла ў Канюшаны яго забіраць.

***Аўтар.*** А калі іх забілі?

***Ненартовіч М. А.*** Гэта было на Вялікдзень. Памятаю, як у цэркву ішлі дзяўчаты з Ліпічанаў, то заходзілі ў нашу хату развітацца з Кірылам, а ён тут ляжаў пасярод пакоя.

***Аўтар.*** Ды ўсё ж — а за што яны вашых хлопцаў пабілі?

***Ненартовіч М. А.*** Не ведаю. Кірыл ні ў партызанах, ні ў самаахове не служыў. Можа, з-за таго, што ён быў беларусам… Хаця і савецкія партызаны білі людзей. Вось ні з таго ні з сяго яны застрэлілі ў нас чалавека. Яго прозвішча было Савашчынскі. Дык вось, нехта партызанам штосьці нагаварыў, яны прыйшлі ноччу і забілі чалавека. Гаварылі нібыта, што ён быў звязаны з белапалякамі. А нашага вось гэтыя забілі.

***Аўтар.*** А скажыце, вось савецкія партызаны знаходзіліся ў Ліпічанскай пушчы, а белапалякі — дзе стаялі?

***Ненартовіч М. А.*** Яны знаходзіліся тут непадалёку, у вёсцы Процім. Дакладней — на хутары паблізу Проціма. Той хутар належаў нейкаму багатаму чалавеку. Але прозвішча яго я ўжо не памятаю. Вось з таго хутара яны і нападалі на нашыя вёскі. Чутно было, што яны ні за што тады многа людзей пабілі.

***Аўтар.*** Скажыце, а чаму яны пабілі, як вы кажаце, вашых хлопцаў у Канюшанах?

***Ненартовіч М. А.*** Відаць, у іх там дзесьці паблізу схованка была, дзе яны знаходзіліся. Бо які быў сэнс хлопцаў нашых туды з Жалудка весці?!

***Аўтар.*** Скажыце, Мікалай Андрэевіч, чаму пасмяротны запіс у метрычнай кнізе Арлянскай царквы зроблены толькі ў чэрвені 1943 года?

***Ненартовіч М. А.*** Рэч у тым, што тыя бандыты забаранілі бацюшку перад пахаваннем іх заносіць у царкву. Ну а бацюшка баяўся. А ўжо пазней, відаць, бацькі ўгаварылі яго. Паперы ж былі патрэбныя. Ды і як быць без рэгістрацыі?..

***Аўтар.*** А нямецкія ўлады — што, не маглі бандытаў суняць?

***Ненартовіч М. А.*** У нас тут былі і солтыс, і іншыя, але яны неяк з імі ладзілі. А нямецкія салдаты тут рэдка з'яўляліся…

---

* Запісана 27 ліпеня 2022 г.

**Метрычная кніга Арлянскай царквы, Шчучынскі раён***

| *Рэгістрацыя* | *Прозвішча, імя ахвяры* | *Дата смерці* | *Год народзін* | *Месца смерці* | *Святар* | *Прычына смерці* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 чэрвеня 1943 г. | Іван Васільевіч Шырнок | 20 красавіка 1943 г. | 1898 | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 5 чэрвеня 1943 г. | Міхаіл Крупіца, сын Еўдакіі | 20 красавіка 1943 г. | 1919 | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 5 чэрвеня 1943 г. | Кірыл Андрэевіч Ненартовіч | 20 красавіка 1943 г. | 22 гады | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 12 кастрычніка 1943 г. | Уладзімір Іванавіч Дзяхцэвіч | 2 кастрычніка 1943 г. | 43 гады | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 12 кастрычніка 1943 г. | Алена Восіпаўна Дзяхцэвіч | 2 кастрычніка 1943 г. | 1891 | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіта |
| 12 кастрычніка 1943 г. | Юлія Уладзіміраўна Дзяхцэвіч | 2 кастрычніка 1943 г. | 1922<br>21 год | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіта |
| 24 кастрычніка 1943 г. | Восіп Жамойда, сын Серафіма і Надзеі | 8 кастрычніка 1943 г. | 7 гадоў | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 24 кастрычніка 1943 г. | Уладзімір Якімчык, сын Антона і Агаф'і | 8 кастрычніка 1943 г. | 14 гадоў | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 26 лістапада 1943 г. | Уладзімір Мікалаевіч Дрозд | 13 лістапада 1943 г. | 1909 | в. Процім | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 26 лістапада 1943 г. | Мікалай Мікалаевіч Дрозд | 13 лістапада 1943 г. | 1913 | в. Процім | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 26 лістапада 1943 г. | Іван Мікалаевіч Дрозд | 13 лістапада 1943 г. | 1917 | в. Процім | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 27 лістапада 1943 г. | Канстанцін Дзмітрыевіч Шалесны | 15 лістапада 1943 г. | 45 гадоў | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 27 лістапада 1943 г. | Юльян Восіпавіч Лапуць | 15 лістапада 1943 г. | 20 гадоў | м. Орля | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 30 снежня 1943 г. | Марыя Крупіца | 10 кастрычніка 1943 г. | 67 гадоў | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіта |
| 30 снежня 1943 г. | Ганна Антонаўна Крупіца | 10 кастрычніка 1943 г. | 1914<br>28 гадоў | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіта |
| 30 снежня 1943 г. | Антон Антонавіч Крупіца | 10 кастрычніка 1943 г. | 1916<br>27 гадоў | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіты |
| 30 снежня 1943 г. | Юлія Антонаўна Крупіца | 10 кастрычніка 1943 г. | 1925<br>16 гадоў | в. Ваўчкі | Канстанцін Сеўба | Забіта |

* НДАБ у г. Гродне. Ф. 922. Воп. 2. Спр. 16.

нарадзіўся 20 ліпеня 1963 года ў вёсцы Александрыя Зэльвенскага раёна. Як мецэнат фундаваў кнігі: факсімільнае выданне Ларысы Геніюш «Ад родных ніў», Міхася Скоблы «Розгі ў розніцу», Юркі Голуба «Багра» ды інш. Друкаваўся ў «Гродзенскай праўдзе», «Дзелавой газеце», у часопісах «Роднае слова», «Дзеяслоў». Выдаў кнігу даследаванняў і вершаў «Архіпелаг Сапегаў», кнігі прозы «Чорная Воля» (2013), «Чужы» (2017), «Сімвал веры» (2018), «Пажарка — прытулак для самотнага музыкі» (2019). Жыве ў Гродне.



# Валянцін Дубатоўка

ЛЕАНІД ЛАЎРЭШ

## Страчаная цывілізацыя: маёнткі Стрэліца і Касцянёва з Паперняй на Лідчыне

*Гістарычныя хронікі*

### Сяклюцкія і маёнтак Стрэліца на Лідчыне

У дакументах аб зацвярджэнні шляхецтва Віленскай герольдыі ад 1820 г. запісана сямейная легенда аб тым, што продкі Сяклюцкіх герба Кушаба прыбылі з Чэхіі каля 1228 г., гэты род *«з многімі знанымі радамі параднёны і ўшанаваны высокімі пасадамі, пра што пісалі <...> хранікёры. За заслугі сям'я была адорана зямлёй і ўзяла прозвішча ад назвы маёнтка Сяклюкі ў Драгічынскай зямлі. Пасля бітвы з туркамі пад Хацінам 11 лістапада 1673 г. адзін з прадстаўнікоў роду Сяклюцкіх пераехаў у Літву. Аляксандр Сяклюцкі служыў у войску пад камандаваннем гетмана Паца, Андрэй быў доктарам багаслоўя, а Войцех у 1591 годзе — Драгічынскім падкаморыем. Родапачынальнікам роду, паводле Нясецкіх* (т. IV, с. 78), *з'яўляецца Леанард Сяклюцкі»*.

Нам вядомы наступныя ранейшыя Сяклюцкія:

Тамаш Юрый Сяклюцкі, лідскі падчашы, у Лідскім павеце валодаў маёнткамі Красулі і Бярозавец (3 км ад былога маёнтка Стрэліца), які ў тастаманце ад 10 студзеня 1672 г. запісаў яго сваім пяцярым сынам. Магчыма, ён і быў першым з Сяклюцкіх, якія перасяліліся на Лідчыну.

У Жалудоцкай парафіі драгічынскі падстолі Уладзіслаў Сяклюцкі, у 1690 г. меў 26 дымоў у Бурчавічах.

Рафал Сяклюцкі, лідскі мечнік, а потым, згодна з прывілеем Аўгуста III ад 23 жніўня 1746 г., «падстолі». У 1728 г. валодаў Бярозаўцам (11 дымоў) і Красулямі (3 дымы).

Антон і Міхал Сяклюцкія з Углаўцаў (11 дымоў).

Станіслаў Сяклюцкі, арандаваў у Дэражнай 5 дымоў.

У Падымным рэестры Лідскага павета ад 1775 г. нейкі Сяклюцкі валодае маёнткам Стрэліца, мае 25 дымоў у Голдаве і 4 дымы ў Лебядзянцы.

Вядомы віленскі генеолаг Часлаў Малеўскі ў свой час пісаў пра:

Барбару Кастравіцкую з Сяклюцкіх — жонку гродскага пісара і лоўчага Лідскага павета, фундатарку касцёла Св. Духа ў Вільні, у 1786 г. яна была пахавана ў лёхах гэтага касцёла;

Люцыяна Сяклюцкага, маёра ў 1874 г.;

вайскоўца Уладзіслава Сяклюцкага;

чыноўніка Канстанціна Сяклюцкага;

васілішскага пробашча ў першай палове XIX ст. Ісідора Сяклюцкага.

З канца XVIII ст. па 1939 г. Сяклюцкія валодалі маёнткамі Гарнастаішкі каля Эйшышак (у 1863 г. — 800 дзесяцін) і Стрэліцай. За падтрымку паўстання 1863 г. Вінцэнтам Сяклюцкім (1793–1864) на маёнтак Гарнастаішкі быў накладзены секвестр. Але да-

казаць віну Вінцэнта Сяклюцкага ўлады не змаглі, і таму яго сын Уладзіслаў вярнуў маёмасць праз суд.

Апошнім уладальнікам Гарнастаішак быў афіцэр рэзерву Юзаф Сяклюцкі — удзельнік Першай сусветнай вайны і афіцэр 1-га Польскага корпуса генерала Юзафа Доўбар-Мусніцкага. Суседзі памяталі яго як вялікага гурмана, які надта любіў паесці. Таму мясцовыя сяляне пасля сытнай ежы часта казалі адзін аднаму: «Пад'еў, як пан Сяклюцкі». У 1939 г. ён быў арыштаваны і вывезены ў глыб СССР, а яго двор стаў сядзібай калгаса «Запаветы Леніна».

Сын апошняга ўладальніка маёнтка Ішчална ў 1920–30-х гадах Караль Лясковіч падае цікавую інфармацыю пра род Сяклюцкіх у XIX і XX стагоддзях.

Вінцэнт Сяклюцкі, які ўжо згадваўся вышэй, цешыўся павагай усяго павета з-за годнага сэрца і лагоднага характару; ён быў апошнім лідскім падкаморыем. Меў трох сыноў і трох дачок. Старэйшы сын ажаніўся з Ганнай Ясінскай і асеў у Кракаве. Другі сын Люцыян узяў у жонкі Стравінскую і пасля смерці бацькі пераняў маёнтак Гарнастаішкі. Трэці сын, Канстанцін, быў жанаты з Ганнай Юндзіл з Сяняжыц, ён атрымаў ад бацькі маёнтак Стрэліцу разам з трыма фальваркамі. З трох дачок старэйшая, Юзэфа выйшла замуж за Люцыяна Кастравіцкага, уладальніка Касцянёва. Другая, Ганна, памерла паненкай, а Гелена выйшла замуж за павятовага лекара Альшанскага, які працаваў у Жалудку ў князёў Чацвярцінскіх.

Канстанцін меў двух сыноў: Станіслава і Вінцэнта. Яны абодва закончылі кадэцкі корпус у Полацку. Пасля таго старэйшы сын Станіслаў вывучыўся на інжынера-будаўніка чыгункі і мастоў, а Вінцэнт пасля смерці бацькі асеў у Стрэліцы і ажаніўся з Фяліцыяй з Навакоўскіх, у іх нарадзіліся чатыры дачкі: Ванда, Ядвіга, Яніна і Марыя.

Сваячка гаспадара маёнтка Ганна Вольф з Сяклюцкіх (дачка Вінцэнта, пасля бацькі яна ўспадкавала Гарнастаішкі), жонка вядомага выдаўца і гандляра кнігамі, знаўцы літаратуры, доктара Юзафа Вольфа, правяла сваё жыццё ў Варшаве. У сваіх мемуарах яна пакінула цікавыя ўспаміны пра Стрэліцу. Таксама цікавыя ўспаміны пра маёнтак Стрэліца ў 1894 г. пакінуў стрыечны ўнук Канстанціна Сяклюцкага (сын яго сястры Юзэфы) Ян Люцыян Кастравіцкі; яшчэ хлопцам ён жыў тут у свайго стрыечнага дзеда. Яго ўспаміны польскі даследчык Анатоль Стэрн надрукаваў у сваёй кнізе «Дом Апалінарыя». Грунтуючыся на гэтых тэкстах, я раскажу пра Стрэліцу ў другой палове XIX ст.

Згодна з інфармацыяй «Геаграфічнага слоўніка», у 1870-х гадах у маёнтку Стрэліца жылі 33 чалавекі. Вядома, што Стрэліца ляжала за 45 вёрст ад павятовага горада Ліда і за 20 вёрст ад мястэчка Жалудок і маёнтка Чацвярцінскіх у гэтым мястэчку (цікава, што, па сцверджанні Яна Кастравіцкага, мястэчка Жалудок пераважна было пабудавана на зямлі, якая належала маёнтку, і карыстальнікі гэтай зямлі плацілі чынш у касу маёнтка).

Дарога з Жалудка да Ліды была звычайнай, толькі трошкі шырэйшай, грунтовай з грэблямі, насыпанымі ў нізкіх і вільготных адцінках і паглыбленнямі на пагорках. У вёсцы Мыто дарога далучалася да шырокага гасцінца, які быў абсаджаны падвойнымі радамі бяроз. Гэты гасцінец бег з Гародні праз Шчучын да Ліды, а адтуль — у Вільню.

На дваццатай вярсце ад Жалудка ад гэтай дарогі адыходзіла грэбля, насыпаная на мокрым лузе. Па ўсёй даўжыні грэбля была абкапана равамі і абсаджана старымі вербамі. Грэбля даходзіла да нязначнага ўзвышша і там пераходзіла ў алею, абсаджаную разлогімі асінамі. На краі ўзвышша стаялі жылыя будынкі работнікаў маёнтка. Праз адну вярсту прысады раптоўна ўпіраліся ў драўляную, але моцную браму, якая заўсёды была замкнута на ланцуг. Ключ знаходзіўся ў жылым доме, які стаяў за брамай. Улева і ўправа ад брамы адыходзіў высокі плот-частакол з моцнага бярвення, плот меў навес, які звісаў унутр агароджы.

Ад брамы да дома вяла шырокая, высыпаная жвірам дарога, якая агінала вялікі траўнік, аточаны старымі каштанамі. Пры дарозе, насупраць брамы, месціўся драўляны, прысадзісты жылы дом. Уваходам у дом служыў досыць вялікі, зашклёны рознакаляровым шклом ганак, у якім у кадушках раслі алеандры і кактусы. Пад столлю віселі мяшкі з высушанымі лекавымі зёлкамі, а ў скрынках каля вокнаў нават зімой квітнелі пеларгоніі.

За ганкам меліся вялікія, змрочныя сенцы, вокны якіх выходзілі ў ганак. Столь у сенцах, як і ва ўсім доме, трымалася на бэльках, на якіх ляжалі дошкі столі. Столь і сцены ў сенцах былі пабелены вапнай, а падлога складалася з пафарбаваных у арэхавы колер сасновых дошак. У сенцах стаялі сасновыя лавы і вешалкі для вопраткі. З сенцаў у суседнія пакоі вялі трое дзвярэй. Над сярэднімі дзвярыма, насупраць увахода, вісела вялікая гравюра з выявай каня англійскай пароды, які ў свой час здабыў шмат узнагарод і быў продкам усіх добрых коней Стрэліцы. А на адваротным баку выявы каня быў прымацаваны партрэт дзейнага рускага цара. Звычайна цар глядзеў у сцяну, але калі ў замкнутую браму грукаўся хто-небудзь з прадстаўнікоў улады, напрыклад паліцэйскі спраўнік з Ліды ці прыстаў з Жалудка, служка, які павінен быў адчыніць браму, меў абавязкам перавярнуць выяву так, каб чыноўніка, які ўвайшоў у хату, вітаў рускі цар. Пасля чыноўніка сытна кармілі і паілі, можа, таму справы маёнтка заўсёды вырашаліся для гаспадароў станоўча. А пасля ад'езду госця выяву зноў пераварочвалі канём вонкі, і цар чакаў візіту каго-небудзь са сваіх чыноўнікаў.

Гэта было адной з прычын, чаму ўязную браму заўсёды трымалі зачыненай. Другой прычынай была наяўнасць у двары дрэсіраванага і ўжо досыць старога мядзведзя, які быў навучаны штодзень насіць дровы з адрыны на кухню і ў жылы дом. Таму сцежкі ад адрыны да дома і кухні мелі адмысловую агароджу. Мядзведзь меў добры нораў і дазваляў нават бавіцца з сабой дзецям, пры тым заўсёды нешта бурчаў, таму сяляне казалі, што мядзведзь увесь час чытае пацеры. Звер прызвычаіўся, што пасля таго, як ён усюды, куды патрэбна, наносіць дроў, старая кухарка Француся яго добра пачастуе. Таму кухня з'яўлялася апошняй кропкай яго маршруту. Жыў ён у адмысловым логаве, якое было прыбудавана да сцяны кухні. Неяк дзяўчына, толькі што ўзятая з вёскі працаваць на кухню, убачыла, як звер прынёс вязанку дроў. Ад страху яна пляснула на яго вядро вады. Гэта вывела мядзведзя з раўнавагі — ён раскідаў дровы і павыбіваў вокны. Толькі старая Француся змагла мятлой загнаць раззлаванага звера ў яго логава, але і там ён бушаваў яшчэ цэлы дзень. Назаўтра мядзведзь перастаў насіць дровы і пачаў кідацца на людзей. Тады некалькі мужчын з паходнямі загналі яго ў логава і зачынілі ў ім. З кожным днём мядзведзь станавіўся ўсё больш агрэсіўным, і праз некалькі тыдняў гаспадар маёнтка Канстанцін Сяклю-

цкі загадаў лесніку застрэліць звера. Шкура мядзведзя потым ляжала ў сенцах на падлозе.

Таксама ў сенцах, акрамя вышэйапісанай двухбаковай выявы, на сценах віселі чучалы ваўкоў з ашчэранымі зубамі, а на падлозе ляжалі ваўчыныя скуры. Адны з дзвярэй у сенцах вялі праз маленькі пакоік у спальню гувернанткі панны Цэцыліі Хаберман і стрыечнага ўнука гаспадара Яна Кастравіцкага. Другія дзверы праз буфетны пакой вялі ў сталовую. А праз дзверы пад двухбаковай выявай можна было прайсці ў більярдны пакой, вокны якога выходзілі ў сад. У гэтым пакоі мелася роўная столь, прыгожыя сцены і паркет на падлозе. З більярднага пакоя ўправа былі дзверы ў салон, які злучаўся са сталовай, а дзверы па левай сцяне вялі ў кабінет Канстанціна Сяклюцкага. З кабінета можна было прайсці ў спальню Канстанціна, а потым у спальню яго сястры.

У більярдным пакоі акрамя більярда меліся яшчэ фартэпіяна і зашклёныя шафы з біялагічнымі і мінералагічнымі зборамі. У першай шафе стаялі слоікі з рознымі земнаводнымі ў спірце, вялікія зборы матылёў і іншае. У другой шафе ў адмысловых тэчках месціліся багатыя калекцыі мінералаў. З іншай мэблі ў гэтым пакоі былі вялікія, мяккія канапы і фатэлі, на сценах віселі карціны вядомых майстроў, сярод іх — карціны мастака віленскай школы Вінцэнта Сляндзінскага. Яну Кастравіцкаму запомнілася карціна, дзе была намаляваная бабуля, якая зацягвае нітку ў іголку. Тая карціна цяпер знаходзіцца ў Літоўскім мастацкім музеі (The Lithuanian National Museum of Art), але, магчыма, яна мела некалькі копій.

У суседнім салоне віселі партрэты Сяклюцкіх: жанчын у карункавых строях і мужчын у кунтушах. Меўся там і партрэт Рафала Сяклюцкага, пра якога згадвалася вышэй.

З більярднага пакоя можна было выйсці на веранду, а з яе — далей на жвіраваную дарожку, якая вяла праз сад да сажалкі. За сажалкай быў зроблены насып, на якім стаяла брама ў кітайскім стылі. У самы доўгі летні дзень з веранды можна было назіраць, як сонца заходзіць менавіта ў той браме.

Вада з сажалкі праз канал выцякала ў іншую сажалку, якая была выкапана сярод гародаў маёнтка. З гэтай другой сажалкі вада праз роў сцякала ў рэчку Лебяду. Над гэтай другой сажалкай з зямлі, выбранай пры яе капанні, быў насыпаны курган, на якім стаяў драўляны крыж. Каля крыжа, на адмыслова зробленым алтарыку, адбываліся травеньскія набажэнствы. Пра гэты крыж, пастаўлены на месцы пахавання паўстанцаў 1863 г., я напішу трошкі ніжэй, а цяпер заўважым, што крыж стаяў ужо ў 1894 г.

Вядома, што будынкі маёнтка Стрэліца разам з жылым домам неаднаразова гарэлі; звычайна пажары пачыналіся з кухні, якая месцілася ў жылым доме. Таму пасля апошняга пажару кухню вынеслі дастаткова далёка ад жылога дома, да таго ж яна была адгароджана ад дома дрэвамі і кустамі. Гэтае рашэнне аказалася вельмі практычным, і дом больш не гарэў, але калі ў халады ў дом везлі ежу, яна астывала, і таму яе трэба было падаграваць у буфетным пакоі. У тым жа пакоі гатавалі смачныя дэсерты і сочывы, і таму тут усё ж мелася невялікая кухонная печ, за якой, каб заўсёды быць недалёка ад гаспадароў, начаваў нехта са служкаў.

За садам, гародам, гаспадарчымі будынкамі, домам арандатара фальварка і жылымі дамамі рабочых маёнтка знаходзілася невялікае ворнае поле памерам каля 10 дзесяцін. Аднак галоўная ралля маёнтка ляжала за дарогай на Жалудок, за гэтай

раллёй раслі лясы Стрэліцы, за лясамі стаяў фальварак Вольгаўцы, што межаваў з іншым маёнткам Хацяновічы, якім ужо валодалі Шалевічы.

Найцікавейшай гістарычнай постаццю Стрэліцы быў Канстанцін Сяклюцкі, чалавек, які нарадзіўся ў першай палове XIX ст. і жыў у другой палове XX. Ён рана аўдавеў — жонка Ганна памерла ад тыфу. У маёнтку адукацыяй дзяцей займалася немка, гувернантка Цэцылія Хаберман, якая пражыла ў Стрэліцы да канца сваіх дзён і лічылася членам сям’і.

Пахаваўшы жонку і забяспечыўшы будучыню сваіх дзяцей, Канстанцін Сяклюцкі даручыў кіраванне маёнткам эканому, а сам заняўся самаадукацыяй. Меў шмат сяброў, цікавае асяроддзе, досціп, жывы характар, шляхетную душу, выбітны інтэлект і замілаванне да падарожжаў і прыгод. Наведаў многія краіны Еўропы, ведаў шмат моў, у Парыжы сябраваў з Гамбета* і лятаў з ім на паветраным шары падчас асады горада немцамі. Закончыў у Парыжы матэматычны факультэт Сарбоны, а потым у Пецярбургу музычную кансерваторыю, заснаваную ў 1862 г. славутым піяністам Антонам Рубінштэйнам, які быў яго прафесарам фартэпіяна. Пасля Пецярбурга зноў жыў у Парыжы, дзе ў іншага вядомага кампазітара Пабла Сарасатэ ўдасканальваў сваю ігру на скрыпцы і віяланчэлі. Належаў да тыпу людзей, якія, маючы матэрыяльныя сродкі, выкарыстоўваюць іх, каб паглыбляць свае веды ва ўсё новых сферах дзейнасці — замест манатоннай працы на гаспадарцы.

Каля 1895 г. Канстанцін Сяклюцкі нарэшце вярнуўся ў Стрэліцу. Маёнтак, які доўгі час жыў без гаспадара, знаходзіўся ў заняпадзе. Але гэта не надта хвалявала Сяклюцкага. Ён перарабіў вялікую більярдную залу сядзібнага дома ў музычны пакой. У гэтым пакоі знаходзіліся шафы з нотамі, два фартэпіяна, тры віяланчэлі і скрыпка высокай якасці, зробленая самім майстрам Антоніем Страдывары з Крэмоны. Менавіта тут ён праводзіў канцэрты з вельмі шырокім рэпертуарам. Сам Канстанцін граў на скрыпцы ці віяланчэлі, а дзве спадарыні — яго сястра Альшанская і маці стрыечнай сястры спадарыня Вольф — на фартэпіяна. Улетку канцэрты праходзілі сярод прыгожай прыроды стрэліцкага двара — пахлі кветкі, стракаталі конікі, чуліся салаўіныя трэлі, усё гэта стварала адчуванне неверагоднай гармоніі.

Постаці Канстанціна Сяклюцкага прысвяціў фрагмент сваіх успамінаў яго стрыечны ўнук Ян Люцыян Кастравіцкі: *«Па адукацыі мой дзед быў матэматыкам — закончыў Сарбону. Як гэта бывае сярод матэматыкаў, ён быў вельмі музыкальным чалавекам і пасля Сарбоны закончыў кансерваторыю ў Пецярбургу, вучыўся ў прафесара Рубінштэйна па класе віяланчэлі <...> Потым асеў у Стрэліцы, ажаніўся з Юндзілоўнай з Сяняжыц, што на Наваградчыне, і працягваў займацца матэматыкай, падтрымліваючы сталыя кантакты з еўрапейскім навуковым светам — у першую чаргу з французскімі матэматыкамі. Заняткі матэматыкай давялі яго да таго, што ён зрабіўся маньякам: калі стала зразумела, што вынікі даследаванняў, якімі ён займаўся шмат гадоў, былі памылковымі, учыніў самагубства.*

*Цалкам непублічна быў пахаваны ў Жалудку ў сямейным склепе — толькі ксёндз акрапіў труну святой вадой перад тым, як яе апусцілі ў магілу. Ён жадаў, каб яго*

* Леон Мішель Гамбета (1838–1882) — французскі палітык, прэм’ер-міністр і міністр замежных спраў Францыі ў 1881–1882 гг.

*так пахавалі і менавіта такі план свайго пахавання пакінуў у перадсмяротным лісце»*.*

Але суседзі лічылі, што самагубства адбылося з-за вялікай запазычанасці і дрэннага фінансавага стану маёнтка.

Замілаванне Канстанціна да музыкі, хоць і ў меншай ступені, але працягвалася ў яго сынах і ўнуках.

Атрымаўшы паведамленне пра самагубства свайго бацькі Канстанціна Сяклюцкага, Вінцэнт, які рыхтаваўся да ваеннай кар'еры, неадкладна вярнуўся ў Стрэліцу і пераняў маёмасць. Яго брат Станіслаў ужо працаваў інжынерам-пуцейцам на будаўніцтве Транссібірскай чыгункі, праз нейкі час ён ажаніўся з расіянкай, і кантакты сям'і з ім спыніліся.

Каля 1900 г. Вінцэнт Сяклюцкі жэніцца з Феліцыяй з Навакоўскіх, дачкой заможных землеўладальнікаў з-пад Любліна. Пасаг Феліцыі дапамог істотна паменшыць даўгі Стрэліцы. Да пачатку Другой сусветнай вайны Стрэліца мела 1000 га зямлі, гаспадарка спецыялізавалася на малочных прадуктах, мясе, рыбе, гароднiне, садавіне, а таксама прадавала будаўнічы лес і дровы. На ферме маёнтка працавалі 10 пастаянных рабочых, якія жылі тут з сем'ямі, атрымліваючы пансіён і прытулак. Падчас жніва наймалі дадатковых работнікаў з суседніх вёсак.

Да Першай сусветнай вайны сям'я жыла ў сваім маёнтку, а пасля пачатку вайны — у Гатчыне пад Санкт-Пецярбургам (разам з мужам і бацькам Вінцэнтам Сяклюцкім, неўзабаве мабілізаваным у царскую армію). Толькі ўлетку 1915 г. Феліцыя вярнулася ў Стрэліцу.

Апісаны вышэй сядзібны дом у Стрэліцы быў спалены казакамі пры адступленні рускіх войскаў у канцы жніўня 1915 г. і ніколі больш не адбудоўваўся. Як успамінала дачка Вінцэнта Ванда, *«...на двор заехала казачая сотня. Яны адразу ж пачалі капаць траншэі па ўсёй даўжыні гаспадарчага двара і канфіскавалі ўсю жывёлу. 300-гадовая сядзіба з лістоўніцы была спалена...»*. Ад маёнтка засталіся руіны. Былі страчаны велізарныя каштоўнасці: сямейныя партрэты, старыя дакументы і бібліятэка. Акрамя сядзібы, таксама было знішчана каля дзясятка гаспадарчых будынкаў. Нягледзячы на пажар, не згарэлі «чваракі» (дом на чатыры сям'і), дзе жылі рабочыя. Потым жыхары чваракаў прымуць сваіх былых гаспадароў.

Агледзеўшы спаленую маёмасць, Феліцыя з чатырма дочкамі і настаўніцай паннай Ядвігай Шалевіч (пазней Славінскай) з'ехала са Стрэліцы. Яна знайшла сабе дах над галавой у маёнтку Семяжыцы каля Наваградка, які належаў сваякам Юндзілам. Потым сям'я Сяклюцкіх жыла ў маёнтку Ратошын, які таксама належаў сваякам Сяклюцкіх. Каля 1923 г. Вінцэнт Сяклюцкі паставіў новы драўляны дом (паводле іншай інфармацыі, перабудаваў у жылы дом мураваную стайню), і ўся сям'я вярнулася ў Стрэліцу. У 1929 г. Стрэліца мела толькі 400 га зямлі.

У 1933-м ва ўзросце 63 гадоў памёр, гуляючы са сваёй жонкай у карты, ад кровазліцця ў мозг гаспадар маёнтка Вінцэнт Сяклюцкі. Ён быў пахаваны на невялікіх могілках у Беразаўцы. Яго жонка Феліцыя на той момант мела 51 год.

* Гл: Stern Anatol. Dom Apollinaire'a: rzecz o polskości i rodzinie poety. Kraków, 1973.

Унук Вінцэнта Сяклюцкага Міраслаў Здановіч, які першыя 14 гадоў свайго жыцця правёў у Стрэліцы, успамінаў: *«Мне было 8 гадоў, калі Вінцэнт памёр. Такім чынам, мае ўспаміны — гэта ўспаміны малога дзіцяці. Вось некалькі малюнкаў з маёй памяці.*

*Мне 5 гадоў — Вінцэнт, трымаючы мяне за руку, вядзе вакол сталовай. Пахне тытунём, і я баюся.*

*Мне 7 ці 8 гадоў — Вінцэнт вядзе мяне ў стайню, каб паказаць, як сесці на каня. Ён выдатны вершнік, я захапляюся ім.*

*Ён грае на віяланчэлі цудоўную музыку, і я слухаю яго.*

*Вінцэнт быў як найменш сярэдняга росту. Ён трымаў сябе надзвычай прама і хадзіў, як атлет. Вочы меў цёмна-сінія, валасы светла-шэрыя, лоб высокі і агалены.*

*Ён быў задаволены сваім лёсам, любіў дзяцей, часта расказваў нам гісторыі і казкі.*

*Я думаю, у яго былі нейкія асаблівыя планы наконт мяне. Магчыма, яму здавалася, што так ці інакш я атрымаю ў спадчыну Стрэліцу. Можа быць, гэта толькі маё ўяўленне, але хто ведае?»*

Пасля смерці мужа Феліцыя Сяклюцкая падзяліла маёмасць паміж дочкамі: Ванда атрымала фальварак Прудзішча, Ядвіга — Польнае, Яніна — Багатэлі, малодшая з сясцёр — незамужняя Марыя — засталася з маці ў Стрэліцы. Восенню 1939 г. Феліцыя з унукамі і дочкамі Марыяй і Ядвігай уцякла ў Цэнтральную Польшчу. Памерла ў 1960 г.

А цяпер яшчэ раз пра крыж на месцы пахавання паўстанцаў 1863 г.

Сусед Сяклюцкіх Караль Лясковіч пісаў: *«У адлегласці 1,5 км ад Стрэліцы, у паўднёва-заходнім кірунку знаходзілася адзіная ў гэтай мясцовасці шляхецкая ваколіца Станкевічы. Паміж дваром і ваколіцай меўся высокі курган з крыжам на вяршыні — помнік 1863 г. Тут была агульная магіла паўстанцаў, палеглых у сутычцы з казакамі»*.

Пасля знаходкі гэтай інфармацыі на месца пахавання была зладжана экспедыцыя, і быў знойдзены той самы курган, дзе пахавалі паўстанцаў.

Да кургана вядзе добрая палявая дарога, але сам курган і зямля вакол яго не разараны. Знайсці рэшткі крыжа не ўдалося. Гэтая інфармацыя мела досыць шырокі распаўсюд праз незалежныя сродкі масавай інфармацыі і сацыяльныя сеткі, часткова спрыяла тое, што няўрымслівая журналісты знайшлі «прывід» каля месца пахавання паўстанцаў...

Праз адну з сацыяльных сетак да мяне звярнуўся Іван Аркадзьевіч Давідовіч (1958 г. н.), урач-неўролаг, інтэлігентны і высокаадукаваны чалавек. Ён нарадзіўся ў вёсцы Ігнаткаўцы, і хутары яго вёскі пераходзілі ў хутары засценка Станкевічы — тая мясцовасць родная для Івана Аркадзьевіча. Ён усё жыццё цікавіўся гісторыяй, чытаў і чытае шмат гістарычнай літаратуры, да таго ж многа размаўляў і размаўляе са старымі людзьмі, ды і яго бацька (1933 г. н.) — сапраўдны скарбец нашай гісторыі.

Дык вось, старыя людзі, якія нарадзіліся ў Ігнаткаўцах яшчэ на пачатку XX ст., у свой час расказвалі Івану Аркадзьевічу, што сутычка паміж паўстанцамі і казакамі

адбылася каля населенага пункта Ваенполь — мясцовая легенда нават звязвала назву «Ваенполь» ці «Вайнаполе» менавіта з той сутычкай, але вядома, што Ваенполь існаваў ужо ў XVIII ст. Гэта не так істотна, бо сутычка паміж паўстанцамі і казакамі магла адбыцца і наўпрост каля Стрэліцы.

Фальварак Ваенполь (які каля Ігнаткаўцаў) і засценак Станкевічы ляжалі каля старажытнага гасцінца Мыто — Голдава — Жалудок, гэтак апісанага ў вопісе Жалудоцкай парафіі 1784 г.: *«[Дарога] ад Ліды да Жалудка <...> ад Жалудка на карчму ў Жушме, дзе ёсць мост на рацэ Лебяда, з Жушмы праз Ходараўцы (вёска яснавяльможнага пана Валовіча, Слонімскага маршалка), каля Беразаўца (яснавяльможнага пана Шукевіча, капітана) і двор Стрэліца (яснавяльможнага пана Сяклюцкага) <...> адсюль трэба ехаць на Голдава (яснавяльможнага пана Важынскага), з Голдава да Радзівонішак (яснавяльможных паноў Нарбутаў), з Радзівонішак да Мыто (яснавяльможнага пана Паца)»*.

Калі сутычка адбылася каля Ігнаткаўцаў, дык забітых паўстанцаў па старажытным гасцінцы адвезлі да кургана, які знаходзіўся на зямлі маёнтка Стрэліца, і там пахавалі. Калі ж сутычка адбылася каля Ваенполя Стрэліцкага, забітых нікуды вазіць і непатрэбна было, пахавальны курган быў зусім блізка. Сутычка, магчыма, сталася вынікам засады паўстанцаў на нейкі расейскі атрад ці пошту. Па ўсім відаць, што паўстанцы з поля бою не ўцякалі, а спакойна хавалі сваіх забітых. Значыць, перамога была за імі. У метрычных кнігах бліжніх праваслаўных цэркваў маглі б быць запісы пра пахаванне расейцаў на нейкіх тутэйшых могілках, бо тады расейцы сваіх забітых нікуды не вывозілі, а хавалі на полі бою ці недалёкіх могілках, але пакуль нічога падобнага не знаходзілі.

Іван Аркадзьевіч яшчэ каля 1970 г. асабіста сам бачыў той крыж на кургане. Ён памятае, што зарослы бэзам драўляны крыж быў бачны здалёк, і раней пра яго добра ведалі ўсе мясцовыя людзі. Памятае гэты крыж на кургане каля Стрэліцы і яго родная сястра Ганна Аркадзьеўна Фунт (1961 г. н.), і, канешне ж, яго бацька.

Трэба ўлічваць, што ўладальнікам маёнтка Стрэліца ў час паўстання быў Вінцэнт Сяклюцкі, які калі наўпрост не прымаў удзел у паўстанні, дык спачуваў яму. Пра іншыя рэпрэсіі супраць Сяклюцкіх, акрамя канфіскацыі Гарнастаішак, невядома, але смерць Вінцэнта Сяклюцкага ў 1864 г. выклікае пэўныя пытанні.

Іван Аркадзьевіч Давідовіч таксама расказаў, што ў 1950-х гадах з Сібіры ў засценак Станкевічы вярнуўся толькі адзін чалавек, але выжыла значна больш жыхароў гэтага старога шляхецкага асяродка — усе астатнія з Сібіры адразу ж з’ехалі ў Польшчу. Па словах Давідовіча, ад Стрэліцы ў той час засталіся толькі гаспадарчыя пабудовы.

14 красавіка 2019 г. беларускія актывісты ўзнавілі крыж паўстанцам Кастуся Каліноўскага на кургане ў былым фальварку Стрэліца на Лідчыне.

**Маёнткі Касцянёва і Паперня**

У XI ст. ва Усходняй Еўропе інтэнсіўна праходзіў працэс фармавання сярэднявечных адміністрацыйна-палітычных адзінак «земляў» ці «княстваў», паміж імі ішла барацьба за палітычныя прыярытэты і эканамічныя сферы ўплываў, за гандлёвыя шляхі і новыя тэрыторыі, што адлюстравана на старонках летапісаў. У памежных

раёнах гарадзішчы з'яўляліся вартавымі памежнымі цвердзямі. Адным з такіх умацаваных паселішчаў на тэрыторыі гістарычнай Лідчыны было гарадзішча каля вёскі Касцянёва.

Археолагі Сяргей Піваварчык і Генадзь Семянчук пішуць пра гэтыя гарадзішчы Касцянёва і недалёкае ад яго Кульбачына (на беразе ракі Астрынкі): *«Іх умацаваная плошча складае каля 1 га. Абарончыя збудаванні маюць вялікую магутнасць — вышыня валоў 4–5 м. Побач з гарадзішчамі знойдзены сляды селішчаў. Раскопкамі выяўлены культурны пласт магутнасцю да 1,2 м. Аналіз рэчавага матэрыялу паказаў, што помнікі ўзніклі ў канцы X — пачатку XI ст. Пляцоўкі гарадзішчаў былі забудаваны наземнымі зрубнымі дамамі (Кульбачына) і паўзямлянкамі (Касцянёва). Знаходкі на гарадзішчы Кульбачына наканечнікаў стрэл, дзідаў, бляхі ад тарчы дазваляюць сцвярджаць, што гэты помнік узнік як памежная вартавая цвердзь. Знаходкі жорнаў, прасліц, рыбалоўных кручкоў, касцяных праколак, касцей свойскай жывёлы сведчаць аб тым, што насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай і промысламі. У верхніх пластах гарадзішча знойдзены пацеркі (шкляныя і з бурштыну), шкляныя бранзалеты, шпора з рапейкай. Гэта дае падставы гаварыць аб тым, што паселішча з другой паловы XII ст. пачынае змяняць сацыяльную функцыю і набываць рысы феадальнай сядзібы, што з'яўлялася вынікам феадалізацыі грамадства. На гарадзішчы Касцянёва таксама знойдзены наканечнікі стрэлаў, жалезныя вырабы (нажы, рэшткі замка́, шыла), косці свойскай жывёлы. У XIII ст. абодва гарадзішчы загінулі ў агні. Знішчэнне іх хутчэй за ўсё звязана з падзеямі 1252 г., калі валынскія князі “плениша всю землю Новогородьскую”»*.

Вядомы савецкі археолаг В. Сядоў атаясамліваў летапісны Вевярэск з гарадзішчам каля вёскі Касцянёва і лічыў, што назва старажытнага горада паходзіць ад гідроніма — ракі Вавёркі (левы прыток ракі Лебяды). В. Сядоў меркаваў, што горад загінуў у выніку нашэсця ў XIII ст., а частка ўратаваўшыхся жыхароў заснавала сучасную Вавёрку за 18 км ад гарадзішча ля Касцянёва. Аднак наступныя археалагічныя пошукі на месцы гэтага гарадзішча выявілі знаходкі больш позняга часу — XV–XVII стст. Таму археолагі перасталі звязваць летапісны Вевярэск з гарадзішчам каля вёскі Касцянёва.

Дакладна вядома, што першым уладальнікам маёнтка Касцянёва (як часткай вялікага маёнтка Дзітва, ці Рулевічы) быў Януш Касцевіч падляшскі ваявода, радуньскі намеснік, уладальнік Начы, дзяржаўца Ожскі і Пераломскі. Бясспрэчна, што менавіта ад першага ўладальніка Януша Касцевіча атрымала назву і яго маёмасць — Касцянёва, тэрыторыя якой на момант надання, верагодна, была толькі лесам і неапрацаваным полем.

Пра род Касцевічаў вядома не шмат. Бацька Януша Касцевіча — Станька Касцевіч, у 1485–1498 гг. — ковенскі староста, з 1492 г. — гаспадарскі маршалак. Станька Касцевіч упершыню згадваецца як каралеўскі дваранін у спісе палонных 1454 г. пасля бітвы пад Хацінам. Пасля гэтага ён выступае як сведка ў дакуменце 1464 г. Марціна Гаштаўта. Памёр каля 1498 г. Звесткі пра паходжанне адсутнічаюць. Браты Станькі — Алехна, згаданы ў некалькіх дакументах сярэдзіны XV ст., і, магчыма, Якуб. Паходжанне і імя жонкі таксама не высветлены. Станька Касцевіч меў сыноў Вацлава і

Яна (Януша) і дачку Сусану з ордэна францішканаў-тэрцыярыяў. Цікава, што акрамя Касцянёва сям'я мела яшчэ і маёмасць з падобнай назвай Касцяневічы ў Ашмянскім павеце.

Невядома, калі Касцевічы страцілі маёнтак Дзітва разам з Касцянёвам.

Ян Кастравіцкі меў у заставе за 60 000 злотых вялікі маёнтак Дзітва, часткай якога былі Касцянёва і Паперня (як і Радзівонішкі, Вавёрка, Дылева і г.д.). Маёнткамі Дзітва, Вялікае Мажэйкава і Ішчална на Лідчыне валодалі Вішнявецкія; ад Кацярыны Яўгеніі Вішнявецкай з роду Тышкевічаў Дзітва перайшла да Канстанціна Крыштафа Вішнявецкага, які 21 чэрвеня 1668 г. прадаў за 40 000 злотых Дзітву сынам Яна, наваградскаму стольніку Самуэлю і лідскаму мечніку Габрыэлю Кастравіцкім. Дадам, што Вішнявецкія, здаецца, ніколі стала на Лідчыне не жылі, і гэтыя маёнткі для іх былі толькі часткай велічэзнай маёмасці.

Вядома, што на пачатку XVII ст. вялікім маёнткам Дзітва, ці Рулевічы, над ракой Дзітвой валодалі Тышкевічы. У дыярыушы мсціслаўскага ваяводы Яна Тышкевіча ад 1625 г. пад назвай «Умовы са Швецыяй» знаходзім шмат падрабязнасцяў, датычных перасылкі ў той час урадавай карэспандэнцыі паміж маёнткам Дзітва, дзе жыў ваявода, і Варшавай, месцам знаходжання караля Жыгімонта II.

Для пераправы цераз Дзітву з даўніх часоў будавалі масты. Самы стары з іх ужо існаваў у 1392 г., ён быў пабудаваны на шляху з Жырмунаў да Васілішак, насупраць Рулевічаў. Мост на вялікай дарозе з Васілішак да Ліды ў Мыто вядомы з канца XV ст.

Трэба адзначыць, што Касцянёва ляжала на «Каралеўскім тракце» — артэрыі, якая злучала дзве сталіцы — Вільню і Кракаў (потым Варшаву), на галоўнай дарозе ў нашым краі таго часу. Ужо ў першай палове XV ст. дарога Кракаў – Вільня ў ваколіцах Нёмана мела два варыянты: адзін — з Ваўкавыска наўпрост на Эйшышкі, другі — з-пад Свіслачы праз Дубну і Новы Двор на Васілішкі і Эйшышкі. У першым варыянце тракт ішоў праз Шчучын і далей праз Касцянёва на Васілішкі, у другім — недалёка ад Касцянёва. Канешне ж, гэта падвышала каштоўнасць Касцянёва для ўладальнікаў гэтай маёмасці.

У 1690 г. Касцянёвам ужо валодаў Стэфан Францкевіч, маёнтак налічваў 102 дымы. З падымнага рэестра 1729 г. даведваемся, што Касцянёва належала ўжо двум Францкевічам: *«Ян Стэфан Радзімінскі Францкевіч, стараста Трабскі з маёнтка Касцянёва, яго частка <...> пяцьдзясят дзевяць дымоў. Ян Марцін Радзімінскі Францкевіч, падстолі мазырскі з Касцянёва, яго частка пасля падзелу Галавічполя з Баярамі — дваццаць два з паловай дымы. Гурнофель, дваццаць адзін дым».*

Наступнымі вядомымі нам уладальнікамі Касцянёва з'яўляліся Александровічы герба «Косы». З гэтага роду былі лідскі кашталян Францішак Александровіч, які памёр пры канцы XVIII ст., а таксама гродскі пісар, а потым лідскі маршалак Міхал Александровіч, *«муж шляхетны і праведны, не было ў павеце такіх праблем, якімі б ён не займаўся».* Калі шведы наклалі на павет кантрыбуцыю з нагоды ваеннага спусташэння, якой землеўладальнікі не маглі выплаціць, дык ён заплаціў кантрыбуцыю гатоўкай, якую дастаў са сваёй скарбонкі. І гэта пры тым, што і яго маёмасць была знішчана.

12 снежня 1756 г. у Лідзе ён у прысутнасці земскага пісара Францішка Александровіча і лідскага гродскага пісара Самуэля з Кастравіц Кастравіцкага падпісаў акт пераносу піярскага калегіума з Воранава ў Ліду.

У 1784 г. Касцянёва ўсё яшчэ належыць Александровічам.

Вядома, што ўжо з XVI ст. Кастравіцкія мелі ўладанні на Лідчыне, а ў XVII ст. займалі розныя пасады ў ВКЛ, галоўным чынам у Менскім і Мсціслаўскім ваяводствах. Вядомы віленскі генеолаг Часлаў Малеўскі паведамляў, што ў Расійскай імперыі Кастравіцкія пацвердзілі сваё шляхецтва 21.01.1799. У канцы XVIII ст. яны валодалі на Лідчыне Перапечыцай, Мажэйкавам, Паперняй, Кавалямі і Касцянёвам.

Вышэй узгаданы Самуэль Кастравіцкі, лідскі лоўчы і гродскі пісар, купіў маёнтак Мажэйкава ў князя Агінскага, а Васілішскае староства — у Яна Сцыпіёна. Самуэль Кастравіцкі быў жанаты з Барбарай Сяклюцкай. Сужэнцы мелі трох сыноў: Казіміра, Ануфрыя і Ігната. Казімір — шамбелян каралеўскага двара, цыбарскі стараста, Ігнат — генерал-ад'ютант, кавалер ордэна св. Станіслава.

Скажу трошкі пра сыноў Казіміра Кастравіцкага. Сын Казіміра Рамульд Кастравіцкі, маршалак Лідскага павета ў 1828–1843 гадах, кавалер ордэна св. Уладзіміра 4-й ст., уладальнік Мажэйкава, яго брат Самуэль — віца-маршалак, капітан артылерыі польскіх войск у адстаўцы, кавалер ордэна св. Станіслава, а трэці брат Геранім — маршалак Слонімскага павета, уладальнік маёнтка Падолле.

Кавалер ордэна св. Станіслава Ігнат Кастравіцкі, які потым стаў генералам артылерыі, ажаніўся з Александравічоўнай і стаў першым з Кастравіцкіх уладальнікам Касцянёва.

У 1792 г. суд павятовай канфедэрацыі па скарзе пана Караля Лясковіча, уладальніка Вавёркі, за звычайны суседскі эксцэс асудзіў Ігнацыя Кастравіцкага, генерал-ад'ютанта Яго Каралеўскай Мосці і кавалера ордэна св. Станіслава, уладальніка Паперні, на некалькі тыдняў «вежы». Кастравіцкі для адбыцця кары прыбыў у Ліду і звярнуўся да гродскага намесніка, каб той вызначыў месца, дзе можна адбыць «вежу». Калі намеснік адказаў яму, што ў Лідзе няма адпаведнага месца, дык Кастравіцкі зрабіў так жа, як і іншыя прыгавораныя рабілі ў такіх выпадках: за ўласныя грошы наняў пакой у кляштары лідскіх піяраў і там адбыў «вежу». Традыцыя адбыцця пакарання «ў вежы» калегіума піяраў (насамрэч у кляштарным пакоі) з'явілася з моманту адкрыцця калегіума і пратрымалася да ўпадку Рэчы Паспалітай.

Пасля 1815 г. на Лідчыне ў Касцянёве пасяліўся адстаўны капітан Тадэвуш Касцюшка — пляменнік знакамітага генерала Тадэвуша Касцюшкі. Тадэвуш-пляменнік — сын Юзафа Касцюшкі і Францішкі з Свідэрскіх, 15-гадовым хлопцам у лістападзе 1794 г. уступіў жаўнерам у войска паўстанцаў, але паўстанне, якім кіраваў ягоны дзядзька, ужо дагарала. Паўторна, старшым сяржантам, уступіў у польскі легіён у 1806 г. У 1807 г. атрымаў чын падпаручніка і быў паранены пры асадзе Гданьска. У 1808 г. стаў паручнікам 5-га палка пяхоты Варшаўскага княства. У 1809 г. ваяваў супраць Аўстрыі і ў 1811 г. стаў капітанам. У 1812 г. ваяваў пад Дынабургам у 2-й брыгадзе Міхала Радзівіла. У 1813 г. трымаўся ў пякельна доўгай абароне Гданьска. У 1815 г. перайшоў у 6-ы полк пяхоты Кангрэсовага Варшаўскага каралеўства і ў тым жа годзе ў Млаве напісаў вялікаму князю Канстанціну рапарт аб адстаўцы з-за слабага здароўя і хатніх праблем. Памёр капітан Касцюшка ў Пінску. Відавочна, што генерал Кастравіцкі быў баявым сябрам беднага капітана — пляменніка вялікага Касцюшкі.

Пасля напалеонаўскіх войнаў Ігнат Кастравіцкі перасяліўся ў Вену. У Касцянёве застаўся яго сын Самуэль (1788–1859), які быў жанаты з Ганнай Залескай. Пасля смерці

бацькі Самуэль таксама эміграваў у Вену, дзе нарадзіліся яго дочкі Мялання і Юлія, а таксама сын Люцыян (1816–1867), які потым вучыўся ў знакамітай французскай вайсковай школе Сен-Сір.

Адзін з апошніх на Лідчыне Кастравіцкіх — Ян (ці Ян Люцыян) Кастравіцкі — пісаў: *«Наш прадзед Самуэль, бацька Мяланні, Юліі і Люцыяна, быў сынам генерала артылерыі Ігната Кастравіцкага, удзельніка маскоўскай кампаніі Напалеона. На Лідчыне ён валодаў маёнткамі Кавалі, Паперня і Касцянёва, таксама валодаў і нейкім маёнткам на Палессі. Жаніўся з паннай Залескай з Валыні. Праўдападобна, з-за падзей 1812 г. Ігнат Кастравіцкі выехаў у Вену і набыў там палац.*

*Усе дзеці Самуэля атрымалі старраннае выхаванне і адукацыю, сын Люцыян вучыўся ў Французскай вышэйшай вайсковай школе, а дочкі былі прынятыя ў двор жонкі Напалеона Марыі Людвікі, якая пасля 1814 г. разам з сынам Напалеона, герцагам Рэйхштацкім, вярнулася да сваіх бацькоў у Аўстрыю. Вядома, што Мялання і Юлія былі вельмі прыгожымі дзяўчатамі».*

Абедзвюм сваім дочкам Самуэль Кастравіцкі даў добрае выхаванне, веданне моў, гісторыі, літаратуры, музыкі і жывапісу. Сёстры былі прыняты ў аўстрыйскі двор, дзе аказаліся ў атачэнні жонкі Напалеона Марыі Людвікі, маці сына Напалеона, князя Рэйхштацкага (1811–1832) (так званага «Арляняці»). Ва ўзросце 18 гадоў, пры невядомых акалічнасцях, Мялання Кастравіцкая зацяжарала і была адаслана ў Італію, дзе нарадзіла сына, імя якога невядома. Дзіцё выхоўвалася за кошт Кастравіцкіх, але пад апекай Ватыкана. Мялання потым вярнулася ў Вену і жыла ва ўспадкаваным ад бацькі палацы, пад канец жыцця яна стала манашкай. Ёсць меркаванне, што слынны французскі паэт Гіём Апалінэр (Кастравіцкі) быў сынам гэтага таямнічага сына Мяланні і Анжалікі Кастравіцкай (дачкі Міхала), якая паходзіла з іншай лініі Кастравіцкіх. Такім чынам, Гіём Апалінэр, верагодна, з'яўляецца ўнукам «Арляняці» і Мяланні Кастравіцкай і таксама праўнукам Напалеона.

Адзін з апошніх уладальнікаў Касцянёва, сын Люцыяна — Марцін Кастравіцкі, у 1903 ці 1904 г. расказаў свайму сыну Яну Люцыяну пра радавод сям'і: *«Цётка бацькі і мая бабуля Мялання Кастравіцкая, тады ўжо старая, жыла ў Вене ва ўласным доме па адной з галоўных вуліц горада, назву якой я не памятаю. Але гэта быў палац сям'і Кастравіцкіх, і жыла там графіня Кастравіцкая. Бацька быў трошкі здзіўлены, бо наша сям'я не мела ніякага тытула. <…> пасля смерці майго бацькі, атрымаў ад яго сястры (сваёй цёткі) шэраг сямейных дакументаў, і сярод іх т. зв. генеалагічнае дрэва. Яно было намаляванае на пергаменце сотню гадоў таму, дакумент меў дату, але я яе ўжо не памятаю. Дакумент быў падпісаны царыцай Кацярынай і Рапнінам і пацвярджаў права на шляхецтва і герб «Байбуза».*

*Калі мой бацька наведаў сваю цётку ў Вене, тая была ўжо ў манаскім строі — у чорным габіце з вялікім крыжам з масіўным ланцугом на грудзях. Бацька некалькі дзён пагасцяваў у цёткі, наведаў могілкі з сямейным склепам Кастравіцкіх. Там былі пахаваны бацькі Мяланні і яе сястра. Там жа была пахавана Фанні Эльслер (Fanny Elssler) — вядомая венская балерына.*

*Дом-палац у Вене, дзе жыла цётка майго бацькі, быў багата мэбляваны, цётка мела шмат служкаў: парцье, камердынер, некалькі асоб жаночай службы, яна была заможная асоба. Магчыма, бацька атрымаў ад цёткі нейкую карысць для свайго маёнтка.*

*Цётка падаравала пляменніку некалькі сваіх партрэтаў, свайго бацькі і сваёй сястры, а таксама яе дзеда і яшчэ кагосьці з нашых продкаў у латах і з паголенай галавой. Партрэты былі добрага пэндзля, я магу пра гэта меркаваць, бо потым некалькі гадоў вывучаў мастацтва. Сярод карцін быў абраз св. Францішкі добрай работы…*

*Акрамя карцін, бацька атрымаў некалькі старасвецкіх куфраў дзіўнага выгляду: абабітых скурай і акутых жалезам і меддзю. У куфрах захоўвалася шмат карэспандэнцыі і старых дакументаў, некалькі тэчак з гравюрамі, малюнкамі, акварэлямі і вялікая колькасць партрэтаў, якія былі хоць і не ў рамах, але нацягнутыя на дошкі. На некаторых з іх на адвароце меліся надпісы: “Рымскі кароль” ці “Герцаг рэйхштацкі”. Таксама ў куфрах ляжалі копіі абразоў з Сіксцінскай капліцы, з якіх найлепшым з’яўляўся малюнак галавы св. Пятра. Захоўвалася ў куфрах і карункавая вопратка, шалі і нават жаночыя танцавальныя пантофлі… Мяланння сказала, што хоча прыбраць з сваіх вачэй усё, што злучае яе са светам, што нагадвае ёй не толькі пра добрае, але і пра злое… Пасля яе смерці мы даведаліся, што свой венскі палац цётка запісала касцёлу.*

*Гэтыя дары бацька прывёз дахаты, партрэты былі развешаны ў пакоях маёнткавага дома ў Касцянёве, а куфры пастаўлены ў адмысловы замкнуты склад на паддашку.*

*Маёнтак Касцянёва быў маёмасцю майго дзядзькі Самуэля, бацькавага брата, які стала жыў у Рызе і працаваў там галоўным архітэктарам, а мае бацькі з дзецьмі ў Касцянёве бавілі вакацыі».*

Падчас візіту ў Францыю рускі цар (Аляксандр I ці Мікалай I) прыехаў у Французскую вайсковую акадэмію Сен-Сір, дзе даведаўся пра брата Мяланні і Юліі Люцыяна Кастравіцкага. Цар загадаў этапаваць яго ў Беларусь. Люцыян пехатой пад канвоем прыйшоў на радзіму, але замест турмы патрапіў пад амністыю. Тым не менш выезд у Еўропу яму быў назаўсёды забаронены.

Праблемы дзяцей — Мяланні і Люцыяна — прывялі да таго, што Ганна Залеская кінула сям’ю і з’ехала на Валынь. Толькі праз шмат гадоў яна вярнулася ў Вену, каб там памерці.

Яе муж Самуэль Кастравіцкі ў Вене пазнаёміўся з слыннай балерынай Фанні Эльслер, якая выступала на лепшых еўрапейскіх сцэнах таго часу. Каханне паміж імі захоўвалася ўсё жыццё, і калі балерына памерла, дык яе пахавалі ў сямейным венскім склепе Кастравіцкіх.

Былы навучэнец акадэміі Сен-Сір Люцыян Кастравіцкі пасля вяртання на радзіму ажаніўся з лідскай падкамаранкай Юзэфай Сяклюцкай. Яны мелі чацвёра дзяцей: Вінцэнта, Самуэля, Марціна і Ганну. Сям’я жыла не ў Касцянёве, а ў Паперні. Кастравіцкім у той час належалі Паперня з 3000 га зямлі, якая была галоўнай сядзібай, Вавёрка з 6000 га, Кавалі з 3000 га, Касцянёва з 3750 га. Трошкі раней, як пасаг за Казіміру Кастравіцкую, якая выйшла замуж за Аляксандра Брахоцкага, ад Кастравіцкіх адышло Малое Мажэйкава. Такім чынам, у першай палове XIX ст. зямельныя ўладанні Кастравіцкіх складаліся з 17 000 га зямлі. Трэба сказаць, што ў другой палове XVIII ст. Кастравіцкія былі калятарамі Маламажэйкаўскай царквы, і пра каля-

тара гэтай царквы, шамбеляна каралеўскага двара і цыбарскага старасту Казіміра Кастравіцкага, нават складзена «чорная легенда» (якую я падрабязна прааналізаваў у сваёй кнізе пра гэтую царкву*).

З 1832 па 1850 год Люцыян Кастравіцкі прадаў Кавалі, Вавёрку і Паперню — 2/3 сваёй маёмасці — і ўсе грошы перавёў сёстрам Мяланні і Юліі. Чаму Люцыян, маючы сваіх дзяцей, перавёў грошы сёстрам (хоць па тагачасных законах, наадварот, ён, як мужчына, павінен быў успадкаваць 3/4 маёмасці сям'і), з'яўляецца тайнай. Потым самі Кастравіцкія лічылі, што грошы былі патрэбны на выхаванне ўнука Напалеона. Паступова ў Люцыяна Кастравіцкага засталося толькі Касцянёва.

З-за няпростага лёсу Люцыян Кастравіцкі меў шмат дзіўных звычак. Напрыклад, ён заўсёды насіў 1000 рублёў — вялікія па тым часе грошы. Гэтыя 1000 рублёў Кастравіцкі разам з нейкімі дакументамі трымаў у адмысловым скураным ворку на плячах пад бялізнай і таму заўсёды меў выгляд гарбуна. Калі яму даводзілася выкарыстаць частку грошай і «капітал на спіне» памяншаўся, Люцыян Кастравіцкі моцна нерваваўся, пакуль зноў не папаўняў гэты запас да звыклай сумы ў 1000 рублёў. Родныя разумелі, што гэты надзвычай інтэлігентны чалавек усё сваё жыццё быў гатовы пакінуць родны кут, гатовы да дэпартацыі ў Сібір. Засталося таямніцай, якія дакументы Люцыян насіў з сабой за плячыма: падчас самазабойства нікога з родных каля яго не было, а паліцыянты, якія забралі цела нябожчыка, знялі з яго скураны ворак і не вярнулі не толькі грошы, але і паперы.

Дзеці Люцыяна мелі наступны лёс: сын Вінцэнт абраў вайсковую кар'еру ў расійскай арміі, Самуэль вывучаў архітэктуру ў Дэрпце, дзе пазней стаў галоўным архітэктарам, Марцін стаў электратэхнікам.

Пасля смерці Люцыяна ў Касцянёве нядоўга жыў Марцін Кастравіцкі (1855–1905), але неўзабаве ён разам з жонкай пераехаў у Варшаву. Наступным гаспадаром Касцянёва стаў яго старэйшы сын Станіслаў (1881–1918), а пасля яго малодшы сын Ян Люцыян (1889–1967), які быў апошнім уладальнікам маёнтка. Дарэчы, дзедам Яна Люцыяна з боку маці быў уладальнік Бердаўкі Захватовіч, якому пасля паўстання 1863 г. загадалі прадаць свой маёнтак на працягу 48 гадзін.

Згодна з сямейным паданнем Кастравіцкіх, Александровічы мелі ў Касцянёве вялікі двухпавярховы палац з лістоўніцы, які быў знішчаны ў часы Паўночнай вайны. З уцалелага бярвення была пабудавана афіцына, якая стаяла да Другой сусветнай вайны. Таксама з часоў Александровічаў захаваўся мураваны будынак, які датаваўся XVII ст. Гэты будынак згарэў, але быў адноўлены ў канцы XIX ст. Паводле падання, яго будавалі масоны і ён павінен быў стаць месцам збору ложы. З іншых паданняў, Александровічы пабудавалі яго як жылы дом, пасля чаго стары палац стаў афіцынай.

Мураваны будынак стаяў паблізу былога палаца і перпендыкулярна яму. Ён ўяўляў сабой прастакутнік даўжынёй 24 метры. З тыльнага боку месціўся ўезд у шырокі калідор піўніцы, а з другога, супрацьлеглага, знаходзіўся ўваход у калідор жылога паверха. Пляцоўка за домам з боку парку ляжала на 1 метр ніжэй, чым пляцоўка перад домам. Сцены дома былі выкананы з вялікіх, абчэсаных з аднаго боку камянёў, абліцаваных знутры цэглай. Таўшчыня сцен перавышала 1 метр. У сценах

* Гл: Лаўрэш Л. Л. Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс. Гродна, 2017. С. 47–57.

знаходзілі шмат дымаходаў, у якіх не было слядоў сажы, гэта маглі быць часткі старой сістэмы абагрэву гарачым паветрам. На такую думку наводзілі рэшкі вялікай печы ў піўніцы. Адбудаваны дом накрылі ламаным гонтавым дахам. З фронту палаца быў дабудаваны ганак з чатырма калонамі.

Ян Люцыян Кастравіцкі пісаў: *«Люцыян Кастравіцкі жыў у часовым доме, а руіны старога дома чакалі, пакуль яго сын Самуэль закончыць курс архітэктуры ў Дэрпцкім універсітэце і пачне працаваць па прафесіі. Самуэль адбудаваў стары дом і пакрыў яго мансардавым, ламаным дахам. Пра тое, як доўга гэты дом быў закінуты, казалі дрэвы, якія раслі сярод руінаў, ствалы дасягалі ўжо 40–50 см дыяметрам. Дом стаяў так, што з галоўнага фасада ўваход вёў у жылыя пакоі, а з задняга фасада — у піўніцы, якія былі пад усім домам. Старыя піўніцы дома захаваліся без пашкоджанняў і паслужылі фундаментам пры адбудове. Скляпенні паднябенняў піўніц, выкананыя з цэглы, мелі вышыню ў 3 м. Вокны піўніц месціліся высока і былі закратаваныя жалезам. У цэнтры піўніц мелася аблямаваная каменем старая студня.*

*Сцены адбудаванага дома былі выкананы з вялікіх камянёў і мелі таўшчыню 1,5 метра. У сярэдзіне дома ішоў калідор, і па абодва бакі ад яго былі 22 пакоі, вышыня столяў у пакоях — 3–3,5 м.*

*Мясцовая легенда казала, што ранейшы дом будаваўся для масонскай ложы (людзі казалі — для "збору"), і таму можна зразумець сэнс расказу пра тое, што з гэтага дома "перакідвалі кельні" (масонскія знакі) у Шайбакпольскі дом, які знаходзіўся на адлегласці за некалькі кіламетраў і тады яшчэ будаваўся. Верагодна, у Шайбакполі павінна была паўстаць новая ложа…»*

Ян Люцыян Кастравіцкі пераказваў сямейную легенду пра тое, што ў свой час масоны выклялі ўвесь род Кастравіцкіх — усе дзяўчаты гэтага роду павінны былі мець пазашлюбных дзяцей. Вядома, што ў 1817 г. ложа «Паходня Поўначы» звярнулася да літоўскай правінцыяльнай ложы «Дасканалая Еднасць» з лістом, у якім даводзіла апошняй, што чляднік ложы Самуэль Кастравіцкі перастаў удзельнічаць у пасяджэннях і браты даведаліся, што ён нават пачаў насміхацца з масонаў. Было вырашана схіліць яго да супакаення. Выкліканы на сход, Кастравіцкі сказаў, што не можа належаць да масонаў, бо рымскі папа забараніў гэта, а калі ён уступаў у ложу, дык не ведаў пра забарону. Потым, у сваім пісьмовым адказе масонам, Кастравіцкі паведаміў, што, як рыма-католік, не можа быць масонам. Самуэль Кастравіцкі ў 1820 г. быў выкраслены са спіса менскай ложы вольных муляраў з забаронай прымаць удзел у сходах.

Ян Люцыян Кастравіцкі пісаў, што яго аднакласнік Станіслаў Садкоўскі быў гадаванцам вядомага віленскага мецэната і адваката Урублеўскага, які быў, бадай што апошнім віленскім «шубраўцам»*: *«Ён прывёў мяне ў дом мецэната. У размове з намі Урублеўскі сказаў мне: "Ведаеш, што твае продкі былі вядомымі масонамі?"*

---

* Шубраўцы — сябры літаратурна-грамадскага таварыства ліберальна-асветніцкага кірунку, якое існавала ў Вільні ў 1817–1822 гг. Падобна, Урублеўскі хацеў аднавіць дзейнасць таварыства.

*Праз пэўны час упісаў мяне ў спіс “шубраўцаў” і расказаў пра мэты і абавязкі сяброў гэтага таварыства»*.

Але вяртаемся да апісання дома ў Касцянёве.

Ян Люцыян Кастравіцкі пісаў: *«Калі дзед Люцыян прадаў маёнткі Кавалі і Паперню, ён пакінуў дом у Паперні, які насамрэч быў не домам, а сапраўдным палацам, і пасяліўся ў Касцянёве. Руіны старога жылога дома маёнтка Касцянёва знаходзіліся на другім баку дарогі Васілішкі — Шчучын ад часовага дома. Руіны атачаў лес, і да старога дома вяла шырокая, ліпавая алея. Ліпы былі пасаджаны так густа, што ўтваралі сапраўдную сцяну, праз якую можна было толькі з цяжкасцю праціснуцца. Ліпы стваралі сапраўдны тунэль і, калі цвілі, давалі вельмі моцны пах»*.

Сядзібны дом меў вялікія сенцы. Управа быў уваход у сталовую, за сталовай месціліся яшчэ два малыя пакоі. Улева меўся ўваход у чатыры жылыя пакоі. Усе пакоі франтальнай часткі палаца разам з сенцамі ўяўлялі сабой адну суцэльную анфіладу. Большасць гэтых пакояў яшчэ мела дзверы ў цэнтральны калідор, у які трэба было сысці з пакоя ўніз па прыступках. З сенцаў наўпрост, таксама па прыступках, можна было ўвайсці ў вялікі салон, які меў форму квадрата. Управа ад салона месціліся дзве гасцінныя, а за імі буфетны пакой, кухня і г. д. Улева з салона меўся ўваход у бібліятэку, за якой ішлі жылыя пакоі.

Да Першай сусветнай вайны дом меў багаты інтэр’ер і каштоўную мэблю, якую часткова вывезлі ў Вену. Асаблівай каштоўнасцю ў доме лічыўся фатэль, выкананы з разьбянага дубу, ён быў такі шырокі, што маглі сесці адразу два чалавекі. Стаяў фатэль на дзвюх разбяных калонах, а над яго спінкай мелася тарча з гербам Кастравіцкіх, сядзенне і спінка былі абабіты аксамітам. Таксама цікавымі былі камода на тры шуфлядкі з выгнутай пярэдняй часткай, інкруставанай каштоўным дрэвам і бронзай, канапа з чырвонага дрэва, якая стаяла на бронзавых ільвіных нагах, столік з чырвонага дрэва з устаўкамі з эбенавага дрэва, вялікі круглы стол, крэсла з эбенавага дрэва і іншае. Мелася тут і некалькі цікавых гадзіннікаў, сярод іх насценны, васьміграннны, памерам 90 на 90 см. Ён біў гадзіны такім нізкім тонам, як быццам быў вежавым. Іншы гадзіннік у доме меў алебастравы корпус, аздоблены пазалочанай бронзай, ён стаяў на падстаўцы ў форме століка. Апрача гэтых, у палацы былі яшчэ два гадзіннікі: з пазалочанай бронзы на чатырох ножках і шафны. Сярод іншых цікавых рэчаў меліся розныя вялікія каштоўныя падсвечнікі.

У адбудаваным доме было багата living рознага посуду: парцалянавыя сервізы, адзін з іх з англійскага фаянсу пачатку XVIII ст., сталовы крышталь і срэбра. Меліся цікавыя дамскія шкатулкі, адна з іх, з чырвонага дрэва, з вечкам, інкруставаным золатам, перажыла ўсе ваенныя завірухі. На вечку была гербавая тарча з надпісам «Марыя Кастравіцкая, 1782, чэрвень, 15».

Кастравіцкія валодалі значнай калекцыяй жывапісу. Да самых каштоўных належалі сямейныя партрэты, сярод іх партрэты мсціслаўскага стражніка Габрыэля Кастравіцкага, намаляванага ў вобразе рыцара ў латах, палкоўніка гусарскай харугвы часоў каралёў Міхала Карыбута Вішнявецкага і Яна III, шамбеляна Ануфрыя Кастравіцкага, генерала Ігната Кастравіцкага, Люцыяна Кастравіцкага, Марыі з Залескіх, а таксама невядомых асоб венскага двара першай паловы XIX ст.

Да гэтай групы належалі і чатыры жаночыя партрэты: маладой, прыстойнай асобы ў вячэрнім строі з дэкальтэ і другі — больш старой жанчыны ў строі манашкі з крыжам на шыі. Гэта былі партрэты Мяланні Каструвіцкай у розным узросце. Трэці партрэт — выява ў профіль маладой дамы, апранутай у цёмна-бэзавую сукню ў паскі. Гэта быў партрэт сястры Мяланні — Юліі Каструвіцкай. Чацвёртым партрэтам быў партрэт слыннай танцоркі Фанні Эльслер. Усе гэтыя карціны мелі вялікія памеры і з'яўляліся працамі таленавітых майстроў. Сярод сямейных партрэтаў меўся таксама выкананы вугалем партрэт Самуэля Каструвіцкага — бацькі Мяланні і Юліі.

Паколькі дом Каструвіцкіх у архітэктурным сэнсе не ўяўляў цікавасці, знаўцы пабудоў двара вылучалі так званы «белы домік», пабудаваны ў класічным стылі тагачасных сядзібных дамоў. Калі быў пабудаваны гэты мураваны дом, невядома, магчыма ў другой палове XVIII ст. Ён меў атынкаваныя белыя сцены і высокі гонтавы дах. Над галоўным уваходам быў порцік на дзвюх калонах, якія трымалі паўдашак.

У сенцах «белага доміка» насупраць уваходных дзвярэй стаяў вялікі камін, які замыкаўся жалезнымі дзвярыма. Усе пакоі — сталовая, кабінет і два салоны — былі абабіты ўзорыстай тканінай і ўпрыгожаны печкамі з каляровай кафлі, кафля гэтая, верагодна, паходзіла з руін палаца Александровічаў і датавалася XVII ст. У кабінеце кафлі печкі мелі раслінны чырвоны арнамент на бледна-блакітным фоне, у будуары была кафля крэмавага колеру з раслінным арнаментам белага і блакітных адценняў. Таксама з руін палаца Александровічаў паходзілі і металічныя часткі печак. Падлогі ў пакоях былі зроблены з лакіраванага дрэва, а ў салонах — з паркету. У часы, калі Каструвіцкія жылі ў Паперні ці Вене, «белы домік» служыў кватэрай для эканомаў маёнтка. Да нашага часу «белы домік» не захаваўся...

Ад двара Александровічаў да нашага часу засталася ўязная брама. Яна стаяла ў канцы доўгай каштанавай алеі ці нават тракту, які зігзагам праходзіў праз сядзібу і далей бег па грэблі над ставам, абсаджаным вербамі і вольхамі. Гэты тракт злучаў мястэчкі Шчучын і Васілішкі. Брама складалася з дзвюх моцных атынкаваных квадратных калон. Абедзве калоны мелі багата прафіляваныя гзымсы. На абедзвюх калонах былі выявы герба «Байбуза».

Палац атачаў вялікі парк, галоўнай аздобай якога была ліпавая алея даўжынёй каля 1 км, ліпы мелі вышыню да 50 м. На распілах ліп бачна, што дрэвы мелі ўзрост каля 340 гадоў. З аднаго боку ад алеі рос сад, а з другога парк. На самым ускрайку парку раслі некалькі старадаўніх дубоў. З паўднёва-ўсходняга боку парк быў абсаджаны бэзам, з боку вёскі Касцянёва — жоўтай акацыяй.

Уладальнік маёнтка Марцін Каструвіцкі памёр у 1905 г., і пасля яго засталіся венскія дакументы ў куфрах. Але яго сын Ян Люцыян Каструвіцкі працяглы час не меў доступу да дакументаў, бо ў маёнтку Касцянёва, дзе захоўваліся гэтыя паперы, гаспадарыла яго мачыха. Толькі пасля пачатку вайны 1914 г. мачыха выехала на сваю радзіму, на Любельшчыну, і Ян разам з братам атрымалі доступ да дакументаў. Але браты не мелі часу чытаць паперы і толькі з куфраў пераклалі дакументы, малюнкі і карціны ў скрыні і запакавалі іх.

У 1914 г. маёнтак Касцянёва складаўся з чатырох фальваркаў агульнай плошчай у 1600 га раллі і 1340 га лесу.

Пачалася Першая сусветная вайна...

У 1915 г. у маёнткавым доме Касцянёва стаяў штаб рускага корпуса, і таму Яна Люцыяна Кастравіцкага з жонкай выселілі ў адзін з малых пакояў. Яго брат прыняў на сябе адміністраванне маёнткам Стрэліца, які належаў іх сваяку Сяклюцкаму, бо Сяклюцкія пакінулі дом і перасяліліся на Любельшчыну, дзе жыла мачыха Яна Кастравіцкага (гаспадар Стрэліцы быў жанаты з сястрой мачыхі Яна). Менавіта ў той час, калі ў Касцянёве стаяў рускі штаб, увесь архіў разам з багатай бібліятэкай Кастравіцкіх быў вывезены ў маёнтак Стрэліца, які ляжаў удалечыні ад вялікіх дарог, сярод багністых лугоў і лясоў. Тут, у Стрэліцы Сяклюцкіх, і былі закапаныя куфры з паперамі Мяланні Кастравіцкай: яе лісты, дакументы, некалькі тэчак з гравюрамі, малюнкі, акварэлі і вялікая колькасць партрэтаў, намаляваных алейнымі фарбамі (на адваротным баку гэтых партрэтаў меліся надпісы «Кароль рымскі» ці «Герцаг рэйхштацкі»), і іншыя сямейныя дакументы. Але, адступаючы, рускія войскі палілі маёнткі, і хутка стала зразумела, што ў Стрэліцы таксама небяспечна. Высокапастаўленыя рускія афіцэры казалі, што яны спыняць нямецкі наступ на Нёмане, і таму мастацкія зборы і архівы, якія належалі абодвум маёнткам — Касцянёву і Стрэліцы, былі перавезены ў маёнтак Сеняжыцы на Наваградчыне, а тое, што вывезці не ўдалося, брат Яна Кастравіцкага аднаасобна вывез у лес і закапаў.

У канцы лета 1915 г. рускія войскі сілком пагналі Яна Люцыяна Кастравіцкага ў бежанства, а потым, нягледзячы на звальненне са службы па стане здароўя, яго мабілізавалі ў армію. Ягоны брат застаўся ў Стрэліцы, дзе і памёр падчас нямецкай акупацыі. Таму ніхто не ведае, куды зніклі ўсе каштоўныя мастацкія зборы і архівы двух маёнткаў. Магчыма, са сховішча ў Сеняжыцах усе рэчы вывезлі немцы, але архіў, закапаны недзе пад Стрэліцай, гэтак і не быў знойдзены.

Калі Ян Кастравіцкі ў 1918 г. вярнуўся з Расіі, жылы дом у Касцянёве стаяў цалкам разгромлены — без вокнаў і дзвярэй, і толькі адзін пакой знаходзіўся ў адносна добрым стане — падчас вайны ў ім жыў нямецкі капрал, які кіраваў гаспадаркай (насамрэч ён быў не немец, а паляк з-пад Познані).

Апошні ўладальнік суседняга маёнтка Малое Мажэйкава Андрэй Брахоцкі пісаў: *«…у Кастравіцкіх застаўся толькі маёнтак Касцянёва, які ў мае дзіцячыя гады меў каля 2000 га. Гаспадарыў там Ян Люцыян Кастравіцкі — меў ён вялікія, але нерэальныя планы. Гэта давяло да таго, што, калі я вярнуўся ў Малое Мажэйкава* (у 1932 г. — *Л. Л.*), *Касцянёва мела ўжо меней за 100 га, а ўладальнік кудысьці эміграваў, пакінуўшы тое, што засталося ад маёнтка, жонцы з двума малымі сынамі».*

Некалькі слоў пра сямейны склеп Кастравіцкіх на могілках Ішчалны. Ян Люцыян Кастравіцкі ў 1920-я гг. пахаваў тут свайго маленькага сына і пакінуў наступнае апісанне: *«Пасля таго, як была адсунута пліта, якая замыкала ўваход, я ўбачыў досыць вялікія лёхі. Наўпрост ад увахода на цаглянай падлозе былі бачны падэшвы скураных ботаў з халявамі, з якіх выглядалі косткі ног, а далей ляжаў цэлы шкілет з чэрапам. Шкілет дзе-нідзе быў пакрыты кавалкамі сукна і нейкай срэбнай стужкай. Труны не было, яна збуцвела і рассыпалася ў прах, які быў бачны паміж костак шкілета. Па левым баку ад шкілета дзеда стаяла замкнутая труна яго жонкі і*

*маёй бабулі, якая добра захавалася. Імя бабулі было бачна на таблічцы, якая абапіралася аб ніз гэтай дубовай труны. З правага боку было вольнае месца, але я не жадаў далёка заходзіць, і таму маленькую труну майго сынка я паставіў каля ног яго прадзеда».*

У 1930–2002 гадах у доме Кастравіцкіх знаходзілася Касцянёўская школа.

З успамінаў былога дырэктара школы Родзевіч Соф'і Андрэеўны: *«Да верасня 1939 г. тут была польская школа, пазней — руская. Дырэктарам школы ў 1939 г. быў Магер Люцыян Аляксандравіч. У гады вайны школа была зачынена, аднавіла сваю працу толькі ў 1945 г. Дырэктарам школы ў пасляваенныя гады была Каскевіч, пазней — Эсфіра Аляксандраўна Болтач».*

— У час існавання школы, — успамінае настаўніца біялогіі Ганна Міхайлаўна Шостак, — у парку можна было праводзіць экскурсіі і ўрокі біялогіі. Тут багаты і разнастайны раслінны свет, шмат першацветаў. А нарцысы растуць па ўсім парку. Многа птушак. А ў той год, калі закрывалі нашу школу, гракі чамусьці не прыляцелі. Мо адчувалі, што дрэвы старыя і віць гнёзды на іх небяспечна. З тых часоў і не гняздуюцца тут…

Да гэтага часу засталіся пяць злучаных паміж сабой каналамі сажалак, у якіх гаспадары маёнтка займаліся вырошчваннем экзатычных відаў рыб, у тым ліку і стронгі. Сажалкі напаўняюцца вадой з крыніц, побач працякае рэчка Касцянёўка.

У 2011 годзе я разам сынам, тады яшчэ студэнтам, уважліва вывучаў дом у Касцянёве і, канешне ж, не мог не звярнуць увагі на вялікія падзямеллі пад домам. Чамусьці закінутая сядзіба пашырала вакол сябе невытлумачальную трывогу і неспакой, як быццам не хацела пускаць мяне ў свае муры і заклікала з'ехаць...

**Пра маёнтак Паперня**

Вядома, што рэчка Вавёрка цякла з малога возера, якое знаходзілася каля вёскі Навасады, і ўпадала ў Лебяду насупраць Бешанкаў. Перад Лебядой раней мелася вялікая грэбля, якая стварала вялікі стаў. У гэтым месцы здаўна знаходзіўся маёнтак Малая Вавёрка, якім у XVIII ст. валодалі князі Вішнявецкія. Інвентар Дзітвянскага ключа, да якога належала Малая Вавёрка, складзены ў 1653 г., паведамляе: *«Пад тым фальваркам вялікі стаў, на якім паперня і млын, выплачана за іх паўтараста злотых»*. Праз нейкі час ад гэтай паперні атрымаў назву двор і вёска Паперня.

У сярэдзіне XVIII ст. князь Крыштаф Вішнявецкі (1635–1686), будучы падляскі, брацлаўскі і белзскі ваявода, заклаў маёнтак Паперня Яну Кастравіцкаму, мсціслаўскаму скарбніку. У 1668 г. сыны Яна Кастравіцкага Габрыэль і Самуэль выкупілі княскія землі. Такім чынам, Паперня ад князёў Вішнявецкіх перайшла да Кастравіцкіх герба «Байбуза».

Ад наваградскага стольніка Самуэля Кастравіцкага Паперня перайшла яго сыну Вацлаву Кастравіцкаму, а затым унуку, гродскаму пісару, а потым лідскаму лоўчаму Самуэлю Кастравіцкаму, жанатаму з Барбарай Сяклюцкай. У вавёрскім касцёле захаваўся абраз Маці Божай з дзіцем. На срэбнай сукенцы — родавыя гербы Кастравіцкіх «Байбуза» і Сяклуцкіх «Кушаба». Барбару Сяклуцкую пахавалі ў віленскім

касцёле Святога Духа, дзе можна знайсці мемарыяльную табліцу, якую ўсталяваў яе сын ад першага шлюбу Канстанты Рыла.

Пасля смерці Самуэля Кастравіцкага Паперня належала яго сыну Ігнату, каралеўскаму генерал-ад'ютанту, удзельніку кампаніі Напалеона.

Наступным уладальнікам Паперні быў сын Ігната Самуэль Кастравіцкі. Ён атрымаў у пасаг за жонку Залескую з Валыні статак чыстакроўных арабскіх коней, для якіх пабудаваў у Паперні цікавы будынак стайні, аздоблены порцікам на калонах; архітэктурна стайня гарманізавала з жылым домам.

Праз нейкі час у Паперні жыў сын Самуэля Люцыян Кастравіцкі. Каля 1860 г. ён прадаў Паперню Слізням. У акце продажу маёнтка было запісана, што ў выпадку, калі Слізні, у сваю чаргу, вырашаць прадаць гэтую маёмасць, дык Кастравіцкія будуць мець прыярытэтнае права выкупіць Паперню (1000 га раллі і лясоў) за тыя ж грошы, за якія яны яе прадалі — за 200 000 рублёў золатам. Гэта ўмова павінна была быць дзейснай на працягу 100 гадоў пасля продажу маёнтка.

Новы ўладальнік маёнтка цешыўся ім не доўга. За падтрымку паўстання 1863 г. Слізня прымусілі прадаць Паперню расійцам Петуховым. У 1910-х гадах уладальнік Паперні калежскі дарадца Аляксандр Віктаравіч Петухоў працаваў членам Віленскага акруговага суда (на выязных сесіях быў і старшынёй суда) і жыў у Вільні па адрасе: вуліца Манастырская, свой дом № 15. Але яго жонка, хоць і была запісана па віленскім адрасе, насамрэч жыла ў сваім маёнтку, бо ў той час Кацярына Пятроўна Петухова ўваходзіла ў папячыцельскі савет Лідскай прыватнай жаночай гімназіі. Верагодна, у гэтай гімназіі вучылася дачка Петуховых.

Той жа сусед Паперні Андрэй Брахоцкі пісаў: *«Паперня перайшла ў рускія рукі і <...> там гаспадарыла пані Петухова, яе дзейнасць у асноўным палягала ў спусташэнні і продажы маёнтка па кавалках».*

На пачатку Першай сусветнай вайны Петуховы прадалі маёмасць нейкаму Клімовічу. Для абедзвюх гэтых сям'яў маёнтак быў толькі крыніцай хуткіх даходаў, і таму пры іх гаспадаранні палац ператварыўся ў руіны, а каштоўны парк быў высечаны і прададзены на драўніну. У 1913 г. ад парку засталіся рэшткі маладых дрэў, а жылой заставалася толькі малая частка палаца. Ян Люцыян Кастравіцкі наведаў Паперню ў 1913 г., але тагачасная ўладальніца маёнтка Петухова пусціла яго толькі ў салон і не дазволіла агледзець цалкам спустошаны палац.

Вядома, што да зруйнавання палац меў форму прастакутніка, у цэнтральнай частцы ён быў двухпавярховы, а па краях аднапавярховы. Да цэнтральнай двухпавярховай часткі прылягаў порцік на чатырох іанічных калонах. На трыкутным шчыце порціка, сярод упрыгожання з тынкоўкі ў выглядзе расліннага арнаменту, вылучаўся герб «Байбуза». Акрамя гэтага, шчыт порціка ўпрыгожвалі дзве каменныя вазы, устаноўленыя сувосева з крайнімі калонамі. Над галоўнымі ўваходнымі дзвярыма быў невялікі балкон. Палац меў вялікія прастакутныя вокны, упрыгожаныя абрамаваннем і трыкутнымі вальмамі. З боку парку, сіметрычна ўваходнаму порціку, меўся рызаліт з тэрасай.

За ўваходнымі дзвярыма ў палац знаходзіўся хол-салон з падлогай з кафлі. З салона ўлева і ўправа багата дэкараваныя дзверы вялі ў жылыя пакоі з ляпнінай на столі і падлогамі з каштоўнага дрэва. Чвэрць салона месцілася ў рызаліце і была аддзеле-

на ад астатняга хола дзвюма іанічнымі калонамі. Сцены салона ўнізе былі пакрыты драўлянымі панэлямі, вышэй іх мелася ўпрыгожанне са стукі (штучнага мармуру). Шырокі фрыз каймаваў салон каля столі, падзеленай на кесоны. Выкшталцона выглядалі дзве круглыя печкі з ліловай кафлі, увенчаныя шырокімі белымі вазамі, падобнымі на тыя, якія стаялі на порціку. З салона праз зашклёныя дзверы можна было выйсці на тэрасу, за якой рос прыгожы парк. Заўважу, што падобныя будынкі ў стылі класіцызму з'явіліся ў Беларусі дзякуючы італьянскаму архітэктару Карла Спампані (каля 1750 — 1783). І насамарэч, сын апошняга ўладальніка маёнтка Ішчална Караль Ляскові́ч пісаў, што жылы дом у Ішчалне праектаваў той самы архітэктар, які праектаваў і будаваў палац у Паперні, *«падобна, гэта быў італьянец, прозвішча яго страчана»*. Верагодным фундатарам палаца быў Ігнат Кастравіцкі.

Парк у лепшыя гады займаў некалькі дзясяткаў гектараў і, падобна, быў цалкам агароджаны плотам з ажурнай цэглы з высокімі мураванымі і атынкаванымі слупамі. Да ўязной брамы вяла алея са старых клёнаў. Перад палацам — паміж брамай і стайняй — меўся вялікі, на некалькі гектараў, траўнік, які паступова паніжаўся да вялікага става. Паміж палацам і ставам раслі бярозы, яны не перашкаджалі бачыць з палаца супрацьлеглы бераг става і лес за ім. Над ставам стаяў дастаткова вялікі мураваны млын. На гэтым месцы калісьці была папяровая фабрыка, ад якой і атрымала назву мясцовасць.

У 1920-я гады архіўныя дакументы з маёнтка Паперня тагачасныя гаспадары прадалі лепшаму гісторыку Лідчыны XX ст. Міхалу Шымялевічу — і, у тым ліку дзякуючы і гэтаму чалавеку, мы ведаем гісторыю Касцянёва і Паперні.



ЛЕАНІД ЛАЎРЭШ

нарадзіўся 1 сакавіка 1963 года ў Лідзе. Скончыў электратэхнічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1985). Па адукацыі інжынер. Стваральнік гістарычна-краязнаўчага сайта pawet.net. Сталы аўтар газеты «Наша слова», часопісаў «Лідскі летапісец», «Маладосць», «Гістарычнага альманаха» і розных навуковых зборнікаў. Аўтар больш за 200 артыкулаў і 10 кніг, у тым ліку «Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне» (2012), «Паўстанчы дух. 1812, 1831, 1863 гады на Лідчыне» (2016), «Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс» (2017), «Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы» (2017), «Генерал, які дайшоў да Беларусі. Жыццяпіс Кіпрыяна Кандратовіча» (2018), «Шпацыры па старой Лідзе» (2020) і інш. Жыве ў Лідзе.

# Дэбют

## Літаратурнаму клубу «Катарсіс» — 25

Літаратурны клуб «Катарсіс» пры Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце — практычна адзінае моладзевае літаратурнае аб’яднанне на Гарадзеншчыне. У 2024 годзе нам — чвэрць веку!

Студэнты-медыкі ў вольны ад вучобы час пішуць вершы, прозу, публіцыстыку, збіраюцца разам, каб абмеркаваць свае творы, паралельна вывучаюць тэорыю вершаскладання і пабудовы празаічнага твора. Прыемна адзначыць, што іх мэтанакіраваная праца над удасканальваннем сваіх мастацкіх твораў прыносіць станоўчыя вынікі. Сяброў «Катарсіса» друкуюць «ЛіМ», «Маладосць», «Медыцынскі веснік», «Звязда». Ужо не адзін год нашы аўтары бароняць гонар Гродзенскай вобласці на рэспубліканскім конкурсе маладых паэтаў. Раз на два гады праводзіцца Рэспубліканскі літаратурны конкурс сярод студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. У 2022 годзе мы атрымалі 22 дыпломы пераможцаў і прызёраў конкурсу ў розных намінацыях. Гэта другі вынік у рэспубліцы, хаця мы, трэба адзначыць, не гуманітарная вышэйшая навучальная ўстанова. «Катарсіс» штогод і сам праводзіць адкрыты літаратурны конкурс, у якім прымаюць удзел аўтары з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Польшчы, Расіі, Германіі. Клуб выдаў пяць калектыўных літаратурных зборнікаў, апошні з якіх называецца «Глыток натхнення».

Сёння мы прапануем чытачам некалькі твораў сяброў «Катарсіса». Добрых уражанняў!

*Віктар Варанец,*
*кіраўнік літаратурнага клуба «Катарсіс»*

## КАЦЯРЫНА ДЗЕЖЫЦ

* * *

З дзяцінства ў памяці куток,
Дзе шчасце з раніцы да ночы,
Дзе грэе бацькавы парог
І дзе маё маленства ходзіць.

Я тут сустрэну новы дзень —
І сэрца радасна заб’ецца.
Пакліча івы ўтульны цень,
І Нёман хваляй засмяецца.

Усё мне роднае да слёз,
Схаваць пачуцці я не ў сілах.
Мне б дакрануцца да нябёс,
Расправіўшы за спінай крылы!

На жаль, у будняй мітусні
Пра хараство забыцца мусім.
Ды пранясём праз нашы дні
Сваю любоў да Беларусі.

## АРЦЁМ ПАЛУДЗЕНЬ

### Буслы

З хваляваннем, з пяшчотаю мілаю
(Пачуццё як сваё перадаць?)
Назіраю штогод я, як з выраю
Зноў буслы на радзіму ляцяць.

Вось ляцяць над знаёмай мясцінаю,
Над палеткамі водзяць кругі…
Зноў спатканне з любімай радзімаю,
Сустракае іх край дарагі.

Тут заўжды і паветра духмянае,
І бярозавы гай, і лугі,
Так знаёмае ўсё і жаданае,
Тут няшчасцяў няма і тугі.

Клёкат птушак мне песняю шчыраю,
З ім не страшны любы ператрус,
Калі бусел вяртаецца з выраю,
На святую зямлю — Беларусь!

## ДЗІЯНА ТРАЦЯК

### Пакажы мне жыццё

Пакажы мне жыццё дасканалае,
Што чакаем, нібы дару Божага.
Што ні разу нікім не зламанае,
Не парушана сілай варожаю.

Пакажы мне жыццё, таго вартае,
Каб пражыць яго і не саромецца
Ні прад продкамі, ні прад нашчадкамі —
За ўсё тое, што намі тут робіцца.

Пакажы мне жыццё больш сапраўднае,
Чым гайсанне між працай і хатаю.
Тэлевізарам не змарнаванае,
Не разбіта бутэлькай праклятаю.

Ды не зваліцца з неба, як марыце,
Ні багацце, ні шчасце, ні рацыя.
Бо жыццё — што вы самі ствараеце
Сэрцам, розумам, плённаю працаю!

**МАКАР ПАШКЕВІЧ**

## Шум за зачыненымі дзвярыма

— Такім чынам, спадар Янот, у Старажытнай Індыі былі наступныя касты: брахманы, кшатрыі, вайша, шудры, — Вольга паглядзела ў вочы плюшавай ляльцы, потым пляснулася шчакою на стол і загаласіла. Але ўжо праз хвіліну дзяўчына са словамі «Занадта доўга» зноў вярнулася да чытання. Не сказаць, каб яна лічыла экзамен па філасофіі чымсьці бессэнсоўным, бо, як сказаў яе выкладчык на лекцыі, «Філасофія — гэта вам не дэмагогія, тут трэба ведаць!». Тым не менш цяпер яна з большай ахвотай мыла б ламелі старэнькіх жалюзі на акне насупраць стала. Прычым з абодвух бакоў.

— Хоць ты паспі за нас дваіх, — Вольга акуратна паклала янота на плюшавы жывот, каб ён не бачыў яе пакут. Потым раздражнёна ўздыхнула і спытала ў пустэчы: — Ну навошта вучыць касты старажытных індусаў?

Пустэча не адказала, і Вольга зноў зарумзала. Гэтым разам сур’ёзна. Што рабіць, калі вучоба не ідзе? Правільна! Паесці. Няшчасная студэнтка адправілася на маленькую кухню, каб забыцца ў абдымках любімага халадзільніка. Дажоўваючы трэці бутэрброд, яна зразумела, што, нягледзячы на позні вечар, прагне выкінуць смецце. І вось яна адна з пустым вядром пад прыгожым начным небам. Як жа тут лёгка дыхаецца! Век бы не вярталася дахаты. Нечакана захацелася гарбаты...

Калі ўсе важныя справы былі скончаны, а гадзіннік паказаў адзінаццаць, дзяўчына са слязамі на вачах і сталёвай упэўненасцю ў сваіх сілах вярнулася за стол. І тут за сцяной нечакана зараўла музыка. Электронная, але не тупая даўбежка, якой запоўнены клубы, а нешта цікавае: з тонкім налётам эстэтыкі васьмідзясятых і ноткамі душэўнай наіўнасці. Няйначай, у суседкі Ані вечарына. Наогул, Аня закатвае вечарыну раз на год, і Вольга не збіралася ісці ладзіць скандал. Але папрасіць крышачку паменшыць гук варта. Яна выйшла на лесвічную пляцоўку і аслупянела: прама пасярэдзіне паміж кватэрамі з нумарамі «95» і «96» аднекуль з’явіўся малюнак металічных дзвярэй, каля якіх стаяла не менш здзіўленая Аня. Але самым неверагодным было тое, што гукі музыкі даносіліся з-за гэтых дзвярэй.

— Прабач, я правільна зразумела? Гук ідзе адтуль? — асцярожна пацікавілася студэнтка.

— Ага, — матнула галавой суседка, не адводзячы вачэй ад намаляваных дзвярэй.

— Даруй, але я не ведаю, што мяне зараз больш палохае: што хтосьці намаляваў гэта хвілін за трыццаць ці што там нехта... жыве, — апошняе слова Вольга вымавіла з максімальнай асцярогай.

— Чаму адразу жыве? — абурылася Ганна. — Калі нам здаецца, што гук ідзе адсюль, яшчэ не значыць, што гэта так.

Дзяўчына прыклала вуха да малюнка, і яе вочы ўмомант пабольшалі:

— Гук сапраўды зыходзіць... знутры.

— Так, пачакай, — цяпер ініцыятыву ўзяла ў свае рукі Вольга. Яна задуменна хмыкнула, не заўважыўшы малюнка званка, і пастукала ў раёне вочка. Пачуўся гук бетоннай сцяны.

— Так, гэта абсалютна дакладна сцяна, а гэта, — яна тыкнула пальцам у дзверы, — абсалютна дакладна малюнак.

— Калі ласка, скажы, што гэта не адной мне здаецца трызненнем, — узмалілася Ганна.

— Ну, групавыя галюцынацыі магчымы толькі ў супольнасці людзей, мы ж сядзелі далёка адна ад адной, у кватэрах, — разважала Вольга. — Гэта не трызненне, а нешта іншае.

— Мне страшна, — змрочна вымавіла суседка.

— Баішся, што цябе запросяць да іх на тусу? — усміхнулася Вольга, але зразумела, што ёй таксама не па сабе. — Што будзем рабіць?

— Не ведаю... Заснуць я не змагу...

— Я таксама, — пагадзілася студэнтка. — І працягваць вучыць бессэнсоўна.

— Божухны, як жа мне становіцца жудасна, калі ўяўляю, што хто-небудзь з дзвярэй раптам выйдзе!

— Але ж трэба неяк даведацца, хто жыве за намаляванымі дзвярыма ў маім пад’ездзе, — сказала Вольга і тут жа схамянулася: — Матухны, што я нясу? Слухай, можа, нам здаецца... Збегай наверх і ўніз, правер, можа, музыка адтуль.

— А чаму я? — абурылася Аня.

— Добра, давай я пайду наверх, а ты ўніз, — прапанавала Вольга.

Суседка відавочна хацела зноў запярэчыць, але стрымалася і коратка кінула:

— Добра.

Вольга пакрочыла наверх. Думкі блыталіся, варта было ўявіць, што ж можа чакаць за дзвярыма. Ад выхаду з матрыцы да абуджэння прывязанай у псіхдыспансеры. Вось таму і трэба самой дакапацца да ісціны. А там пабачым. Яна рашуча націснула на кнопку званка. За дзвярыма пачуліся нейкія рухі, пасля чаго пранізлівы жаночы голас заверашчаў:

— Я зараз міліцыю выклічу, вар’ятка.

«Мабыць, занадта моцна пазваніла», — падумала дзяўчына і дадала ўжо ўслых:

— Прашу прабачэння. Не падкажаце, можа, вам чутная музыка знізу?

— Адзінае, што я зараз чую, — гэта твой гідкі голас, дурная! Ты час бачыла?!

— Яшчэ раз прабачце, — крыкнула Вольга наўздагон, зразумеўшы, што суразмоўца вярнулася ў глыб кватэры. Ну, калі хтосьці адзін не чуе, не значыць, што не чуюць усе, вырашыла Вольга і накіравалася да яшчэ адных дзвярэй.

— Толькі дакраніся да званка, я выйду і пырсну ў цябе пярцоўкай! — пачуўся раздражнёны голас, калі студэнтка падняла руку.

— Ой, а вы...

— Прэч! Хай толькі яшчэ раз пабачу цябе на сваім паверсе! Так-так! Я ведаю, дзе ты жывеш!

— Добра, — пагадзілася Вольга, накіраваўшыся да апошняй кватэры.

— Там ніхто не жыве! — пачулася з-за папярэдніх дзвярэй. — Прэч, алкагалічка!

Вользе нічога не заставалася, як пайсці прэч. І хай ёй нічога добрага не сказалі, даведалася дзяўчына сапраўды шмат. А менавіта: па-першае, суседзі зверху нічога не чуюць; па-другое (што куды важней), шум зыходзіць сапраўды з яе паверха. Вядома, быў яшчэ варыянт, што Ганна прынясе іншыя весткі, але Вольга ведала (спадзявалася), што не.

— Вось і ты, нарэшце, — дрыготкі голас Ганны гучаў аднекуль знізу. — Я чакала, пакуль ты спусцішся, бо мне зусім ужо ніякавата.

— Чаму не паднялася? — пацікавілася Вольга.

— А калі б яны адчыніліся?

На гэтае пытанне Вольга не ведала адказу. Дзяўчына паняцця не мела, як сама паступіць, адкрыйся загадкавы малюнак прама цяпер, і яе перастае забаўляць сітуацыя: занадта шмат загадкавага, занадта шмат чагосьці тагасветнага.

— Хадзем да мяне, — прапанавала Вольга, — вып’ем гарбаты.

— Не, дзякуй, не люблю хадзіць па чужых кватэрах, — адмовілася Ганна.

— Тады... добрай ночы? — няўпэўнена спытала студэнтка.

— Не-не-не, мы пойдзем да мяне, — хуценька адказала Ганна.

Кватэра дзяўчыны аказалася неверагодна чыстай і ўтульнай. Дзяўчаты прайшлі на кухню.

— Табе які чай? Зялёны, чорны? З цукрам? Без? — запытала гаспадыня.

— Зялёны, дзве лыжкі, — адказала Вольга.

— Фі, брыдота, — скрывілася суседка.

— Як ёсць, — паціснула плячыма студэнтка.

А вечарына ў сцяне і не думала заціхаць. Дзяўчыны выразна чулі вясёлыя крыкі маладых людзей, смех, музыку і, здаецца, звон шкла.

— Трымай сваю атруту, — Ганна падала кубачак.

— Калі са мной нешта стане, ты ў гэтым вінаватая, — усміхнулася Вольга.

— Мяне суд апраўдае. Ты п’еш зялёную гарбату з цукрам, пасля такога звычайна не жывуць…

Памяшканне напоўнілася прыглушаным, але шчырым смехам.

— Як ты думаеш, — Вольга адпіла чай, — можа, гэта ўрад праводзіць эксперыменты? Выпрабоўвае хімічную зброю?

— Не, — махнула рукой Аня, — хутчэй нашы кватэры праклятыя.

— Кім? Навошта? — Вольга не ўтрымала смяшок і падавілася напоем.

— Ну, твая мной, таму што занадта шумна, мая — табой, таму што занадта ціха.

Ганна падышла да сцяны, прыслухалася.

— Гукі змяняюцца, — казала яна.

— Што ты маеш на ўвазе?

— Я падумала, што калі там, усярэдзіне, нейкім цудам апынуўся прайгравальнік і яго нехта для нечага ўключыў, то гук павінен заставацца аднолькавым, але ён змяняецца па ходу ўсёй гэтай сцяны, — Ганна правяла пальцам да ўваходных дзвярэй. — У розных кропках розныя галасы, розная гучнасць музыкі і гэтак далей.

Раптам у кватэры запанавала цішыня.

— Усё, сціхла! — закрычала Ганна.

— Няўжо?! — Вольга прыпала да сцяны.

І праўда. Цішыня. Поўная. Нават дзяўчаты, мяркуючы па ўсім, забыліся дыхаць.

— У мяне такія змешаныя пачуцці… — зашаптала Аня.

— Гэта поўны аблом! — заверашчала Вольга. — Гэй! Свалата! Працягвайце, чым вы там займаліся?! Гэта несумленна!

— Яны альбо не чуюць, альбо іх не існуе, — па-філасофску заўважыла Аня.

— Яны існуюць! Яны павінны існаваць! Ідзём за мной.

Цішыня ў кватэры, цішыня ў пад’ездзе. Так, дзверы ўсё яшчэ раздражнялі сваёй намаляванасцю, але больш — сваёй маўклівасцю. Жудасная насмешка вышэйшых сіл. Засталося толькі міргнуць, і ўсё знікне. На гадзінніку смартфона тры гадзіны ночы, час праляцеў, бессэнсоўна праведзены абедзвюма. А як сённяшнія іспыты? А як вар’яцкая таямніца намаляваных дзвярэй?

— Добрай ночы, — суха прамовіла Вольга і, не дачакаўшыся адказу, ляснула дзвярыма.

Заснуць не не атрымалася. Яна не выключыла ні святло, ні камп’ютар, нават не распранулася. Цяжка паваліласяна ложак і нерухома праляжала тры гадзіны. Думкі змянялі адна адну, але сканцэнтравацца на нейкай адной не выйшла. Вольга паднялася ў шэсць раніцы з ачмурэлай галавой, з’ела гумовы бутэрброд і, прыхапіўшы торбу з падручнікамі, выйшла на лесвічную пляцоўку.

— Што за д’ябал?! — усклікнула дзяўчына, убачыўшы, як нейкі мужык у расшпіленым пухавіку зафарбоўвае намаляваныя дзверы зялёнай фарбай.

— Ой, добры дзень, — падхапіўся ён. — Вам не дужа перашкодзілі ноччу?

— Што? Не моцна... — Вользе здавалася, што суразмоўца гаворыць незнаёмаю моваю. Словы тыя ж, але сэнс іншы. — Ну, я не магла заснуць.

— Даруйце, — узмаліўся незнаёмец. — Гэтага дакладна больш не паўторыцца!

— А што тут, уласна кажучы, адбылося ?!

— А вось, трымайце, — ён працягнуў маленькую кардонку, выразаную спехам і ўручную візітоўку.

— Кватэры на суткі, — прабубнела Вольга, счытваючы тэкст.

— Ага…

Дзяўчына падняла вочы на мужчыну, паспрабавала спаліць яго позіркам, а калі не атрымалася, коратка спытала:

— Чаго?

— Разумееце, — пачаў незнаёмец, — метр жылой плошчы сёння дарагі. Прычым паўсюль: у цэнтры, на ўскраінах. Вельмі хачу займацца падобнай дзейнасцю, ну… здаваць кватэры на розны час, але няма грошай купляць стацыянарна. Даводзіцца выкручвацца.

— І вы малюеце іх? — удакладніла Вольга.

— Так.

— Гэта крута. І страшна.

— Дзякуй, — усміхнуўся мужчына, — тэлефануйце, калі што…

— Я паспрабую, — прашаптала Вольга.

* * *

— Гісторыя, вядома, цікавая, — уздыхнуў пажылы выкладчык. — Я шмат чаго чуў, але падобнае трызненне — вельмі вялікая рэдкасць.

Па ягоным абыякавым твары можна было лёгка сказаць, што старога нічым ужо не здзівіць, але калі бледная і спатнелая ад хвалявання студэнтка дастала крывую картку з вылінялым нумарам тэлефона ды ініцыяламі «В. У.», ён не вытрымаў і зарагатаў.

— Здала, добра, толькі за непахісную веру ў свае ідэі і жаданне ісці да канца. Але надалей вучыце.

Дзяўчына пакінула аўдыторыю разам са сваім аднагрупнікам, якому пашанцавала менш. Хлопец у нейкі момант перастаў старацца выцягнуць свой адказ і моўчкі слухаў яе абсурдную гісторыю.

— Ну ты выдала, старая! — засмяяўся ён і прысеў побач з Вольгай на лаўцы. Дзяўчына кінула злосны позірк на няпрошанага суседа, рэзка ўскочыла і пабегла прэч.

Чаму, як толькі хочаш нешта сказаць свету, свет зусім не слухае? А крыва напісаная, ужо з пацёртым надпісам візітоўка — адзіная твая зачэпка.

# Нашым юбілярам

Шчыра віншуем нашых калегаў-пісьменнікаў Рычарда Бялячыца, Валянціна Дубатоўку, Віктара Варанца, Леаніда Лаўрэша, Віктара Сазонава, Сяргея Чыгрына, Леанарду Юргелевіч з круглымі датамі! Жадаем моцнага здароўя, натхнёнага творчага плёну, поспехаў у працы і ў жыцці.

*Рэдакцыя альманаха і калектыў аўтараў*

## ВАЛЯНЦІН ДУБАТОЎКА

### Рычард Бялячыц — невыпраўны рамантык

Не адно стагоддзе інтэлектуальнае грамадства вядзе зацятыя спрэчкі, хто можа лічыць сябе творцам. Чалавек, які мае адпаведную адукацыю, з веданнем асноўных прынцыпаў напісання верша альбо стварэння музыкі і правільнага малявання пейзажа ці папросту таленавітая асоба з асаблівым станам душы, для якога настаўнік і прафесійнае навучанне з'яўляецца хутчэй нейкай недарэчнасцю, чым патрэбай.

Чалавеку, пра якога я хацеў бы сказаць колькі слоў, у гэтым годзе 75, і ён мае і тое, і другое. Рычард Станіслававіч Бялячыц, будучы ад нараджэння безумоўна таленавітым паэтам, мае яшчэ і адпаведную адукацыю. У яго за плячыма музычна-літаратурнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута Максіма Танка плюс працяглая праца ў рэдакцыях раённых газет «Астравецкая праўда» і «Дзянніца» (Шчучынскі раён). Але варта ўсё ж вярнуцца ў самы пачатак…

Нарадзіўся Рычард Станіслававіч 16 верасня 1953 года ў вёсцы Стаўбуры Астравецкага раёна, скончыў Варнянскую сярэднюю школу і згаданы вышэй педагагічны інстытут. Пасля заканчэння альма-матар ён прайшоў класічны шлях беларускага пісьменніка. Настаўнічаў у розных вясковых школах і іншых педагагічных установах Астравеччыны. У 1987 годзе пераехаў у Шчучын, дзе і надалей працягваў працаваць настаўнікам аж да выхаду на пенсію. Карацей, класічны шлях беларускага літаратара дваццатага стагоддзя.

Маё першае знаёмства з творчасцю Рычарда Бялячыца адбылося напрыканцы сямідзясятых, калі спадар Рычард друкаваўся ў «Гарадзенскай праўдзе», дзе літаратурнай часткай на той час загадваў Юрка Голуб. Менавіта ад Юрыя Уладзіміравіча я ўпершыню пачуў узнёслыя словы пра творчасць спадара Рычарда. Не было ніводнага месяца з той пары, каб Юрка не даваў у «Гродзенскай праўдзе» нізкі вершаў Рычарда Бялячыца. Многія аўтары там з'яўляліся перыядычна, але вось вершы спадара Рычарда былі на літаратурнай старонцы практычна заўсёды.

Што больш за ўсё — ад першых радкоў на старонках абласной газеты да апошніх яго кніг паэзіі — уражвае ў творчасці Рычарда Бялячыца? Каб так пяшчотна, узнёсла і непаўторна пісаць увесь час, трэба быць сапраўдным паэтам. У кожнага паэта бываюць розныя перыяды творчасці, але не кожны можа захаваць такі імпэт да жыцця, як гэта ўдаецца спадару Рычарду. Яго ўзнёслая паэтычная вобразнасць і ўяўленні ў адносінах да жанчыны ставяць яго ў першыя шэрагі творцаў высокай еўрапейскай культуры.

У спадара Рычарда выйшла багата кніг паэзіі («Сакавіцкае крыло», 1988, «Прасветлінка», 1995, «Міг выратавання», 2001, іншыя), але нельга было не заўважыць у чарговай кнізе «Вочы малітвы» (2005) нейкі больш рэалістычны, рацыянальна-ўзважлівы і ў нечым больш палемічны кірунак. У вершах таго часу праз аўтарскі боль і нервовасць тэматычна дамінавалі матывы асэнсавання рэчаіснасці. І можна было памылкова падумаць, што нават у такога рамантыка, як Рычард Бялячыц, зламалася нешта ў душы пад уплывам сённяшняга ўрбанізаванага часу, але праз год з’явілася новая кніга «Бераг маўчання» — і ўсё стала на сваё месца. Да чытача зноў вярнуўся той самы вечны рамантык. І гэта абсалютна нармальна, калі творца асэнсоўвае жыццё, як пражытае, так і надзённае. А жыццё, па-сутнасці, усяго толькі працэс, над якім не можа не рэфлексаваць творчы чалавек, тым больш паэт, а Рычард Бялячыц — сапраўдны паэт.

У 2020 годзе Рычард Станіслававіч Бялячыц за непаўторны ўклад у скарбонку беларускай літаратуры быў узнагароджаны літаратурнай прэміяй імя Анатоля Іверса.

Рычард Бялячыц сёння — гэта адзін з самых аўтарытэтных літаратараў Гарадзеншчыны. Яго кнігі паэзіі з’яўляюцца сапраўдным здабыткам беларускай літаратуры.

Хочацца пажадаць юбіляру творчых поспехаў, здароўя і, самае галоўнае, не згубіць свой непаўторны рамантызм, які ва ўсе часы любілі чытачы.

МІКОЛА КАНАНОВІЧ

## 65-я восень Сяргея Чыгрына

Мой зямляк і калега па пісьменніцкаму і журналісцкаму цэху Сяргей Чыгрын адзначае ў сёлетнім верасні сваё 65-годдзе. Адзначае ў любімым Слоніме на шмат разоў апісанай ім у краязнаўчых кнігах і журналісцкіх рэпартажах нашай роднай Слонімскай зямлі. Восень — яго любімая пара года, а верасень — ці не самы любімы месяц у годзе.

Так сталася, што прозвішча Сяргея Чыгрына я ведаў задоўга да асабістага знаёмства з яго носьбітам. Ведаў найперш па публікацыях у раённай газеце «За перамогу камунізму» (потым «Слонімскі веснік»), у «ЛіМе», «Маладосці» і іншай перыёдыцы. А наша першая сустрэча адбылася не ў Слоніме, а ў 708-м пакоі студэнцкага інтэрната БДУ № 7 на Кастрычніцкай вуліцы, 10-А ў Мінску. Было гэта восенню 1987 года, калі Чыгрын завітаў у госці да свайго сябра паэта Міхася Скоблы, які на той час толькі вярнуўся з савецкага войска і ўзнавіўся на другі курс філфака. Я ж тады толькі паступіў на філфак БДУ і жыў са Скоблам у адным пакоі. З той сустрэчы ўжо слаба што помніцца. Толькі напаўжартоўнае Скоблава: «І ты да гэтай пары не ведаў такога знакамітага ў Слоніме чалавека?!»

А вось другая сустрэча запомнілася выдатна. Ішоў я пагодным вераснёўскім днём 1992 года праз слонімскі скверык у цэнтры горада ці не ў першую гарадскую сталоўку перакусіць пасля шасці ўрокаў у мясцовай СШ № 8, куды ў тым годзе патрапіў працаваць настаўнікам беларускай мовы і літаратуры пасля заканчэння ўніверсітэта, а насустрач мне — Сяргей Чыгрын. А было мне ў тую першую слонімскую восень сумна і маркотна пасля бурнага сталічнага студэнцкага жыцця і акурат хацелася сустрэць каго з творцаў мясцовых, пазнаёміцца, але найперш якраз Чыгрына. І вось тая сустрэча. Сяргей Мікалаевіч працаваў тады ў «Слонімскім весніку», вёў там літаратурную старонку, таму адразу пасля вітання прапанаваў падрыхтаваць і адаслаць яму на адрас рэдакцыі падборку маіх вершаў. У той час я шмат пісаў і актыўна друкаваўся ў сталічных літаратурных выданнях, а вось у раёнцы публікацый дагэтуль яшчэ зусім не было.

Чыгрын у тую нашу першую слонімскую сустрэчу адчуў мой настрой і сказаў, што і ў яго пасля прыезду сюды на працу пасля вучобы было нешта падобнае і вельмі цягнула назад, у Мінск, але ён хутка адаптаваўся, і для мяне Слонім таксама стане найлепшым горадам у свеце. «Наш Слонім — старажытны горад з багатай еўрапейскай гісторыяй, але і сёння тут жыве шмат цікавых і цудоўных людзей, пазнаёмішся з імі — і сумна табе не будзе», — запэўніў мяне на развітанне Сяргей на сваёй дарозе паміж рэдакцыяй раёнкі і тэатрам, дзе таксама працаваў.

Сапраўды, у Слоніме тады жылі Анатоль Іверс, Васіль Супрун, Ірына Войтка, Рудольф Пастухоў, часта бываў Алег Лойка, прыязджалі Юрка Голуб, Алена Руцкая, Данута Бічэль-Загнетава з Гродна, мінскія пісьменнікі. Жыццё і тут віравала. І літаратурнае, і палітычнае, што я хутка зразумеў і адчуў. І дапамог мне ў гэтым найперш Сяргей Чыгрын той далёкай ужо восенню 1992 года. У тую ж восень у «Слонімскім

весніку» выйшла вялікая падборка маіх вершаў з рамантычным такім фотаздымкам... Гэтую публікацыю заўважылі нават мае тагачасныя вучаніцы са старэйшых класаў слонімскай восьмай школы.

А далей… Гэта Чыгрын паклікаў мяне на працу ў толькі што запачаткаваную Віктарам Валадашчуком «Газету Слонімскую» ў 1997 годзе, дзе ён ужо працаваў намеснікам галоўнага рэдактара. З таго часу так шмат было зроблена і перажыта разам: абурэнне і ўдзячнасць чытачоў, святы і будні, камандзіроўкі і стажыроўкі, падпісныя кампаніі і рэпартажы з раённых, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў, рэдакцыйныя святы, літаратурныя сустрэчы і фестывалі, але найперш праца і праца. А яшчэ кнігі Сяргея Чыгрына з аўтографамі і добрымі пажаданнямі. Дарэчы тут будзе ўзгадаць, што паэтычных, краязнаўчых, гістарычных, літаратуразнаўчых, публіцыстычных і кніг для дзяцей Сяргей Чыгрын выдаў за сваё жыццё каля сямі дзясяткаў. Толькі яго любімы пісьменнік-зямляк Алег Лойка сярод слонімскіх літаратараў пакуль пераўзыходзіць па колькасці выданняў Чыгрына.

А што сёння, калі няма ўжо таго маладога жыццёвага запалу, калі сталі гісторыяй (і часта небяспечнай) колішнія дасягненні ды, здаецца часам, жывем мы толькі надзеяй?..

А застаецца ўсё тая ж любоў і прага да жыцця, якая заўсёды перамагала і перамагае нянавісць і адчай. З такім настроем сустракае сваё 65-годдзе беларускі пісьменнік, краязнаўца і журналіст, мой старэйшы слонімскі сябра Сяргей Чыгрын.

«…Хоць я і “здзяцінеў”, але ж хочацца жыць і радавацца таму, што ёсць, што навокал нас», — напісаў мне сёлета ў аўтографе да сваёй дзіцячай кнігі «Згадка ад сінічак» Сяргей Чыгрын. І я жадаю табе, дарагі Сяргей, радасці і натхнення, новых кніг і сяброўскіх сустрэч, светлага вераснёўскага неба і шмат яшчэ верасняў у тваім жыцці.

З юбілеем!

**ЯНКА ТРАЦЯК**

## Віктар Варанец: штрыхі да творчага партрэта

Кожны аўтар, у дадзеным выпадку маем на ўвазе аўтараў альманаха «Новы замак», заслугоўвае ўважлівага прачытання і аб'ектыўнага аналізу сваёй творчасці спецыялістамі-літаратарамі, — так, як гэта робіцца ва ўмовах нармальнага літаратурнага працэсу. Але пакуль што атрымліваецца так, што літаратурная крытыка маўчыць і нашы паэты і пісьменнікі варацца ва ўласным соўсе і на свой страх і сваю рызыку выносяць творы напаказ пры адсутнасці ўдзячнай (няўдзячнай) рэакцыі з боку аўдыторыі чытачоў і тых жа крытыкаў. Пры такой сітуацыі радуе толькі адно: як бы там ні было, а творы назапашваюцца ад года ў год, і паводле іх можна меркаваць, наколькі аўтар самастойна, без падказак і дапамогі спецыялістаў «выплывае» на шырокія літаратурныя прасторы, а менавіта: адшліфоўвае майстэрства валоданнем словам і вобразам, выходзіць на свой стыль, манеру, знаходзіць свае тэмы і становіцца вядомым пісьменнікам не толькі ў межах свайго рэгіёну, але і ў маштабах усёй рэспублікі.

Менавіта такія надыходзяць думкі, калі звяртаешся да творчасці Віктара Варанца, з якім аўтар гэтых радкоў знаёмы больш за сорак гадоў.

Згадваецца першая палова 1980-х, калі група студэнтаў філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (аб'яднаных вакол Віктара, дзе ён быў душой калектыву) весела прамаўляла тосты з нагоды першых яго публікацый і, вядома, за кошт яго сціплых ганарараў, якія прыходзілі ад рэдакцый газет «Гродзенская праўда» і «Чырвоная змена», дзе друкаваліся апавяданні і вершы Віктара. Пасля тыя ж аб'яднаныя студэнты згуртаваліся вакол самвыдатаўскага літаратурнага часопіса «Містыка», рэдактарам якога і друкаром на друкавальнай машынцы быў усё той жа Віктар Варанец.

Трохі пазней Віктар выдаў зборнік гумарыстычных вершаў і пародый «Лёс беларуса» (1998), зборнік з іранічным, насмешлівым і сур'ёзным зместам, з элементамі таго, што сёння называецца сцёбам. У анатацыі да зборніка чытаем: «Ва ўласцівай яму манеры Віктар Варанец па-добраму смяецца над тымі недарэчнасцямі, якія акружаюць нас у штодзённым жыцці, з іншага боку стараецца паглядзець на ствараемы ў грамадскай свядомасці стэрэатып “памяркоўнага беларуса”».

Я долар зялёны ўчора купіў,
І гэтым, сябры, ганаруся.
А сёння той долар узяў ды згубіў —
Такі ўжо лёс беларуса.

*(Віктар Варанец. Лёс беларуса)*

Сёння, калі перачытваеш гэты зборнічак, з сумам прыходзіцца адзначыць, што прайшло чвэрць стагоддзя, а добра знаёмае застаецца нязменным:

…Вось жонка кліча, што ж, пайду пад’ем.
Зноў крупнік будзе, — і няма ўздыму,
Сын запытаў: «Што ж сумна так жывем?»
Такую маем мы, сынок, Радзіму.

*(Віктар Варанец. Лёс беларуса)*

У наступным зборніку — зборніку вершаў і прозы «Рамізнік» (2008) — аўтар пашырыў тэматыку, больш устойліва загучалі лірычна-рамантычныя матывы, часам яны пераклікаюцца з матывамі сацыяльнымі і жыццёвымі, у цэнтры якіх мітусіцца чалавек са сваімі вечнымі патрэбамі.

Зборнік «Рамізнік» стаў для аўтара той пераходнай з’явай, якая пацвердзіла заканамерны і апраўданы пераход ад паэта-насмешніка да сур’ёзнага і ўдумлівага празаіка.

Што да сцвярджэння Віктара Варанца ў прозе, дык тут трэба вартае аддаць літаратурнай старонцы газеты «Звязда», дзе ў першым дзесяцігоддзі XX стагоддзя пачалі з’яўляцца апавяданні Віктара. Болей за тое, у 2008, 2016, 2021 гадах ён стаў пераможцам конкурсу апавяданняў газеты «Звязда».

Увогуле, 2000-я гады і выводзяць Віктара на шырокі літаратурны абсяг як таленавітага празаіка. Яго апавяданні друкуюцца не толькі ў «Звяздзе», але і ў літаратурным альманаху «Новы замак», «Літаратурнай Беларусі», «ЛіМе», «Дзеяслове», «Полымі», «Западной Двине».

Што характэрна для апавяданняў Віктара? Першае — гэта дэтэктыўна-гістарычны сюжэт, які (у большасці выпадкаў) цесна, загадкава і займальна пераплятаецца з сучаснасцю (як тут не згадаць Уладзіміра Караткевіча?!). Другое — вельмі пераканаўчая гістарычная рэканструкцыя часу, абставін і, самае галоўнае, псіхалогія мыслення герояў як гістарычных, так і сучасных… Тут падбіраюцца патрэбныя словы, сказы, якія суправаджаюцца адпаведнымі дзеяннямі, падзеямі, учынкамі. І чытач верыць у тое, што інакш і быць не магло ў той ці іншай сітуацыі, падзеях, гісторыі… І на трэцяе — некалькі характэрных аўтарскіх, індывідуальных прыёмаў і падыходаў: лаканічнасць (няма лішніх слоў, вобразаў, апісанняў); апавядальная лёгкасць і займальнасць (не заўважаеш, як уцягваешся ў сюжэт і ўжо не адкінеш працэс прачытання да апошняй кропкі); і той жа, так уласцівы Віктару, насмешлівы погляд, што часам надае яго тэкстам лёгкі, іранічны гумар…

А ў цэлым Віктар Варанец сваімі літаратурнымі тэкстамі стварае сваю мастацка-вобразную гісторыю Беларусі, гісторыю такую спрэчную і такую цікавую, такую далёкую і такую блізкую да рэальнасці.

У 2018 годзе Віктар браў удзел у рэспубліканскім літаратурным конкурсе «Славянская ліра» і атрымаў дыплом II ступені ў намінацыі «Драматургія». Дарэчы, п’есы аўтара былі надрукаваныя ў альманаху «Новы замак» і ў літаратурным зборніку «Славянская ліра».

Варта згадаць і тое, што на працягу ўжо больш як чвэрці стагоддзя Віктар Іванавіч кіруе літаратурным клубам «Катарсіс» пры Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. І маладыя літаратары «Катарсіса» штогод бываюць пераможцамі

рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў. Апрача таго, на базе літаратурнага клуба Віктарам Варанцом як арганізатарам праводзіцца штогадовы адкрыты літаратурны конкурс. Лепшыя творы канкурсантаў складаюць шматлікія калектыўныя літаратурныя зборнікі, рэдактарам і ўкладальнікам якіх выступае Віктар Варанец.

Высокай ацэнкай прафесійнай літаратурнай дзейнасці Віктара Варанца стала яго сяброўства ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў (2018).

На астатак хацелася б колькі слоў сказаць і пра такую вельмі патрэбную працу ў наш час, як папулярызацыя роднага слова ў сферы прафесійнай медыцынскай лексікі: Віктар Варанец з'яўляецца аўтарам 15 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, шэрагу артыкулаў па пытаннях беларускай медыцынскай тэрміналогіі. Выдаў «Русско-белорусский медицинский словарь», «Руска-беларускі тлумачальны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў», «Дыялектны слоўнік медыцынскіх тэрмінаў Беларусі», «Руска-беларускі слоўнік-даведнік лекавых раслін», «Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі» (2021, у суаўтарстве).

Пра апошні слоўнік хацелася б сказаць больш. У анатацыі да выдання адзначана, што слоўнік прызначаны для студэнтаў розных факультэтаў медуніверсітэта, дактароў і псіхолагаў. Тым не менш варта заўважыць, што «Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі» можа быць незаменнай настольнай кнігаю для тых аўтараў-пісьменнікаў, якія звяртаюцца ў сваіх творах да медыцынскай тэматыкі.

Вось колькі характэрных штрыхоў да творчага партрэта празаіка Віктара Варанца. Поўны партрэт празаіка, будзем спадзявацца, чакае яго наперадзе.

## СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН

# Ад родных ніў Александрыі і Дзярэчына

У Беларусі ёсць некалькі вёсак з назвай Александрыя. Больш вядома сёння шклоўская, дзе штогод гучаць песні і скокі, куды прыязджае шмат турыстаў, гасцей, чыноўнікаў розных рангаў… А вось пра зэльвенскую Александрыю, якая знаходзіцца побач з мястэчкам Дзярэчын, ведаюць нямногія, найбольш пра яе чуў тутэйшы зэльвенскі люд.

Зэльвенская Александрыя — неперспектыўная і забытая вёсачка. Гэта ў XVIII стагоддзі фальварак Александрыя ўваходзіў у маёнтак Дзярэчын і быў уласнасцю князёў Сапегаў. Сапегі любілі Александрыю і Дзярэчын. Пра іх добра распавёў Міхась Скобла ў сваёй кнізе «Дзярэчынскі дыярыюш» (Мінск, 1999). Але лепш за ўсё пра Сапегаў напісаў Валянцін Дубатоўка ў кнізе «Архіпелаг Сапегаў» (Мінск, 2002).

Род Сапегаў упісаў не адну слаўную старонку ў гісторыю Беларусі. А Валянцін Дубатоўка мае асабістыя сімпатыі да Сапегаў, як сказаў у прадмове да кнігі «Архіпелаг Сапегаў» доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч. І гэта сапраўды так. Александрыю і Дзярэчын любілі не толькі Сапегі, іх вельмі моцна сёння любіць і Валянцін Дубатоўка. Плюс да гэтага, ён нарадзіўся ў Александрыі 60 гадоў таму — 20 ліпеня 1963 года, а ў Дзярэчынскай сярэдняй школе — вучыўся. Потым скончыў электратэхнічнае вучылішча ў Гродне, служыў у Савецкай арміі, працаваў у пажарнай ахове на гродзенскім прадпрыемстве «Азот»…

Бліжэй з Валянцінам Дубатоўкам я пазнаёміўся ў 1995 годзе. А магчыма, і раней, ужо не памятаю. У 1995 годзе пісьменнік-зямляк Міхась Скобла прапанаваў мне выпусціць у Слоніме факсімільнае выданне зборніка вершаў Ларысы Геніюш «Ад родных ніў», які быў надрукаваны ў Празе ў 1942 годзе. Фундатарам выдання пагадзілася быць гродзенскае ТАА «Альгерд» у асобе Валянціна Дубатоўкі, Міхася Чапрасава і Віктара Каладскага. Я пайшоў да дырэктара Слонімскай узбуйненай друкарні Філіпава Уладзіслава Пятровіча са сваім заказам-прапановай. Уладзіслаў Пятровіч быў вопытным друкаром і кіраўніком адной з лепшых рэгіянальных друкарняў Беларусі. Ён паслухаў мяне, узяў у рукі арыгінал «Ад родных ніў» і сказаў: «Раней такога заказу наша друкарня не мела. Але гэта цікавы заказ, і даволі фінансавы для друкарні». Ён пагадзіўся прыняць заказ, і 10 кастрычніка 1995 года ён быў падпісаны да друку. Хутка зборнік надрукавалі трохтысячным накладам. Валянцін Дубатоўка і яго сябры прафінансавалі выданне своечасова, і зборнік «Ад родных ніў» Ларысы Геніюш пайшоў да чытачоў.

Пасля гэтай добрай справы мы пазнаёміліся бліжэй. Літаратурных сустрэч і мерапрыемстваў было шмат, многа чаго цікавага мы разам рэалізавалі, ажыццявілі. І безліч задумак і планаў засталіся пакуль толькі на паперы з надзеяй на іх рэалізацыю.

У 1987 годзе Валянцін заснаваў першы ў Гродзенскай вобласці музычны кааператыў «Актава». А з 1992 года займаецца вытворча-камерцыйнай дзейнасцю. Арганізаваў некалі і кіраваў прадпрыемствамі «Вітаўт», «Губерт», «Фрадо», «Тэх-Еўрамэбля», «Рагнеда». Працягвае займацца гэтым і сёння. Цяпер праблем, праўда, у

прадпрымальніцкай дзейнасці хапае, але неяк яшчэ выжывае, працуе. Дзякуючы гэтаму Валянцін Дубатоўка з’яўляўся шчырым фундатарам шматлікіх карысных спраў на Гродзеншчыне. Асабліва ён не шкадаваў фінансаў на выданне кніг землякоў. З яго добрай ласкі свет пабачылі кнігі Пятра Марціноўскага «Наша Лорка», Юркі Голуба «Поруч з дажджом», «Багра», Міхася Скоблы «Розгі ў розніцу», «Дзярэчынскі дыярыюш» і выданні іншых аўтараў.

Валянцін Дубатоўка — веруючы чалавек. Ён сябруе са святарамі розных канфесій. Асабліва ў шчырых адносінах Валянцін заўсёды быў з архіепіскапам Арцеміем (Кішчанкам, 1952–2023), які сёлета пакінуў гэты свет.

У Дзярэчынскім касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі намаганнямі Валянціна Дубатоўкі ўсталявана мемарыяльная дошка ў гонар удзельніка паўстання 1830 года Яўстаха Каятана Сапегі. А ў зэльвенскай Свята-Троіцкай праваслаўнай царкве дзякуючы Валянціну з’явілася мемарыяльная дошка ў гонар Ларысы Геніюш. Ён быў фундатарам царквы Усіх Беларускіх Святых у Гродне.

Валянцін Дубатоўка вельмі дасціпны чалавек, уважлівы, шчыры. Але па характары ён розны, мне ў ім падабаецца тое, што яго душа і памяць багатыя на гумар. З ім ніколі сумаваць не прыходзіцца. Ён, дарэчы, добра разбіраецца ў музыцы, іграе на розных інструментах, піша тэксты песень і хораша сам спявае. Яшчэ ў маладосці разам з сябрамі іграў на вяселлях, весяліў маладых і гасцей. Разам з тым Валянцін умее сябраваць, мае шмат сяброў не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі. Сяброў Валянцін Дубатоўка ніколі не кіне ў бядзе, заўсёды дапаможа, падкажа, параіць, з ім прыемна гутарыць і разважаць пра наша няпростае жыццё. У характары Валянціна таксама гняздзіцца і нейкі маленькі чыноўнік, нават начальнік. Падобная іскарка не патухла ў ім да сённяшніх дзён. І гэта добра. Невыпадкова літаратары Гродзеншчыны абралі яго кіраўніком абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў, які Валянцін узначальваў некалькі гадоў. І дзякуючы яму актывізавалася творчая дзейнасць гродзенскіх літаратараў. Былі арганізаваны дзясяткі розных сустрэч з чытачамі, конкурсаў, прэзентацый і выступаў, з’явілася абласное свята паэзіі ў Зачэпічах на Дзятлаўшчыне, выдаваліся кнігі пісьменнікаў і г. д. Усё гэта адбывалася не без вялікай дапамогі Валянціна Дубатоўкі і яго калег па пяру. На вялікі жаль, цяпер Саюз беларускіх пісьменнікаў ліквідаваны, таму сёння кожны літаратар выжывае па-свойму, і кожнаму свая болька баліць. Але калі патрэбна дапамога, Валянцін Яўгенавіч тут як тут.

Валянцін Дубатоўка — творчы чалавек. Бог надзяліў яго талентам пісаць вершы, апавяданні, аповесці, займацца гісторыка-краязнаўчымі пошукамі. У адным з інтэрв’ю ён сказаў: «Мы нарэшце павінны зразумець, што вяртання ў мінулае не будзе. Таму калі вы вырашылі ўсё ж такі займацца літаратурай, рыхтуйцеся змагацца за свае погляды, за свайго чытача і свае кнігі. І, самае галоўнае, трэба цікава і таленавіта пісаць, каб чытачы вашы кнігі самі шукалі ў крамах». З Валянцінам можна пагадзіцца.

Пісаць Валянцін Дубатоўка пачаў у школьныя гады, друкаваўся ў зэльвенскай раённай газеце «Праца», дзе штомесячна выдавалася літаратурная старонка «Зоры над Зэльвянкай», якую рыхтаваў дзярэчынскі настаўнік Пётр Мікалаевіч Марціноўскі. «Колькім маладым талентам вымасціў Пётр Мікалаевіч сваімі рэкаменда-

цыямі і павучальнымі размовамі дарогу ў літаратуру! Настаўнік рабіў усё магчымае, каб яго вучні, якія прайшлі праз літаратурную старонку зэльвенскай раённай газеты “Праца”, упэўнена сталі на літаратурнае крыло…» — прыгадвае Валянцін Дубатоўка ў кнізе ўспамінаў пра Пятра Марціноўскага «Каб не пагаслі зоры». Вучань Пятра Марціноўскага пасля «Працы» друкаваў свае вершы і прозу ў «Гродзенскай праўдзе», «Родным слове», «Дзеяслове», «Дзелавой газеце», «Новым замку», калектыўных зборніках і іншых выданнях. А ў 2002 годзе ў Мінску ў выдавецтве «Кнігазбор» выходзіць першая кніга Валянціна Дубатоўкі «Архіпелах Сапегаў», куды ўвайшлі гістарычныя нарысы пра Сапегаў і падборка вершаў «Знічкамі заплакаў небасхіл…». У вершах таксама скразной лініяй праходзіць гістарычная тэматыка, прысвечаная Адаму Міцкевічу, Шчорсам, Айчыне, Давыду Гарадзенскаму, Каложы, Бярозаўскаму кляштару…

Толькі праз 11 гадоў у Гродне выходзіць другая кніга прозы Валянціна Дубатоўкі «Чорная воля». Падзеі ў гэтай кнізе адбываюцца пераважна напярэдадні і падчас Другой сусветнай вайны ў Заходняй Беларусі, а дакладней — на Зэльвеншчыне. Амаль усе творы маюць трагічныя сюжэты. Героі Валянціна Дубатоўкі — сяляне, якія ў гэты драматычны перыяд для Бацькаўшчыны трапляюць у складаныя сітуацыі, — калі лёс не пакідае ім выбару, калі цёмныя сілы з двух бакоў — бальшавіцкага і фашыстоўскага — знішчаюць апошні шанц на ратунак. Зборнік пачынаецца невялікай аповесцю «Боты», у якой апавядаецца пра лёс хутараніна Міколы Шпака. У маладосці ён ездзіў у Амерыку на заробкі. Вярнуўся ў родныя мясціны, купіў зямлю, стварыў сям’ю, пабудаваў цагляную хату. Але не доўга цешыўся шчаслівым жыццём. Спачатку на Слонімшчыну прыйшла Чырвоная армія, і хутаранін вымушаны, каб уратаваць сям’ю, запісацца ў калгаснікі. А затым пачынаецца вайна, і Шпак увогуле трапляе паміж молатам і кавадлам — паміж паліцаямі і немцамі, з аднаго боку, і партызанамі — з другога. Усе рабуюць і прымушаюць працаваць на сябе. Яшчэ за Польшчай Шпак пашыў сабе шыкоўныя боты, якія хочуць здабыць для сябе і паліцай Альбін Клімашэўскі, і партызанскі камандзір Сцяпан Кулак. І гэтыя злашчасныя боты прынеслі Шпаку няшчасце. Каб спыніць зачараванае кола цкавання яго і сям’і, Мікола, ужо пасля заканчэння вайны, забівае і аднаго, і другога…

Наогул, тэма Другой сусветнай вайны, тэма савецкіх партызанаў, пасляваеннае жыццё беларусаў даўно хвалююць пісьменніка, каб праўдзіва паказаць тое, што адбывалася ў Заходняй Беларусі падчас вайны і пасля яе.

У 2017 годзе ў Мінску выдаецца новая кніга Валянціна Дубатоўкі «Чужы», куды ўвайшлі аповесць «Чужы» і два апавяданні «Брат» і «Іосіф». У цэнтры вострасюжэтнай эпічнай аповесці «Чужы» — жыццё заходнебеларускага хлопца Кастуся Саўчыка, на долю якога выпалі цяжкія выпрабаванні, але не зламалі яго — у фінале ён дорыць жыццё свайму крэўнаму ворагу і тым самым застаецца чалавекам. Дэтэктыўнасць, псіхалагізм, трапнасць мастацкіх дэталяў уласцівыя апавяданням «Брат» і «Іосіф»…

Пабачыла свет кніга апавяданняў і аповесці Валянціна Дубатоўкі «Сімвал веры» (Мінск, 2018) з прадмовай протаіерэя Георгія Роя, які адзначыў, што «новая кніга Валянціна Дубатоўкі, без сумніву, глыбока псіхалагічная і ў нечым нават правакацыйная. Сэнсавым стрыжнем усіх апавяданняў, сабраных у гэтай кнізе пад адной вокладкай, ёсць тэма веры і чалавечага сумлення».

Ёсць у Валянціна Дубатоўкі яшчэ адна цудоўная кніга «Пажарка — прытулак для самотнага музыкі». Яе склалі лірычна-хуліганскія нататкі ў прозе. Кніга вельмі арыгінальная, чытаецца з усмешкай, лёгка і проста. Гэта ўспаміны-імгненні пра тыя прыгоды, якія адбываліся ў Савецкім Саюзе падчас гарбачоўскай перабудовы, а канкрэтней — у пажарнай часці, дзе некалі служыў-працаваў сам аўтар.

Пра кнігі, якія напісаў і выдаў Валянцін Дубатоўка, можна разважаць доўга. Аўтар, бясспрэчна, вельмі таленавіты, піша разнастайныя творы, натхнёна працуе над новымі. Магчыма, не вельмі шмат напісана за 60 гадоў, але тое, што выйшла з-пад пяра юбіляра, заслугоўвае ўвагі, пашаны і падзякі. І, вядома ж, яго грамадска-культурная дзейнасць таксама вартая шчырай павагі. Дарэчы, Валянцін Дубатоўка быў узнагароджаны медалём «100 гадоў з дня народзінаў Ларысы Геніюш», а ў 2018 годзе ён стаў лаўрэатам міжнароднай літаратурнай прэміі памяці Міхася Жызнеўскага «Воін Святла».

У адным са сваіх вершаў Валянцін Дубатоўка напісаў:

У абуджаным памяццю парку,
Дзе юнацтва не ўваскрасіць,
Я ізноў уздымаў чарку,
Хоць і прыкра мне з паркам піць.

А мы давайце ўздымем чаркі за гэтага таленавітага чалавека і вып’ем за яго здароўе, дабрабыт і натхненне. Чакаем тваіх новых кніг і спраў на карысць нашай Бацькаўшчыны, паважаны Валянцін Яўгенавіч!

## Занатоўка пра пісьменніка з Гальшанаў

Пісьменнік Віктар Сазонаў вельмі таленавіты чалавек. І са мной могуць пагадзіцца ўсе тыя, хто яго ведае, хто яго любіць і паважае, і нават тыя, хто яго не любіць. Віктара можна любіць і не любіць, а вось паважаць яго трэба да бясконцасці. Паважаць менавіта за талент. Пацвярджэннем з’яўляецца і напісаны ім фундаментальны раман «Генетычны алфавіт», які тоўстай кнігай з’явіўся ў Беластоку ў 2021 годзе.

Слухаць і чытаць Віктара Сазонава — гэта ў сто разоў цікавей, чым проста з ім выпіць дзвесце грамаў віскі. Хаця калі п’ецца віскі, то падчас распівання ён раскажа столькі гісторый, што хапіла б на пяць кніжак кшталту «Суседскіх быляў», якая таксама пабачыла свет у Беластоку ў 2015 годзе.

Наогул, Віктар Сазонаў — чалавек унікальны. У ім даўно губляецца талент тэатральнага драматурга, кінасцэнарыста, музыканта, а таксама вядучага якога-небудзь гумарыстычнага шоу на Беларускім тэлебачанні. Але такіх шоу ў Беларусі няма. Таму Віктар Сазонаў, чакаючы свайго зорнага часу, у вольную хвіліну напісаў «Суседскія былі». Здаецца, ён іх не пісаў, а проста распавядаў, а нехта непрыкметна іх занатаваў. Дужа гладка і файна ў яго яны атрымаліся. Ну ўсё як па масле: лёгка, таленавіта і смешна!

З-пад пяра Віктара Сазонава выйшлі яшчэ кнігі «Занатоўкі кантрабандыста, або Аповеды Сымона Нальшанскага» (2005), «Сандалі мітрапаліта, або Маленькія

гісторыі з вялікай палітыкі» (2012), «Паэзія прозы» (2013). Вядома ж, на рабочым стале за камп’ютарам пішуцца новыя кнігі на самыя розныя тэмы. Але ж у іх абавязкова будзе гумар, сарказм, «свята душы».

Віктар Сазонаў вельмі схільны да гумару і сатыры, ён умее прыкмячаць самае смешнае і недарэчнае ў жыцці і надаваць гэтаму ўласнае мастацкае асэнсаванне. Многія героі твораў Віктара Сазонава, як у апавяданнях рускага празаіка Васіля Шукшына, — дзівакі. Героі Віктара Сазонава цікавыя яшчэ і тым, што многія з іх узяты практычна з жыцця, іх нават нельга падзяліць на станоўчых і адмоўных. Як і ў рэальнасці, яны прыходзяць да разумення дабра шляхам горкага вопыту.

Многія «дзівакі» Віктара Сазонава вельмі імпульсіўныя і таму натуральныя. Іх учынкі вызначаюцца не толькі карыснымі разлікамі, але і ўнутранымі маральнымі паняццямі. Хаця наўрад ці самі героі ўсведамляюць гэта, бо імкненне да дабра складае аснову іх характараў.

Калі чытаеш кнігі Віктара Сазонава, можна падумаць, што аўтар ідэалізуе сваіх дзіўных герояў. Ды не, гэта не так: проста ў кожным з іх пісьменнік знаходзіць тое, што блізка яму самому. Ствараючы сваіх «дзівакоў», аўтар стараецца зачапіць і нас, чытачоў, за жывое, прабіцца ў нашыя душы, у гісторыю краіны, у жыццё людзей. Ён прымушае нас задумацца над самым балючым пытаннем: што з намі адбываецца, што з намі было і будзе?

Вядома ж, літаратура павінна вучыць дабру. Думку пра неабходнасць сцвярджаць дабро ў нашым жыцці Віктар Сазонаў імкнецца данесці праз герояў сваіх кніг.

Віктар Сазонаў — філосаф і жартаўнік. З ім ніхто не сумаваў і не сумуе. А яшчэ ён мае мастацка-сцэнічны талент, схільны да рэлігійна-філасофскага асэнсавання жыцця і г. д. Родам пісьменнік са славутых Гальшанаў. Нарадзіўся 60 гадоў таму — 18 кастрычніка 1963 года. Як ён адзначаў на старонках сваіх кніг: па нацыянальнасці — беларус, па веравызнанні — праваслаўны, жанаты, выхаваў дачку і сына, па адукацыі — гісторык, а ў войску быў разведчыкам войскаў спецыяльнага прызначэння. На дэмбель прыйшоў у форме спецназаўца-дэсантніка, дзеўкі не толькі з Гальшанаў, але і з усёй Беларусі па ім аж млелі. Сапраўды, быў ён крэпкі, моцны, плюс да ўсяго — таленавіты.

Працоўны шлях Віктара Сазонава пачаўся з токара на ашмянскім заводзе, працягваўся ў Гродзенскім музеі гісторыі рэлігіі. Пасля Віктар паспрабаваў быць прадпрымальнікам, грамадска-культурным актывістам: прайшоў «Паходню», ТБМ, фонд імя Льва Сапегі, таварыства братоў Каліноўскіх, настаўніцкае згуртаванне «Вулей», БСДГ, рэдагаваў інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь «Свой лад» і г. д. І, вядома ж, скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Пра палітыку Віктар Сазонаў сказаў у кнізе «Сандалі мітрапалітыка...»: «Калі ты палітыкай не займаешся, то палітыка зоймецца табой». Пра «нефармалаў», якія ператварыліся ў «адраджэнцаў», пра адраджэнцаў, якія сталі «свядомымі», пра свядомых, якія сталі «дэмакратамі», пра дэмакратаў, якія ператварыліся ў «палітыкаў», а пра палітыкаў, якія сталі «апазіцыянерамі», ён паспрабаваў распавесці таксама ў сваіх «Сандалях...». Але ўсё ж лепш у яго атрымліваюцца вясёлыя і сумныя гісторыі пра простых людзей і пра нас з вамі. Мы ўсё ж, пісьменнікі, бліжэй да простага люду, а палітыкай няхай займаюцца палітыкі.

А яшчэ Віктар Сазонаў піша вершы. І даўно яму пара выдаць ладны паэтычны зборнік. Дзіўна атрымліваецца, бо ў вершах ён зусім не такі, як у сваёй прозе. Паэтычныя радкі Віктара Сазонава вельмі шчырыя, пяшчотныя, светлыя. Шмат напісана патрыятычных строфаў, радкоў — прызнанняў у любові да Бацькаўшчыны:

Беларусь — гэта гонар за даўні народ,
За Айчыну сваю, наш праслаўлены род,
Беларусь ёсць малітвай, дзе крыж і псалмы,
Беларусь — гэта ты, гэта я, гэта МЫ!

Віктар Сазонаў — паэт-лірык. Вельмі мне падабаецца яго верш-песня «Яшчэ маёй ты не была…». Гэты верш можа стаць назвай яго першай паэтычнай кнігі. Вядома ж, гады мяняюць сэнс і матывы жыцця, але каханне застаецца неўміручым і вечным, як і тое, што напішацца.

Віктар Сазонаў не дужа ўмее надпісваць на сваіх выданнях аўтографы. Амаль усім, каму ён падпісаў свае кнігі, ён жадае ўсяго самага найлепшага. Гэтага ўсяго самага найлепшага ў жыцці і творчасці мы жадаем і яму. А таксама чакаем новых кніг і літаратурных адкрыццяў.

# IN MEMORIA

*На добры ўспамін пра Паўла Уладзіміравіча Сцяцко (05.03.1930–23.03.2020)*

ВАЛЯНЦІН ДУБАТОЎКА

## Прафесар з хутара Нябайкі

Найперш хацелася б узгадаць не значныя дасягненні ў мовазнаўстве паважанага прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і доктара навук Паўла Уладзіміравіча Сцяцко (Сцяцка), — гэта лепш ведаюць яго ўніверсітэцкія калегі, а некаторыя факты з жыцця Паўла Уладзіміравіча. Рэч у тым, што мяне з ім звязвае не толькі працяглае знаёмства і плённае супрацоўніцтва, але і агульная зямля ў прамым сэнсе гэтага слова. Нарадзіўся Павал Уладзіміравіч на хутары Нябайкі паблізу мястэчка Дзярэчын. На гэтым жа хутары пазней гадаваўся і я: фальварак майго дзеда Міхася знаходзіўся паблізу хаты, дзе нарадзіўся і правёў дзяцінства будучы знакаміты навуковец. Больш за тое, бацька Паўла Уладзімір Сцяцко і мой дзед былі кумамі, добрымі суседзямі і сябрамі. Хоць сам Павал Уладзіміравіч іншым разам узгадваў вёску Грабава як месца свайго нараджэння, але гэтая вёска месціцца ў двух кіламетрах ад хутара Нябайкі.

У якім жа асяродку нарадзіўся і жыў будучы доктар навук Павал Сцяцко?

З часоў першай «Нашай Нівы» склаўся памылковы вобраз беларускай інтэлігенцыі дваццатага стагоддзя, прадстаўнікі якой нібыта выбіліся ў свет з самых нізоў, дзяцінства якіх праходзіла ў збяднелых і напалову разбураных вясковых халупах. Калі ў сялянскіх дзяцей не было ні прыстойнай вопраткі, ні нават чаго паесці... Дык вось, асяродак, у якім правёў дзяцінства Павал Уладзіміравіч, абсалютна не адпавядаў гэтаму наратыву.

Жыла сям'я Паўла Сцяцка на хутары, мела добры кавалак ворыўнай зямлі і балота. Так, я не памыліўся, менавіта балота. Бо без пашы гаспадар у Заходняй Беларусі не мог мець ні коней, ні кароў. Таму балота таксама мела свой кошт. Дом будучага прафесара быў больш падобны на маёнтак заможнага шляхціча, чым на хату беларускага селяніна. Высокі падмурак, жоўтыя цагляныя сцены, дах, накрыты бляхаю, драўляныя каламаны каля ўвахода, высокія вокны. Дашчаныя палы, высокая столь, прыгожыя і аздобленыя разьбою дзверы з мажнымі каванымі клямкамі. Фальварак меў шмат гаспадарчых пабудоў, якія мясціліся крышку наводдаль, каб не псаваць эстэтыку фальварка. За хлявамі і гумнамі рос дагледжаны сад, дзе было багата

яблыняў, груш, вішняў. Усё пералічанае яскрава сведчыць, што сям'я Паўла Уладзіміравіча жыла даволі заможна, нават у параўнанні з іншымі тубыльцамі Нябаек. Але прыстойнае жыццё на зямлі таксама мела свой кошт. Сям'я з раніцы да ночы цяжка працавала на ўласнай гаспадарцы. І Павал, як і іншыя чальцы сям'і, з ранняга дзяцінства спазнаваў няўдзячную сялянскую працу.

Але ж не толькі хлебам адзіным жыла сям'я. Бацькі Паўла Уладзіміравіча былі адданымі прыхаджанамі Дзярэчынскага праваслаўнага храма Святога Міхала (які на выходныя і святы абавязкова наведвалі). Пачатковую школу Павал скончыў у вёсцы Грабава, у якой разам з ім вучылася і мая маці. Мая матуля часта ставіла мне ў прыклад свайго аднакласніка як узорнага вучня. І Павал з дзяцінства праявіў здольнасці да навук. Чым яскрава адрозніваўся ад астатніх вучняў вясковай школкі. Праўда, у далейшым шляхі нябайкаўскіх дзяцей разышліся. Павал прадоўжыў сваю вучобу спачатку ў Дзярэчынскай школе, потым у Ваўкавыскім педагагічным тэхнікуме і Гарадзенскім інстытуце, а мая мама засталася на хутары, бо раптоўна захварэла мая бабуля.

А жыццё ішло... У вёсках Заходняй Беларусі неўзабаве з'явіліся калгасы, Саветы амаль адразу ўзяліся знішчаць хутары, адбіраць зямлю, перасяляць у адну вёску. Праз нейкі час у Нябайках засталося толькі некалькі фальваркаў, а гэта быў канец шасцідзясятых, і мяне ўсё часцей і часцей бацькі адвозілі на дзядзькаванне да дзеда Міхася. Вельмі добра памятаю, як ганарыўся мой дзед поспехамі сына свайго сябра. І амаль усе мае наступныя прыезды на хутар сканчаліся аповедам, дзе і як цяпер працуе Уладзеў сын і пра тое, як варта і мне будаваць сваё жыццё ды з каго браць прыклад. Ужо многа-многа пазней, калі пашчасціла асабіста пазнаёміцца з Паўлам Уладзіміравічам, я расказаў яму гэтую гісторыю, падарыўшы яму некалькі прыемных хвілін. Калі Павал Уладзіміравіч працаваў у Гродзенскім дзяржуніверсітэце, нашыя сустрэчы адбываліся даволі часта і з розных нагодаў...

Дык якім жа быў чалавекам прафесар П. У. Сцяцко? Як і любая асоба, якая можа пахваліцца істотнымі дасягненнямі, Павал Уладзіміравіч меў свае ўсталяваныя прынцыпы і звычкі, без якіх, напэўна, і нельга дасягнуць у гэтым жыцці хоць нечага вартага. Многія нашыя агульныя знаёмыя папярэджвалі мяне, што прафесар надзвычай складаны чалавек і камунікацыя з ім — няпростая справа. Ды і яго вучні расказвалі пра свайго навуковага кіраўніка як пра чалавека хоць і зычлівага, але пры тым надзвычай патрабавальнага. Што я магу сказаць на гэта? За многія гады жыццё прывучыла мяне меркаваць пра чалавека не па словах, а па яго справах. А велізарная навуковая спадчына прафесара Паўла Уладзіміравіча гаворыць сама за сябе.

Сярод інтэлігенцыі існуе такое ўстойлівае меркаванне, што выкладчык заўсёды лепш гаворыць, чым піша. І ў дадзенай тэзы маецца багата пацверджанняў. Ці мала мы ведаем прыкладаў, калі чалавек з'яўляецца непаўторным аратарам — а напісанае ім і на кніжную паліцу брыдка паставіць? І спадар Павал добра разумеў розніцу паміж навуковай дзейнасцю і літаратурай. Аднаго разу я звярнуўся да яго з просьбай напісаць успаміны для нашага альманаха «Новы замак». І добра памятаю, што ён мне адказаў: «Як сведчаць многія рэцэнзіі на навуковыя працы Паўла Уладзіміравіча Сцяцка, падаецца, што ён нядрэнны навуковец, але ён ні разу і нідзе не сустракаў добрага слоўца пра пісьменніка Паўла Сцяцка. З гэтага я лічу, што не варта мяняць склаўшуюся за многія гады сістэму каардынат».

І тут да месца будзе прывесці словы Юрыя Уладзіміравіча Голуба, калі на Радзе Саюза беларускіх пісьменнікаў разгарэліся гарачыя спрэчкі наконт таго, ці варта прымаць у Саюз Паўла Уладзіміравіча, чалавека, які, па-сутнасці, не напісаў ніводнага мастацкага твора: «Перад тым як галасаваць, я прашу падумаць маіх калегаў пра тых нашых літаратараў, якія навучыліся пісаць на навуковых працах і артыкулах сённяшняга нашага кандыдата. І ці сталі б вы самі тымі, якія ёсць цяпер, без моўных адкрыццяў Паўла Сцяцка?» Галасаванне было амаль аднадушным.

Дык вось, не атрымаўшы жаданага адказу наконт успамінаў, Павал Уладзіміравіч у звычайнай гутарцы расказаў мне некалькі гісторый са свайго цікавага жыцця. А калі ўлічыць, што ў той самы час я пісаў кнігу «Чужы», успаміны датычыліся якраз перыяду мінулай вайны. Як яго бацькоўскі хутар рабавалі паліцаі днём, а партызаны ноччу. Як на пачатку пяцідзясятых яго ледзь не застрэлілі жаўнеры Арміі Краёвай у мястэчку Парэчча, калі ён быў там у этнаграфічнай экспедыцыі. І гэта былі эмацыйныя і жывапісныя жыццёвыя гісторыі.

Але мне ўсё ж найбольш запомнілася наша паездка ў 2002 годзе ў мінскае выдавецтва «Тэхналогія», у якое Павал Уладзіміравіч вёз рукапіс сваёй кнігі «Культура мовы». Трэба было бачыць, як самааддана расказваў Павал Уладзіміравіч пра гэтую сваю працу. Тут было ўсё: і зачараванне прыгажосцю роднай мовы, і захапленне незвычайным багаццем і глыбінёй беларускіх прымавак. Я бачыў, як загараюцца вочы немаладога ўжо прафесара, калі ён прыводзіў прыклады незаслужана забытых беларускіх слоў. Мне многа разоў за сваё жыццё па справах і так даводзілася ездзіць у Мінск, але такой цікавай паездкі, скажу па-шчырасці, ні да гэтага, ні потым больш не было. У далейшым было шмат розных нашых сустрэч і размоў, часам вельмі працяглых. Але вось тая паездка ў Мінск мне чамусьці вельмі запала ў сэрца.

Перад самым адыходам Паўла Уладзіміравіча ў лепшы свет я ўзяў у яго інтэрв’ю для «Слонімскай газеты». Гэта была самая што ні на ёсць споведзь вялікага навукоўца і адданага свайму краю чалавека. Тут была і развага, як сёння цяжка выжывае беларуская мова, і як заняпала нашая адукацыя, і як знішчаюцца малыя бібліятэкі, і чаму ўсё цяпер так адбываецца ў нашай краіне. Гэта былі разважанні сапраўды вялікага навукоўца, выкладчыка і, галоўнае, Беларуса. Па ўсім адчувалася, як ён перажывае за тое, як знішчаюцца ў вёсках і гарадах Панямоння беларускія школы, як зніжаецца цікавасць ва ўніверсітэтах да вывучэння беларускай мовы… Гэта быў крык душы дасведчанага чалавека, які глыбока перажывае за лёс справы, якой ён прысвяціў усё сваё жыццё. А жыццё яго было цалкам ахвяраванае на алтар Беларусі.

…Няма ўжо на зямлі ні хутара Нябайкі, ні школкі ў вёсцы Грабава, у якой вучыўся будучы знакаміты навуковец. Дый сама вёска ўжо амаль памерла. Калісьці мы з Сяргеем Чыгрыным задумалі ўсталяваць камень і шыльду ў гонар Паўла Уладзіміравіча на ўскрайку Грабава, і я, не марудзячы, выбраўся шукаць месца. Але, калі пабачыў паўсюльнае запусценне вёскі, у мяне апусціліся рукі. Навокал закінутыя хаты і хлявы, бадыллё і ламачча на месцы, дзе была школа, у якой вучыўся Павал Уладзіміравіч. Памятаю, як цяжка мне было на душы, што вось так сёння адбываецца.

Але так не можа быць вечна! Усё ж настануць часы, калі не ў вёсцы Грабава, дык у іншым месцы з’явіцца нарэшце не тое што шыльда, а сапраўдны помнік нашаму выбітнаму навукоўцу, прафесару і слаўнаму сыну Беларускай зямлі Паўлу Уладзіміравічу Сцяцку.

# Дзецям

## ІВАН БУДНІК

### Пра пчолку і жыццё вулея

Юны дружа, любіш мёд?
Павядзем тады гаворку
Мы з табой пра тую пчолку,
Што цябе парой частуе,
Як жыве, працуе, днюе.
...Рушым, дружа, мы ў паход.

Хатка пчолкі без вакон
Прымасцілася пад вішняй.
Хоць стаіць тут шум і звон,
Жыхароў няма ў ім лішніх.

Цёплы сонечны прамень
Загляне прыветна ў хатку —
Сон прагоніць, хмуры дзень,
Збудзіць жыхароў і матку.

Як у вуллі мамка ёсць,
То яго насельнік кожны
Разумее: ён не госць
І не пан яснавяльможны.

Ён — старанны гаспадар,
Лекар, майстар на ўсе рукі,
Не сустрэнеш тут ні скнар,
Ні лянівых лежабокаў.

Тут жыццё вякамі йдзе —
Як у зладжаным аркестры
У з’яднанай грамадзе
Пад камандаю маэстра.

Толькі гляне ў вешні сад
Сонейка з-за небасхілу,
Як шукаць нектарны клад
Мчацца пчолкі ва ўсю сілу.

Як умыюцца расой
Кветкі ў полі і на лузе,
Наталіцца іх красой
Пчолка ў вуллі не марудзіць.

Свой увесь кароткі век
Лекі з кветачак збірае.
Ёй удзячны чалавек,
Што істота ёсць такая!

Мноства кветак абляціць,
Кожную з іх пацалуе.
Тая ж хоча адплаціць,
Падарункаў не шкадуе.

Ўладкаваўшы кветак дар —
Што на спінку, што на ножкі
(Тут пыльца і клей, нектар),
Адпраўляецца ў дарожку.

Пчолка наша — у дамок
Здаць дары ў перапрацоўку,
Адпачыла — й на ляток,
Паляцела ў поле зноўку.

Бо цяпер — гарачы час,
Зладжана кіпіць работа:
На зіму кладуць запас,
Чысцяць і глянсуюць соты.

Залацісты мёд кладуць
Ў соты — бочкі васкавыя, —
І зімой не прападуць
У мароз, завеі злыя…

СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН

## Верталёт Бабы-Ягі

*Казка для дзяцей у адной дзеі*

**Дзеючыя асобы:**

Б а б а-Я г а.
М я д з в е д з ь.
З а я ц.
Д з я ц е л Д з і м а.

Усе дзеючыя асобы маюць мабільныя тэлефоны.

На лясной паляне на пні сядзіць м я д з в е д з ь у капелюшы і есць вялікай лыжкай з калоды мёд. У яго добры настрой.

М я д з в е д з ь (*частуецца мёдам і спявае песеньку*).

Блукаю па лесе,
А стомы няма,
І мёдам прапахла
Паляна сама.
Лісце густою
Іскрыцца расой
Па-над шчаслівай
Маёй галавой.

*Прыпеў:*
Ой, ой, оё-ё-ёй,
Мёд-мядок заўсёды са мной,
Любіць мяне ён, а я яго,
Ох, ох, ого-го-го!

Ціха на травы,
На верас і мох
Лягу-прылягу,
Шчаслівы, з дарог.
Побач са мною
Калоду не руш.
Мёдам прапах
І мой капялюш.

*Прыпеў:*

Ой, ой, оё-ё-ёй,
Мёд-мядок заўсёды са мной,
Любіць мяне ён, а я яго,
Ох, ох, ого-го-го!

Раптам на паляну выбягае спалоханы з а я ц. Убачыў мядзведзя — і адразу да яго.

З а я ц. Чаго ты тут сядзіш, Патапыч?

М я д з в е д з ь. Хачу і сяджу, мёд ем.

З а я ц. Які мёд, тут не да мёду!

М я д з в е д з ь. Мёд, касавокі, — гэта святое. Калі б не было пчолаў і мёду, то не было б у лесе мядзведзяў. А калі б не было мядзведзяў, то ў лесе не было б парадку і дысцыпліны. Зразумеў?

З а я ц. Зразумеў, Патапыч! Але тут ёсць больш важныя праблемы, таму не да твайго мёду. Ён мне здаецца ўжо горкім.

М я д з в е д з ь. Мёд горкім не бывае.

З а я ц. Не бывае, але можа хутка быць… Горкі мёд, уяўляеш?..

М я д з в е д з ь. Я не разумею цябе, можа, што здарылася ў лесе? Чаго ты такі спалоханы, касавокі? Кажы хутчэй! (*Адкладвае калоду ўбок.*)

З а я ц. Хутка і ты спалохаешся.

М я д з в е д з ь. Я яшчэ нікога ў гэтым лесе не спалохаўся і не баюся нікога і нічога. У лесе я адчуваю сябе ўтульна, вольна і… смачна. (*Паказвае на калоду з мёдам.*) Але, сапраўды, што здарылася? Скажы мне, можа, я дапамагу чым…

З а я ц (*кажа ціха*). Справа ў тым, што я чуў навіну ад сарокі. Яна мне сказала вельмі важную для нашага лесу інфармацыю.

М я д з в е д з ь. Якую інфармацыю?

З а я ц. Пра Бабу-Ягу.

М я д з в е д з ь. Я не баюся гэтай старой порхаўкі…

З а я ц. Ты не хваліся сваёй смеласцю! Глядзі, каб са страху не бег па лесе куды лапы панясуць…

М я д з в е д з ь. Нічога не разумею, касавокі. Растлумач, што здарылася? Мяне гэта таксама зацікавіла. Ну, растлумач…

З а я ц. Што тут тлумачыць? Бяда ў наш ціхі і спакойны лес прыйшла.

М я д з в е д з ь (*здзіўлена*). Якая бяда? Кажы хутчэй.

З а я ц. У Бабы-Ягі з'явілася новая мятла…

М я д з в е д з ь. Што тут за бяда? Гэта ж радасць для Бабы-Ягі. Няхай лётае па лесе і на той новай мятле. Яна ж асаблівай шкоды нам не прыносіць.

З а я ц. Ды справа не ў гэтым…

М я д з в е д з ь. А ў чым?

З а я ц. У тым, што гэтая мятла не такая, якія ў яе раней былі. Гэтая мятла чарадзейная.

М я д з в е д з ь. Чарадзейнай мятлы не бывае! У чым заключаецца тое чарадзейства? Га?..

З а я ц. Мятла вельмі дарагая, з рухавіком, са святлом, рычагамі, крэслам, тормазам і са свістам… Нават уявіць ты не зможаш. Вось якая ў яе мятла!..

М я д з в е д з ь (*здзіўлена*). Ого! І са свістам? І дзе яна яе здабыла? Цікава ведаць…

З а я ц. У Кітаі. Гэта кітайская мятла, спецыяльна выраблена для Бабы-Ягі.

М я д з в е д з ь. А ў якім гэта лесе знаходзіцца той Кітай?..

З а я ц. Кітай — гэта не лес, Кітай — гэта вялікая краіна (*паказвае рукамі*), якая знаходзіцца за тысячу тысяч кіламетраў ад нашага лесу. Але для Бабы-Ягі спецыяльна прывезлі іншыя кітайскія Бабы-Ёжкі ў падарунак на 100-годдзе з дня яе нараджэння. Сто гадоў нашай Бабцы-Язе, касцяной назе! Уяўляеш, сто гадоў ажно! Мы ніколі не дажывем да яе ўзросту…

М я д з в е д з ь. Гэта ўжо цікава! Хочацца паглядзець на тую кітайскую мятлу.

З а я ц. А ты не баішся?

М я д з в е д з ь. А чаго баяцца? Мятла як мятла, толькі з маторам.

Раптам пачуўся гул, свіст, лямант. Мядзведзь схапіў калоду з мёдам, і разам з зайцам яны схаваліся за куст.

З а я ц. Гэта, мусіць, Баба-Яга ляціць да нас. Будзе бяда з гэтай мятлою і Бабай-Ягою… Ой, будзе!..

М я д з в е д з ь. Не бойся, касавокі, я з табой. Калі што не так, забяром у яе тую мятлу і самі будзем лётаць над лесам. (*Смяецца.*)

Гул набліжаецца, стала страшнавата. Мядзведзь з зайцам закрылі вушы і прыцiснуліся за кустом да зямлі. У гэты момант на паляну прылятае Б а б а-Я г а на кітайскай мятле, глушыць матор.

Б а б а-Я г а. Ну што, баязліўцы, га? Спалохаліся маёй мятлы і мяне, так?

З-за куста асцярожна падымаюцца з зямлі мядзведзь і заяц і баязліва, асцярожна, пацiху падыходзяць да Бабы-Ягі.

М я д з в е д з ь. І што ты тут прыдумала на старасць гадоў? Навошта парушаеш лясную цішыню?

Б а б а-Я г а. Патапыч, час мяняецца, я ўжо не тая Баба-Ёжка, якая была пяцьдзясят гадоў таму. На старой мятле лётала, баялася, каб не ўпасці, не зачапіцца за галінкі дрэў. Цяпер зусім іншы час. І мятла ў мяне самая сучасная. Паглядзіце…

Мядзведзь і заяц падыходзяць да мятлы, разглядаюць яе, Баба-Яга пачынае іх знаёміць са сваім «верталётам».

Вось паглядзіце на маю сучасную мятлу (*паказвае*). Вось гэта рухавік, гэта тормаз, гэта газ… Гэта, наогул, не мятла, а сапраўдны верталёт, верталёт-мятла. Вы пра такі і не снілі нават! Ён спецыяльна выпушчаны для мяне адной-адзінай на белым свеце. Верталёт для Бабы-Ягі!

З а я ц (*здзіўлена*). Спецыяльна для цябе?

Б а б а-Я г а. Так. Спецыяльна для мяне на спецыяльным заводзе ў Кітаі. Самыя лепшыя спецыялісты свету яе рабілі!

М я д з в е д з ь. А дзе такі Кітай?

Б а б а-Я г а. Далёка за марамі, акіянамі, лясамі і лугамі, палямі і стэпамі. Вам не зразумець і ніколі там не пабываць! Вам толькі па нашай пушчы бегаць туды-сюды, а да Кітая можна толькі даляцець. А ў вас крылаў няма… Таму не відаць вам Кітая…

З а я ц. А ты была?

Б а б а-Я г а. Я за сто гадоў увесь свет аблётала, усё бачыла — і нават Кітай.

М я д з в е д з ь (*здзіўлена*). А ён вялікі — той Кітай?

Б а б а-Я г а. Самы вялікі на свеце, ад зямлі да неба! Такі вялікі, што нам не абляцець і не абысці. Вось такі вялікі!

Усе здзіўлена на яе глядзяць.

(*Паказвае рукамі ўсхвалявана. Пачынае скакаць каля мятлы-верталёта і спяваць.*)

Верталёцік-верталёт,
Палячу з табой ў палёт,
Палячу я і ў Кітай,
А ў Кітаі бабцы рай.

*Прыпеў:*
Ану, зайка, даганяй,
І ты, Мішка, даганяй.
Я лячу адна ў Кітай, —
Не дагоніш — даганяй!

Верталёцік-верталёт,
Не чапляйся ты за плот,
Не чапляйся ты за дрэвы,
Я з табою — каралева!

*Прыпеў:*
Ану, зайка, даганяй,
І ты, Мішка, даганяй.
Я лячу адна ў Кітай, —
Не дагоніш — даганяй!

З а я ц. Баба-Яга! Дык вазьмі і нас з сабой у палёт!

Б а б а-Я г а. Калі б вы былі мае сваякі, то я вас узяла б, але ж вы мне зусім чужыя. Вы не сваякі. Таму я вас нікуды не вазьму.

М я д з в е д з ь. Дзіўная ты! Вельмі дзіўная і хітрая!

Б а б а-Я г а. Сам ты дзіўны, Патапыч! Не разбіраешся ў сучаснай тэхніцы, дык і маўчы.

З а я ц. Быццам ты разбіраешся…

Б а б а-Я г а. Я разбіраюся з маленства. З самых маленькіх гадоў я звязана з тэхнікай. Спачатку лётала на мятле, а цяпер на самай сучаснай тэхніцы — мятле-верталёце. А ты на чым лётаў, касавокі?

З а я ц. Мне нельга лётаць. Я ўмею добра бегаць, ты мяне, старая, не дагоніш і на верталёце!

Б а б а-Я г а (*смяецца*). Цябе? Цябе нават мурашка дагоніць.

З а я ц. А цябе дагоніць і перагоніць муха. Яна лётае хутка.

Б а б а-Я г а. Калі муха стане верталётам, то тады, можа, і дагоніць.

М я д з в е д з ь. А калі я стану верталётам, то тады ўсіх абганю. І буду лётаць высока над лесам. І далячу да твайго Кітая. І нават далей. (*Бегае, рукі расставіўшы, і гудзе, як верталёт.*)

Усе смяюцца.

З а я ц. А калі ты, Патапыч, упадзеш зверху, то так грукнешся, што лес наш задрыжыць.

М я д з в е д з ь. Не ўпаду! Дай, Бабка-Ёжка, мне хоць раз палётаць на тваім верталёце!

Б а б а-Я г а. Не дам. Ты вельмі цяжкі, пузаты, цябе мой верталёт не падніме ў неба.

З а я ц. Тады мне дай праехаць. Я зверху хачу ўбачыць усіх сваіх ворагаў, хто хоча мяне напалохаць і з'есці!

Б а б а-Я г а. А ты хто такі, каб я табе давала праехаць? Ты проста заяц-палахлівец. Ты паднімешся ўверх, і ў цябе са страху сэрца разарвецца. Гэта мой верталёт, мой, таму нікому я не дам на ім пакатацца. Я ў лесе самая прыгожая, маладая, шустрая, таму мне і падарылі такі дарагі падарунак. А вы ўсе не заслужылі, вы гультаі, абібокі, шкоднікі. (*Смяецца.*)

М я д з в е д з ь. Я не зразумеў, хто ў лесе шкоднік?

З а я ц. І я не зразумеў...

М я д з в е д з ь і з а я ц (*разам*). Што ты сказала, Ёжка?!

Наступаюць на Бабу-Ягу. Бегаюць за ёй вакол верталёта. Б а б а-Я г а спалохалася і хуценька села ў свой верталёт, завяла яго і паляцела. Здзіўленыя мядзведзь і заяц застылі на месцы...

М я д з в е д з ь. Нахабная стала!

З а я ц. Вельмі нахабная. Выхваляецца сваёй мятлой з рухавіком. Патапыч, а давай мы забяром верталёт!

М я д з в е д з ь. Нельга забіраць, ёй жа падарылі на юбілей. А падарункі, як ты ведаеш, забіраць нельга.

З а я ц. Сапраўды, нельга. А я, скажу шчыра, так хачу пакатацца на верталёце... Вельмі хачу падняцца ў неба і паглядзець на лес, на дрэвы і палянкі, падляцець бліжэй да сонейка. Гэта ж цікава, праўда, Патапыч?!

М я д з в е д з ь. Праўда. І мне было б цікава. Надакучыла хадзіць-блукаць па лесе. Хочацца больш волі, святла, вышыні.

З а я ц. А давай і мы напішам пісьмо ў Кітай, каб і нам прыслалі такія верталёты, як у Бабы-Ягі. Хаця б адзін на дваіх...

М я д з в е д з ь. Давай!

З а я ц. Але я не ведаю адраса, куды пісаць і каму.

М я д з в е д з ь. І я не ведаю.

З а я ц. Трэба патэлефанаваць Бабцы-Ёжцы і запытаць у яе адрас, куды дасылаць заяўку на набыццё верталёта.

Заяц дастае мабільны тэлефон, набірае нумар — і раптам чуе голас Бабы-Ягі.

Б а б а-Я г а. Алё!

З а я ц. Баба-Ёжка, гэта я, заяц. Хачу ў цябе запытаць адрас, куды нам напісаць пісьмо, каб і нам з Кітая прыслалі верталёт.

Б а б а-Я г а (*смяецца ў трубку*). Вам нельга мець такі верталёт, бо вы зваліцеся, і я буду вінаватая, што дала вам адрас. Не, не дам.

З а я ц. Ды не, дапамажы нам!

Б а б а-Я г а. Добра, я зараз да вас прылячу.

Заяц выключае тэлефон і хавае яго.

М я д з в е д з ь. Не дасць яна нам адраса. А калі і дасць, то ніхто нам верталёта не прышле. У кітайскіх лясах сваіх мядзведзяў і зайцоў хапае.

Чуецца гул і свіст. На паляну зноў прылятае Б а б а-Я г а на верталёце.

Б а б а-Я г а. Ну што, прыгажунчыкі? Захацелі і вы верталёта, га?

З а я ц. Захацелі. Ты ўжо маеш, а чаму нам нельга мець? Мы таксама хочам падняцца ў неба і паглядзець на наш лес з вышыні.

Б а б а-Я г а. Ты хочаш проста палётаць над лесам ці назаўсёды мець такі верталёт?

З а я ц. Ну, хаця б адзін раз палётаць і паглядзець…

Б а б а-Я г а. Добра, я табе дам адзін раз палётаць. Сядай.

Баба-Яга і мядзведзь трымаюць верталёт і дапамагаюць зайцу сесці. Заяц баіцца, але радасна ўсміхаецца.

З а я ц. Мне страшна!..

М я д з в е д з ь. Сядай, сядай, касавокі! Спачатку ты, а потым паспрабую я.

З а я ц. Я такі шчаслівы, такі шчаслівы! А можна — я ад радасці і шчасця для вас і для ўсіх, хто мяне бачыць і чуе, праспяваю песеньку?

Б а б а-Я г а. Мусіць, ты хочаш праспяваць песеньку ад страху?

З а я ц. Ды не, праўда, я вельмі шчаслівы, што, як птушкі, паднімуся ў неба і зверху гляну на наш лес.

М я д з в е д з ь. Не бойся, касавокі! Усё будзе добра! Спявай!

З а я ц (*вылазіць з верталёта і спявае песеньку ды танчыць вакол верталёта*).

Верталёт, мой верталёт
Паімчыць мяне ў палёт,
Ён мяне падніме ў неба
І парадуе як трэба.

*Прыпеў:*
Хоць хвалююся чуць-чуць,
Хачу неба я адчуць,

Пад аблокі узляцець
І на лес наш паглядзець.

Мая мара — верталёт,
Я чакаў яго шмат год,
Не заўважыць нават вока —
Палячу за ўсіх высока.

*Прыпеў:*
Хоць хвалююся чуць-чуць,
Хачу неба я адчуць,
Пад аблокі узляцець
І у лес зноў прыляцець.

Б а б а-Я г а. Вельмі добрая песенька. Ну, а цяпер сядай, касавокі!

Заяц сядае ў верталёт, баіцца, дрыжыць, але сядае. Баба-Яга дапамагае ўключыць рухавік, а потым яна разам з мядзведзем піхае верталёт за кулісы, дзе ён «узлятае» ў неба разам з з а й ц а м.

М я д з в е д з ь. Ну, паляцеў. І добра. Няхай паглядзіць, касавокі, на нас з вышыні.
Б а б а-Я г а. Ён вельмі баяўся.
М я д з в е д з ь. І я баюся, але хачу падняцца ў неба, як і заяц. Я ж таксама наш лес люблю. І ўсіх звяроў, якія жывуць тут разам з намі.
Б а б а-Я г а. Ты, Патапыч, вельмі цяжкі. Мая мятла-верталёт, можа, і не падніме цябе на вышыню.

Раптам пачуўся гул, свіст, трэск...

М я д з в е д з ь (*спалохана*). Гэта што такое, га?
Б а б а-Я г а. Бяда, верталёт упаў разам з зайцам. Я пабягу пагляджу, што там здарылася.
М я д з в е д з ь. Бяжы хутчэй, бяжы, трэба ратаваць зайца.
Б а б а-Я г а. Ды пры чым тут заяц? Мой верталёт упаў. Ой, бяда, ой, бяда... Я пабегла... Ах, мой верталёцік, ах, мой даражэнькі! Я ж цябе так любіла і шанавала!.. (*Пачынае плакаць, выбягае.*)
М я д з в е д з ь. Так добра і ціха было ў лесе. Але ж гэтая Ёжка з’явілася са сваім верталётам-пералётам-недалётам!.. І што ж цяпер будзе? Як далей нам жыць у лесе?..

Здалёку пачуўся голас Бабы-Ягі: «Патапыч, дапамажы нам, хутчэй!»

О! Пачалося!.. Трэба бегчы дапамагаць!

За кулісамі чуваць галасы зайца і Бабы-Ягі: «Дапамагай, бо нам цяжка. Давай усе разам!..» На сцэну з а я ц, Б а б а-Я г а і м я д з в е д з ь выцягваюць верталёт. Ён пашкоджаны.

Б а б а-Я г а (*прыгаворвае і плача*). І што я цяпер буду рабіць без свайго верталёціка? І на чым я, старая, буду лётаць? Ай-яй-яй!.. І навошта я табе, касавокі, дазволіла на ім пакатацца?.. Ты ж няўмека-недарэка!.. І як я буду жыць?.. (*Плача.*)

М я д з в е д з ь. Не плач! Адрамантуем мы твой верталёт-пералёт-недалёт!

Б а б а-Я г а. Хто мне яго адрамантуе, вы ўсе першы раз у жыцці ўбачылі такую тэхніку.

З а я ц. Адрамантуем, не хвалюйся! І я ведаю як!

Б а б а-Я г а і м я д з в е д з ь (*разам*). Як? Хто можа адрамантаваць верталёт?

З а я ц (*з гонарам*). Верталёт можа адрамантаваць толькі адзін наш лясны спецыяліст. Ён у гэтым разбіраецца, ён майстар на ўсе рукі.

Б а б а-Я г а. І хто гэта?

М я д з в е д з ь. Кажы хутчэй, мне таксама цікава ведаць!

З а я ц. Ён усе дрэвы лечыць, дапамагае лясным звярам, ды і сам добра і высока лётае.

М я д з в е д з ь. Гэта сава?

З а я ц (*пачаў смяяцца*). Якая сава? Яна толькі ноччу лётае.

Б а б а-Я г а. Ну, няхай ноччу і рамантуе. Галоўнае, каб мой верталёт зноў лёгка заводзіўся і падымаўся ў неба.

М я д з в е д з ь. А хто? Можа, бусел?

З а я ц (*зноў смяецца*). Ды не, не бусел. Ён толькі жабаў ловіць на балоце.

Б а б а-Я г а. Дык, можа, гэта сарока?

З а я ц (*зноў смяецца*). Якая сарока-белабока? Яна толькі навіны збірае па лесе, і ўсё, больш нічога не ўмее. Яна — лясное радыё.

М я д з в е д з ь. Дык, можа, цар звяроў — леў?

Б а б а-Я г а. Леў жа лётаць не ўмее… Кажы хутчэй, касавокі!..

З а я ц. Гэта… гэта дзяцел! Вы што, забыліся, што ён добры спецыяліст?

М я д з в е д з ь. А цікавая ідэя. Трэба патэлефанаваць дзятлу.

Б а б а-Я г а. Тэлефануй хутчэй, Патапыч!..

Мядзведзь дастае мабільны тэлефон і тэлефануе дзятлу. У трубцы чуваць голас: «Алё! Дзяцел Дзіма слухае вас!»

М я д з в е д з ь. Вітаю цябе, дзяцел Дзіма!

Д з я ц е л Д з і м а. Патапыч, добры дзень! Як гэта ты надумаўся мне патэлефанаваць, ніколі такога не было… Ці ў цябе нешта здарылася?

М я д з в е д з ь. Прылятай да нас тэрмінова на паляну, мы ўсё раскажам і пакажам. Неабходна твая дапамога!

Д з я ц е л Д з і м а. Добра, лячу!..

З а я ц. Ну вось, гэта іншая справа. Дзяцел Дзіма нам павінен дапамагчы.

Б а б а-Я г а. Хутчэй бы… Я так перажываю, так перажываю!..

М я д з в е д з ь. Не перажывай, вырашым тваю праблему.

На сцэне з’яўляецца д з я ц е л Д з і м а са скрынкай розных інструментаў.

Д з я ц е л Д з і м а. І што тут у вас за праблемы?

М я д з в е д з ь (*паказвае на верталёт*). Ты ведаеш, Дзіма, што гэта?

Д з я ц е л  Д з і м а. Чуў ад сарокі. Ведаю. Гэта верталёт.

З а я ц. Дык вось… здарылася бяда, дзяцел Дзіма. А справа ў тым, што мне дазволіла Баба-Яга палётаць. А я ж ніколі не лятаў на верталёце. Сеў я ў верталёт і паляцеў. Падчас палёту зачапіўся за верхавіны дрэў і ўпаў. Верталёт моцна пашкодзіўся і не заводзіцца.

Б а б а-Я г а. Як мне цяпер жыць? Мне ўжо сто гадоў. Я не магу на старой мятле лётаць па лесе, мне на ёй нязручна і страшна, галава кружыцца, старыя ногі трымцяць. Я так палюбіла свой верталёцік, што жыць без яго не змагу. Можа, ты, наш майстар, паглядзіш і адрамантуеш яго? Га?.. (*Абдымае верталёт і цалуе яго.*)

Д з я ц е л  Д з і м а. Калі вы ўсе так просіце, то я абавязкова яго пагляджу, а калі змагу, то і адрамантую.

Б а б а-Я г а. Ой, дзякуй, дзякуй табе, дзятлік Дзіма!

Д з я ц е л  Д з і м а. Рана яшчэ дзякаваць. Можа, у мяне нічога не атрымаецца, я ж першы раз у жыцці буду рамантаваць верталёт… (*Бярэ інструменты і падыходзіць да верталёта. Да яго падбягае заяц.*)

З а я ц. Найперш паглядзі рухавік…

Б а б а-Я г а. Як быццам ты ведаеш, што такое рухавік.

З а я ц. Ведаю. Гэта тое, што рухае верталёт.

Д з я ц е л  Д з і м а. Правільна, зайка. З рухавіка я і пачну рамонт.

М я д з в е д з ь. А каб табе было весела працаваць, мы праспяваем прыпеўкі.

Б а б а-Я г а. Я не буду спяваць, мне цяпер не да спеваў.

М я д з в е д з ь. Ты будзеш не толькі спяваць, але і скакаць разам з намі. Праўда, касавокі?! Пачынай, Ёжка!

Загучала музыка.

Б а б а-Я г а (*заспявала*).

Самалёцік мой ляціць —  
Крылы ў яго белыя.  
Мы з табою, касавокі,  
Вельмі-вельмі смелыя.

З а я ц.

Каб не сумна нам лятаць  
Было ў паднябессі,  
Мы з табою, Баба-Ёжка,  
Праспяваем песні.

М я д з в е д з ь.

А мяне ваш верталёт  
Не падніме ў неба,  
Я баюся ваш палёт,  
Мне яго не трэба.

Б а б а-Я г а.

Ты не бойся вышыні,
Касалапы Мішка,
А баяцца яе станеш —
Будзе табе крышка.

З а я ц.

Мішка любіць вельмі мёд,
Пчол ён паважае.
Возьмем Мішку мы ў палёт —
Ён па мёд злятае.

М я д з в е д з ь.

Ах, чаму не птушкі мы?
Адкажы мне, зайка.
Ў неба мы заўжды ўзляталі б
Вечарам і ранкам…

Баба-Яга, заяц і мядзведзь, вясёлыя, танцуюць і спяваюць. Іх весялосць спыняе голас дзятла Дзімы: «Усё-о-о!»

Б а б а-Я г а, м я д з в е д з ь і з а я ц (*разам, спыняючы скокі, здзіўлена і спалохана*). Што ўсё?!

Д з я ц е л Д з і м а. Адрамантаваў!

Б а б а-Я г а, м я д з в е д з ь і з а я ц (*разам*). Ура! Ура! Ура!..

Б а б а-Я г а. Вялікі дзякуй табе, дзяцел Дзіма! Я цябе ніколі не забуду. Цяпер я ўжо буду ведаць, хто зможа адрамантаваць маю мятлу-верталёт. (*Сядае ў верталёт, заводзіць яго, разганяецца і знікае.*)

З а я ц. Ты мяне выратаваў, дзяцел Дзіма. Калі б не ты, мяне Баба-Яга забіла б. Яна так перажывала, так хвалявалася, што проста табе не расказаць…

М я д з в е д з ь. Дзякуй, сапраўды, а то з-за гэтага верталёта ўвесь наш лес захваляваўся, нават дрэвы сталі гаманіць і шумець не так, як заўсёды. Патрывожыла нас усіх Баба-Яга сваім верталётам-недалётам. І хто гэта ёй падарыў такую дзіўную машыну? Ты не ведаеш, дзяцел Дзіма?

Д з я ц е л Д з і м а. Не, не ведаю.

З а я ц. Яна ж сказала, што з Кітая…

Д з я ц е л Д з і м а. З Кітая? Дык гэта зусім не кітайскі верталёт!

М я д з в е д з ь і з а я ц (*разам*). Як не кітайскі? Значыць, яна нас усіх падманула, ашукала?.. Так атрымліваецца?..

Д з я ц е л Д з і м а. Так. Але ж няхай ужо лётае. Тым больш што яна старая, нядужая. Ёй ногі баляць, цяжка рухацца… Не перажывайце, сябры. Дазвольце з вамі развітацца, калі што спатрэбіцца, тэлефануйце. Да пабачэння! (*Развітваецца.*)

М я д з в е д з ь і з а я ц (*разам*). Да пабачэння, дзяцел Дзіма! Да сустрэчы!

Дзяцел Дзіма знікае. Мядзведзь і заяц застаюцца на паляне адны.

Заяц (*задумліва*). Нешта тут, Патапыч, не тое. Мне не падабаецца гэта сітуацыя з верталётам.

Мядзведзь. І мне неяк трывожна стала.

Раптам пачуўся гул і свіст. На паляну зноў прылятае Баба-Яга.

Паслухай, мы тут пачулі адну навіну…

Баба-Яга. Якую?

Заяц. Навіна гэта цябе не парадуе.

Баба-Яга. Чаму?

Заяц. Бо твой верталёт не быў зроблены ў Кітаі.

Баба-Яга. А дзе?

Мядзведзь. Вось мы і хочам у цябе запытацца, дзе ты ўзяла чарадзейную мятлу-верталёт?

Баба-Яга. Я вам сказала, дзе ўзяла і хто мне падарыў, больш паўтараць не буду. (*Заводзіць верталёт і пачынае разганяцца.*)

Здалёк пачуўся голас дзятла Дзімы: «Сябры, трымайце Бабу-Ягу, яна нас усіх падманула, ашукала!»

Дзяцел Дзіма (*выбягае на паляну з тэлефонам у руках*). Дзе яна?

У гэты час знікае на верталёце Баба-Яга.

Мядзведзь і заяц (*разам*). Паляцела ўжо.

Дзяцел Дзіма. Гэта не яе верталёт!

Мядзведзь і заяц (*разам, здзіўлена*). Як не яе?

Дзяцел Дзіма. Вось так. Толькі што мне патэлефанавалі з Белавежскай пушчы і сказалі, што яна з лясной бальніцы ўкрала верталёт.

Заяц. А, што ёй з Кітая на стагадовы юбілей прыслалі кітайскія Бабы-Ёжкі гэты верталёт у падарунак!..

Дзяцел Дзіма. Гэта няпраўда. Яна зладзейка-шахрайка!

Мядзведзь. А навошта лясной бальніцы верталёт?

Дзяцел Дзіма (*здзіўлена*). Як навошта? Калі раптам нехта захварэе ці здарыцца бяда, доктар і лётчык сядаюць у верталёт і ляцяць туды, дзе знаходзіцца хворы ці пацярпелы. Прызямляюцца і аказваюць першую медыцынскую дапамогу. Альбо хуценька дастаўляюць хворага ў лясную бальніцу.

Заяц. Дык у верталёце толькі адно месца.

Дзяцел Дзіма. Там тры месцы, проста Баба-Яга іх адкруціла і пакінула адно пасадачнае месца толькі для сябе.

Мядзведзь. Вось яно што… Ага!..

Заяц. І што мы будзем цяпер рабіць?

Дзяцел Дзіма. Трэба злавіць Бабу-Ягу і забраць верталёт. А пасля вярнуць яго ў лясную бальніцу.

Мядзведзь. А як мы яе з верталётам цяпер зловім? Паспрабуй яе злавіць, калі яна пастаянна ў небе.

З а я ц. Нешта трэба такое прыдумаць, каб яна сама сюды прыляцела.

Д з я ц е л  Д з і м а. Трэба паслаць ёй эсэмэску і напісаць, што ў яе верталёт няспраўны.

М я д з в е д з ь. А мабільны тэлефон у яе ёсць?

З а я ц. Ёсць. У яе адной з першых у нашым лесе з'явіўся мабільнік.

Д з я ц е л  Д з і м а. Ого! Крутая стагадовая бабуля!

М я д з в е д з ь. Не, так мы яе не падманем. Яна хітрая бабка.

З а я ц. А давайце паспрабуем!

М я д з в е д з ь. Яна здагадаецца, што гэта ты, заяц, альбо я прыслалі.

Д з я ц е л  Д з і м а. А давайце я са свайго мабільніка ёй дашлю эсэмэску.

М я д з в е д з ь  і  з а я ц (*разам*). О, правільна. Яна твайго нумара не ведае.

З а я ц. Набірай…

Мядзведзь і заяц глядзяць, як дзяцел Дзіма дастае мабільны тэлефон і пачынае набіраць эсэмэску.

Д з я ц е л  Д з і м а (*набірае СМС і ўслых прамаўляе*). Паважаная Баба-Яга. Гэта вам пішуць са станцыі абслугоўвання верталётаў Белавежскай пушчы. Паведамляем, што ваш верталёт тэрмінова павінен прайсці тэхнічны агляд, інакш можа адбыцца авіякатастрофа. Таму на ім часова нельга лётаць. Патэлефануйце нам, дзе мы можам паглядзець ваш верталёт і выпісаць вам дазвол на палёты. Шчыры дзякуй!

З а я ц. Выдатна, дзяцел Дзіма!

М я д з в е д з ь. Цудоўна ты прыдумаў, Дзімусік! Адпраўляй ёй гэту эсэмэску, вось яе нумар. (*Паказвае свой мабільнік з тэлефонам Бабы-Ягі.*)

Д з я ц е л  Д з і м а (*перапісвае нумар і адпраўляе СМС*). Усё, адправіў. Будзем чакаць вынікаў.

Баба-Яга адразу патэлефанавала.

Гэта тэлефануе Баба-Яга…

З а я ц. Размаўляй з ёю.

М я д з в е д з ь. Няхай прылятае сюды, і тут мы яе затрымаем!

Д з я ц е л  Д з і м а. Алё! Станцыя абслугоўвання верталётаў слухае.

Б а б а-Я г а. Добры дзень, станцыя! Гэта Баба-Яга. Я тэлефаную наконт тэхагляду майго верталёта. Мне тэрмінова трэба прайсці гэты тэхагляд, бо я баюся, каб верталёт, і я разам з ім, не ўпаў.

Д з я ц е л  Д з і м а. Правільна вы разважаеце, таму нашы майстры ўжо цяпер падрыхтаваныя для агляду вашага верталёта. Прылятайце на самую вялікую паляну ў пушчы, мы будзем чакаць.

Б а б а-Я г а. Добра. Вылятаю, чакайце!

Чутны кароткія тэлефонныя гудкі, сувязь спынілася.

З а я ц. Нам трэба тэрмінова ўсім схавацца. А калі яна прыляціць сюды, мы яе і схопім.

М я д з в е д з ь. Яна хітрая, можа ўцячы ад нас, і мы яе не дагонім. Трэба нешта прыдумаць, каб адразу схапіць яе.

З а я ц. І што прыдумаць, як яе злавіць і аддаць пад лясны суд?

М я д з в е д з ь. Ды не трэба яе судзіць. Трэба проста забраць украдзены верталёт і вярнуць яго ў лясную бальніцу. А яе выгнаць з нашай пушчы.

Д з я ц е л Д з і м а. А давайце мы кожны сабе на галаву надзенем мяшкі, зробім дзірачкі для вачэй, і, калі верталёт тут прызямліцца, мы выйдзем, і яна нас адразу не пазнае, спалохаецца. Мы яе акружым і гэтыя мяшкі накінем на яе і схопім.

М я д з в е д з ь. Ідэя нядрэнная. А калі яна спалохаецца і пачне ўцякаць?

З а я ц. Тады мы яе не дагонім…

Д з я ц е л Д з і м а. Галоўнае, каб забраць верталёт. Гэта наша асноўная задача.

З а я ц. І напалохаць Ёжку.

М я д з в е д з ь. Хопіць разважаць, давайце пакінем гэтую паляну, бо хутка сюды прыляціць Баба-Яга.

Д з я ц е л Д з і м а. А яшчэ я прапаную напісаць на мяшках адно слова.

З а я ц. Якое?

Д з я ц е л Д з і м а. Слова «майстар».

М я д з в е д з ь. Добрая прапанова. Баба-Яга падумае, што на самай справе мы тэхнічныя майстры, умеем рамантаваць і ажыццяўляць тэхагляды верталётаў.

З а я ц. Значыць, так і зробім. Але ж яна чытаць не ўмее…

Д з я ц е л Д з і м а. Мы прачытаем для яе.

Усе знікаюць. Раптам пачуўся гул, свіст, лямант. На паляну на верталёце прызямляецца Б а б а-Я г а. Вылазіць з кабіны, азіраецца.

Б а б а-Я г а. Вось і я. Дзякаваць Богу, прызямлілася паспяхова. (*Пачынае сама з сабой размаўляць.*) Нешта я тут нікога не бачу. Цішыня анямелая. А дзе тыя майстры, якія рамантуюць верталёты? Я ўжо прыляцела, а майстроў няма. Дзіўная сітуацыя. Трэба патэлефанаваць. (*Дастае тэлефон, набірае нумар і тэлефануе дзятлу Дзіму.*)

Г о л а с д з я т л а Д з і м ы (*чуецца ў трубцы*). Алё! Я слухаю!

Б а б а-Я г а. Гэта майстар па верталётах?

Г о л а с д з я т л а Д з і м ы. Так. Гэта станцыя абслугоўвання верталётаў.

Б а б а-Я г а. Я прыляцела ўжо на паляну, калі вы будзеце аглядаць мой верталёт?

Г о л а с д з я т л а Д з і м ы. Хутка. Пачакайце хвіліну.

Б а б а-Я г а. Добра. Чакаю вас.

Баба-Яга кладзе тэлефон і заўважае, як на паляну выходзіць адзін мяшок. У мяшку хаваецца д з я ц е л Д з і м а.

Ой, хто гэта і што гэта?

Д з я ц е л Д з і м а. Чытайце, што тут напісана.

Б а б а-Я г а (*імкнецца прачытаць, але яна не ўмее чытаць і не ведае літар*). Я не ўмею чытаць, я не вучылася ў школе.

Д з я ц е л Д з і м а (*падыходзіць бліжэй да Бабы-Ягі*). Вы не ўмееце чытаць? (*Здзіўляецца.*) А як вы кіруеце верталётам?

Б а б а-Я г а. Проста ведаю, дзе знаходзіцца кожная кнопка і дзе які рычаг, вывучыла іх, таму і ўмею.

Д з я ц е л  Д з і м а. Той, хто не вучыўся ў школе, той, хто не ўмее чытаць і пісаць, той, хто не ўмее лічыць…

Б а б а-Я г а (*перабівае дзятла*). Лічыць я ўмею лепш за ўсіх!

Д з я ц е л  Д з і м а. Калі ласка, палічыце, колькі вакол нас елак, бяроз, дубоў і асін.

Б а б а-Я г а (*пачынае лічыць*). Адзін, два, тры, пяць, шэсць, дзевяць… трынаццаць…

Д з я ц е л  Д з і м а. Стоп, стоп, стоп. Хопіць! Зусім няправільна.

Б а б а-Я г а. Усё правільна. Гэта ты неадукаваны майстар па верталётах.

Д з я ц е л  Д з і м а. Тады прачытайце, што тут напісана. (*Паказвае на мяшок са словам.*)

Б а б а-Я г а (*глядзіць здзіўлена на слова*). Тут напісана… тут напісана, што ты… дрэнны майстар. І наогул, хто ты такі?

Д з я ц е л  Д з і м а. Майстар, які абслугоўвае верталёты.

Б а б а-Я г а. І ты адзін абслугоўваеш верталёты?..

Д з я ц е л  Д з і м а. Не, не адзін. Вось яшчэ мае майстры.

На паляну выходзяць м я д з в е д з ь  і  з а я ц у мяшках.

М я д з в е д з ь  і  З а я ц (*разам*). І мы майстры, дапамагаем абслугоўваць верталёты і самалёты.

Б а б а-Я г а (*спалохана*). І самалёты?

З а я ц. І самалёты таксама.

М я д з в е д з ь. Усё, што лётае над нашым лесам, мы рамантуем.

З а я ц. І нават рамантуем машыны, мапеды і… скутары… (*Усе смяюцца.*)

Дзяцел Дзіма, заяц і мядзведзь у мяшках акружылі Бабу-Ягу.

Б а б а-Я г а. А як вы рамантуеце і абслугоўваеце, калі ў вас няма рук?

Д з я ц е л  Д з і м а, з а я ц  і  м я д з в е д з ь (*разам*). Ёсць! Вось яны!..

Усе адначасова скідваюць мяшкі, паказваюць рукі, пасля бяруцца за рукі і акружаюць Бабу-Ягу. Яна хоча вырвацца, але яе не пускаюць. Заяц і мядзведзь гавораць, нібы чытаюць паэтычныя радкі.

З а я ц (*злосна*). Ты — манюка ў нашай пушчы.

М я д з в е д з ь. Ты — зладзейка ў нашай пушчы.

З а я ц. Мы цябе адсюль не пусцім.

М я д з в е д з ь. І ты ў свет не паляціш…

Усе разам трымаюць Бабу-Ягу. Потым хапаюць яе, і дзяцел Дзіма вяроўкаю звязвае ёй рукі.

Б а б а-Я г а (*крычыць*). Гэта несправядліва! Я буду пісаць скаргу ў лясную ахову! Адпусціце мяне, адвяжыце!

Баба-Яга, прывязаная, сядзіць каля верталёта.

Д з я ц е л  Д з і м а. Супакойся!

З а я ц. Мы цяпер цябе будзем судзіць лясным звярыным і птушыным судом.

М я д з в е д з ь. Судзіць за тое, што ўкрала ў лясной бальніцы верталёт, а нас падманула і сказала, што табе яго падарылі з Кітая. Навошта ты так зрабіла? Га?..

Б а б а-Я г а. Мне так захацелася… Я хацела палётаць над лесам, як жураўлі, высока-высока ў небе…

Д з я ц е л  Д з і м а. Не трэба тут філасофстваваць!

З а я ц. У цябе ёсць мятла, вось і лётай колькі хочаш.

Б а б а-Я г а. Мне не падабаецца на мятле, сумна на ёй лётаць, баюся ўпасці, я ж зусім старая, няшчасная… (*Прыкідваецца, што плача.*)

М я д з в е д з ь. Тады сядзі ў сваёй хатцы на курыных ножках і не перашкаджай жыць і радавацца жыццю ўсім лясным жыхарам.

Б а б а-Я г а. Я ім не перашкаджаю, няхай жывуць.

З а я ц. Але ж ты вінаватая, што ўкрала верталёт, вельмі важны транспарт у нашай пушчы. Ты — зладзейка, махлярка!..

Д з я ц е л  Д з і м а. Хопіць з ёй гутарыць. Трэба тэрмінова даставіць верталёт у лясную бальніцу, там яго чакаюць, і ён вельмі патрэбны. Тым больш што па свеце ходзіць страшная хвароба — каранавірус, які можа хутка дабрацца і да нашай пушчы. Таму толькі на верталёце можна даляцець да самых далёкіх лясных палянак, сцяжынак і крыніц, каб аказаць усім неабходную дапамогу. Таму давайце мы спачатку адкоцім яго з гэтай паляны, а там лясныя лётчыкі верталёт забяруць, і ўсё будзе добра.

М я д з в е д з ь. А тады разбяромся і з Бабай-Ягой.

З а я ц. Дапамагай, Ёжка! Хопіць ныць, добра хоць, што не разбіла верталёт і сама не загінула.

Баба-Яга ўстае, звязаная, але бокам дапамагае піхаць верталёт разам з усімі з лясной паляны за кулісы. Калі верталёт схаваўся, усе вярнуліся на паляну. І прывялі Бабу-Ягу.

Д з я ц е л  Д з і м а. Дык што з ёй будзем рабіць? (*Паказвае на Бабу-Ягу.*)

З а я ц. Яе трэба за гэты дрэнны ўчынак расстраляць… (*Усміхаецца непрыкметна.*)

М я д з в е д з ь. Не, не, яе трэба ўтапіць у самай глыбокай сажалцы, на самае глыбокае дно апусціць.

Б а б а-Я г а. Ой, што вы прыдумалі, як гэта расстраляць, як гэта на дно сажалкі апусціць?! Я баюся такой кары… Ой, баюся!

З а я ц. А красці наша лясное нацыянальнае дабро ты не баялася?! Верталёт — гэта наш агульны лясны скарб. Яго трэба берагчы ўсім лясным звярам і птушкам. Для ўсіх нас берагчы. А ты ўсё зрабіла наадварот.

М я д з в е д з ь. Адна лётала над лесам, ганарылася, задавалася… Ух!.. (*Замахнуўся на яе лапай.*)

Б а б а-Я г а. Прабачце, я больш не буду. Я вінаватая. Шчыра вам кажу: я так рабіць больш не буду. Развяжыце мяне…

Раптам пачуліся гул, свіст, лямант.

Д з я ц е л  Д з і м а. Гэта лётчыкі забралі верталёт. Паляцелі яны ў лясную бальніцу.

З а я ц. Шчаслівай ім дарогі!

Б а б а-Я г а. Развяжыце мяне, я вас прашу! Я больш нічога дрэннага рабіць не буду. Гэта была памылка майго жыцця. Я каюся... Я вельмі шкадую пра гэта. Я вінаватая ва ўсім.

М я д з в е д з ь. А можа, сапраўды, даруем ёй усё тое, што яна натварыла тут?

Б а б а-Я г а. Даруйце мне, калі ласка, развяжыце рукі, яны старыя, баляць. І ногі баляць, і ўсё баліць. Нельга ж старых крыўдзіць! Праўда я кажу, дзяцел Дзіма?

Д з я ц е л  Д з і м а. Кажаш праўду. Гэта так! Старых нельга крыўдзіць. Але ж ты зладзейка, а на злодзеі і шапка гарыць.

Б а б а-Я г а. У мяне няма шапкі, я шапкі не крала, у мяне ёсць свая хустка.

Усе смяюцца.

М я д з в е д з ь. Хто парася ўкраў, таму ў вушах пішчыць...

Б а б а-Я г а. Я парася не крала, навошта мне парася?.. (*Плача.*)

Усе зноў рагочуць.

З а я ц. Можа, ты хочаш і мядзведзя з ільвом украсці?

Б а б а-Я г а. Не хачу. Я хачу на волю. Адвяжыце мяне і адпусціце!

М я д з в е д з ь. А можа, і праўда даруем ёй усё свавольства? Яна больш такое ўчыняць не будзе. Не будзеш, старая?!

Б а б а-Я г а. Не буду, не буду, шчыра вам усім кажу, я добрая.

Д з я ц е л  Д з і м а. Так і быць, першы і апошні раз даруем табе твой несумленны ўчынак.

Б а б а-Я г а (*плача ад радасці*). Дзякуй вам, дзякуй, што даравалі мне. Я сапраўды паступіла вельмі дрэнна, неабдумана. Клянуся лясной цішынёй, што больш так ніколі рабіць не буду. Чужога чапаць не асмелюся. Ды і нельга так рабіць, нельга.

З а я ц. Правільна, Ёжка, ты разважаеш. Давай я цябе развяжу. (*Развязвае рукі Бабы-Ягі.*)

Б а б а-Я г а (*енчыць*). Ох, ручкі мае, ручанькі! Ацяклі ўсе, баляць, ныюць. О, ручкі мае, ручанькі!..

Д з я ц е л  Д з і м а. Хопіць, хопіць!

Б а б а-Я г а. І што вы цяпер са мной будзеце рабіць?

М я д з в е д з ь. Нічога. У лясную турму адвязём... І ўсё!

Б а б а-Я г а. У турму? Мяне? Старую і нядужую?..

З а я ц. Цябе! Каб больш ніколі чужога не брала.

Б а б а-Я г а. Не буду, клянуся ўжо сваёй старой мятлой!

Д з я ц е л  Д з і м а. А дзе твая мятла?

Б а б а-Я г а. Няма ўжо ні верталёта, ні мятлы, а магчыма — і хаткі не засталося. І як я буду жыць, дажываць да глыбокай старасці?!

М я д з в е д з ь. Цікава, а колькі гадоў жывуць Бабкі-Ёжкі?

Д з я ц е л  Д з і м а. Магчыма, тысячу гадоў. (*Здзекліва смяецца.*)

З а я ц. А можа, і ўсе дзве тысячы гадоў...

Б а б а-Я г а. Не-не-не, столькі я не пражыву...

Усе смяюцца.

М я д з в е д з ь. Ты ў нашай Белавежскай пушчы будзеш доўгажыхаркай. Пра цябе напішуць усе лясныя газеты свету. З інтэрнэту ты сыходзіць не будзеш.

З а я ц. Праглядаў будзе мільёны. Ты станеш самай багатай Бабай-Ягой у свеце. Нават у Кітаі такой не будзе.

Усе зноў смяюцца.

Д з я ц е л Д з і м а. А потым купіш сабе верталёт ці самалёт і будзеш лётаць над лясамі і палямі, гарадамі і вёскамі, марамі і акіянамі.

М я д з в е д з ь. А можа, нават паляціш на Месяц!

З а я ц. І будзеш першым касманаўтам Бабай-Ягой у свеце…

Д з я ц е л Д з і м а. А можа, завітаеш і ў той Кітай!..

Усе рагочуць.

Б а б а-Я г а. Ой, хопіць вам здзекавацца са старой. Што ж мне цяпер рабіць, як далей жыць без верталёта, мятлы і хаткі?

Д з я ц е л Д з і м а. Ды ёсць у цябе хатка, ёсць. Не хвалюйся.

Б а б а-Я г а. Ёсць?! Дзякуй вялікі! Ты мяне парадаваў.

М я д з в е д з ь. Ды яе ніхто ў цябе і не забіраў. Стаіць, як стаяла. Жыві і радуйся жыццю!

З а я ц. І не рабі лясным жыхарам шкоды. Зразумела?

Б а б а-Я г а. Зразумела. Хопіць ужо пра гэта, адно і тое ж тарабаніце мне пад вуха.

Д з я ц е л Д з і м а. Я хуценька прыйду, пачакайце тут мяне. (*Выходзіць.*)

З а я ц. І я хутка вярнуся. (*Выбягае.*)

Б а б а-Я г а. А куды яны пайшлі?

М я д з в е д з ь. Не ведаю, мне самому цікава, што гэта яны задумалі…

Б а б а-Я г а. А можа, яны мяне хочуць арыштаваць?

М я д з в е д з ь. Ды каму ты патрэбна? Га? Каму?..

Б а б а-Я г а (*плача*). Нікому. Я адна ўсё жыццё пражыла… Свету не бачыла, пушчы нашай добра не ведаю…

Выбягае з а я ц з мятлой у руках.

З а я ц (*крычыць*). Баба-Ёжка, я прынёс табе новы падарунак!..

Б а б а-Я г а (*здзіўлена*). А што за падарунак?

З а я ц. Я прынёс ад усіх нас табе новую мятлу. Вось яна, трымай падарунак! (*Уручае мятлу.*)

Б а б а-Я г а (*бярэ яе і разглядае*). Я гэты падарунак не заслужыла, навошта вы мне яго далі?

М я д з в е д з ь. З надзеяй на будучыню, зразумела?

Б а б а-Я г а (*усміхнулася, трымаючы ў руках мятлу, па-ранейшаму разглядае яе*). А як я на ёй буду лётаць?

У гэты момант на паляну выходзіць д з я ц е л Д з і м а са скрынкаю ў руках. На скрынцы напісана слова «Рухавік».

З а я ц. Чытай, бабуля, што тут напісана!

Б а б а-Я г а. Ты лепш, даражэнькі, мне прачытай, я без акуляраў не бачу ўжо.

Д з я ц е л Д з і м а. Ты ўсё бачыш, проста не ўмееш чытаць, як і ўсе Бабы-Ёжкі.

Б а б а-Я г а. Так! Не ўмею, шкада. За сто гадоў так і не навучылася…

М я д з в е д з ь. А тут напісана адно слова: «Ру-ха-вік». (*Звяртаецца да Бабы-Ягі.*) Ведаеш, што такое рухавік?

Б а б а-Я г а. Не, не ведаю.

З а я ц. Гэта тое, што будзе рухаць тваю новую мятлу і цябе. Вось паглядзіш зараз. Даставай, дзяцел Дзіма, рухавік.

Д з я ц е л Д з і м а (*дастае рухавік і прычапляе да мятлы*). Сядай, Баба-Ёжка, пакажу, як карыстацца.

Б а б а-Я г а. Ой, я баюся…

М я д з в е д з ь. На верталёце лётаць не баялася, а на мятле з рухавіком баішся. Дзіўная ты! Ці хітрая? Не магу зразумець…

З а я ц. Сядай, я дапамагу.

Баба-Яга асцярожна сядае на мятлу, а дзяцел Дзіма паказвае, як трэба карыстацца рухавіком.

Д з я ц е л Д з і м а. Як толькі ты села на мятлу, адной рукой трымайся за кіёк, а другой рукой за гэтую вяровачку. (*Паказвае, якую.*) *А* потым пацягні вяровачку, і рухавік завядзецца, разганяйся — і ты паляціш.

Б а б а-Я г а. А калі я захачу прызямліцца, то што мне рабіць?

Д з я ц е л Д з і м а. Ды нічога складанага. Табе толькі трэба будзе сказаць чарадзейныя словы: «Мятла, мятла, пасадзі мяне на зямлю, якую я вельмі люблю». І мятла паціху пачне апускацца.

М я д з в е д з ь. Толькі высока не ўзлятай, а то мятла можа цябе не паслухацца. Вышэй за вершаліны дрэў не ўзнімайся. Зразумела?

Б а б а-Я г а. Зразумела.

З а я ц. А калі будзеш красці чужое і падманваць лясных жыхароў, то мятла гэтая завязе цябе ў далёкі Кітай, і ты ніколі адтуль не вернешся.

Б а б а-Я г а. Абяцаю, што ўсё будзе добра. І я буду самай шчаслівай, добрай, шчырай Бабкай-Ёжкай!..

Д з я ц е л Д з і м а. А цяпер пара на старт. Заводзь рухавік! Разганяйся і ляці, куды пажадаеш.

Б а б а-Я г а. Палячу дамоў, у сваю хатку. Хачу адпачыць ад усяго, ды і вам пара на адпачынак.

М я д з в е д з ь. А я яшчэ свой мёд не даеў. Хачу мёду…

З а я ц. Разганяйся, Ёжка!

Б а б а-Я г а заводзіць рухавік, разганяецца і знікае.

Д з я ц е л Д з і м а. Узляцела добра. Няхай ляціць, старая яна, нядужая ўжо стала. Шкада яе.

М я д з в е д з ь. Няхай адпачывае!

З а я ц. А давайце на развітанне праспяваем песеньку. Ну, што-небудзь пра шчасце. Каб усе мы разам у нашым лесе і ўсе дзеткі ў свеце былі шчаслівымі.

Д з я ц е л Д з і м а і м я д з в е д з ь (*разам*). Давайце.

Гучыць музыка.

З а я ц, м я д з в е д з ь і д з я ц е л Д з і м а (*спяваюць*).

Хмарка ў неба паляцела,
Адчыніла дзверы насцеж.
Ў небе сонейка смяецца —
Рассыпае промні шчасця.

*Прыпеў:*
Шчасце — гэта сонца,
Наша пушча — шчасце,
Жыць нам тут бясконца,
Жыць і усміхацца.

Хай жывуць у нашым лесе
Ўсе, хто пажадае.
І бяды ніхто ніколі
Хай не сустракае.

*Прыпеў:*
Шчасце — гэта сонца,
Наша пушча — шчасце,
Жыць нам тут бясконца,
Жыць і усміхацца.

З а с л о н а.



## Сяргей Чыгрын

нарадзіўся 24 верасня 1958 года ў вёсцы Хадзявічы Слонімскага раёна. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1985). З'яўляецца аўтарам зборнікаў паэзіі «Шчырая Шчара» (1993), «Горад без цябе» (1999), «Лірыка» (2007), «Камень Міндоўга» (2009); шматлікіх літаратуразнаўчых артыкулаў і гісторыка-краязнаўчых кніг: «Янка Купала і Слонімшчына» (1993), «Родам са Слонімшчыны» (2003), «Пакліканыя на родны парог» (2005), «Чамяры і чамяроўцы» (2006), «У пошуках слонімскіх скарбаў» (2007), «Тэатр у Слоніме» (2008), «Альбярцін», (2011), «Па слядах Купалы і Коласа» (2012), «Такі іх лёс» (2012), «Слонімскія падмуркі» (2012), «Сярод сваіх людзей» (2012), «Іншых шляхоў не было» (2013), «Легенды і паданні Слонімшчыны» (2013), «Слонімшчына. Гістарычныя нататкі» (2019), «Гістарычная мазаіка Слонімшчыны» (2019), а таксама кніг «Слонік і гармонік» (2021), «Загадка ад сінічак» (2023) і іншых. Жыве ў Слоніме.

# Сатыра і гумар

## Іван Буднік

### Ліса-будаўнік

На птушкаферме ў навальніцу
Абрынуўся прагнілы плот.
Развал убачыўшы, Лісіца
Змікіціла на тым разжыцца,
Гаспадара ўзяла у абарот:
— Узвесці хутка агароджу
Мне Усявышні дапаможа,
Бо я — курыны патрыёт
І не адзін паставіла ўжо плот.
За ўсе гады маёй работы
Я мела розныя турботы,
А вынік — у мяне
Ні мыш, ні воўк не прашмыгне,
Камар там носа не падточыць.
А вось чубаткі, як захочуць,
Няхай наказ мне прасакочуць.
Пры узвядзенні пабудовы
Мо я ўлічу іх прапановы.
На тым сышліся,
І хутка сцены падняліся.
І быў узведзены парадны
Уезд, шыкоўны і прывабны,
А ў тыл вілася змейкай
Лісе вядомая лазейка,
Дзе для яе выгод
Пракладзены падземны ход.
Цяпер Ліса «наверняка»
Тут мела «курку табака».

Выснова просіцца сама
І нам даецца задарма:
Калі Лісе даверыць плот,

То ўжо праз пару год
Чубаткі знікнуць і прыплод.

## Свіння-дызайнер

Свіння прапанавала Мужыку
Дызайн навесці ў агародзе,
Бо ў ім зямля ўжо дрэнна родзіць
І ўсё расце, як на таку.

Паскроб патыліцу Мужык,
Зірнуўшы у свіныя вочы.
Ужо ён да ўсяго прывык,
Абдураны быў не аднойчы,
Але дызайнеру паверыў
І агарод яму даверыў,
Каб па навейшай модзе
Парадкі ўвесці ў агародзе.

Свіння ўвяла свае парадкі:
Паўсюль нарыла ўзгоркі, ямы.
А пасярод таго бедламу
У цэнтры лужыну стварыла,
Дзе, закапаўшыся па рыла,
Свой дзень працоўны завяршала,
Пасля ў бярлозе спачывала.

У дзень умоўлены Мужык
З'явіўся ў агародзе —
Аслупянеў,
Нібы прысох язык:
— Я на такі дызайн не згодзен!
Тут здзек з зямлі, разбой,
Я развітаюся з табой.
Табе дарога акурат —
На мясакамбінат!

Такіх служакаў часам маем,
Што сцерагуць свой інтарэс,
А нас прываблiваюць раем.
Тады адбудзецца прагрэс,
Як іх мятлой павымятаем.

## УЛАДЗІМІР ВАСЬКО

### Пчаляр, мядзведзь і ліса

Пчаляр застаў мядзведзя пры вуллі.
— Ты што задумаў, касалапы Мішка?
Ты пчол ні разу цукрам не карміў,
а хочаш мёд дастаць,
як бульбу з прыска.
— Спадар пчаляр, я многа не хачу.
Спатоліць прагу і малая міска.
Я еўрыкамі тут жа заплачу.
Ды не скупіся, — узмаліўся Мішка.
— А дзе ты ўзяў тых еўрыкаў, прахвост?
Абрабаваў, напэўна, банк у Лідзе?
І іх схаваў пад той драўляны мост,
які ўжо інкасатарам абрыдзеў?
— Я раніцай пазычыў у лісы.
Яна зняла працэнты з дэпазіта.
Мы з ёю дружым,
разам ноччу спім,
ямо прысмакі з аднаго карыта.
Характар вельмі добры ж у лісы.
І сёння грошай мне не шкадавала:
сабе купіла новыя трусы,
а рэшту мне на мёд ахвяравала.
— Бяжы, мядзведзь, адсюль, пакуль крычу,
табе не давяраю я нікольки,
бо зараз вось калом як змалачу —
забудзеш пра лісу і мёд салодкі.

Пабег мядзведзь сцяжынкаю лясной.
Яго міліцыянты не дагналі б.
А ноччу з той пакладзістай лісой
у пчаляра усе вуллі пакралі…

### Перапюбы

Перапюбы дзяцел палюбіў
і лётаў ад сініцы да зязюлі.
Яго прымалі:
ён прыгожы быў,

насіў шматкаляровыя кашулі.
Ды пра сябе падумала сава:
«А чым я горшая за кволую сініцу?
І галава ў мяне як галава,
і вочы могуць фарамі свяціцца.
Не, дзятла я усё-ткі прыманю
ці праўдай, ці салодкаю манюю.
Падкіну ўміг любоўнага агню —
і ён паваліцца перада мною».
Паціху падляцела — і давай
Настырна расфуфырваць чары:
— Табе спяку я смачны каравай,
прыпаднясу гарэлкі моцнай чарку.
Ты будзеш на падушцы мяккай спаць,
не на сухой, ігольчатай кастрыцы.
Цябе я буду ноччу цалаваць.
Мы можам нават сёння пажаніцца.
І дзяцел здаўся,
прымаком пайшоў
да гэтай самай совушкі-савіцы.
Яна яго адзела ў новы шоўк,
пляла й пра залатыя небыліцы.
Ён кожны дзень ахвотна піў і еў,
дапамагаў дзятве рабіць урокі.
А цераз год — ужо пераляцеў
да белабокай маладой сарокі.

## Перапала

Сініца слугавала ў вераб'я:
варыла стравы,
мыла ложкі, міскі,
давалася сябе ў кутку абняць,
калі нікога не было паблізку.
А ён такі разбэшчаны хадзіў,
зняважліва паглядваў на суседзяў,
ні з кім сяброўства ў вёсцы не вадзіў
і піва выпіваць у горад ездзіў.
Раскашаваў гадоў так пяць ці сем,
не ведаў ні турбот ані, ні скрухі.
І дом яго быў як жывы эдэм,
дзе ён не атрымоўваў аплявухі.
Але аднойчы на зыходзе дня,

калі сініцу цiскаў ён на кухні,
заспела вераб'іха вераб'я
і гвазданула чарпаком у вуха.
Любоўнік не паспеў і рук разняць,
і не знайсці для апраўдання словы —
пасыпалася пер'е з вераб'я,
як поўсць з худой, ліняючай каровы.

## Дзед і пацук

Не знэнджаны пацук шукаў яду ў хляве,
дзе не было ні клеткі,
ні карыта,
бо гаспадар той жыўнасці не меў:
найбольш пасціў,
не харчаваўся сытна.
Было гаспадару гадоў пад сто.
Ён дрэнна чуў і слабавата бачыў,
не скошваў нават крапівы густой
і планаваў свой дом прадаць на дачу.
Ды гэты вось пацук панадзіўся сюды:
падгрызваў сцены,
да нары быў скоры.
Напэўна, ён настырны, малады,
бо ўжо далез да бульбы у каморы.
А ў дзеда тога не было ката.
Тады стары купіў у краме пастку.
«Не выкруцішся ты ў мяне, брыда,
закіну ў інвалідную каляску».
Ён асцярожна на кручок надзеў
скарынку хлеба,
кінуў трошку булкі.
«Няўжо на іх грызун не нападзе —
на гэтыя прывабныя пілюлькі?»
Наранку дзед памкнуўся паглядзець,
што адбылося ж у яго каморы.
Прыйшлося аж прысесці, успацець:
ні пацука, ніársткі —
                                        толькі норы.

## Куніца і сава

Куніца папярэдзіла саву:
— Не нападай на мышанят, зладзейка,
бо галаву сівую адарву,
заплача па табе ў бары жалейка.
— Заткніся, рыжая, —
прамовіла сава. —
Са мной бездапаможная цягацца.
Мне нават сам арол наканаваў
нікога ў гэтым лесе не баяцца.
Тут фыркнула сава
і паляцела ўніз
і мышку захапіла дзюбай —
тым самым праявіла свой капрыз
перад куніцай вёрткай, вастразубай.
Куніца кінулася на саву рыўком
і запусціла моцна зубы ў спіну.
Сава ж яе па воку — кіпцюром,
ўдваіх яны і ўпалі на ажыну.
Зноў бойку на зямлі распачалі:
ляцела пер’е, кроў лілася.
Змагаліся, пакуль не паляглі.
А мышка ўсё ж жывою засталася.
Загінулі між хвояў і бяроз
куніца і сава без славы.

...Так могуць скончыць свой жыццёвы лёс
дзве ядзерныя звышдзяржавы.

## Падхалімка

Ліслівіла ліса ваўку:
— Ты самы спрытны, самы смелы,
і не раўня зануду-барсуку,
які і палахлівы, і няўмелы.

А воўк той натапыраны сядзеў
і скоса пазіраў на падхалімку.
Пасля паслаў яе ў фінаддзел,
які яна прызнала за малінку.

Воўк вельмі махінацыі цаніў,
і зроду быў нячысты ён на лапу:

то пажывіцца задарма любіў,
то грошы з дзяржкішэні ха́паў.

Нака́пала ліса мядзведзю на ваўка,
і той не стаў марудзіць, ухіляцца,
а загадаў настырным вепрукам
да ісціны дарыцца, дакапацца.

Загад пад брылік вепрукі ўзялі,
вышуквалі прыхаваныя факты,
стараліся, спяшылі, як маглі,
і акуратна састаўлялі акты.

Грахоў набралася ў ваўка мяшок,
чым нават дбайных следчых азадачыў…
І сцёр яго мядзведзь у парашок,
Ну а лісу начальнікам прызначыў.

## Дыялог ворана і крата

Так, крот сябе не лічыць баявым,
жыве сабе ў сваёй нары паціху.
Наесца чарвякоў, нібы халвы,
і сноўдае, каб напаткаць крацiху.

Ні кот не дабярэцца да яго,
ні хітрая ліса і ні сабака,
ні спёка, ні маланкавы агонь.
Ды вось што воран з вышыні пракаркаў:

— Ну як ты там жывеш, мышыны брат,
у цемрыве, без грама кіслароду?
І ўсё капаешся кудысьці наўздагад…
Цьфу на цябе, крацiная парода!
А тут такая прыгажосць наўкол,
шумяць лясы, квітнеюць сенажаці,
сінее неба, зелянее дол —
не варта табе гэтага цурацца.
Адлюднік ты, сівы, нікчэмны крот.
Баішся на паверхню нос паказваць?
Сядзіш там пад зямлёю з году ў год.
Якая можа быць у гэтым радасць?

— Затое, воран, тут мяне нішто
не пакалечыць, не заб’е знянацку.

Я не адзін, тут полчышчы кратоў,
і ўсе жывём спакойна і па-брацку.
Ну, а ў цябе ці ўрэжацца снарад,
ці новы вірус грыпу ці халеры.
Не, я табе не пазайздрошчу, брат.
Такія вось няважныя паперы…

## Каршун-ліхадзей

Нявабны, закажэнены каршун
лунаў у небе і шукаў наедак.
Яго не зачароўваў лесу шум
і прыгажосць бярозавых сукенак…

А малады неасцярожны дрозд
аблюбаваў чырвоную каліну —
і кінуўся туды каршун наўпрост,
ды ўрэзаўся ў калючую галіну.

Кроў пацякла з разбітай галавы.
Ляжыць драпежнік, лыпае вачыма,
такі бездапаможны і сівы…
— Вось тут табе і будзе, гад, канчына, —
сказаў павесялелы дрозд
і выпрастаўся на ўвесь рост.

Не прымярайце пер’е каршуна,
бо можа напаткаць,
як і яго,
хана.

*2023*

# Сярод кніг

**В. І. Варанец, М. А. Валько. Асацыятыўны слоўнік медыцынскай лексікі: дапаможнік для студэнтаў.** — Гродна: ГрДМУ, 2021. — 92 с.




У дапаможніку падаюцца асацыяцыі на 303 медыцынскія тэрміны, што дае магчымасць спецыялістам падбіраць больш нейтральную лексіку з пацыентамі.

**Беларускія думкі, звычаі, абрады з Лідскага павета XIX стагоддзя: этнаграфічны зборнік.** — Ліда, 2023. — 72 с. (Выданне часопіса «Лідскі летапісец» і ДУ «Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай спадчыны». Рэдактар Станіслаў Суднік, укладальнікі Леанід Лаўрэш, Станіслаў Суднік.)




У зборніку змешчаны 42 фальклорныя матэрыялы з вёскі Глыбокае Лідскага павета, якія былі запісаныя Уладзіславам Вярыгам, Юркевічам і Бірутам у другой палове XIX ст.

**Уладзімір Васько. Неабдымнае: паэзія і проза.** — Ліда: Лідская друкарня, 2023. — 168 с.




У кнізе «Неабдымнае» ёсць вершы, байкі і апавяданні аўтара, які, выкарыстоўваючы сакавітую беларускую мову, вобразныя багацці, імкнецца зліцца з роднай прыродай, увабраць у сябе сусвет, адлюстраваць цяперашняе і мінулае жыццё, складанасць і супярэчлівасць нашага часу.




**Галіна Самойла. Бандары.** — Гродна: ЮрСаПрынт, 2023. — 812 с.

«Хто мы і адкуль мы?» — на гэтыя пытанні змогуць атрымаць адказы ў гэтай кнізе нашчадкі тых, хто прыйшоў у жыццё ў вёсцы Бандары Скідзельскага сельсавета Гродзенскага раёна ў ХХ стагоддзі. Кніга складзена з успамінаў вяскоўцаў, фотаздымкаў, дакументаў з хатніх архіваў і архіваў Гродна.




**Сяргей Чыгрын. Загадка ад сінічак.** — Гомель: Барк, 2023. — 76 с.

Кніга адрасавана юным чытачам, іх бацькам і настаўнікам. У ёй надрукаваны вершы на самыя разнастайныя тэмы. У чатырох раздзелах зборніка аўтар дасціпна і цікава распавядае пра лясных звяроў, птушак, поры года, узаемаадносіны дзяцей дома і ў школе. Шмат вершаў напісаны з гумарам, яны лёгка чытаюцца і запамінаюцца.




**Шляхам яго жыцця: успаміны, роздумы, доследы.** — Гродна, 2023.

Гэты зборнік — даніна агульнай памяці старэйшых і маладзейшых калег вядомага беларускага тэарэтыка і літаратурнага крытыка, доктара філалагічных навук, прафесара Ігара Васільевіча Жука (1957–2017). У ім чытач пагартае асобныя старонкі летапісу яго працоўнага жыцця, пазнаёміцца з навуковым досведам у асэнсаванні складаных і супярэчлівых працэсаў станаўлення і развіцця нацыянальнай літаратуры, яшчэ раз заглыбіцца ў роздум пра існаванне і лёс беларускага мастацкага слова.




**Сяргей Чыгрын. Верыў у Беларусь. Аляксандр Герасіменка.** — Мінск: Тэхналогія, 2022. — 209 с.

Прыгожа выдадзеная кніга прысвечана першаму мэру Мінска, дэпутату Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, намесніку міністра замежных спраў, паслу ў Балгарыі, Грэцыі і Латвіі, старшыні Савета старэйшын Мінскага гарвыканкама Аляксандру Герасіменку (1946–2017).

# Змест

## Паэзія

Рычард Бялячыц

Больш няма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Прашу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Песні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Песня выраю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Святая праўда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Прызнанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Жаданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Здымак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Варнянская вежа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Апроч цябе . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
* * * Як раніцай вырай пакажацца стуль... . . . . . . . . . . . 9
Запытанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Запрашэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .10
Вераніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .10

Уладзімір Васько

* * * Мітусня... І нічога добрага... . . . . . . . . . . . . . .12
Распяцце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .12
Паратунак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .13
Майскі павеў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .14
Батрак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .14
Пад ліпаю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .15
Занядоліла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .16
Бездухоўны кацёл . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .17
Душэўны прытулак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .18
Фантазія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .18

Паліна Дваранская

Балада Алаізы Пашкевіч (Цёткі) . . . . . . . . . . . . . . . .20
* * * Я стаю пад дажджом... . . . . . . . . . . . . . . . . . .20
Няхай квітнеюць сады... і ты . . . . . . . . . . . . . . . . .21
Несмяротная душа беларуса . . . . . . . . . . . . . . . . . . .21
Трыялет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .22
Рандэль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .22
* * * Я люблю іх... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .23

Мікола Кананові́ч

Час летняга сонцастаяння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Ода дажджу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Пляменніку Ціхану — віншаванне з атрыманнем дыплома ВНУ . . . . 25
* * * Разбуджаны ветрам і музыкай мухі… . . . . . . . . 26
* * * Раніца ў палоне цішыні… . . . . . . . . . . . 26
Сястры Святлане . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
* * * Цвітуць зноў вішні ў садзе маладым… . . . . . . . 27
* * * А заўтра дождж і мокры снег… . . . . . . . . . 28
* * * Белыя лісты паперы… . . . . . . . . . . . . . 28
* * * Вецер выстудзіў свет мой наскрозь… . . . . . . . 29
* * * Вясна свае пяшчоты раскрывае… . . . . . . . . . 30
Вясновае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
* * * Не паражыць туманнасць Андрамеды… . . . . . . . 30
Паслясвяцце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Паэт і вершы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Радуніца ў Востраве . . . . . . . . . . . . . . . 32

Альжбета Кеда

Лацінкаю піша тутэйшае поле…
*Пяціверша* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

Мечыслаў Курыловіч

Слухаю вочы
*Вершаваныя гумарэскі* . . . . . . . . . . . . . . 37
Балада Нёмана . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Балада ветру . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Настальгія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Дзень незалежнасці . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Рэклама . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
* * * На грані смерці і жыцця… . . . . . . . . . . . 41
* * * Свет з грахом назаўжды… . . . . . . . . . . . . 41

Віктар Сазонаў

Ты са мной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Позняя восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Камін у сэрцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Белы Рысь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Лятаюць птушкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Фельетон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Восень. Жоўтыя лісточкі… . . . . . . . . . . . . . 46
Кілішак са Старым Новым годам . . . . . . . . . . . 47

Янка Трацяк

*СМЕШНЫЯ ВЕРШЫ*
Нешта пайшло не так… . . . . . . . . . . . . . . . 48
* * * Зямное і нябеснае… . . . . . . . . . . . . . . 49
* * * Дадзена нам у пачуццях… . . . . . . . . . . . 49

Сам ведаеш…
*Споведзь іншапланетніка* . . . . . . . . . . . . . . . . . .50
Дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .51
Калі прачнешся… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .51
Дзіўны знак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .52
Чорт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
Пра блуднага сабаку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
Блытаніна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
* * * Не люблю жанчын у джынсах… . . . . . . . . . . . . . .54
Позняе прызнанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .55
Паэт і каханне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .55
Будзе яшчэ лепш… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .56

## ПРОЗА

Віктар Варанец

Ад Fabergé . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .58
Падарожжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .67
«Уралачка»
*Іранічны дэтэктыў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .70
Выгадная прапанова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .74

Уладзімір Васько

Авечка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .79
Дрэкс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .81
Рабы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .85
Злодзей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .89

Міхась Зізюк

Скачок з парашутам
*Аповесць* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .92

Віктар Сазонаў

Фрак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
Залатая прыбіральня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126

Станіслаў Суднік

Мама, дай! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Не дай божа дажыць… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Сасна крычала… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137

Янка Трацяк

Ляжалі разам… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142

## Запісы

Рычард Бялячыц

У святле палаца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154

Тацяна Валенцік

Пад покрывам Маці Божай
*Непрыдуманая гісторыя* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 158

Валянцін Дубатоўка

Між кувалдай і кавадлам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165

Леанід Лаўрэш

Страчаная цывілізацыя:
маёнткі Стрэліца і Касцянёва з Паперняй на Лідчыне
*Гістарычныя хронікі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174

## Дэбют

Літаратурнаму клубу «Катарсіс» — 25. *В. Варанец* . . . . . . . . . . . . . . . . . 193

Кацярына Дзежыц

* * * З дзяцінства ў памяці куток... . . . . . . . . . . . . . . . . . 194

Арцём Палудзень

Буслы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195

Дзіяна Трацяк

Пакажы мне жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196

Макар Пашкевіч

Шум за зачыненымі дзвярыма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197

## Нашым юбілярам

Валянцін Дубатоўка

Рычард Бялячыц — невыпраўны рамантык . . . . . . . . . . . . . . 202

Мікола Кадановіч

65-я восень Сяргея Чыгрына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204

Янка Трацяк

Віктар Варанец: штрыхі да творчага партрэта . . . . . . . . . . . 206

Сяргей Чыгрын

Ад родных ніў Александрыі і Дзярэчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
Занатоўка пра пісьменніка з Гальшанаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212

## IN MEMORIA

*На добры ўспамін пра Паўла Уладзіміравіча Сцяцко (05.03.1930–23.03.2020)*

Валянцін Дубатоўка

Прафесар з хутара Нябайкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215

## ДЗЕЦЯМ

Іван Буднік

Пра пчолку і жыццё вулея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218

Сяргей Чыгрын

Верталёт Бабы-Ягі
*Казка для дзяцей у адной дзеі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220

## САТЫРА І ГУМАР

Іван Буднік

Ліса-будаўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 239
Свіння-дызайнер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240

Уладзімір Васько

Пчаляр, мядзведзь і ліса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 241
Пералюбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 241
Перапала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
Дзед і пацук . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 243
Куніца і сава . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 244
Падхалімка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 244
Дыялог ворана і крата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 245
Каршун-ліхадзей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246

## СЯРОД КНІГ

Сярод кніг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 247

Альманах выходзіць на беларускай мове адзін раз на год.

Тэксты дасылаюцца ў праграме Microsoft Word, шрыфт Times New Roman праз адзін інтэрвал. Рэдакцыя тэксты не рэцэнзуе. Аўтары дасылаюць свой здымак у пашырэнні JPEG памерам не менш за 1000 КБайт (1 МБайт) і сціслую біяграфічную даведку з акцэнтам на літаратурнай творчасці. Узор даведкі — у альманаху.

Матэрыялы дасылаюцца на адрас: jantrac016@gmail.com або novyzamak.sbp@gmail.com.

**12+**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**НОВЫ ЗАМАК**

*Літаратурны альманах. Гродна. MMXXIII. Выпуск 12*

Рэдактар *Алік Акуліч*
Вёрстка *Алены Цішковай*
Карэктарка *Алена Крыцкая*

Падпісана да друку 27.10.2023. Фармат 70×100 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 16,24. Ум. друк. арк. 20,64.